бібліятэка Свабоды

XXI стагодзьдзе



Аляксандар Лукашук

сьлед матылька

Освальд у Менску

радыё свабода

сьлед матылька


NEW OR
112
8

Аляксандар Лукашук

сьлед матылька

Освальд у Менску

Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода

Аляксандар Лукашук. Сьлед матылька. Освальд у Менску. (Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе.) — Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2011. — 390 с.: іл.

Заснавальнік і каардынатар сэрыі
Аляксандар Лукашук
Мастацкі рэдактар *Генадзь Мацур*

Рэдактар *Сяргей Дубавец*
Мастак *Генадзь Мацур*
Карэктар *Сяргей Шупа*

Публікацыі і архіўныя матэрыялы выкарыстаныя з дазволу:
The Mailer Estate, New York («Oswald's Story» Н. Мэйлера);
выдавецтва «MonLitera», Менск («Oswald: Russian Episode» Э. Цітаўца);
Дзяржаўнага архіву кінафотафонадакумэнтаў Беларусі, г. Дзяржынск.

© Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011
FOL

ISBN 978-0-929849-41-6

Зьмест

Замест прадмовы ... 8
У ГУМ заднім ходам ... 11
Першы сьмех ... 15
Пакараньне Менскам ... 20
Дзёньнік гістарычнага чалавека ... 24
Шоў-шоў і прыйшоў ... 27
Дэпутат ідзе ў КДБ ... 30
Дэпутат ідзе з КДБ ... 36
Сарокі над КДБ ... 42
Удар па амбіцыях ... 47
Удар, але па мячыку ... 50
Дзьве памяці, плюс-мінус ... 55
«Russia» ці «Belorussia»? ... 61
Самагонка для Мэйлера ... 67
Acherontia atropos, сямейства чэкістых ... 71
Палёты «Справы № 34451» ... 77
Станіслаў Шушкевіч і шапка з вушамі ... 81
Першыя дні «расейскага рабочага» ... 84
Кватэра для кавалера ... 89
76 прыступак уверх і ўніз ... 92
Освальд і яго імёны ... 96
Першая памылка КДБ ... 99
Карацейшы ў 38,6 раза ... 104
Аргентынскае танга на Чырвонай ... 106
«Ідэот», не ідыёт ... 110
Чый Освальд? ... 115
Песьня для Хрушчова ... 120
Хэлоў, карова са штату Аёва ... 126
Найважнейшае з мастацтваў ... 131
«Аооаох!» — і міма ... 135
Мэйлер і падзякі ... 139
Мэйлер і Цітавец ... 141
Мэйлер і «Цітавец» ... 144
Гепард з хуткасьцю чарапахі ... 148
Ці ведаў Освальд Цітаўца? ... 153
«Здрастуй!» І бывай... ... 156

Паходы ў манастыр 159
Заўважана імкненьне знаёміцца з бляндынкамі 162
КДБ і «мужчыны зь вялікай задніцай» 166
Мэйлер і гіганты сэксу 169
Цнота 172
Халтуршчыкі з КДБ 174
Разьбітае сэрца Освальда 177
«Я — амэрыканскі грамадзянін!» 181
На танцы 185
Дэман амнэзіі 189
З танцаў 194
Allegretto, allegro, allegrissimo 198
Тайна мядовага месяца 204
Роля дзірачак у гісторыі 209
Рэцэпт драмы 213
Камсамольская любоў 217
П'еса «Маладыя». Акт 1 222
П'еса «Маладыя». Акт 2 227
Талстаеўскі 232
Освальд і Пушкін 236
Дагнаць Амэрыку 242
Навагодні сьмех 249
Бомба для Хрушчова 253
Пад бела-чорнымі крыламі 257
Каго бусел прынёс 261
Антысавецкая фармацэўтыка 266
Нахабства бязь межаў 269
Ідыёт, сабака, мярзотнік, падонак 275
Грошы, свабода, каханьне, душа 279
Спэцтэхніка падвяла 283
Нататкі антысаветчыка 286
Освальд і Сталін 293
Нататкі антысаветчыка. Працяг 297
Нашы на Месяцы 303
«Калектыў» пра калектыў 309
Злавіць матылька 314
Апошнія клопаты 319
Віза для Марыны 322
Лекі ад «Доктара Жывага» 326
«Лі Освальд» — 35 разоў па-беларуску 333
Памылка Мэйлера 338

Кніга без ілюстрацыяў 342
Далсты 347
Освальд — чытач «Гісторыі Освальда» 351
Цягнік, які не спазьніўся 358
Хоць на Месяц узвый 361
Пераклады перакладаў перакладаў 368
Хто сьмяецца апошні 370
Замест пасьляслоўя 372
Падзякі 374
Асноўныя крыніцы 375
Паказьнік асобаў 376
Пра аўтара 384
Summary 385



— Не, быць ня можа. Не з-за такой малой рэчы. Не! З камяку бруду выбліскваў зеленьню, золатам і чэрню матылёк, вельмі прыгожы і вельмі мёртвы.
— Не з-за такой драбніцы! Не з-за матылька!

Рэй Брэдбэры. І грымнуў гром

Замест прадмовы

У 1952 годзе, калі герою гэтай кнігі Лі Освальду было 13 гадоў і падлеткі зачытваліся фантастыкай, амэрыканскі пісьменьнік Рэй Брэдбэры апублікаваў самае вядомае сваё апавяданьне «І грымнуў гром» (па колькасьці перавыданьняў у сваім жанры яно займае першае месца ў сьвеце).

... На раніцу пасьля прэзыдэнцкіх выбараў герой Брэдбэры ідзе ў кантору, якая арганізуе падарожжы ў часе, бо лепш адправіцца ў мінулае, чым жыць пры новым прэзыдэнце-дыктатары. Аднак высьвятляецца, што выбары ўсё ж выйграў яго супернік, і герой зь лёгкім сэрцам адпраўляецца ў мінулае на паляваньне. Там ён выпадкова расьціснуў матылька, і калі вярнуўся, аказалася, што ў выніку ланцужка падзеяў рэчаіснасьць зьмянілася, і прэзыдэнтам стаў дыктатар. Апошняе, што чуе герой — гром стрэлу, якім абрываюць яго жыцьцё і ягоную ролю ў гісторыі...

Забойства амэрыканскага прэзыдэнта Джона Фіцджэральда Кенэдзі Лі Гарві Освальдам — самая вялікая ў гісторыі чалавецтва сьледчая справа, якая налічвае больш за чатыры мільёны аркушаў арыгінальных дакумэнтаў, ня кажучы пра кнігі, фільмы, тэлесэрыялы — у тым ліку пра падарожжа ў часе ў 1963-ці, каб спыніць забойцу. Быў нават м'юзыкал.

Свае пяць капеек у гэтую гісторыю я ўставіў яшчэ калі хадзілі пятакі зь дзяржаўным гербам СССР: пераклаў і апублікаваў яго «Гістарычны дзёньнік», пазьней быў кансультантам амэрыканскай здымачнай групы тэлекампаніі Frontline, якая на пачатку 1990-х здымала ў Менску фільм «Хто быў Лі Гарві Освальд?», даваў інтэрвію і выступаў з аповедамі пра менскі пэрыяд героя падчас паездак на яго радзіму.

У СССР 1960-х амэрыканец, які па сваёй волі прыехаў сюды жыць і працаваць, успрымаўся як матылёк зь іншай плянэты. Менск часоў Освальда цяпер — таксама ўжо іншая плянэта, дзе лётае загадкавая чужародная істота.

І ўвесь час за ёй паварочваецца пільнае вока і вуха.

За Освальдам у Менску назіралі, як энтамоляг назірае за членістаногай казуркай атраду лускакрылых. Вывучаюцца стадыі жыцьцёвага цыклю — яйка, вопрадзень, вусень, імага, фіксуюцца звычкі, рухі, маршруты, харчаваньне, сэксуальныя функцыі, здольнасьць да мімікрыі, узаемадзеяньне з асяродзьдзем, спэцыфічныя навыкі, рэакцыя на раздражняльнікі, экалёгія...

Разьдзел энтамалёгіі, які вывучае матылькоў, называецца лепідаптэралёгія. Разьдзел дзяржавы, які вывучаў людзей, называецца — кадэбэ.

Амэрыканскі пісьменьнік Норман Мэйлер стаў першым і адзіным дасьледнікам, які атрымаў доступ да «калекцыі» КДБ у Менску, абмежаваны і фрагмэнтарны, але ў спалучэньні з успамінамі сваякоў, сяброў, знаёмых героя дастатковы, каб яго кніга «Гісторыя Освальда» ўзьляцела ў сьпіс бэстсэлераў.

Мінулай вясной я панёс кветкі на магілу аднаго свайго даўняга амэрыканскага знаёмага-вэтэрана, якога пахавалі на Арлінгтанскіх могілках у Вашынгтоне, і потым падняўся на ўзгорак, дзе спачывае 35-ты прэзыдэнт ЗША.

Падыходзілі сем'і, турыстычныя групы, студэнты — нацыянальная памяць дагэтуль ня можа зьмірыцца з раптоўнай брутальнай і бессэнсоўнай стратай.

Гэтая кніга не пра тое, хто і як забіў Кенэдзі.

Хутчэй — спроба аднавіць сьляды, якія пакінуў у менскім паветры паўстагодзьдзя таму адзін матылёк.

Літаратурны ляндшафт пасьля Освальда выглядае як пасьля рэйду цяжкога бамбавіка, а яго біяграфія — як гісторыя сусьветных войнаў.

Хоць насамрэч — матылёк праляцеў.



У ГУМ заднім ходам

7 студзеня 1960 году ў 8 гадзін 23 хвіліны раніцы з купэйнага вагона маскоўскага цягніка № 9 на пэрон Менскага вакзалу ступіў 20-гадовы амэрыканскі грамадзянін у салдацкай шапцы-вушанцы й бяз пашпарта — ён здаў яго ў амбасаду ў Маскве, заявіўшы пра жаданьне застацца ў СССР, пасьля чаго праз два з паловай месяцы чаканьня і спробы самагубства атрымаў 5000 рублёў ад Чырвонага Крыжа, накіраваньне на працу і жытло ў сталіцы Беларусі, дзе праз год ажаніўся, а калі нарадзілася дзіця, разам зь сям'ёю вярнуўся ў ЗША, каб а 12:30 у суботу 22 лістапада 1963 году з вакна шостага паверху даласкага кніжнага складу з адлегласьці 50 мэтраў з італьянскага карабіна Манліхер-Каркана калібру 6,5 мм першым стрэлам параніць 35-га прэзыдэнта ЗША Джона Кенэдзі, другім — губэрнатара Тэхаса Джона Коналі, трэцім — дабіць прэзыдэнта, затым на вуліцы рэвальвэрным стрэлам у галаву забіць афіцэра паліцыі Джэй Ды Тыпіта, і праз 46 гадзінаў 51 хвіліну, падчас пераводу з пастарунку

ў турму, пры ўключаных камэрах у простым эфіры амэрыканскага тэлебачаньня атрымаць ва ўпор кулю з Кольта-Кобры 38 ад мясцовага жыхара Джэка Рубі, і пасьля ўскрыцьця трупа ў моргу ды іншых фармальнасьцяў быць закапаным на могілках гораду Форт Ворт у яме, побач зь якой дзесяцігодзьдзямі ня будуць хаваць нікога.

Так скончылася адно жыцьцё Лі Гарві Освальда і пачалося другое.

У новым жыцьці нешта, вядомае як «Лі Гарві Освальд» ці «ЛГО», стала аб'ектам гістэрычнай увагі палітыкаў, журналістаў, пісьменьнікаў, героем шматлікіх расьсьледаваньняў, публікацыяў, кніг, фільмаў, прадметам абмеркаваньня Кангрэсу ЗША і Палітбюро ЦК КПСС, галаўным болем для ФБР, ЦРУ і КДБ. Яго выкопвалі з магілы, называлі забойцам-псыхапатам, кубінскім агентам, заслaным двайніком КДБ, а таксама нявіннай ахвярай мафіі, амэрыканскіх спэцслужбаў, правых і левых радыкалаў, сакрэтных біялягічных экспэрымэнтаў, правадніком акультнай усясьветнай змовы.

Дата, калі ён націснуў на спускавы гачок, стала сакральнай у амэрыканскім жыцьці на паўстагодзьдзя: а дзе ты быў, калі забілі Кенэдзі, а што ты рабіла ў той дзень?..

У Савецкім Саюзе яшчэ доўга пра яго амаль ніхто ня будзе ведаць, хоць амаль кожны яго менскі дзень ад 7 студзеня 1960 году да 22 траўня 1962-га, кожны ліст і размова таксама былі прадметам пільнай увагі.

Рапарт вонкавага назіраньня КДБ
10.01.60
08:00-24:00

У 11:00 Лі Гарві выйшаў з гатэлю «Менск» і пайшоў у ГУМ. Там зайшоў у аддзел электратавараў, нешта спытаўся ў прадаўца, дастаў з кішэні грошы і пайшоў да касы. Ні за што не заплаціў, паклаў грошы назад у кішэню і пачаў хадзіць па першым паверсе ўнівэрмагу туды і назад і разглядаць розныя тавары. Затым вярнуўся ў аддзел электратавараў, заплаціў 2 рублі 25 капеек за электравілку, паклаў яе ў кішэню і падняўся на другі паверх. Там правёў некаторы час у аддзеле гатовага адзеньня, перагледзеў наяўныя касьцюмы, затым хутка пакінуў ГУМ. Вярнуўся ў гатэль у 11:25.

У 12:45 выйшаў са свайго пакою і пайшоў у рэстаран. Сеў за вольны столік і пачаў есьці. *(Назіраньне падчас яды не вялося, бо больш людзей там не было.)*

У 13:35 Лі Гарві выйшаў з рэстарану і вярнуўся ў свой пакой.

У 18:10 выйшаў з пакою і пайшоў у рэстаран. Сеў за вольны столік, пад'еў, выйшаў з рэстарану ў 18:45, на ліфце падняўся на чацьвёрты паверх і пайшоў у свой пакой.

Не выходзіў з пакою да 24:00, пасьля чаго назіраньне не вялося да раніцы.

Назіральнік як бясстрасная камэра фіксуе нават, як аб'ект засоўвае рукі ў кішэні, і прыводзіць такія пераканаўчыя дэталі, як кошт электравілкі.

Але навошта яна амэрыканцу ў гатэлі? Каб сабраць дэтэктарны перадатчык і паслаць паведамленьне ў ЦРУ, бо амэрыканская пляскатая вілка не падыходзіць да беларускай разэткі з круглымі дзірачкамі?

Ад гатэлю да ГУМу — каля кілямэтра, туды і назад, плюс разьлік на касе, абыход першага паверху, потым другога — і на ўсё 25 хвілін, калі верыць КДБ?

І як гэта суадносіцца з запісам пра 10 студзеня ў дзёньніку самога Освальда:

Цэлы дзень мой. Гуляю па горадзе. Вельмі прыгожа.

Дзе тут праўда? Дзе насамрэч быў Освальд?

Архіўныя дакумэнты маюць уласныя стасункі з часам — як камяні ў рацэ, яны могуць паказваць то адзін бок, то другі, могуць зьнікаць безь сьлядоў і выходзіць на паверхню ў іншым кантэксьце, з новымі сэнсамі і акцэнтамі. Спрабаваць скарыстаць іх для хроналягічнага аднаўленьня падзеяў — усё адно як пасьля цэлага дня паездак па горадзе назаўтра захацець аднавіць учорашні дзень і паспрабаваць праехаць заднім ходам па ўсім маршруце, гледзячы толькі ў люстэрка задняга віду. Напор новага трафіку, рамонты дарог і здарэньні робяць спробу безнадзейнай. Можна толькі зноў выехаць з зыходнага пункту і паўтарыць маршрут, каб заўважыць ці высьветліць сёе-тое, што засталося па-за кадрам.

А яшчэ лепш пайсьці пешкі. Прагуляцца.

Гадзіньнікавыя стрэлкі паказалі 11:00, швэйцар адчыніў рэстаўраваныя дзьверы абноўленага гатэлю «Менск», я выйшаў на праспэкт Незалежнасьці, які ў час прыезду Освальда насіў імя Сталіна, а падчас яго ад'езду — ужо Леніна, паглядзеў на калёны самага прыгожага будынку ў горадзе — Менскага паштамту, павярнуў налева і пайшоў у ГУМ купляць электравілку.



Першы сьмех

Нічога не пачынаецца тады, калі пачынаецца, і пакуль аўтар ідзе ў ГУМ, адгорнем старонкі ненапісанай першай часткі гэтай кнігі, безь якой яна была б немагчымая, як матылёк бяз кукалкі, вопрадзень бяз вусеня, вусень бязь яйка.

Освальд нарадзіўся 18 кастрычніка 1939 году ў Новым Арлеане (бацька памёр за два месяцы да яго нараджэньня) і меў двух старэйшых братоў. У 1955-м пасьля канфліктаў у школе кідае вучобу, далучаецца да сацыялістычнай лігі. Ідзе на вайсковую службу ў марскую пяхоту, атрымлівае спэцыяльнасьць апэратара авіяцыйнай электронікі (радары). Служыць у Японіі, на Тайвані і Філіпінах. Здае тэст на прыцэльную стральбу ў катэгорыі снайпэр. Летам 1959-га дэмабілізуецца з базы ў Каліфорніі.

16 кастрычніка 1959 году ў пошуках сапраўднага марксізму празь Фінляндыю прыяжджае ў СССР зь пяцідзённай турыстычнай візай, пасяляецца ў маскоўскім гатэлі «Бэрлін» і заяўляе перакладчыцы Інтурысту, што ён — камуніст і хоча атрымаць

савецкае грамадзянства. Праз два дні ў яго дзень народзінаў, які ён прабавіў зь перакладчыцай і пакінуў запіс у дзёньніку:

Мой 20-ты дзень народзінаў, ідзём на выставу раніцай, а пасьля абеду — у маўзалей Леніна-Сталіна. Яна ўручае мне падарунак — кнігу «Ідыёт» Дастаеўскага.

21 кастрычніка Освальд атрымлівае паведамленьне, што ў грамадзянстве адмоўлена, віза скончаецца, і ён мусіць пакінуць краіну да 20:00. За гадзіну да сканчэньня тэрміну ў ваньне рэжа вены на левай руцэ. «Хуткая» адвозіць у шпіталь. На наступны дзень ён робіць дзёньнікавы запіс:

Я ў маленькай палаце. Са мной 12 хворых. Палата цёмная, сьняданак дрэнны. Пасьля працяглага двухгадзіннага назіраньня за іншымі хворымі я прыходжу да высновы, што я ў палаце для вар'ятаў, і гэта мяне вельмі бянтэжыць.

Пасьля выпіскі праз тыдзень яго перавозяць у гатэль «Мэтраполь», у больш сьціплы нумар, пачынаюцца сустрэчы з прадстаўнікамі Інтурысту і АВІРу. У лісьце старэйшаму брату ён патлумачыць, чаму вырашыў застацца ў Савецкім Саюзе.

ЛГО — Робэрту Освальду
26.11.59

Дарагі Робэрт,

Я задам табе пытаньне, Робэрт: дзеля чаго ты падтрымліваеш амэрыканскі ўрад? Які ідэал на першым пляне? Не кажы «свабода», бо свабода гэта слова, якое ўсе народы выкарыстоўвалі ўвесь час.

Спытай у мяне, і я адкажу, што змагаюся за камунізм. Гэтыя словы наводзяць цябе на думку пра рабоў ці несправядлівасьць — гэта з-за амэрыканскай прапаганды. Ты кажаш пра выгаду і перавагі. Ты думаеш, я тут дзеля гэтага? Дзеля асабістых, матэрыяльных выгадаў? Шчасьце —не асабістая рэч, яго не складаюць маленькі дом, магчымасьць усё браць і атрымліваць...

Тут добрыя, цёплыя, жывыя людзі. Яны хочуць, каб усе народы жылі ў міры, але адначасна яны б хацелі бачыць свабоднымі эканамічна заняволеных людзей Захаду. Яны вераць у свае ідэалы і стаяць за свой урад і краіну да канца.

Ты кажаш, што не выракаўся мяне, добра, я рады, але я скажу табе пра мае ўмовы. Я хачу, каб ты зразумеў, што я зараз скажу, і я не кажу гэта лёгка ці не падумаўшы, бо я, як ты ведаеш, служыў у войску і ведаю, што такое вайна.

1. Калі будзе вайна, я заб'ю кожнага амэрыканца, які надзене вайсковую форму дзеля абароны амэрыканскага ўраду — любога амэрыканца.

2. Унутрана я ня маю ніякага дачыненьня да ЗША.

3. Я хачу і буду мець нармальнае, шчасьлівае і мірнае жыцьцё тут, у Савецкім Саюзе да канца свайго жыцьця.

4. Мая маці й ты не зьяўляецеся аб'ектамі маёй любові, а толькі прыкладамі рабочых у ЗША.

Не спрабуй узгадаць, якім я быў, бо толькі цяпер я паказваю табе, які я. Я ня маю горычы ці нянавісьці, я прыехаў сюды, толькі каб знайсьці свабоду. Кажу праўду, я адчуваю, што нарэшце я са сваім народам.

У Маскве цяпер ідзе сьнег і ўсё выглядае вельмі прыгожа. Я магу бачыць Крэмль і Красную плошчу, і я толькі што павячэраў mjaso і kartofel, мясам і бульбай. Бачыш, расейцы ня так ужо й адрозьніваюцца ад цябе і мяне.

Лі.

У лісьце Освальд вылучае некалькі словаў, адно зь іх — заб'ю ***кожнага*** амэрыканца. Кожны — гэта й брат. І ня толькі.

У апошні дзень году Освальд бярэ таксі, едзе ў амэрыканскую амбасаду, заяўляе пра адмову ад грамадзянства і здае пашпарт консулу Рычарду Снайдэру.*

У наступныя дні Освальд дае некалькі інтэрвію амэрыканскім журналістам, але потым адмаўляецца ад кантактаў, сядзіць адзін у нумары, вучыць расейскую мову і чакае рашэньня.

4 студзеня 1960 году яго выклікаюць у АВІР, выдаюць дакумэнт для асобаў без грамадзянства. Супрацоўнік паведамляе, што месцам жыхарства вызначаны Менск.

*Незадоўга перад тым Снайдэру давялося мець справу з падобным выпадкам: адразу пасьля службы ў войску амэрыканец Пэтрулі прыехаў у Маскву як турыст, зьявіўся ў амбасадзе, каб здаць пашпарт, і заявіў, што адмаўляецца ад грамадзянства і застаецца ў СССР. Празь некалькі тыдняў назіраньняў савецкія ўлады запатрабавалі, каб амбасада вярнула яго ў ЗША: Пэтрулі быў псыхічна хворы.

Освальд запісвае ў дзёньніку:

Я пытаюся: гэта ў Сібіры? Ён сьмяецца.

Гэты першы сьмех у гісторыі Освальда можна лічыць пачаткам гэтай гісторыі.*

*Амэрыканцы жылі і працавалі ў Менску і да Освальда. У 1922-23 гадах тут дзейнічаў офіс Амэрыканскай адміністрацыі дапамогі (АРА), дзе шэсьць амэрыканцаў займаліся аказаньнем гуманітарнай дапамогі (гл. маю кнігу «Прыгоды АРА ў Беларусі», 2005). У 1946-47 гадах пятнаццаць амэрыканцаў працавалі ў місіі ЮНРРА, якая таксама займалася дапамогай. Амэрыканцы жылі ў сядзібе ў менскім прадмесьці Лошыца, Освальд мог бачыць помнік на Вайсковых могілках, дзе пахаваная адна супрацоўніца ЮНРРА Рут Ўолер. (Гл. фільм «Забытая місія» на сайце Амбасады ЗША ў Менску).



Пакараньне Менскам

Сталіца савецкай Беларусі не ўваходзіла ў сьпіс гарадоў, якія трымаў у памяці звычайны амэрыканец. Апроч Масквы і Ленінграду, ён ведаў Кіеў, Сталінград, магчыма, адрасы лэнд-лізу — вайсковыя парты Мурманск і Ўладзівасток.

Праз чатыры гады пытаньне пра Менск прагучала ў Вашынгтоне на пасяджэньні Прэзыдэнцкай Камісіі, якая расьсьледавала забойства Кенэдзі («Камісія Ўорэна»).*

---

*Камісія ў справе забойства Кенэдзі была створаная распараджэньнем прэзыдэнта ЗША Ліндана Джонсана 29 лістапада 1963 году. Яе складалі 34 чалавекі, а ўзначальваў старшыня Вярхоўнага суду ЗША Эрл Ўорэн. Пасьля году расьсьледаваньня Камісія выпусьціла справаздачу, у якой зрабіла выснову, што Лі Гарві Освальд забіў прэзыдэнта адзін і без пабочнай дапамогі. Тэкст справаздачы склаў 888 старонак, апублікаваныя матэрыялы склалі 26 тамоў, а дадатковыя дакумэнты, мэмарандумы і стэнаграмы пасяджэньняў налічваюць больш за 50 тысяч старонак. Усе дакумэнты (за выняткам мінімальнай інфармацыі пра падаткі прыватных асобаў) цяпер адкрытыя для дасьледнікаў і ў большасьці даступныя ў Інтэрнэце.

Пытаньне было адрасаванае дыплямату амэрыканскай амбасады ў Маскве Рычарду Снайдэру, які займаўся дакумэнтамі Освальда:

Кангрэсмэн Форд: Калі б вы тады ведалі, што Освальд будзе ў Менску, што б вы сказалі?

Снайдэр: Так яму і трэба.

Кангрэсмэн Форд: Чаму вы так кажаце?

Снайдэр: Вы ніколі не былі ў Менску. Гарады ў правінцыі ў Савецкім Саюзе знаходзяцца на вялікую прыступку ніжэй за сталіцу, а сталіца, паверце мне, на даволі вялікую прыступку ніжэй за любы амэрыканскі населены пункт. Адрозьненьне паміж буйнымі гарадамі і малымі і паміж малымі і вёскамі — гэта велізарны крок назад у часе. Жыць у Менску ці любым іншым правінцыйным горадзе ў Савецкім Саюзе — даволі змрочны досьвед для любога, хто жыў у нашым грамадзтве.

Кангрэсмэн Форд: Вы калі-небудзь былі ў Менску?

Снайдэр: Я правёў каля гадзіны ў Менску, гуляў паміж цягнікамі, аднойчы.

Кангрэсмэна, які пытаўся пра Менск, звалі Джэральд — празь дзесяць гадоў ён стане 38-м прэзыдэнтам ЗША, у гэтай якасьці паставіць свой подпіс пад Хэльсынскімі пагадненьнямі, якія дадуць юрыдычны аргумэнт («выконвайце сваю Канстытуцыю і законы!») савецкаму і постсавецкаму дысыдэнцкаму руху (у Менску таксама зьявіцца свой «Хэльсынскі камітэт»).

Форд у Менску ніколі ня быў. А вось яго папярэднік у Белым доме сталіцу Беларусі адведаў. Рычард Ніксан з жонкай былі ў Менску на пачатку ліпеня

1974-га, калі тут адзначалі 30-я ўгодкі вызваленьня Беларусі ад нямецкай акупацыі.

Яны прыляцелі з Крыму, дзе сустракаліся з генэральным сакратаром ЦК КПСС Брэжневым, на два дні. Прысутнічалі на парадзе, усклалі кветкі да помнікаў, іх завезьлі ў мэмарыяльны комплекс Хатынь. Заходні друк пісаў тады пра Хатынь як сьвядомую падмену Катыні, дзе НКВД расстраляла тысячы польскіх афіцэраў.

Ніксан заўважна кульгаў — у яго абвастрыўся тромбафлебіт на левай назе, у Вашынгтоне даходзіў да кульмінацыі Ўотэргейцкі скандал, да ганебнай адстаўкі заставалася шэсьць тыдняў...

Ніксан быў на плошчы Перамогі, куды штодня хадзіў Освальд, але наўрад ці яму паказвалі будынак па суседзтве, дзе жыў забойца яго колішняга суперніка на выбарах.

У 1960-м, калі выбаршчык Освальд жыў у Менску і не галасаваў, Ніксан прайграў прэзыдэнцкія выбары Джону Кенэдзі — усяго 0,1% галасоў. Калі б выйграў — у Освальда магла б быць іншая мішэнь.


Марына Освальд пазьней раскажа сьледчым, што муж сапраўды зьбіраўся пры выпадку забіць Ніксана. Такі выпадак надарыўся ў 1963-м, калі Ніксан меўся прыехаць у Далас. Освальд падрыхтаваў зброю і на пытаньне ўстрывожанай Марыны адказаў, што будзе дзейнічаць па абставінах. Яна ведала, што ён не жартуе, бо раней ужо спрабаваў забіць генэрала Ўолкера, аднаго зь лідэраў амэрыканскіх правых, абстраляў яго дом. Паліцыя вяла сьледзтва, але нікога не знайшла. У дзень прыезду Ніксана Марыне ўдалося са скандалам адгаварыць Освальда.

Менск стаў апошнім горадам за мяжой, які наведаў Ніксан-прэзыдэнт. На ўрачыстым абедзе падчас абмену тостамі Ніксан пажартаваў, што Брэжнеў паслаў яго ў Менск з-за таго, што там жыве гімнастка Вольга Корбут, алімпійская чэмпіёнка.

А мог і пра Освальда пажартаваць.

Скандал быў бы — ня меншы за Ўотэргейт.*

*Астролягі, канечне, заўважаць, што апошнія паўстагодзьдзя Менск спэцыфічна зьвязаны зь Белым домам: спачатку забойства Кенэдзі, потым Джонсан, які, дзякуючы гэтаму, стаў прэзыдэнтам, адмаўляецца ісьці на другі тэрмін, затым Ніксан пасьля візыту ў Менск ідзе ў адстаўку, Клінтан адведвае Менск і атрымлівае імпічмэнт. У менскай паездцы Ніксана суправаджаў памочнік Пэт Бюкэнан, які потым сам тройчы спрабаваў стаць прэзыдэнтам ЗША — і ўвесь час марна. Страшнае слова просіцца з кампутара на старонку — карма.



Дзёньнік гістарычнага чалавека

Існуе мноства прычынаў і мэтаў, чаму людзі запісваюць падзеі жыцця і свае ўражаньні ў дзёньніку, але найбольш дакладны адказ дае часцей за ўсё сам тэкст.

Пасьля арышту Освальда паліцыя правяла ператрус яго рэчаў і знайшла запісы пад загалоўкам «Гістарычны дзёньнік».*

Уся гістарычная гісторыя зьмясьцілася на дванаццаці старонках, якія ахопліваюць падзеі ад прыезду ў Маскву ў кастрычніку 1959-га і да сакавіка 1962-га. Апошнія тры месяцы перад ад'ездам у Амэрыку запісы не рабіліся — але большасьць

---

*Арыгінал далучаны да матэрыялаў Камісіі Ўорэна. Першая публікацыя ў СССР адбылася ў 1990-м у часопісе «Крыніца/Родник» накладам 400 тысяч асобнікаў — я рыхтаваў яе паводле публікацыі «Поўны расейскі дзёньнік Освальда» ў часопісе «Life» за 1964 год. У той амэрыканскай публікацыі і, адпаведна, у маім перакладзе зь меркаваньняў бясьпекі былі зьмененыя імёны людзей, зь якімі Освальд сустракаўся ў СССР. У гэтым беларускім тэксьце — новы поўны пераклад з арыгіналу. Памылкі правапісу не перадаваліся.

старонак запоўненая і прысьвечаная падзеям, якія адбываюцца ў Менску.

Дзёньнік ЛГО
7 студзеня 1960

Выяжджаю цягніком з Масквы ў Менск, Беларусь.

Але потым ізноў:

7 студзеня 1960

Прыяжджаю ў Менск.

За адзін дзень? Цягніком?..

Дзёньнік выклікае масу падобных пытаньняў — ён стракаціць граматычнымі памылкамі, непасьлядоўны, зь вялікімі прабеламі, пазьнейшымі дадаткамі, часам выглядае, быццам напісаны задняй датай, за адзін прысест. Ці сапраўды гэта дзёньнік?

Адказ дае сам тэкст — гэта такі дзёньнік. Запісы арганізаваныя храналягічна, але рабіліся нерытмічна, часам запозьнена, зь вялікімі пропускамі. Ня клясыка жанру. І правапіс мадэрнісцкі — перастаўленыя літары, пропускі, перайначаныя імёны.

У Освальда была дысьлексія — ён ня мог граматычна правільна пісаць. Але на праўдзівасьць напісанага дысьлексія не ўплывае. Як і час, калі запісы робяцца.

І памылкі, калі яны сустракаюцца — усяго толькі памылкі, а не падробка ці фальшаваньне.

4 студзеня Освальда выклікалі ў Маскоўскі АВІР і выдалі гадавы дазвол на жыхарства, назаўтра ён атрымаў грошы ад Чырвонага Крыжа і празь дзень увечары з рэчамі выправіўся на Беларускі вакзал.

Дзёньнік ЛГО
7 студзеня 1960

Выяжджаю цягніком з Масквы ў Менск, Беларусь. Рахунак за гатэль быў на 2200 рублёў, квіток да Менску — 150 рублёў, такім чынам, у мяне шмат грошай і надзеі. Я напісаў брату і маці лісты, дзе сказаў, што ніколі больш з вамі не жадаю кантактаваць. Я пачынаю новае жыцьцё і не хачу нічога са старога.

Насамрэч ён выехаў на дзень раней, 6 студзеня. Дата ў дзёньніку пазначаная памылкова.

Маці і брат заставаліся ў мінулым, з сабой меліся грошы і надзея, наперадзе быў Менск.

Пад стук колаў на паліцы ў начным цягніку сьпіць пасажыр, тым часам спраўджваецца ягоная мара: з замежнага турыста і асобы бяз пашпарту ён ператвараецца ў новага чалавека — жыхара сталіцы адной з правінцыяў камуністычнай імпэрыі і члена савецкае рабочае клясы, самае перадавое, як пісалі тады газэты, клясы сучаснасьці, якой належыць будучыня.

Ён пачынае новае жыцьцё і нічога ня хоча са старога.

Так, забыўшыся пра сваё існаваньне ў якасьці яйка, вусеня і вопрадня, калі б думаў, мог лічыць матылёк.



Шоў-шоў і прыйшоў

Освальда чакалі.

Дзёньнік ЛГО
7 студзеня 1960

Прыяжджаю ў Менск, сустракаюць дзьве жанчыны з Чырвонага Крыжа, ідзем у гатэль «Менск», бяру нумар, знаёмлюся з Розай і Стэлінай, супрацоўніцамі Інтурысту ў гатэлі, якія гавораць па-ангельску. Стэліне за 40, прыгожая, замужам, мае малое дзіця, Розе каля 23, бляндынка, сымпатычная, ня замужам, выдатная ангельская, мы адразу ўпадабалі адно аднаго.

8 студзеня 1960

Сустракаюся з мэрам гораду таварышам Шарапавым, які вітае мяне і абяцае «неўзабаве» знайсьці для мяне бясплатную кватэру, папярэджвае пра «некультурных людзей», якія часам абражаюць замежнікаў.

Паход у гарсавет і сустрэча са старшынём былі арганізаваныя яшчэ ў Маскве, і падрыхтаваны там сцэнар для Освальда ў Менску ўвасабляўся без адхіленьняў.

Рапарт вонкавага назіраньня КДБ
09.01.60
08:00-23:00

У 10 гадзін Лі Гарві ўвайшоў у фае гатэлю «Менск», падышоў да адміністратара і пачаў размаўляць зь ім пра нешта. Пасьля падняўся ў фае 4-га паверху, сеў і ўступіў у размову зь перакладчыцай Таняй, да якой далучылася яшчэ адна работніца гатэлю.

Пасьля размовы, якая доўжылася каля 40 хвілін, Лі Гарві вярнуўся ў свой пакой 453.

У 11:40 Лі Гарві выйшаў з гатэлю і хутка пайшоў уніз па вуліцы Сьвярдлова да мясной крамы. Усярэдзіне ён абышоў прылаўкі, коратка агледзеў выстаўленыя прадукты, пасьля чаго выйшаў і накіраваўся па вуліцы Кірава на скрыжаваньне да вакзалу, спыніўся, агледзеў вітрыну тэхнічнага аддзелу Беларускай чыгункі, затым падышоў да рэстарану «Радуга», пастаяў там, пасьля пайшоў у гастраном на вуліцы Кірава. На ўваходзе ён разглядаў людзей, якія ўваходзілі за ім. Прайшоў па краме, выйшаў, нічога не купіўшы, і напрасткі пайшоў у кнігарню, дзе прайшоў праз усе сэкцыі не спыняючыся, затым выйшаў і хутка пайшоў. Вярнуўся ў гатэль у 12:25.

16:40 Лі Гарві выйшаў з пакою і спусьціўся ў рэстаран «Менск». Сеў за вольны столік і стаў чакаць афіцыянтку. *(Назіраньне ў рэстаране не вялося, бо было замала людзей.)*

Выйшаў з рэстарану праз 45 хвілін і падняўся ў свой пакой. Не выходзіў з пакою да 11:00 вечара, і назіраньне прыпынена да наступнай раніцы.

Пайшоў, увайшоў, абышоў, прайшоў, выйшаў, пайшоў — гэты прымітыўны, як апісаньне рухаў казуркі, тэкст цытуецца тут ня зь першакрыніцы.



Дэпутат ідзе ў КДБ

Першакрыніцамі за савецкім часам называлі працы клясыкаў марксізму-ленінізму (фактычна замест дуэту было трыё ці нават квартэт, але Энгельс на свой «ізм» не дацягнуў, а Сталін на пачатку 60-х з канцэртнай брыгады ўжо выпаў). Першакрыніцай менскага пэрыяду Освальда зьяўляецца, канечне, справа агентурнай распрацоўкі КДБ — гэты орган дыктатуры вёў свой летапіс жыцьця, часам кастраваны, нярэдка ў стылі фэнтэзі, але па-канцылярску падрабязны.

Освальдам у Менску я пачаў цікавіцца яшчэ за часамі СССР, але ніколі, нягледзячы на статус сябра камісіі Вярхоўнага Савету па правах ахвяраў палітрэпрэсіяў, нават ня бачыў яго архіўную справу, і калі б асабіста ня ведаў аднаго чалавека, які трымаў яе ў руках, мог бы падумаць — а ці ёсьць яна ўвогуле?

Чалавек, які ня толькі бачыў, але гартаў справу Освальда — дэпутат Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня Сяргей Навумчык.

Неяк у 1992-м да мяне ў Менск пазванілі амэрыканскія тэлежурналісты, якія зьбіраліся здымаць дакумэнтальны фільм пра Освальда — набліжалася 30-я гадавіна забойства Кенэдзі, ім трэба была дапамога са здымкамі на заводзе, з архіўнай справай КДБ. Я пераадрасаваў просьбу Сяргею Навумчыку — ён быў ня толькі ўплывовым каардынатарам парлямэнцкай апазыцыі, але і сакратаром камісіі па справах сродкаў масавай інфармацыі, галоснасьці і правоў чалавека.

І яшчэ ён быў журналістам — таму ахвотна ўзяўся дапамагчы і зацікавіўся справай сам. Ён успамінае:*

У 1992 годзе я атрымаў просьбу амэрыканскіх журналістаў паспрыяць доступу да справы Освальда ў беларускім КДБ. Я напісаў ліст старшыні Вярхоўнага Савету Беларусі Станіславу Шушкевічу з просьбай даць доступ да «справы Освальда» і мне. Я разумеў, што калі Шушкевіч дасьць прамое ўказаньне кіраўніцтву КДБ, у мяне будуць рэальныя шанцы атрымаць доступ. Празь некалькі дзён памочнік старшыні ВС паказаў мне рэзалюцыю на маім звароце: «Э.Шыркоўскаму — С.Шушкевіч». І — усё. Маўляў, хай старшыня КДБ вырашае.

У той час КДБ напрасткі падпарадкоўваўся Вярхоўнаму Савету і яго старшыні — іншага начальства над камітэтам у незалежнай Беларусі не было. Апроч таго, паводле заканадаўства, дэпутаты мелі

*Спэцыяльна для гэтай кнігі Сяргей Навумчык аднавіў хаду падзеяў — у яго захавалася шмат сваіх нататак таго часу, дакумэнтаў, аўдыёзапісаў.

доступ ва ўсе дзяржаўныя органы і да ўсіх дакумэнтаў. Ведамасныя інструкцыі КДБ абмяжоўвалі кола асобаў, дапушчаных да сакрэтаў. Але закон мусіў быць вышэйшы.

Ня ўсё было так проста, канечне. У перапынку сэсіі Вярхоўнага Савету да Навумчыка падышоў таксама дэпутат, намесьнік старшыні КДБ генэрал Генадзь Лавіцкі і агарошыў навіной: вось ты, Сяргей, пішаш просьбы да Шушкевіча, а ў Менску поўным ходам працуе амэрыканскі пісьменьнік Мэйлер, прыходзіць у клюб Дзяржынскага і яму даюць дакумэнты са справы Освальда, водзяць да яго менскіх знаёмцаў Освальда.

Дэпутат навіну ўспрыняў спакойна, бо лічыў, што хто-хто, а амэрыканцы маюць маральнае права атрымаць інфармацыю пра таго, хто прызнаны забойцам іх прэзыдэнта. Але ён таксама лічыў, што і беларускія дасьледнікі мелі права атрымаць такую інфармацыю:

Пасьля «ніякай» рэзалюцыі Шушкевіча заставалася чакаць рашэньня генэрал-палкоўніка Шыркоўскага, апошняга кіраўніка КДБ у БССР і першага старшыні гэтай установы ў незалежнай Беларусі.

Даць пэўную (зразумела, ня ўсю) інфармацыю са справы Освальда беларускаму дасьледніку, ды яшчэ з дэмакратычным іміджам, ды яшчэ таму, хто, як бы там ні было, паводле заканадаўства мае на гэта права, — значыла зьняць магчымыя папрокі ў бок КДБ за гісторыю з Мэйлерам. Ну і, магчыма, не апошнюю ролю адыгрываў мой статус каардынатара парлямэнцкай апазыцыі БНФ — праца такога дэпутата ў архіве КДБ най-

лепшым чынам сьведчыла пра ступень дэмакратызацыі «органаў» (і рабіла праблематычнай крытыку дэпутата ў бок КДБ хаця б на час гэтай працы).

У выніку Шыркоўскі станоўча паставіўся да маёй просьбы, і недзе ўвесну 1993-га ў кабінэце начальніка архіўнага ўпраўленьня Аляксандра Вераса мне паказалі тое, што называецца «Справай Освальда».

Тут важна адзначыць — да Сяргея Навумчыка ніхто з цывільных дасьледнікаў, айчынных ці замежных, ніколі не трымаў у руках і не гартаў «Справу агентурнай распрацоўкі № 34451».

Гэта — першае поўнае яе апісаньне:

На калясцы (падобнай да тых, што выкарыстоўваюць у аэрапортах ці супэрмаркетах), прывезьлі пульхныя тамы і паклалі іх на стол.

Тамоў было сем. Апошні, сёмы, цалкам складаўся зь ліставаньня наконт выдачы матэрыялаў справы дасьледнікам, а самым апошнім падшытым дакумэнтам быў мой ліст да Шушкевіча на дэпутацкім блянку зь ягонай рэзалюцыяй. Быў том, які пачынаўся выцінкай з газэты (здаецца, «Известия») з партрэтам Кенэдзі ў жалобнай рамцы; былі й выцінкі зь іншых газэтаў. Мне паказалі запыт па ўрадавай сувязі (ВЧ) у КДБ БССР пра Освальда, зроблены адразу пасьля забойства Кенэдзі і адказ-даведку, ізноў жа па ВЧ, старшыні КДБ Пятрова. І там жа — машынапіс артыкулу за подпісам АПН («Дык што ж рабіў Освальд у Савецкім Саюзе?») з праўкамі ад рукі.

Асобны том складалі матэрыялы, зьвязаныя з

выездам Освальда і Марыны Прусаковай з СССР — ліставаньне з АВІРам, нейкія даведкі.

Яшчэ адзін том утрымліваў матэрыялы, вынятыя з розных савецкіх (пераважна, менскіх) устаноў, якія мелі дачыненьне да Освальда — так, я заўважыў ягоную мэдычную картку.

Але, канечне, найбольш цікавымі былі тамы «апэратыўнай распрацоўкі» Освальда — данясеньні прыстаўленых да яго агентаў (памятаю фразу «и быстрым шагом пошёл»), стэнаграмы размоваў — і ня толькі тэлефонных (імгненнага позірку на нейкі тэкст хапіла, каб зразумець, што кватэра Освальда ў Менску праслухоўвалася. Я заўважыў расшыфраваную ў форме дыялёгу «Ён-Яна-Ён-Яна» размову).

На некаторых аркушах у машынапісным тэксьце былі прочыркі, у якія былі ўпісаныя словы чарнільнай ручкай.

Былі нават тэксты нататак, вынятых са сьметніцы.

Асобны том складаўся з капэртаў, у якіх былі магнітафонныя стужкі і фотанэгатывы (35-мілімэтроўкі, нарэзаныя па 4-5 кадраў). Так, у адной капэрце ляжалі нэгатывы зь вясельля Освальда — як мне патлумачылі, зробленыя схаванай камэрай. Магнітафонныя стужкі былі пераважна без бабінаў.

Былі і лісты — Освальду і ад Освальда, зь Менску і з Амэрыкі. Я заўважыў капэрту, зь якой была адарваная «зь мясам» паштовая марка — трэба думаць, нехта з тагачасных супрацоўнікаў КДБ захапляўся філятэліяй, адарваў амэрыканскую марачку ў калекцыю.

Філятэлістычныя жарсьці аказаліся больш моцнымі за дзяржаўную бясьпеку. Ну, а калі б там былі мікракропкі ці які спэцыяльны код, як часам паказваюць у кіно? Куды толькі ўся хвалёная пільнасьць падзелася.

Аказалася — нікуды не падзелася.



Дэпутат ідзе з КДБ

Далей усё выглядала як у казцы пра сароку, якая кашку варыла, на прыпечку студзіла, чарпаком мяшала, дзеткам давала:

Гэтаму дала,
Гэтаму дала,
Гэтаму дала,
Гэтаму дала,
А гэтаму не дала.

Сяргей Навумчык заўважыў, што некаторыя прозьвішчы ў рапартах былі заклееныя палоскамі паперы.

— Гэта так рыхтавалі дакумэнты для Мэйлера? — запытаўся я ў Вераса.

— Што Вы, Мэйлеру ніводнага дакумэнта адсюль не патрапіла — адказаў палкоўнік. — Сяргей Іосіфавіч, увогуле вы першы, хто трымае ў руках гэтыя папкі. Калі не лічыць нашых супрацоўнікаў, зразумела.

Дэпутату патлумачылі, што дзьве акалічнасьці

перашкаджаюць даць гэтыя тамы ў поўнае распараджэньне: прозьвішчы тайных агентаў і мэтады апэратыўнай працы.

— Я табе скажу па-простаму — тлумачыў мне Лавіцкі ў сваім кабінэце пад партрэтам Дзяржынскага. — Пачынаючы з утварэньня «органаў», з 1917-га, мы ніколі не раскрылі ніводнага імя ніводнага агента. Гэта гарантыя нашай працы. Бо калі б раскрылі — як бы мы сёньня прыцягвалі новых агентаў?

Яшчэ адна прычына — матэрыялы пра амэрыканскую амбасаду ў Маскве, дзе, са словаў супрацоўнікаў КДБ, у іх былі інфарматары. Сяргей Навумчык ізноў пайшоў да Шыркоўскага. Гутарка адбылася на пачатку траўня 1993 году ў кабінэце старшыні на трэцім паверсе будынку КДБ:

Шыркоўскі пазваніў Верасу: «Тут у мяне дэпутат Навумчык. Дык Вы яму ўсё паказалі? Так, ён мне сказаў, што ты паказаў, і падзякаваў. Але разумееш, там вялікая праца. Давай-ка ты вось што. Трэба ўключацца ў справы. Ну што гэта, амэрыканцы там прыяжджаюць, пішуць. Што, у нас няма нармальных журналістаў наогул? Ёсьць пытаньні, давай паглядзім, і будзем шукаць. Па Касьцюкову. Што ты яго знайсьці ня можаш? Шукай. Ты прабачэньне перадай, што я тады іх усіх шугануў, калі амэрыканец прыяжджаў. А то, ведаеш, прыехаў амэрыканец, пасадзілі яго ў гэтым клюбе Дзяржынскага, вадзілі ўсіх туды».

З апошніх словаў Сяргей Навумчык зрабіў выснову, што Норману Мэйлеру спрыялі (прынамсі, да пэўнага часу) бяз згоды старшыні КДБ і што

старшыня гэтую дапамогу не вітаў. Ці магчыма такое ў ваенізаванай арганізацыі, ці генэрал «ваньку валял», ці былі сапраўды супярэчнасьці паміж начальнікамі — ня так істотна.*

Істотна, што Шыркоўскі паабяцаў спрыяць, назваў прозьвішча апэратыўніка, які займаўся Освальдам — Касьцюкоў, загадаў прыцягнуць яго на дапамогу дэпутату.

— У нас яшчэ шмат недалёкіх людзей у апараце, — сказаў Шыркоўскі на разьвітаньне. — Табе яшчэ давядзецца зьвярнуцца да мяне ў гэтай справе. І, павер мне, не адзін раз.

Як у ваду глядзеў. Ці ў люстэрка.**

Наступныя некалькі месяцаў былі падобныя да перамоваў па ядзерным раззбраеньні, якія вядуцца з Паўночнай Карэяй.

Спачатку мне сказалі, што дадуць усё — за выняткам гэтых самых прозьвішчаў. «Гэтаму Мэйлеру нагаварылі 40 працэнтаў хлусьні, а ў Вас будуць праўдзівыя факты», — паабяцаў мне Верас. Потым — што патрэбна прапусьціць кожны дакумэнт праз адмысловую ведамасную камісію па рассакрэчваньні, у якой, сярод іншых, былі і

---

*Пазыцыя генэрала мянялася — і набыла сваё завяршэньне ў раздражнёным афарызьме на старонках друку ўлетку таго самага году: «КДБ — ня хата-чытальня».

**У 1992 годзе Э.Шыркоўскі заявіў, што яму прапаноўвалі 50 мільёнаў даляраў за «справу Освальда»(«Известия», 6 жніўня 1992). Для параўнаньня — нататнік Джона Кенэдзі 1960 году з накідамі прамоваў прадаецца за 20 000 даляраў. У сьнежні 2010-га на аўкцыён была выстаўленая сасновая труна Освальда (пасьля эксгумацыі парэшткі перапахавалі ў іншай труне), якую купілі за 87 469 даляраў. На думку амэрыканскіх дыпляматаў і выдаўцоў, лічба Шыркоўскага — галюцынацыя ці дэзынфармацыя.

вэтэраны КДБ. Потым сказалі, што, паколькі там вэтэраны, дык цяжка апэратыўна ўсіх сабраць.

Дэпутата, як і абяцалі, аднойчы зьвялі з палкоўнікам у адстаўцы Касьцюковым, які сказаў, што ў яго было дзьве мэты: высьветліць, ці не зьяўляецца Освальд агентам ЦРУ і ці нельга яго завэрбаваць у інтарэсах КДБ. На абодва пытаньні атрымалі адмоўныя адказы — Освальд, паводле свайго характару, не ўяўляў цікавасьці для спэцслужбаў.

Потым паўза працягвалася, бо адказны супрацоўнік КДБ трапіў у шпіталь.

— Трагічная гісторыя, — патлумачыў мне Лавіцкі. — У палкоўніка быў летнік, ён туды ня езьдзіў — няма часу, гарыць чалавек на працы. Адказны афіцэр, прафэсійны чэкіст. А жонка пілуе й пілуе яго, што суседзі памідоры-гуркі садзяць, а ў нас адно пустазельле. Ну, адпрасіўся ён у мяне, узяў тры дні адпачынку за свой кошт. Паехаў на дачу. Тры дні капаў-араў, усё ўзараў, пасадзіў. Аказалася — ня свой участак узараў, а суседаў. Ён да суседа (таксама чэкіст), узары, кажа, цяпер ты мой участак, а сусед — «А я што, цябе прасіў мой араць?» Расхваляваўся, ціск падняўся, цяпер вось у шпіталі...

Дачная драма настолькі прыгожая, што, ня выключана, нават сапраўдная.

Аднойчы ўзьнікла новая перашкода. Кіраўніцтва КДБ раптоўна занепакоілі юрыдычныя інтарэсы дэпутата — а ці не засудзіць беларускага грамадзяніна Марына Прусакова-Освальд-Портэр, калі ён абнародуе пэўныя эпізоды яе прыватнага жыцьця, падслуханыя і падгледжаныя органамі?

У нейкі момант Сяргею Навумчыку прапанавалі («каб не закапацца ў матэрыялах, бо адно капіяваньне на ксэраксе зойме некалькі тыдняў»), засяродзіцца на некалькіх тэматычных блёках — напрыклад, ці быў Освальд агентам КДБ? Магчыма, небеспадстаўна лічылі, што калі дэмакратычны дасьледнік заявіць, што не, ня быў — гэта будзе гучаць больш пераканаўча, чым іх уласныя заявы.

— Але ж Вы разумееце, што, каб пісаць, што Освальд ня быў агентам, я павінен мець доказы. А доказы — гэта матэрыялы справы, — адказаў я.

— Ды паверце, што ня быў!

— Магу паверыць. Але чаму Вы думаеце, што іншыя мне павераць? Давайце матэрыялы!

Далей ізноў — абяцаньні, часовыя праблемы, паважныя прычыны.

Аднойчы я сказаў: «Паслухайце, ваша мэта — як мага больш схаваць, мая мэта — як мага больш у вас узяць. Як бачу, нічога ў нас не атрымаецца». — «Вы што, — запэўнівалі мяне, — мы ж разумеем, што рана ці позна трэба будзе рассакрэчваць, проста гэта трэба рабіць акуратна...»

Дні складаліся ў тыдні, тыдні ў месяцы, і да сярэдзіны 1993-га ў Беларусі на вачах памянялася палітычная тэмпэратура. Пасьля разгрому рэфэрэндуму аб датэрміновых выбарах камуністычная намэнклятура аб'ядналася вакол прэм'ера Вячаслава Кебіча, які пакаяўся за подпіс у Віскулях і ўзяў курс на інтэграцыю Беларусі і Расеі. КДБ ужо ня бачыў патрэбы гуляць у галоснасьць нават акуратна.

Паходы дэпутата скончыліся тым, што яму далі ксэракопіі (не на вынас, а перапісаць) некалькіх

дакумэнтаў пра ад'езд Освальдаў у ЗША, у тым ліку заяву ў АВІР зь візай міністра ўнутраных справаў Аляксандра Аксёнава.

І гэта, як ён успамінае, — усё:

Напэўна, я ўжо ніколі не даведаюся, на што разьлічвалі кіраўнікі КДБ, калі абяцалі даць мне матэрыялы справы Освальда. Што дакладна — некалькі месяцаў майго часу было страчана на безвыніковыя размовы з чэкістамі.

Сяргей Навумчык лічыць галоўнай прычынай адступленьня КДБ ад свайго першапачатковага абяцаньня зьмену агульнай палітычнай сытуацыі. Галоўнай — але не адзінай.

Канечне, калі б у 1992-м Шушкевіч наклаў недвухсэнсоўную рэзалюцыю адкрыць справу Освальда, была вялікая верагоднасьць, што кіраўніцтвам КДБ яна была б выкананая.

Сяргей Навумчык гаворыць усё ж хоць і пра вялікую, але — верагоднасьць.

Дала-не дала-дала...



Сарокі над КДБ

Увесну 1992-га падчас сустрэчы зь першым амэрыканскім амбасадарам у Менску Дэйвідам Суорцам кіраўнік Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч зьдзівіў дыплямата аповедам пра сваё асабістае знаёмства з амэрыканцам, які жыў тут за трыццаць гадоў да беларускай незалежнасьці.

... Калі ў 1960-м нядаўняга асьпіранта Інстытуту фізыкі Акадэміі Навук БССР Станіслава Шушкевіча, які займаўся дасьледчай працай на Менскім радыёзаводзе, выклікалі ў заводзкі парткам, ён менш за ўсё гатовы быў да размовы пра граматыку расейскай мовы.

У парткаме маладому інжынэру паведамілі пра аказаны давер — вучыць скланеньням і спражэньням новага рабочага-амэрыканца. Шушкевіч вывучаў ангельскую ва ўнівэрсытэце, але яго адразу папярэдзілі — ніякіх размоваў пра мінулае жыцьцё з Освальдам ня весьці.

Освальд запісаў у нататнік імя настаўніка: Станіслаў Шушкевіч. Заняткі адбываліся ў корпусе,

дзе працаваў інжынэр, пасьля зьмены Освальд прыходзіў туды, падымаўся на другі паверх, і яны прыступалі да граматыкі.

Мова давалася цяжка. Освальд быў ня надта старанны вучань, не праяўляў вялікага зацікаўленьня, эмоцыяў, не ўсьміхаўся і ня дзякаваў пасьля заняткаў. Але праз пэўны час ён пачаў тое-сёе разумець, калі Шушкевіч гаварыў павольна, дапамагаў жэстамі, пісаў асобныя словы на паперцы і разгортваў слоўнік.*

Амбасадар Суорц неадкладна ўключыў аповед Шушкевіча ў тэлеграму ў Дзярждэпартамэнт. З адміністрацыі прэзыдэнта Джорджа Буша-старэйшага адразу пайшлі запыты пра архіўную справу. Суорц папрасіў кіраўніцтва КДБ аб сустрэчы — яго прыязна прынялі, выслухалі і паабяцалі спрыяць.

Больш амбасадар да гэтай тэмы не вяртаўся — на парадку дня быў вывад ядзернай зброі зь Беларусі, пабудова ўсяго комплексу паўнавартасных дзяржаўных стасункаў з новай дзяржавай, падрыхтоўка першага візыту кіраўніка Беларусі ў Вашынгтон.

Праз трыццаць гадоў пасьля забойства Кенэдзі, летам 1993-га Шушкевіч сустракаўся з прэзыдэнтам Клінтанам у Белым доме.

Кенэдзі быў асабістым героем Клінтана, існуе фільм, дзе Кенэдзі цісьне яму руку. Пра сваё знаёмства з Освальдам падчас гутаркі ў Белым доме Шуш-

*У матэрыялах Камісіі Ўорэна можна пабачыць шэраг лістоў і запісаў у нататніку Освальда, зробленых па-расейску — на цалкам прымальным узроўні для штодзённых камунікацыйных патрэбаў. Па вяртаньні ў Амэрыку ён нават атрымаў прафэсійную рэкамэндацыю, што можа быць вусным і пісьмовым перакладчыкам з расейскай.

кевіч не згадаў ні тады, ні падчас прыезду Клінтана ў Беларусь.*

Чалавечы кантакт часам нечакана ўплывае на гісторыю — як, верагодна, і яго адсутнасьць. Але рэч была ня толькі ў асабістай гістарычнай настальгіі двух удзельнікаў сустрэчы ў Авальным кабінэце, дзе лунаў цень яго былога гаспадара. Якраз тады адміністрацыя Клінтана напрасткі займалася справай забойства Кенэдзі.

У 1992-м Кангрэс ЗША ўтварыў незалежную «Раду ў справе перагляду дакумэнтаў забойства», і адміністрацыя Клінтана, якая пераняла ўладу ад Джорджа Буша ў студзені 1993-га, мусіла арганізоўваць працу Рады.**

---

*У Беларусі Клінтан сустракаўся зь яшчэ адным чалавекам, які асабіста ведаў Освальда. Гэта перакладчыца амбасады ЗША Іна Маркава, якая пазнаёмілася з Освальдам, калі вучылася ў ін'язе. Яна перакладала размову лідэра парлямэнцкай апазыцыі Зянона Пазьняка і амэрыканскага прэзыдэнта ў Курапатах.

**Хаця забойства Кенэдзі дасьледавала прэзыдэнцкая Камісія Ўорэна ў 1963-64 гадах, затым адбываліся дадатковыя слуханьні ў Кангрэсе ў 1970-х, амэрыканская публіка працягвала задаваць пытаньні, што і чаму здарылася ў Даласе. Сакрэтнасьць, якая была неад'емнай рысай працы дзяржаўных інстытутаў падчас халоднай вайны, не спрыяла адкрыцьцю ўсіх архіваў.

Падазрэньні, выкліканыя сакрэтнасьцю, размывалі ўпэўненасьць у праўдзівасьці фэдэральных органаў улады і шкодзілі даверу да іх. Буялі канспіралягічныя тэорыі, розгалас атрымаў фільм Олівэра Стоўна «Джэй Эф Кэй» (прыняты ў Амэрыцы скарот ініцыялаў 35-га прэзыдэнта) з высновамі пра змову і ўдзел у ёй дзяржаўных структураў. У адказ на фільм выйшла кніга Дэйвіда Райцэза з красамоўнай назвай «100 памылак у фактах і высновах фільму «Джэй Эф Кэй».

У 1992-м Кангрэс прыняў «Акт аб зборы дакумэнтаў, датычных забойства прэзыдэнта Джона Ф. Кенэдзі», стварыў Раду і надзяліў яе адмысловымі паўнамоцтвамі. Менская тэлеграма Суорца і яго перамовы з кіраўніцтвам КДБ патрапілі ў поле новага расьсьледаваньня.

У верасьні 1998-га Біл Клінтан атрымаў справаздачу. Рада прымусіла рассакрэціць і апублікавала больш за дваццаць тысяч дакумэнтаў ФБР, больш за тры тысячы — ЦРУ, таксама больш за тры тысячы — Пэнтагону, тысячы справаздачаў, архіўных матэрыялаў іншых ведамстваў і папераў прыватных грамадзян — цалкам 33 176 дакумэнтаў. Агульны аб'ём «Калекцыі Кенэдзі», адкрытай для грамадзкасьці, перавысіў чатыры мільёны старонак.

У справаздачы быў разьдзел пад загалоўкам **«Беларусь»:**

З дапамогай амбасады ЗША ў Менску старшыня Рады Тангайм, сябра Рады Гол і выканаўчы дырэктар Марвэл у лістападзе 1996 году перагледзелі абшырныя матэрыялы справы сачэньня за Освальдам беларускага КДБ. Справа апісвае больш за два гады абшырнага сачэньня і аналізу КДБ за Лі Гарві Освальдам падчас яго жыцьця ў беларускай сталіцы. Некаторыя з дакумэнтаў былі ўжытыя Норманам Мэйлерам у яго кнізе «Гісторыя Освальда».

Радзе не ўдалося атрымаць копію справы, часткова з прычыны пагаршэньня адносінаў паміж ЗША і Беларусьсю ў 1997-98 гады.

Ізноў, Рада настойліва рэкамэндуе прыкласьці ўсе магчымыя намаганьні, каб атрымаць для амэрыканскага народу гэтыя важныя дакумэнты пра дзейнасьць абвінавачанага забойцы Лі Гарві Освальда ў гады перад забойствам.

Рада таксама наракала на слабое супрацоўніцтва з Масквой.

Аднак менш чым праз год, у чэрвені 1999-га падчас сустрэчы «вялікай васьмёркі» ў Кёльне

прэзыдэнт Расеі Барыс Ельцын зрабіў жэст, які міжнародныя экспэрты тады назвалі «дыпляматыяй дакумэнтаў» — перадаў Білу Клінтану 39 тэчак «справы Освальда». Гэта былі дакумэнты не КДБ, а ЦК КПСС, МЗС і МУС СССР, якія зьявіліся на сьвет адразу пасьля забойства. У Маскве тады, пасьля Карыбскага крызісу, вельмі баяліся абвінавачаньня ў падрыхтоўцы замаху, і гэтаму было прысьвечанае ліхаманкавае ліставаньне з савецкай амбасадай у Вашынгтоне, даведкі і тлумачэньні.

Менскі пэрыяд Освальда там толькі згадваецца, але не раскрываецца — матэрыялы менскага КДБ ніяк не фігуруюць.

Тады ж, улетку 1999-га ельцынскую перадачу дакумэнтаў пракамэнтаваў яшчэ адзін прэзыдэнт — Аляксандар Лукашэнка. На полі ў Берасьцейскай вобласьці ён заявіў журналістам:

— Паглядзеў я гэтыя справы — няма там нічога такога, каб ірваць на галаве апошнія валасы і плакацца.

І патлумачыў:

— Мы не зьбіраемся пляваць на сваю гісторыю.

Менскія сарокі-вароны, якія лётаюць над КДБ, сьпяваюць па-свойму:

Гэтаму не дала,
Гэтаму не дала,
Гэтаму не дала,
Гэтаму не дала,
А гэтаму дала.

У такой прыкладна прапорцыі. Тым больш цікава — каму і як давала.



Удар па амбіцыях

У 1995-м, калі Станіслаў Шушкевіч ужо ня быў старшынём Вярхоўнага Савету, а Эдуард Шыркоўскі — старшынём КДБ, калі ўведзенае ў парлямэнт войска зьбіла дэпутатаў апазыцыі, якія абаранялі нацыянальны сьцяг і герб, калі першы прэзыдэнт заявіў, што ўсім лепшым у сваім жыцьці ён абавязаны КДБ, у Амэрыцы выйшла кніга Нормана Мэйлера «Гісторыя Освальда».

На супэрвокладцы выдавецтва Random House пісала:

У 1993-м Норман Мэйлер правёў шэсьць месяцаў у Расеі, дзе ён браў інтэрвію ў былых сяброў і каханак Освальда, атрымаў эксклюзіўныя інтэрвію з афіцэрамі КДБ, прыстаўленымі адсочваць кожны рух Освальда. Яму таксама далі эксклюзіўны доступ да матэрыялаў справы Освальда ў КДБ, у тым ліку да транскрыптаў падслуханых размоваў у кватэры, дзе Лі жыў са сваёй расейскай жонкай Марынай.

На гэты ўдар абухом па амбіцыях і інтарэсах усіх айчынных дасьледнікаў было нават няясна як рэагаваць, на каго крыўдзіцца. На непрадказальнага экс-сьпікера былога Вярхоўнага Савету? На адсутнасьць патрыятызму ў КДБ? На яго падступнасьць? Прадажнасьць?

Заставалася толькі парадавацца — за амэрыканскага калегу і яго чытачоў, якія нарэшце змаглі пазнаёміцца зь невядомымі дагэтуль менскімі старонкамі сваёй нацыянальнай трагедыі.*

Ну, і сёе-тое ўдакладніць.

І я пазваніў у Нью Ёрк першаму (і дагэтуль адзінаму) аўтару на сьвеце, які атрымаў доступ да матэрыялаў КДБ пра Освальда.

Атрымаць доступ да Нормана Мэйлера было таксама няпроста, але рэч была не ў адсутнасьці спрыяльнай рэзалюцыі ЦРУ, асабістай згодзе ці пярэчаньнях, нейкіх умовах — цяжка было скантактавацца. Ягоны адрас і тэлефон ня значыліся ў даведніках; у Інтэрнэце была старонка Мэйлера, але яе аўтарам і дапісчыкам быў ня сам пісьменьнік, а ягоныя чытачы.

Пакуль аўтар гэтай кнігі лістуецца з выдавецтвам Random House і шле факсы літаратурнаму агенту Мэйлера, можна адкрыць энцыкляпэдыю ці

*У лістападзе 1991 году некаторыя старонкі справы Освальда паказалі журналістам амэрыканскай тэлекампаніі ABC-News. Летам 1991-га і вясной 1992-га з дапамогай маскоўскай тэлепраграмы «Взгляд» у Менск прыяжджаў канадзкі журналіст Пітэр Уронскі — ён сустракаўся са знаёмымі Освальда, запісваў відэаінтэрвію зь імі. Матэрыялы КДБ яму не паказалі. Улетку 1992-га карэспандэнту «Известий» Сяргею Мастаўшчыкову дазволілі сфатаграфаваць сэйф, дзе захоўвалася справа і зрабіць здалёк здымак шасьці тамоў, раскладзеных на крэслах. Ён таксама сустрэўся зь некаторымі знаёмымі Освальда.

набраць імя амэрыканскага пісьменьніка ў Інтэрнэце і ўведаць гады жыцьця (1923—2007), адукацыю (Гарвардзкі ўнівэрсытэт), удзел у другой сусьветнай вайне (служыў на Ціхім акіяне), род заняткаў (празаік, журналіст, драматург, паэт, кінасцэнарыст), публікацыі (больш за 30 кніг, першы раман «Голыя і мёртвыя» выйшаў у 1948-м), узнагароды (двойчы ляўрэат Пуліцэраўскай прэміі, Нобэлеўскі намінант, крытыка называе яго «амэрыканскім Талстым»).

Калі нарэшце дазваніўся, я ўжо ведаў, што перад прыездам у Менск Мэйлер скончыў самую даўгую кнігу ў сваім жыцьці, дакумэнтальна-мастацкі твор «Прывід прасталыткі»: 1300 старонак, прысьвечаных гісторыі ЦРУ (кажуць, кніга ўваходзіць у рэкамэндаваны курс чытаньня для супрацоўнікаў ЦРУ). «Прывід» мусіў мець працяг — другі том, але наступнай стала кніга пра Освальда.

На маё пытаньне наўпрост:

— Ці ўзяліся б Вы за гэтую кнігу, калі б ня мелі доступу да архіву КДБ?

Мэйлер даў наўпроставы адказ:

— Не. Не, я ніколі б нават не пачынаў кнігу бяз гэтага.

Усё ж некаторыя рэчы пачынаюцца тады, калі пачынаюцца.



Удар, але па мячыку

«Гісторыя Освальда» стала 28-й кнігаю Мэйлера, а яго гутарка са мной у лістападзе 1995-га першым інтэрвію зь беларускім журналістам.

— Пра забойства Кенэдзі напісаныя сотні кніг — чаму вы вырашылі далучыцца да гэтага клюбу?

— Я належу да гэтага клюбу — неафіцыйна, бо раней не пісаў на гэтую тэму — больш за 30 гадоў. Хаця я пачаў зьбіраць матэрыял для кнігі пра Освальда толькі праз 29 гадоў пасьля забойства. Я быў уражаны гэтым забойствам. Я пачынаў пісаць, зыходзячы зь меркаваньня, што Освальд быў удзельнікам змовы, што была змова, каб забіць Кенэдзі. На працягу 6 месяцаў пошукаў у Беларусі, потым пасьля вяртаньня ў Амэрыку, правёўшы блізу двух гадоў над гэтай кнігай, я прыйшоў да змрочнай высновы, што Освальд цалкам мог зрабіць гэта сам. Я скончыў тым, што сказаў, што 75% верагоднасьці, што гэта

справа Освальда. Ведаеце, у бізнэсе і ў разьведцы верагоднасьць любяць вымяраць у адсотках.

Аўтарскія правы на кнігу «Гісторыя Освальда», апроч Мэйлера, належаць кінарэжысэру і журналісту Лорэнсу Шылеру. Мэйлер працаваў разам зь ім над сваімі папярэднімі бэстсэлерамі, у тым ліку над біяграфіяй Мэрылін Манро. Менавіта Шылер, як патлумачыў мне Мэйлер, здабыў матэрыялы архіву КДБ.

— Адбылося наступнае: Шылер зьвярнуўся да мяне яшчэ ў 1991 годзе і сказаў — выглядае, ён зможа дабрацца да матэрыялаў КДБ. Ці не зацікавіла б мяне праца над кнігай пра Освальда? Я сказаў — так. Ён кажа: магчыма, давядзецца паехаць у Менск на шэсьць месяцаў. Я сказаў: олрайт, я еду! Мяне ўсхвалявала магчымасьць дабрацца да гэтых тэчак.

Здаецца, у 1991 годзе (калі гэта абаранялі Белы Дом у Маскве?) усё было адкрыта недзе цягам году. Толькі КДБ ня ведаў, дзе гэтыя матэрыялы знаходзяцца. Шылер — надзвычайны гандляр, і ён пачаў размаўляць з КДБ.

— Давайце вернемся да матэрыялаў, якія вы атрымалі.

— Здарылася наступнае: спачатку КДБ пагадзіўся. Але ў той час у Нямеччыне пачалі адкрываць імёны агентаў Штазі. І гэта стварыла сапраўднае пекла ва Ўсходняй Нямеччыне. Шмат людзей былі інфарматарамі Штазі, яны патрапілі ў вельмі непрыемнае становішча і горка наракалі. І ў беларускага КДБ тады ўзьніклі іншыя думкі наконт абяцаньня, якое яны нам далі.

— З кім вы скантактаваліся першым у справе дакумэнтаў?

— У верасьні 1992 году мы прыехалі ў Менск. У нас быў кантакт, супрацоўнік КДБ, зь якім мы рэгулярна сустракаліся. Мы пыталіся, калі зможам атрымаць той ці іншы дакумэнт, і ён адказваў: гэта зараз абмяркоўваецца ў камітэце.

— Якога кшталту матэрыялы Вы прасілі?

— Ну, мы хацелі б мець усё, што было ў іх у справе. Так гучала іх першапачатковае абяцаньне — мы атрымаем поўную справу Освальда.

— Як яны рэагавалі на Вашыя просьбы?

— Рэакцыя была такой: у нас праблемы. Вельмі шмат людзей пацярпела б, калі б гэтыя дакумэнты адкрылі. Гэта доўгая гісторыя, якая цягнулася шэсьць месяцаў. Сёе-тое яны нам далі, сёе-тое мы здабылі з чорнага ходу. Мы здабывалі матэрыялы рознымі спосабамі, і атрымалі даволі шмат матэрыялу. Але ўсё гэта было вельмі й вельмі цяжка.

— Дзе было лягчэй кантактаваць з афіцэрамі КДБ, у Менску ці Маскве?

— У Маскве. Перш за ўсё, мы гутарылі зь вельмі высокапастаўленымі супрацоўнікамі КДБ. У Маскве людзі былі вельмі зацікаўленыя, дапамагалі нам — да пэўнай ступені. Мы сустракаліся з высокімі чынамі КДБ, пераважна ў адстаўцы — бо ім было менш чаго губляць у адстаўцы. І яны былі з намі шчырыя.

— Як вы іх знаходзілі?

— Вы мусіце разумець, што маскоўскі КДБ нам дапамагаў. У іх добрая служба сувязяў з грамадзкасьцю. Гэта ўжо больш не Савецкі Саюз. Гэта цалкам новая расейская рэспубліка. На чале

КДБ стаялі новыя людзі. І іхны падыход быў: мы хочам мець добрыя адносіны з Амэрыкай, гэта шырока вядомы амэрыканскі пісьменьнік, і давайце яму дапаможам. І яны дапамаглі нам з кантактамі. Мы правялі інтэрвію з 17 супрацоўнікамі КДБ.

— Дзе Вы зь імі сустракаліся — у іх кабінэтах, у гатэлі?..

— Мы пайшлі на Лубянку — там у нас быў цэлы шэраг гутарак. У Менску ў асноўным мы праводзілі інтэрвію ў нашым офісе. У нас быў невялікі офіс у Менску.

— Вы запісвалі Вашыя гутаркі на магнітафон альбо вялі нататкі?

— Мы запісвалі на магнітафон.

— Што наконт фотаздымкаў — у вас быў фотаапарат?

— Не, мы вырашылі не фатаграфаваць, яны ня любяць, калі іх здымаюць. Ніхто зь іх не пагадзіўся, каб у кніжцы прыводзіліся сапраўдныя прозьвішчы.

— Вы працавалі з дакумэнтамі ў офісе?

— Не. Гэта было ў цэнтры гораду.

— Вы былі адзін, калі працавалі з дакумэнтамі?

— Са мной былі перакладчыкі. Гэта была цэлая каманда — на нас працавалі чатыры чалавекі. Людміла Перасьветава была нашым галоўным перакладчыкам.

— Вам дазвалялі выносіць дакумэнты?

— Не-не-не. Яны давалі нам дакумэнты час ад часу. Дакладней, копіі дакумэнтаў. Затым мы іх перакладалі і вывучалі.

— Гэта былі тэчкі ў поўным аб'ёме альбо выбраныя старонкі?

— Тэчкі былі толькі невялікай часткай таго, з чым мы працавалі ў Менску. Галоўным сталіся інтэрвію людзей, якія ведалі Освальда. Мы пачыналі з думкай зрабіць тое, што хочам, на аснове матэрыялаў КДБ, але скончылі сэрыяй сапраўды кранальных інтэрвію зь людзьмі, якія ведалі Освальда. Мы атрымалі нашмат лепшую карціну Менску і Освальда ў Менску на пачатку 1960-х.

Кніга Мэйлера стала правадніком па менскім жыцьці героя. Мэйлер адкрыў шмат якія дзьверы і зазірнуў у куткі, дзе дзесяцігодзьдзямі не ступала нага дасьледніка, і ня толькі дасьледніка ў цывільным (у тым цывільным, якое звычайна бяруць у двукосьсе).

Амэрыканец зрабіў тое, што мусіў бы зрабіць мясцовы аўтар.

На такі ўдар па амбіцыях крыўдаваць не выпадала.

Гэта быў удар не па амбіцыях, а па мячыку — і ён цяпер быў на беларускім баку поля.



Дзьве памяці, плюс-мінус

Гістарычны час у Менску цёк іначай, чым у Амэрыцы — тут, на думку Мэйлера, можна было сапраўды зрабіць падарожжа на дзесяцігодзьдзі назад.

Галоўнае, што дазволіла зрабіць кнігу, надзвычай станоўчы момант — у адрозьненьне ад цяжкасьцяў з КДБ — было тое, што мы распытвалі людзей, якія ведалі Освальда падчас яго жыцьця ў Менску на працягу двух гадоў і чатырох з паловай месяцаў. У яго і жонкі Марыны было шмат сяброў. Да іх пасьля забойства прэзыдэнта Кенэдзі падыходзілі людзі з КДБ і казалі: ні слова пра Освальда.

Калі паглядзець з вышыні гадоў, дык трэба зразумець, што з пункту гледжаньня КДБ, які вельмі шчыльна сачыў за Освальдам, ён быў абсалютна бяскрыўдны. І яны былі ў моцным шоку пасьля забойства. Яны лічылі, што ён невінаваты. Што гэта правакацыя ЗША. Некаторыя

людзі у КДБ думалі — што, калі ЗША спрабуюць распачаць трэцюю сусьветную вайну? Была атмасфэра сапраўднага ціхага жаху. Бо яны не маглі гэта зразумець.

Освальд не займаўся ніякімі значнымі справамі ў Беларусі. Ён не зрабіў на КДБ ніякага ўражаньня — яго не ўспрымалі як нейкага сур'ёзнага чалавека. Ён зусім ня ўразіў КДБ. Ім было вельмі цяжка паверыць, што ён мог такое зрабіць. Яны меркавалі, што цяпер ЗША выкарыстоўваюць яго, бо ён быў у Расеі.

Яны думалі, што яго выкарыстоўваюць — безь ягонага ведама. Яны верылі ў гэтую вэрсію. Яны хутка сустрэліся з усімі, хто ведаў Освальда, і ўсіх папярэдзілі: заткніцеся, не гаварыце пра гэта. І людзі гэта хавалі ў сабе ўсе гэтыя гады.

Мы зьявіліся праз 30 гадоў. Савецкая сыстэма сканала. Сталінізм у далёкім мінулым. І людзі цяпер гатовыя гаварыць. І вялікай перавагай, з нашага пункту гледжаньня, сталася тое, што іх памяць была абсалютна чыстая, яны ніколі не гаварылі пра гэта. Яны маўчалі, бо баяліся КДБ, і з пачуцьця самааховы не гаварылі амаль 30 гадаў.

І мы атрымалі цудоўны матэрыял. Сьвежы, надзвычай сьвежы матэрыял. Вось маленькі прыклад таго, які матэрыял мы здабылі: адна жанчына сказала, што ёй падабаўся Освальд, ён быў разумны, але ў яго былі два недахопы. Ён любіў чытаць амэрыканскія коміксы, якія яму прысылала маці, і пры гэтым рагатаў як ашалелы, што выклікала раздражненьне Марыны і яе самой — ён быў «некультурны». А другое — ён псаваў паветра, як яна выказалася.

І наадварот, калі мы вярнуліся ў Амэрыку — нічыім успамінам пра гэты пэрыяд нельга было даверяць. Гэта ўжо было поле бітвы, па якім пракацілася туды й назад армада танкаў. Гэта было балота. Хочаш атрымаць сапраўдныя ўспаміны — і маеш справу з багнай. Кожны даваў інтэрвію шмат разоў, кожнага распытвалі. Усе ўжо ведалі пра справаздачу Камісіі Ўорэна і ведалі, што там лічылася праўдзівымі зьвесткамі, што не, і яны забыліся, што было насамрэч. Безнадзейная справа. Урэшце я прыйшоў да таго, што сам мусіў узяць справаздачу Камісіі за аснову як найлепшы матэрыял, які магла даць людзкая памяць. Але нават гэта было ненадзейна. У нас быў кантраст: цудоўныя, дакладныя, падрабязныя інтэрвію ў Менску і ніводнага сапраўднага інтэрвію ў Амэрыцы. Патрабавалася складаць шмат кавалачкаў, каб атрымаць сэнс.

Вось якая якасная ў Беларусі памяць.

І яшчэ неблагая ў Беларусі даведачная служба тэлефонаў. Там, напрыклад, адразу далі нумар абанэнта, чыё прозьвішча Освальд згадвае ў сваіх самых першых запісах у Менску напачатку 1960 году.

Дзёньнік ЛГО
8 студзеня 1960

Сустракаюся з мэрам гораду таварышам Шарапавым, які вітае мяне і абяцае «неўзабаве» знайсьці для мяне бясплатную кватэру, папярэджвае пра «некультурных людзей», якія часам абражаюць замежнікаў.

Празь пяцьдзясят гадоў пасьля гэтага запісу

Васіль Іванавіч Шарапаў, які сапраўды ўзначальваў Менскі гарвыканкам з 1954-га па 1967-мы, гледзячы мне ў вочы, ціхім упэўненым голасам скажа:

— Я з Освальдам не сустракаўся.

У Шарапава зайздросная памяць: у 1945-м ён прыехаў у Менск пасьля дэмабілізацыі па раненьні, называе прозьвішчы, імёны і пасады людзей, зь якімі працаваў паўстагодзьдзя таму, памятае назвы вуліц, якіх няма на мапе, тлумачыць, чаму і як тыя, што ёсьць, былі перайменаваныя, адзінае чаго ня помніць — сустрэчы з Освальдам.

Пра Освальда ўсё ж нешта чуў — быццам быў такі амэрыканец, прыехаў у Менск з жонкай, потым зьехаў. Нават працаваў тут, здаецца. Пра жонку казалі, быццам лёгкіх паводзінаў. Гуляла, казалі. Ён піша, што сустракаўся са мной? І я казаў пра некультурных людзей? Ня памятаю такога. Ці размаўлялі са мной з КДБ пра яго? Ня думаю. Пра кватэры са мной шмат хто гаварыў. Кожную пятніцу вёў прыём па кватэрным пытаньні, бясконцы паток людзей, у кожнага свая гісторыя, свае праблемы, не хапала жыльля ўсім. Ці былі на прыёме замежнікі — так, бывалі, напрыклад, разы з чатыры сустракаўся з адным рэпатрыянтам з Аргентыны, Зігер прозьвішча, Аляксандар Раманавіч, у яго яшчэ дзьве дачкі было, адна вельмі прыгожая сьпявачка, Элеанора, а другая — здаецца, Аніта, далі яму кватэру. А Освальд? Ня памятаю. Здаецца, званілі аднойчы, з сакратарыяту Хрушчова, здаецца, але кватэру яму даваў завод, можа, мы далі заводу, такое магло быць...

Цёплым верасьнёўскім днём 2010-га на дачы, праз тры гадзіны гутаркі, падчас якой гаворка таксама ішла пра гістарычны прыпынак у Менску цягніка

Сталіна на Ўсходнім вакзале, адкуль адкрываўся від на руіны, і пасажыр нумар адзін быццам сказаў тагачаснаму першаму сакратару Панамарэнку, што Менск можна адбудаваць, толькі пасадзіўшы тут два заводы саюзнага значэньня, і яны выцягнуць, і так зьявіліся аўтамабільны і трактарны, пра знакаміты «нацыянальны» пленум ЦК КПБ 1953 году, калі спрабавалі памяняць першага сакратара расейца Патолічава на кандыдата Берыі беларуса Зімяніна, пра помнік Сталіну, як ставілі і як зносілі, і дзе захоўвалі 9-мэтровы бронзавы статуй пасьля дэмантажу, пра першага сакратара ЦК КПБ і патрыёта Беларусі Кірылу Мазурава, пра прыезды ў Беларусь валюнтарыста Хрушчова, пра менскае падпольле, якое Шарапаў дапамагаў рэабілітаваць насуперак партызанскай мафіі, пра ссылку з пасады першага сакратара гаркаму ў міністры, бо новаму першаму сакратару ЦК Машэраву не падабалася, што ён не раздаваў вымовы налева-направа, пра пабудову «дарогі нумар 1» да Маскоўскай алімпіяды і закладку новай транспартнай інфраструктуры, закупы імпартнай тэхнікі і выхаваньне кадраў дарожнікаў, якія дагэтуль штогод прыяжджаюць на дзень народзінаў свайго любімага міністра, ужо на разьвітаньне былы чыгуначнік, салдат другой сусьветнай вайны, самы доўгатрывалы мэр у гісторыі беларускай сталіцы, член ЦК КПБ і ўдзельнік паўтузіна зьездаў КПСС, чалавек, чыё прозьвішча пасьля публікацыі часопіса «Life» ў 1964-м стала ўсясьветна вядомым, дзякуючы не таму, чаго ён дасягнуў у сваім жыцьці, а таму, што яго згадаў у сваім непісьменным дзёньніку 20-гадовы амэрыканскі наведнік, Васіль Іванавіч Шарапаў, 94-гадовы бе-


ларус з-пад Барысава, у добрым здароўі і жывым розуме ўсьміхнуўся і сказаў:

— Ну, трэба Вам напісаць, што я сустракаўся з Освальдам — ну, напішыце.

А Мэйлер наракае на амэрыканскую памяць.*

*Гэта трапная заўвага — так у 70-80-я гады мяне бянтэжылі два тыпы ўспамінаў пра мінулае. Вэтэраны вайны, якія выступалі ў школе, інстытуце, па тэлебачаньні, гаварылі ня толькі адно і тое ж, але і аднолькава. Мэмуары розьніліся толькі геаграфічнымі назвамі і прозьвішчамі. Тэма была так зафармалізаваная, забоўтаная, што ператварылася ў закасьцянелы біблейскі тэкст, дзе ўсё было як ва ўсіх. І хаця пасьля вайны мінула толькі некалькі дзесяцігодзьдзяў, і час ад часу адкопвалі неразарваныя бомбы, знаёмым пацанам адрывала пальцы знойдзенай гранатай, яшчэ ня выйшлі на пэнсію і працавалі салдаты вайны, здавалася, яна адбылася ў іншую эпоху і, магчыма, на нейкай іншай плянэце. Патрабаваўся маштаб і талент Васіля Быкава, каб узламаць панцыр афіцыёзу і дабрацца да праўды.

Вэтэраны Гулагу, наадварот, калі пасьля дзесяцігодзьдзяў маўчаньня пераадольвалі страх і пачыналі гаварыць, гэта былі настолькі сьвежыя, непасрэдныя ўспаміны, непадробленыя эмоцыі й жывыя дэталі, што міжволі нараджалася адчуваньне, што ўсё гэта было толькі што, учора, і можа паўтарыцца заўтра. Менавіта на такой якасьці асабістых успамінаў, дасланых Аляксандру Салжаніцыну, пабудаваная гіганцкая жывая канструкцыя «Архіпэлагу Гулагу». Магчыма таму для новых пакаленьняў небясьпека сталінізму адчувалася куды больш моцна і пагрозьліва, чым небясьпека новай вайны.



«Russia» ці «Belorussia»?

Першы амбасадар ЗША ў незалежнай Беларусі Дэйвід Суорц любіў паказваць дом Освальда гасьцям з Вашынгтону — яны слупянелі ад зьдзіўленьня, якое выклікае раптоўная сустрэча з гісторыяй. Усе думалі, што Освальд жыў у Маскве.

Калі Суорц ляцеў у Менск у 1992-м, ён таксама нічога ня ведаў пра жыцьцё там амэрыканскага грамадзяніна Освальда — ведаў толькі, што той жыў у Савецкім Саюзе.

Суорц быў прафэсійным дыпляматам, які ў 1972 годзе ўжо працаваў у амбасадзе ў Маскве, што ж казаць пра іншых, менш дасьведчаных амэрыканцаў. СССР быў адна вялікая Russia, ніхто не расшыфроўваў чатыры зычныя, якія ўтваралі самую даўгую сьвісьцячую абрэвіятуру для назвы краіны ў гісторыі чалавецтва. (І самую хлусьлівую: не саюз, а імпэрыя, не рэспублік, а аўтакратыяў,

не савецкіх, а партыйных, не сацыялістычных, а фэадальных — ІПФА.*)

Самае цікавае ў пытаньні «Ці быў Освальд у Беларусі?» — гэта тое, як бы ён адказаў на яго сам.

Дзёньнік ЛГО
11 студзеня 1960

Наведваю менскі радыёзавод, дзе буду працаваць. Там сустракаюся з аргентынскім эмігрантам Аляксандрам Зігерам, польскім габрэем паводле нараджэньня. Ён іміграваў у Аргентыну ў 1938-м і назад на польскую радзіму (цяпер частку Беларусі) у 1955-м. Гаворыць па-ангельску з амэрыканскім акцэнтам. Працаваў на амэрыканскую кампанію ў Аргентыне. Ён загадчык аддзелу, ужо далёка за 40 гадоў, мяккія манеры, прыемны. Здаецца, хоча мне нешта сказаць. Я паказваю яму мой часовы дакумэнт і кажу, што хутка буду мець расейскае грамадзянства.

Можна прачытаць сотні старонак кнігі Мэйлера, так ці іначай прысьвечаных людзям і падзеям у Беларусі, і не зразумець, што гэта не Расея. Усіх знаёмых Освальд лічыць расейцамі (выключэньне — габрэі, якія, аднак, таксама расейцы), навокал размаўляюць па-расейску, кіно, опэра, канцэрты, назвы вуліц, рапарты КДБ — усё па-расейску.

Рабочыя на заводзе, бальшыня якіх прыехала ў Менск зь вёскі, дзе навучаньне было па-беларуску,

*Напісаў і сам зацікавіўся, што б гэта ІПФА значыла. Google, як заўсёды, выдаў першы тузін адказаў пад рубрыкай «анамальныя сэксуальныя паводзіны», зь якіх самым прыстойным быў «індывідуальны профіль функцыянальнай асымэтрыі». Нешта ў гэтым ёсьць.

маглі гаварыць на роднай мове. Але на перадавой вытворчасьці і ў сталіцы трэба было гаварыць «пагарадзкому» — тым больш з амэрыканцам.

У сваім дзёньніку Освальд згадвае назву Беларусі тры разы: першы, калі атрымлівае навіну пра сваё разьмеркаваньне ў Менск (аказваецца, гэта не ў Сібіры), другі — калі піша пра рэпатрыяцыю Зігера, і трэці — восеньню 1960-га, у лірычнай (і камічнай) сумесі надвор'я і геаграфіі:

Мой жах перад новай расейскай зімой растае ў цудоўным золаце і чырвані восені ў Беларусі.

Якраз тады, калі Освальд напіша гэтыя радкі, пытаньне беларускай мовы будзе абмяркоўвацца на яго радзіме, у Амэрыцы, людзьмі, з адным зь якіх ён неўзабаве пазнаёміцца і нават будзе госьцем у доме.

Тут патрэбнае адступленьне: у Беларусі даўно ходзіць показка пра тое, як кіраўнік партыі і ўраду Мікіта Хрушчоў падчас прыезду ў Менск сказаў, што беларусы першыя прыйдуць да камунізму, бо ўжо адмовіліся ад роднай мовы і перайшлі на расейскую, якая будзе мовай камуністычнага грамадзтва. Існуюць розныя вэрсіі, дзе і калі гэта было сказана — якія, аднак, не пацьвярджаюцца ні стэнаграмамі, ні пісьмовымі сьведчаньнямі сучасьнікаў па гарачых сьлядах.*

Дакладна ж вядомае якраз супрацьлеглае.

Увосень 1960-га адбывалася сэсія ААН, на якой БССР і Ўкраіна, як звычайна, былі прадстаўленыя асобнымі дэлегацыямі. Мікіта Хрушчоў, удзел якога

*Хоць мог і сказаць — і не такое нёс. А маглі і мясцовыя таварышы ад стараннасьці дадумаць, тыя яшчэ кадры былі.

ў гэтай сэсіі звычайна ўзгадваюць у сувязі са стуканьнем чаравікам па стале, піша ва ўспамінах, як папрасіў кіраўнікоў дэлегацыяў выступіць на родных мовах. Хрушчоў разьлічваў на ўвагу ўкраінскай і беларускай дыяспары ў ЗША і Канадзе.

Прыйшоў дзень іх выступаў. Украінцы зрабілі, як я ім параіў, а зь Беларусьсю ня выйшла. Я быў вельмі засмучаны. «Мы ня можам падрыхтаваць тэкст на беларускай мове, — апраўдваліся прадстаўнікі БССР, — нават друкарскай машынкі няма зь беларускім шрыфтам».

«Калі ня можаце, дык іншага выйсьця, вядома, няма, але гэта наносіць шкоду нацыянальнай палітыцы. Ворагі савецкай сыстэмы скарыстаюць гэты факт у прапагандзе: няма ў саюзных рэспублік ніякіх правоў, усё там робіцца напаказ замежжу, суцэльная фікцыя. Расейцы душаць усіх, і нават на такім міжнародным форуме, як сэсія ААН, яе член выступае не на сваёй роднай мове, а па-расейску».

Думаю, гэта разумеў і прадстаўнік Беларусі. Але ён асабіста ня быў падрыхтаваны, ня ведаў сваёй роднай мовы.

Прадстаўніцтва БССР было ўтворанае ў 1958 годзе, і яго кіраўніком, насуперак прапановам Менску, быў прызначаны член КПСС з 1927 году супрацоўнік МЗС СССР Феадосій Гразноў. У пашпарце ён пісаўся беларусам, але мовай не валодаў. У 1961-м яго замяніў кандыдат Менску П. Астапенка — але беларускай мовы ў ААН не пабольшала.

Кіраўніком дэлегацыі ў 1960-м быў першы сакратар ЦК КПБ Кірыл Мазураў — ён ня толькі ведаў мову, але й лісты пісаў па-беларуску, і нават

вершы. І ў 1959 годзе выступіў па-беларуску на ўрачыстасьцях да 40-х угодкаў ўтварэньня БССР, за што нават атрымаў прачуханку ад пераменлівага Хрушчова. У складзе дэлегацыі быў і вядомы паэт Максім Танк.

Афіцыйную прамову трэба было чытаць з паперкі — не было як надрукаваць.*

І тут ужо нават чалавек, які пагражаў закапаць капіталізм і размахваў вадароднай бомбай, быў бясьсільны.

У, бадай, самы важны дзень свайго жыцьця ў Менску, калі ён сустрэў будучую жонку, Освальд пазнаёміцца таксама з членам той беларускай дэлегацыі ў ААН, Лідзіяй Чаркасавай, і нават будзе разглядаць яе здымак разам з Хрушчовым. Чаркасава выступала з публічнай лекцыяй пра сваю паездку на сэсію ААН. Але нават калі пасьля афіцыйнай часткі Освальд апынецца ў Чаркасавай дома, драму зь беларускай мовай ніхто не згадае (можа, таму, што драмы не заўважаць — Чаркасава была біёлягам, прафэсарам мэдінстытуту, родам з Украіны, у Менск прыехала ў 1950-м).

---

*Друкарскай машынкі зь беларускім шрыфтам у місіі ААН не было яшчэ і ў першы год незалежнасьці. Больш за тое, тагачасны прадстаўнік Беларусі ў ААН Генадзь Бураўкін узгадваў, што дакумэнты з МЗС па-беларуску зь Менску прыходзілі без «ў», а замест «і» ставілі клічнік. А сябра дэлегацыі 1960 году Максім Танк у дзёньніку скандал зь беларускай мовай зашыфраваў так, што і не зразумееш, што да чаго: напісаў, што кіраўнік украінскай дэлегацыі М. Падгорны гаварыў на ўкраінскай мове, а пра Мазурава — што той выступаў двойчы. А потым патлумачыў: «Як вядома, толькі главы ўрадаў маюць права выступаць на сваёй мове, а ўсе іншыя дэлегаты павінны выступаць на любой з рабочых моваў: англійскай, іспанскай, рускай, французскай ці кітайскай». Падгорны, як і Мазураў, быў першым сакратаром ЦК кампартыі, а не кіраўніком ураду.

У дзёньніку Освальда тагачасная назва Беларусі па-ангельску («Byelorussia») ніводнага разу не напісаная правільна.

І справа ня толькі ў дысьлексіі.

Адказ на пытаньне, ці быў Освальд у Беларусі, Мэйлер даў у кнізе: Освальд быў у СССР.

Нават БССР ледзь праступае праз расейскую мову, расейскія назвы, агульную савецкую рэчаіснасьць і будучыню, якая як сьнегам пакрывае ўвесь ляндшафт.

Цікава, што гэтае самае пытаньне можна адрасаваць і Мэйлеру — ці быў ён у Беларусі?

Адказ Мэйлера — ён быў у Менску.



Самагонка для Мэйлера

Любы горад адзін для яго жыхароў і іншы для наведнікаў. Калі Мэйлер упершыню прыехаў у беларускую сталіцу, з усіх магчымых вызначэньняў Менску яго, верагодна, больш за ўсё зьдзівіла б «горад сонца».

— Калі я быў у Менску, гэта быў вельмі цяжкі час для людзей. Інфляцыя — за тыя паўгода, што мы там былі, курс упаў ад двух з паловай да сямі з паловай тысяч рублёў за даляр. І гэта было яшчэ значна менш у параўнаньні з інфляцыяй, якая наступіла пазьней. Людзі прадавалі сваю маёмасьць. У нейкай ступені падобна да таго, што было ў Нямеччыне, у Вэймарскай рэспубліцы. Людзі ў Менску пераважна стаялі на кансэрватыўных пазыцыях і былі ня надта радыя гэтым вялізным нечаканым пераменам. Яны прывыклі да савецкай сыстэмы. Гэта было адно зь некалькіх месцаў, дзе старая сыстэма пра-

цавала. Напалову працавала. І раптам — новая сытуацыя, якую яны не разумелі. Гэта быў час дрэннага настрою, неразьбярыхі. Многія з тых, з кім мы сустракаліся, былі вельмі прывабныя. Вельмі годныя людзі, большасьць з тых, каго мы сустракалі ў Менску.

Мэйлер прыехаў у Менск у верасьні 1992-га. Спачатку ён пасяліўся ў гатэлі, затым яму зьнялі кватэру, дзе ён жыў да лютага 1993 году.

— Я жыў кілямэтры за тры ад цэнтру, у рабочым раёне, у доме, дзе жылі рабочыя, у маленькай цёмнай кватэры. Паводле менскіх стандартаў гэта была шыкоўная кватэра. Невялікая кухня, дзьве маленькія спальні, сярэдняга памеру гасьцёўня. Я плаціў каля 200 даляраў за месяц, што ў 20 разоў перавышала кошт кватэры для ўласьніка.

Гэта быў нялёгкі пэрыяд і для 70-гадовага пісьменьніка: раз на тры-чатыры тыдні ён вяртаўся ў Амэрыку, потым прыяжджаў зноў. Давалася ў знакі розьніца ў часе, штодня адбываліся сустрэчы і вяліся гутаркі пад запіс. У Менску не было чаго рабіць вечарамі, апроч як «пайсьці на абы-якую ежу ў сумным рэстаране, бо Менск ніколі ня будзе вядомы сваёй кухняй, прынамсі цягам наступнага дзесяцігодзьдзя ці двух».

— Змрочнае месца з выглядам у двор. Адзіную рэч, якую я памятаю — сонца ніколі не было ў Менску ад кастрычніка да лютага. Як толькі сонца выглядала на 10 хвілінаў, маці высыпалі на двор разам зь дзецьмі й вазочкамі і трымалі сваіх

дзяцей на сонцы. А калі сонца хавалася, яны беглі назад дадому, каб дзеці не прастылі.

Мэйлер і яго калегі нанесьлі візыт у амэрыканскую амбасаду, дыпляматы ім ахвотна дапамагалі, яны разам адзначалі Дзень удзячнасьці, які амэрыканцы сьвяткуюць у апошні чацьвер лістапада. Рэзыдэнцыя амбасадара месьцілася ў Драздах, у велізарнай дачы, дзе раней жыў сакратар ЦК, з холам для прыёмаў і сваёй кіназаляй. Лэры Шылер, які шмат і пасьпяхова працаваў у Галівудзе, быў у захапленьні ад праекцыйнай апаратуры — антыкварыят! Шылеру ўдалося зьняць кватэру ў тым самым комплексе будынкаў, дзе некалі жыў Освальд, і туды на вечарынкі яны запрашалі амбасадара і яго супрацоўнікаў.

Але Мэйлер жыў асобна.

— Гэта быў рабочы раён. Падлеткі, 18-19 гадоў, напіваліся ўвечары ў пятніцу і суботу. Але гэта былі неблагія дзеці. Мне нават падабалася там.

Часам, калі Мэйлер ішоў дадому, падлеткі віталіся зь ім і прапаноўвалі самагонку.*

Мэйлер дзякаваў і адказваў адной зь некалькіх фразаў, якія вывучыў, кожны раз аднолькава:

— Я — амэрыканскі!

---

*Гарадзкое самагонаварэньне існавала заўсёды, і са зьнікненьнем прыватнага сэктару яно перакачавала ў шматпавярховыя панэльныя дамы. Практыкаваўся як традыцыйны гарачы мэтад, калі брагу грэлі на газавай пліце, а зьмеявік ахалоджвалі водаправоднай вадой, так і больш просты халодны спосаб — брагу залівалі ў пластыкавыя пакеты ад малака, клалі ў маразільнік, сусла замярзала, алькаголь заставаўся зьверху і разьліваўся ў бутэлькі. У першым выпадку самагонка была больш чыстая, у другім — адразу халодная.

Гэта заўсёды выклікала выбух сьмеху.
Менск быў усё ж ня змрочны горад.
Не беларускі толькі.



Acherontia atropos, сямейства чэкістых

Мэйлер сустракаўся зь сямнаццацю афіцэрамі КДБ у Маскве і Менску.

Гэтая лічба ў кнізе падобная да шчыгрынавай скуры: толькі пяць з тых, хто займаўся Освальдам, пагадзіліся на інтэрвію па тэме, у кнізе фігуруюць толькі тры, бо трох зь пяцёркі давялося аб'яднаць пад адным імем, ніводзін зь іх не пагадзіўся даць сваё сапраўднае імя.

Адзін з тых, чыё сапраўднае імя згадваецца ў кнізе — першы кіраўнік КДБ незалежнай Беларусі Эдуард Шыркоўскі. Мэйлер так сфармуляваў сваё ўражаньне падчас інтэрвію:

— Я думаю, гэта тыповы чалавек КДБ. Моцны, крыху брутальны, з добрымі манерамі — для брутальнага тыпу. Цынічны. Глыбока цынічны.

«Генэрал Мараў» — зборнае імя для трох высокапастаўленых чыноў КДБ у Маскве.

«Ігар Іванавіч Гузьмін», ён жа «Ігар» — начальнік

управы КДБ у Менску, якая займалася Освальдам.

«Сьцяпан Васілевіч Грыгор'еў», ці проста «Сьцяпан» — яго падначалены, афіцэр КДБ, які непасрэдна, з дня ў дзень, на працягу двух з паловай гадоў займаўся Освальдам.

Адзін з вэтэранаў шчыта і мяча сьціпла патлумачыў сваю нелюбоў да галоснасьці зразумелымі і сьвятымі для амэрыканцаў каштоўнасьцямі прыватнага жыцьця:

Каб на пэнсіі журналісты не дакучалі пытаньнямі.

Амэрыканцы, трэба спадзявацца, зразумелі правільна.

Яшчэ да выхаду кнігі Мэйлера чэкістаў расшыфравалі. У Інтэрнэце, газэтах можна ўведаць, што генэрал «Ігар Гузьмін» быў Галубцовым, яго прыслалі ў Менск з Масквы «на ўмацаваньне кадраў» у 1946-м, да Освальда ён займаўся пошукам калябарантаў, напачатку 1950-х лавіў парашутыстаў (чацьвёрка Вострыкава), і выйшаў у адстаўку з пасады начальніка ўправы контраразьведкі ў 1977-м.

Мэйлер дае такі партрэт 70-гадовага генэрала КДБ у адстаўцы:

Вялікі чалавек, стары, з чырвоным вялікім тварам, які мог належаць ірляндзкаму паліцыянту ў Нью Ёрку, твар уражвае: ад вострага носа і ўверх — выцьвілыя блакітныя вочы, гатовыя загарэцца праведным маральным агнём; але ад вуснаў і ўніз ён выглядаў карумпаваным — двай-

ное падбародзьдзе, разьдзьмутая шыя паліцэйскага шэфа.

А непасрэдны куратар Освальда «Сьцяпан» ідэнтыфікаваны як капітан Аляксандар Фёдаравіч Касьцюкоў, ураджэнец Гомельскай вобласьці — у 1992-м яго імя надрукавалі «Известия», менавіта так ён быў прадстаўлены і дэпутату Сяргею Навумчыку.

«Сьцяпану», як і «Ігару», прысьвечаны асобны разьдзел у кнізе. Мэйлер цытуе «Гузьміна» пра Касьцюкова: інтэлігентны, прафэсійны, сур'ёзны, з халоднай галавой, характар устойлівы, цярплівы, чысты беларус, добра ведаў мясцовую спэцыфіку, лавіў і дапытваў нямецкіх і брытанскіх шпіёнаў — тутэйшых жыхароў, якіх падчас вайны занесла на Захад, а потым дадому.

Касьцюкоў нарадзіўся ў вёсцы на Сожы, ваяваў, быў паранены, прыйшоў у органы яшчэ за часам Цанавы і Берыі, а перад тым быў супрацоўнікам раённага аддзелу статыстыкі. Мэйлеру ён расказваў, што ня піў, не паліў, не гуляў у даміно, быў маральна ўстойлівы, толькі працаваў. Кватэра была за тры кілямэтры ад працы, выходзіў з дому рана, ішоў пешкі ціхай вуліцай да парку Горкага, праходзіў каля парку Купалы, далей па праспэкце, да дому з калёнамі, падымаўся на свой трэці паверх і быў за сталом а палове дзявятай. Яму падабалася, што вокны выходзілі ў двор — ціха, нічога не перашкаджае. Пачынаў дзень з працы над дакумэнтамі, якія заўсёды замыкаў у сэйфе, нават калі выходзіў на хвіліну. І не таму, што у кабінэце быў яшчэ адзін супрацоўнік, а таму што такі парадак. Потым сядзеў на нарадах, сходах, абедаў у службовай сталоўцы,

вельмі добрай (біфштэкс ці катлеты, салаты, чай з 20% вяршкамі), у абед выходзіў ва ўнутраны дворык, пасядзець на сонцы, часам згуляць у валейбол, ён быў хоць і невысокі, але няблага біў крукам.

Праца была творчая, тлумачыў ён Мэйлеру, нешта можна было вырашыць за месяц, а нешта за год. Нельга было абмяжоўвацца часавымі рамкамі — заўсёды ўзьнікала нешта нечаканае. Хто, напрыклад, мог прадбачыць, што Освальд ажэніцца з Марынай? Былі заданьні, якія немагчыма было выканаць, як ні старайся. Часам сыходзіў уначы, жонка ставілася з разуменьнем, сама працавала на вызваленай камсамольскай пасадзе, дзеці былі ў кругласутачных ясьлях, кожны панядзелак службовы аўтобус адвозіў іх ад будынку КДБ на былую дачу Цанавы пад Менскам і там яны заставаліся да пятніцы.

Калі справа Освальда падыходзіла да завяршэньня, Касьцюкова пакрыўдзілі: прызначылі намесьнікам начальніка аддзелу, далі асобны кабінэт, але званьне засталося ранейшае — капітан. Паўгода ён маўчаў, але потым усё ж пайшоў у аддзел кадраў, аказалася, проста забыліся — хадзілі ж у цывільным.

Калі Мэйлер папрасіў яго пакрытыкаваць самога сябе, Касьцюкоў сказаў, што быў занадта патрабавальны да дзяцей, занадта дамагаўся дысцыпліны. І часам быў нецярплівы, калі суразмоўцы гаварылі не па дзелу, тады ён перапыняў і накіроўваў гаворку да сутнасьці справы.

У дзяцінстве ён хацеў стаць настаўнікам.

Калі шукаць аналёгіі ў межах лепідэптаралёгіі, дык чэкісты, канечне, належаць да Acherontia

atropos, сямейства сьфінксаў ці бражнікаў. Як пішуць у папулярнай энтамалягічнай літаратуры:

Матылёк «Сьфінкс Мёртвая Галава» зьяўляецца прадметам прымхаў і жаху сярод простых людзей з-за яго тужлівага гуканьня і выявы чэрапа на грудзях.

Тужлівае гуканьне на пачатку 1960-х чуваць было нашмат радзей, чымся ў папярэднія дзесяцігодзьдзі, калі газэты не пасьпявалі друкаваць паведамленьні пра выкрыцьцё варожых змоваў і вокамгненныя прысуды. Цяпер гукалі звычайна раз на год, у сьнежні, на дзень народзінаў органаў. Напрыклад, калега «Ігара» і «Сьцяпана» Міхаіл Аценкаў, расеец, зь мяшчан, член КПСС з 1916-га, чэкіст з 1920-га, зэк з 1938-га (патрапіў пад хвалю чыстак НКВД ад «яжоўшчыны»), пасьля адседкі на Поўначы — жыхар Менску і заслужаны вэтэран, пісаў у «Звяздзе» на 45-я ўгодкі ўтварэньня ЧК:

Дарэмна цёмныя сілы міжнароднай рэакцыі высоўваюць сваё ядавітае джала. Яго адсячэ цьвёрдая рука нашых слаўных чэкістаў! Адшчапенцам і наймітам, людзям з чорнымі душамі ня зьвіць сваіх гнёздаў на нашай зямлі.

У 1926-м Аценкаў атрымаў вымову «за п'янства ў прытонах», якая падарожнічала за ім у асабістай справе праз усё жыцьцё — можа гэтым і выкліканая была некаторая туга, уласьцівая «бражнікам».

Аматары мастацкай літаратуры могуць разгарнуць апавяданьне Эдгара По «Сьфінкс»: герой сустракае страхавітага монстра, у якога з касматай масы шчаціністых валасоў вытыркаецца дваццацімэтровы хобат з пашчай на канцы, з поўсьці

тырчаць таксама два бліскучыя іклы як у дзіка, хобат з бакоў прыкрываюць два крыштальныя прызматычныя рагі, дзьве пары пакрытых мэталічнай луской крылаў, якія раскінуліся на дзьвесьце мэтраў у шырыню. На грудзях ярка бялела выява чэрапа. Монстар зароў і герой самлеў.

Аказалася — звычайны матылёк.

Толькі вырас бескантрольна.



Палёты «Справы № 34451»

У 1990-м, калі ў часопісе «Крыніца/Родник» рыхтавалася да друку маё першае дасьледаваньне Освальда і пераклад «Гістарычнага дзёньніка», рэдакцыя зьвярнулася ў КДБ БССР з запытам пра архіўныя матэрыялы. У адказ было паведамлена, што ніякіх матэрыялаў у іх няма. Ніхто тады ў гэта не паверыў і, як высьветлілася, дарма.

Усе сакрэтныя тамы менскай «Агентурнай справы № 34451» былі ў Маскве ўжо на наступны дзень пасьля забойства Кенэдзі.

Як расказваў Мэйлеру «Сьцяпан», увечары 22 лістапада 1963 году Менск атрымаў загад з Масквы — тэрмінова даставіць дакумэнты. На наступны дзень «Сьцяпан» склаў тэчкі — усё зьмясьцілася ў адну шэрую паштовую сумку — і адправіўся на аэрадром. Яго суправаджаў узброены ахоўнік. На вайсковым аэрадроме ў Люберцах іх чакалі. Праз гадзіну яны ўваходзілі ў будынак КДБ на плошчы Дзяржынскага — на Лубянку. Пасьля доўгага блуканьня па калідорах яго завялі ў пакой, дзе за

сталом сядзелі некалькі чалавек. «Сьцяпан» далажыў — згодна з вашымі ўказаньнямі матэрыялы дастаўленыя. Ён запомніў першае пытаньне і свой адказ быццам гэта было ўчора:

— Ці рабілі вы спробы правесьці вэрбоўку Освальда?

— Даю галаву на адсячэньне, мы ня толькі не спрабавалі, нават гэтая думка нам у галаву не прыходзіла. Азнаёмцеся з гэтымі дакумэнтамі. Там вельмі ясна бачна, у якім накірунку мы працавалі. Выконвалі вашы інструкцыі.

Усе за сталом літаральна выдыхнулі з палёгкай.

Мэйлеру патлумачылі, што КДБ распрацоўваў некалькі вэрсіяў. Першая — Освальд агент ЦРУ, бо служыў у марской пяхоце, адкуль нярэдка набіраюць агентаў у разьведку. Падазрэньне выклікала заява Освальда пра тое, што ён марксіст — КДБ прыйшоў да высновы, што ён слаба ведаў марксісцка-ленінскую тэорыю. Была небясьпека, што Освальд гаварыў па-расейску лепш, чым паказваў. Магчыма, разьведзаданьне палягала ў тым, каб высьветліць, як савецкія ўлады працуюць зь перабежчыкамі з ЗША. Яшчэ адна вэрсія — Освальд сапраўды быў шчырым імігрантам, і апошняя — ён быў псыхічна няўстойлівым.

«Сьцяпан» потым сказаў Мэйлеру, што калі пасьля забойства Кенэдзі пачалася кампанія паклёпу на Савецкі Саюз, ён думаў, што, магчыма, Хрушчоў перадасьць гэтыя тэчкі амэрыканскаму ўраду:

— І ўсе амэрыканскія чуткі лопнуць як мыльная бурбалка.

Тэчкі, у якіх дасьледаваліся гэтыя вэрсіі, не былі перададзеныя амэрыканскаму ўраду. Яны ляжалі ў Маскве наступныя 27 гадоў — і іх дасталі са сховішча толькі пасьля правалу камуністычнага путчу ў жніўні 1991-га. Старшыня КДБ Кручкоў пайшоў на турэмныя нары, а новы старшыня Вадзім Бакацін на пачатку восені ў адказ на пытаньні амэрыканскіх і сваіх журналістаў паабяцаў, што справу Освальда рассакрэцяць.

Гэта амаль адбылося ў лістападзе 1991-га: памочнік Бакаціна прачытаў справу за тры вечары і перадаў яе для адпаведнага афармленьня ведамаснай камісіі.

Газэта «Известия» на першай паласе надрукавала партрэт Освальда і паведамленьне пад загалоўкам:

КДБ мае намер рассакрэціць дасье на забойцу Джона Кенэдзі

Камісія экспэртаў КДБ у пятніцу, 22 лістапада, скончыла вывучэньне сабранага савецкай контраразьведкай дасье, якое захоўваецца ў архівах камітэту, на амэрыканскага грамадзяніна Лі Гарві Освальда, які падазраецца ў забойстве прэзыдэнта ЗША Джона Кенэдзі, учыненым роўна 28 гадоў таму, 22 лістапада 1963 году. Як чакаецца, на пачатку наступнага тыдня вынікі працы будуць дакладзеныя Вадзіму Бакаціну, які прыме рашэньне, якія матэрыялы будуць апублікаваныя.

Ці то «Известия» ўважліва чыталі ў Менску, ці нехта з маскоўскага апарату пазваніў, але на наступным тыдні Бакаціну патэлефанаваў старшыня

беларускага КДБ Шыркоўскі, які папрасіў перад рассакрэчваньнем улічыць меркаваньне беларускага боку — большую частку агентурнай справы складаюць менскія матэрыялы. Бакацін выслухаў — просьба выглядала лягічнай — і пагадзіўся.

У канцы лістапада «Агентурная справа № 34451» вярнулася ў Менск.

У сьнежні сканаў Савецкі Саюз і Бакацін застаўся бяз працы і зваротнага адрасу.

Пасылку распакавалі, перайменавалі ў «Архіўную справу № 266», зрабілі надпіс «Без дазволу начальніка аддзелу не выдаваць» і замкнулі ў асобным сэйфе.

Палятала і хопіць.



Станіслаў Шушкевіч і шапка з вушамі

Гісторыя і час зусім не лінейныя рэчы і нават ня рэчы зусім, таму тое, што выглядае, як забяганьне наперад, насамрэч не забяганьне (бо й пераду асаблівага няма), а найкарацейшы шлях у выгнутай прасторы, мост ці падземны пераход, прахадны двор, якія адразу выводзяць у іншае месца маршруту.

У інтэрвію Мэйлер так узгадваў перамену адрасу «справы Освальда»:

— Затым Беларусь аддзялілася ад Расеі, і Шылеру давялося ехаць у Менск і пачынаць усё спачатку. Ён зьвязаўся з КДБ, ціснуў на прэзыдэнта — як было яго імя, Шушкевіч?

— Шушкевіч.

— І яму ўдалося пераканаць Шушкевіча і яго людзей, што гэта добрая ідэя, што добра, калі вядомы амэрыканскі пісьменьнік зробіць кнігу, якая прыцягне ўвагу да Беларусі. Усе перамовы вёў Шылер, ён прадаваў ідэю, і ён цудоўны ганд-

ляр. І ён пераканаў іх, што гэта добрая ідэя. І КДБ у гэты момант пагадзіўся.

— Якое Ваша ўражаньне ад Станіслава Шушкевіча?

— Мне падалося, што гэта добры чалавек. Мне падалося, што крыху запозна прыйшоў у палітыку. Я ня ведаю, што адбылося пасьля нашага ад'езду, але тады ў мяне было вельмі добрае ўражаньне.

У сваю чаргу, Станіслаў Шушкевіч так успамінаў пра сустрэчу:

— Калі да мяне зьвярнуўся чалавек і калі я даведаўся, што ён аўтар раману «Голыя і мёртвыя», што гэта вядомы Мэйлер, я сказаў, што з задавальненьнем зь ім сустрэнуся. Калі ён сказаў, што хоча пазнаёміцца са справай Лі Гарві Освальда ў беларускім КДБ, я затэлефанаваў старшыні КДБ, ён сказаў, што вывучыць гэтае пытаньне і дасьць адказ, і пасьля таго ён сказаў — калі ласка, калі хоча азнаёміцца — няхай знаёміцца.

Шушкевіч агаломшыў суразмоўцу расказам пра шапку Освальда — аказалася, ён асабіста ведаў амэрыканца, і такая дэталь!

Шапку Освальд купіў яшчэ ў Маскве, дзе ў сьнежні тэмпэратура апускалася ніжэй за — 20°С. Адзіны галаўны ўбор, што тады ляжаў на прылаўках, які можна было набыць без чаргі і знаёмстваў, была вушанка. І ня проста вушанка, а самая простая зь іх — салдацкая, з шэрага сукна і шэрай штучнай футры, з матузкамі. Гэта статусны галаўны ўбор, які, хто б яго ні надзеў, адразу ператварае генэрала

ў радавога, абаронцу айчыны ў салдата Чонкіна, замежніка ў асобу без грамадзянства.

Першае, што Шушкевіч успамінаў пра Освальда ў размовах з Мэйлерам і зь іншымі, заўсёды была гэтая салдацкая шапка.

— Ён пачуваўся ў ёй вельмі камфортна, як джэнтэльмэн!

У выніку Шушкевіч патрапіў у кнігу Мэйлера і стаў вядомы многім амэрыканцам — але ня ў якасьці дзеяча, датычнага да ўнікальнай у гісторыі чалавецтва падзеі — мірнага распаду імпэрыі, а ў ролі настаўніка расейскай мовы. Мэйлер нічога не напісаў пра асабістую гісторыю «члена сям'і здрадніка радзімы» Станіслава Шушкевіча, як рабіў гэта зь іншымі сваімі суразмоўцамі.*

Няма нічога горшага за здраду радзіме — так праз тры дзесяцігодзьдзі пасьля ўрокаў расейскай мовы Шушкевіч патлумачыў амэрыканскаму пісьменьніку, чаму ён не ўпадабаў Освальда.

Шушкевіч быў выхаваны ў старых традыцыях — так патлумачыў Мэйлер сваім чытачам словы Шушкевіча.

Шапка як на джэнтэльмэне — крыху дзіўны камплімэнт, звычайна так кажуць пра капялюш, але гэта быў самы пазытыўны водгук, які Шушкевіч даў пра вучня пры сустрэчы з Мэйлерам.

Освальд Шушкевіча ў сваім дзёньніку ня згадвае.

Але ў нататніку яго імя ёсьць.

---

*Бацька Шушкевіча, беларускі паэт, правёў 14 гадоў у ГУЛАГу за «прыналежнасьць да контрарэвалюцыйнай нацдэмаўскай арганізацыі».



Першыя дні «расейскага рабочага»

Загадам № 6 ад 12 студзеня 1960 году Лі Гарві Освальд быў прыняты на працу рэгуліроўшчыкам 1-га разраду ў экспэрымэнтальны цэх Менскага радыёзаводу.

Генэрал «Ігар» патлумачыў Мэйлеру, што:

а) КДБ не займаўся працаўладкаваньнем Освальда,

б) не падбіраў яму кватэру,

в) гэта была прэрагатыва Савету міністраў,

г) з органамі нават не кансультаваліся.

Мэйлер паўтарае гэтыя словы без камэнтароў.*

Падрабязнасьці першага працоўнага дня зафіксаваныя КДБ.

---

*Тлумачэньню «Ігара» сапраўды можна даць веры. Калі б з КДБ у Менску кансультаваліся, ніхто б не пасяліў амэрыканца, якога падазраюць у сувязях з ЦРУ, побач з трыма рэжымнымі аб'ектамі з кругласутачнай аховай: у двары тэлецэнтру, побач з радыёкамітэтам і зь відам на штаб вайсковай акругі.

Рапарт вонкавага назіраньня КДБ
13.01.60
Ад 08:00 да 24:00

У 8:00 было ўсталяванае назіраньне за прахадной на радыёзаводзе, дзе цяпер працуе Лі Гарві.

У 16:25 Лі Гарві выйшаў з радыёзаводу і пайшоў уніз па Чырвонай і вуліцы Захарава да тралейбуснага прыпынку, там сеў на тралейбус № 2 і, не ўступаючы ні з кім у размовы, даехаў да прыпынку «Вуліца Валадарскага», выйшаў з тралейбуса і пайшоў у гатэль. Было 17:00, калі ён увайшоў у гатэль. Пайшоў адразу ў свой пакой.

У 21:55 Лі Гарві пакінуў свой пакой у гатэлі і спусьціўся ў рэстаран, дзе сеў за вольны столік, замовіў у афіцыянткі ежу, павячэраў, затым расплаціўся і вярнуўся ў пакой у 22:25.

З пакою не выходзіў. У 24:00 назіраньне было спыненае да наступнай раніцы.

За Освальдам пільнавала некалькі груп супрацоўнікаў КДБ, якія, як выглядае, не павінны былі ведаць адна пра адну. Усе рапарты траплялі да «Сьцяпана», які рабіў рэгулярныя справаздачы «Ігару», а той інфармаваў напрасткі Маскву. Старшыня КДБ генэрал Васіль Пятроў таксама ведаў пра апэрацыю. Ад Лубянкі Освальда аддзялялі толькі тры ерархічныя прыступкі.

Дзёньнік ЛГО
13-16 студзеня 1960

Працую «кантралёрам», сьлесарам, зарплата: 700 рублёў у месяц. Праца вельмі лёгкая. Хутка вучу расейскую мову. Усе вельмі прыязныя і добрыя. Сустракаю шмат маладых расейскіх ра-

бочых майго ўзросту, у кожнага свой характар, усе хочуць пра мяне ведаць, нават прапануюць правесьці сход, каб я пра сябе расказаў. Ветліва адмаўляюся.

Вечарамі з Розай хаджу ў тэатар, кіно ці опэру амаль штодня. Жыву на шырокую нагу і вельмі задаволены. Атрымліваю «дапамогу« ад Чырвонага Крыжа, 5 дня кожнага месяца. Гэта 700 рублёў. Цалкам у месяц у мяне выходзіць 1400. Амаль як у дырэктара заводу!

1400 рублёў — гэта «старымі», да рэформы 1961 году, якая адняла адзін нуль. Афіцыйна сярэдняя зарплата ў СССР складала 783 рублі.*

Што можна было купіць за гэтыя грошы? Свой досьвед жыцьця і працы ў СССР Освальд выкладзе ў рукапісе, які назаве «Калектыў — жыцьцё расейскага рабочага». Аўтар не абмяжуецца назіраньнямі за заводзкай прахадной. Падчас шпацыраў па Менску Освальд ня толькі заходзіў у ГУМ, каб купіць электравілку, але і для вывучэньня прапановы, попыту і коштаў (у новых рублях), якія акуратна запісваў.

Кавалак пра ГУМ атрымаўся насычаны:

Тут можна купіць усё, што прадаецца ў малых спэцыялізаваных крамах, запісацца на халадзільнік, пыласос, нават машыну (нічога з гэтага нельга купіць адразу). Чарга на халадзільнікі (112 мільёнаў прададзена з 1952 па 1958 год) — тры

*Мэйлеру ў КДБ паведамілі, што месячная зарплата куратара Освальда «Сьцяпана» складала тады 80 рублёў (новымі). Падманулі. Касьцюкоў меў званьне капітана, займаў пасаду старэйшага опэрработніка, атрымліваў надбаўку за выслугу гадоў. Выходзіла ў раёне 200 рублёў.

месяцы, столькі ж на пыласосы. На аўтамашыны чарга ад шасьці месяцаў да году, у залежнасьці ад таго, на якую з трох мадэляў унесены задатак. «Масквіч» каштуе 2 500 рублёў, лічыцца найлепшым, і таму яго чакаць трэба амаль год; аднак «Пабеда» і «Волга» крыху таньнейшыя, і іх можна дачакацца праз шэсьць-сем месяцаў.

Тут Освальд наблытаў: «Масквіч» каштаваў 2500 рублёў, «Волга» — 4000. (Абедзьве антыкварныя маркі 1960 году выпуску можна купіць і праз паўстагодзьдзя, але розьніца ў кошце ўжо трыццаціразовая — на карысьць «Волгі».)

Машыны тут купляюць збольшага пад замову. Мадэлі ня надта ўражваюць. «Масквіч» выглядае як скрынка на колах, а «Волга» — як «Студэбэкер» 1938 году, паводле якога, дарэчы, яна і зробленая, «даваенная дапамога Амэрыкі».

Матацыклы і тэлевізары, аднак, можна набыць адразу за гатоўку. Добры, з магутным рухавіком матацыкл каштуе 350 рублёў, і іх якасьць лепшая, чым у больш складаных аўтамабіляў. Тэлевізар каштуе ад 80 рублёў за экран памерам 6 на 6 цаляў, да 350 рублёў за добра зроблены апарат з экранам 22 цалі. Іншыя мадэлі, лёгкія настольныя, каштуюць 190 і 145 рублёў.

Ні матацыкла, ні тэлевізара Освальд не купіў. Купляў кашулі, гальштукі, касьцюм.

Тут можна купіць гатовыя касьцюмы, пашытыя з грубай тканіны. Больш танныя, двубортавыя блакітныя за 110 рублёў, альбо лепш пашытыя на трох гузіках за 250 рублёў. Пінжак каштуе 40 рублёў, і пара штаноў ня менш за 15

рублёў. Таксама звычайна прадаюцца і танныя пінжакі, па 30 рублёў.

Освальд ня згадвае ў гэтых запісах самую важную і самую даўгую чаргу па тое, што выдавалася бясплатна — жыльлё.



Кватэра для кавалера

Праз два тыдні пасьля зьяўленьня амэрыканца на радыёзаводзе газэта «Звязда» апублікавала дзіўны ліст рабочага гэтага самага заводу.

Пад крыху гульлівым загалоўкам «А як жа халасьцяку?» нехта М.Дзьмітрыенка скардзіцца на дыскрымінацыю па сямейнай прыкмеце — ён жыве ў інтэрнаце, нежанаты, а такіх ня ставяць на чаргу на атрыманьне кватэры. Ён называе прозьвішчы розных заводзкіх і прафсаюзных начальнікаў, якія са сьмехам раяць яму знайсьці дзяўчыну з кватэрай, ці спачатку пабрацца шлюбам і нарадзіць дзіцё, а потым запісвацца ў чаргу, і паведамляе — яму не да жартаў, бо да стварэньня сям'і трэба ставіцца ўдумліва.

Дзіўным гэты ліст быў толькі з адной прычыны — што яго апублікавалі, бо такіх, як Дзьмітрыенка, былі дзясяткі тысячаў. Газэта нават атрымае тлумачэньні дырэктара заводу «тав. Юдзялевіча» (у адрозьненьне ад аўтара ліста — рабочага, ініцыялы дырэктара не называюцца) — але не надрукуе цалкам, а толькі пакпіць і назаве іх незразумелымі.

Ніводзін з трох удзельнікаў гэтай міні-эпісталярнай бойкі на газэтных старонках ня шчыры: кавалер ведае, што па кутах туляцца нават інваліды вайны, шматдзетныя сем'і, і робіць акцэнт на разважнае, сур'ёзнае стаўленьне да сям'і.

Дырэктар ведае, што інструкцыя нічога не забараняе, але лічыць патрабаваньні рабочага «незразумелымі», бо той забясьпечаны інтэрнатам.

А газэта дэманструе прынцыповасьць, ні словам не згадаўшы саму праблему — разьвіцьцё цяжкай індустрыі і вайскова-касьмічнага комплексу за кошт сацыяльных капіталаўкладаньняў.

Усё адбываецца як у анэкдоце Мэйлера пра садыста і мазахіста, толькі ніхто не задаволены.*

Дзёньнік ЛГО
16 сакавіка 1960

Атрымліваю невялікую кватэру. Адзін пакой, кухня, ванны пакой, недалёка ад заводу (8 хвілін пешкі) з цудоўным выглядам з 2-х бальконаў, амаль бясплатна (60 рублёў за месяц). Гэта мара расейцаў.

Пра кватэру на беразе рэчкі ў цэнтры гораду на аднаго за менш чым 5% месячнага заробку 20-гадовыя рабочыя маглі з аднолькавым посьпехам марыць і ў Нью Арлеане, і ў Маскве.

Больш рэалістычным ня толькі для Амэрыкі, але і для СССР выглядаў свой аўтамабіль. Для Освальда — «Запарожац», які пачалі выпускаць у 1960-м, і каштаваў ён 16 000 рублёў. Да свайго ад'езду зь Менску ў чэрвені 1962-га Освальд рэальна мог бы

*Анэкдот будзе расказаны на ст. 119.

сабраць на машыну і стаць першым амэрыканцам — уладальнікам гарбатага «Запарожца».

І потым перавезьці яго ў Амэрыку, і езьдзіць на працу, і ў адзін лістападаўскі дзень ён заглух бы па дарозе, і замест складу падручнікаў кіроўца мусіў бы патрапіць у аўтамайстэрню і там доўга расказваць шакаваным мэханікам, адкуль такі цуд узяўся, чаму замест матора наперадзе багажнік, і навошта там карабін і пачак патронаў.

Освальд у Менску машыну не купіў.

Ён увогуле ня меў правоў і ня ўмеў вадзіць.

Але стрэльбу — купіў.



76 прыступак уверх і ўніз

Дом на вуліцы Калініна, 4* будавалі яшчэ палонныя немцы. Капітальныя сьцены клалі з цэглы, а перагародкі ў кватэрах рабілі з дрэва, запаўнялі скрыжаваныя дранкі азбэстам, тынкавалі і клеілі шпалеры. Ліфта няма, да пляцоўкі чацьвёртага паверху трэба адолець 76 прыступак.

Падлога паркетная, зь невялікай вітальні адны дзьверы вялі ў кладоўку, другія на кухню, справа дзьверы ў ванны пакой, дзе разам зь велізарнай чыгуннай эмаляванай ваннай (давялося дадаткова рабіць прарэз у вушаку, каб яна стала) быў туалет — белы стульчак, ад якога адыходзіла чыгунная труба да зьліўнога, таксама чыгуннага бачка на вышыні двух мэтраў. Пацягнеш за ланцужок — і рынецца ўніз вада, змываючы парваныя на дробныя кавалкі шыфроўкі, сакрэтныя дакумэнты, схемы аэрадромаў...

Нічога такога Освальд не змываў, бо ня меў. Але

*Цяпер Камуністычная, 4.

чыгунныя трубы і прылады засталіся бязь зьменаў (капітальнага рамонту не было) і працягваюць служыць новаму гаспадару кватэры, які ходзіць па тым самым паркеце, глядзіць у тыя самыя вокны і ахвотна фатаграфуецца з журналістамі на балконе ў той самай позе, як некалі Марына і Освальд: прыхіліўшыся да калёны, жонка бліжэй да краю, абое глядзяць у аб'ектыў.

Калі Эдуард Кадыравіч Сагындыкаў купляў кватэру ў 1990-х, ён нічога ня ведаў пра знакамітага жыхара. Папярэдняя гаспадыня сказала, толькі калі былі афармленыя і падпісаныя ўсе паперы. Цяпер у сп. Эдуарда ў кампутары маса інфармацыі пра Освальда, інтэрвію, гістарычныя фатаздымкі, газэтныя публікацыі.

Сагындыкаў сёе-тое перарабіў у кватэры — паставіў новыя вокны, зьмяніў грубасткую чыгунную батарэю на эфэктыўную сучасную і прарэзаў сьценку з пакою ў кухню, каб кожнага разу не хадзіць кругам праз калідор. Шырыня ўнутранай сьценкі — 12 сантымэтраў, дранка, дрэва, пустоты — менавіта праз такую сьценку вялі назіраньне супрацоўнікі КДБ. Рэч у тым, што першапачаткова кватэра плянавалася як большая, але потым зь яе зрабілі дзьве — і іх разьдзяляе якраз такая несур'ёзная перагародка. Калі Сагындыкаў засынае і забывае выключыць тэлевізар, суседзі скардзяцца — усё чуваць. Цяпер сусед робіць гукаізаляцыю.

Дом на беразе рэчкі быў адным з самых зайздросных у Менску: у самым цэнтры, да плошчы Перамогі адна хвіліна праз двор, восем хвілін да заводзкай прахадной, вокны на парк і на Сьвіслач, чыё вадзяное люстэрка выглядала тут як возера, з падвойнага балькона, больш падобнага да тэрасы,

відаць было парк Горкага, Дом афіцэраў, будынак ЦК партыі зьлева, далей дзьве вежы праваслаўнага сабору, тэатар опэры і балету і клясычны франтон штабу Беларускай вайсковай акругі.

Проста пад вокнамі, крыху лявей, драўляны дом-музэй 1-га зьезду РСДРП. Освальд не пакінуў сьведчаньняў, ці быў у музэі. Было б дзіўна, калі б не адведаў — малады марксіст мусіў прычасьціцца такой гістарычнай сьвятыні, зь якой усё пачалося. І ня мог не падумаць пра сымбалічнае значэньне месца — можа, і яму наканавана пакінуць свой сьлед у гісторыі. Калі пазьней вуліцу Калініна перайменавалі ў Камуністычную, гэта магло стаць яшчэ адным знакам.

Сагындыкаў у музэі ня быў, хаця да пераезду жыў побач, насупраць праз праспэкт, з боку парку Горкага. Жонка памерла, дзеці выраслі і разьехаліся і ён перабраўся ў меншую кватэру. Калі некаму заманецца напісаць для сцэны гісторыю жыхароў кватэры № 22, напрыклад, зрабіць мюзыкал, праблемы з выкананьнем ролі цяперашняга гаспадара будуць большыя, чым з роляй Освальда.


Спачатку пытаньне мовы — казах паводле пашпарта, Сагындыкаў разумее ідыш, на якім гаварылі ў Менску да вайны, працаваў на беларускім тэлебачаньні і можа гаварыць па-беларуску, але па-казахску ня ведае ані слова.

Яго дзед, заможны менскі габрэй-гандляр Клейнэр, паглядзеў на пасьлярэвалюцыйны вэрхал і прыняў адзіна правільнае рашэньне — зьехаць у Амэрыку. Але чатыры дачкі-марксісткі цьвёрда верылі ў ідэалы новага сьвету і засталіся яго будаваць. Адна зь іх паехала на вучобу ў Маскву ў камуністычны ўнівэрсытэт імя Сьвярдлова, пазнаёмілася

там з нацыянальным кадрам з Казахстану, як называлі прадстаўнікоў савецкіх рэспублік, і паехала зь ім у Петразаводзк, куды яго прызначылі сакратаром абкаму партыі. Пасьля нараджэньня сына бацьку неўзабаве арыштавалі і расстралялі, маці як жонку ворага народу саслалі ў ГУЛАГ, а малога аддалі ў дзіцячы дом. Там яго пазьней знайшла цётка, забрала і выхоўвала як сына — да 10 гадоў ён нічога ня ведаў пра сваю гісторыю. Праз пару гадоў пасьля вайны аднойчы ён вярнуўся са школы дадому і пабачыў дзьвюх маці — сёстры былі блізьнятамі. Ну і гэтак далей.

Мэйлер аж трэсься ад такіх гісторыяў і ўключаў у кнігу ўсё, што патрапляла пад руку, якое б далёкае дачыненьне ні мелі жыцьцёвыя пэрыпэтыі яго суразмоўцаў да цэнтральнай тэмы кнігі. Гэтай гісторыі ў кнізе няма ня толькі таму, што інтэрнацыянальны гаспадар засяліўся ў дом на Камуністычнай ужо пасьля выхаду кнігі.

За паўгода ў Менску Мэйлер ні разу ня быў у кватэры Освальда.


Членский билет № 01311655
Освальд
отчество Харвей

Освальд і яго імёны

Самае першае імя Освальда ў Менску — «Алёша». Менавіта так пачынаюць называць яго дзяўчаты-перакладчыцы Інтурысту ў гатэлі «Менск». Першая рэакцыя Мэйлера на гэта — канечне, паводле Дастаеўскага, як аднаго з братоў Карамазавых?..

У адказ перакладчыца расказвае пісьменьніку гісторыю пра песьню і баўгарскі помнік савецкім воінам-вызваліцелям у Плоўдзіве, названы так пяшчотна ў гонар салдата-сувязіста.*

На менскім радыёзаводзе Освальда называюць «Алік» — ён адгукаецца на гэтае імя, і так яго большасьць знаёмых і запомніла на многія дзесяцігодзьдзі.

Жонка называе яго яшчэ й «Алька».

Сам Освальд па-расейску часьцей за ўсё падпісваецца «Алек».

---

*Гэтае тлумачэньне — тыповая кантамінацыя, накладаньне пазьнейшых падзеяў на папярэднія, як нярэдка здараецца пры гістарычных рэканструкцыях. Папулярная песьня, якая зьвязала помнік і імя, была напісаная толькі ў 1968 годзе.

Адзін выпускнік палітэхнічнага інстытуту, куды Освальд заходзіў са сваім заводзкім сябрам, таксама студэнтам-завочнікам Паўлам Галавачовым, згадвае ў сваіх успамінах, што студэнты паміж сабой называлі яго па-расейску «Лихарь», «Лихаря» і нават «Харя».

У рапартах КДБ Освальда называюць «Лі Гарві». Можа і пачціва, але малапісьменна, бо гэта толькі імя і другое імя, нават не імя па бацьку. Неўзабаве яму прысвойваецца мянушка «Ліхі» — тут ужо адчуваецца фанэтычны густ.

Затым яна мяняецца на «Налім». Чаму — можна толькі здагадвацца. Магчыма, звычайнае бюракратычнае суперніцтва розных управаў і аддзелаў, адсутнасьць каардынацыі, можа вынік рэжыму сакрэтнасьці, калі кожны супрацоўнік ці група працуюць аўтаномна і ня ведаюць, што робяць калегі. Дзьве мянушкі некаторы час ужываюцца адначасна.

Таксама ўжываюцца абрэвіятуры: «ОЛГ» — да ліпеня 1961-га, пасьля — «ЛГО», і зрэдку — «Л».

У канцы 1961 году амэрыканца ў рапартах КДБ прадстаўляюць як савецкага грамадзяніна — «Освальд Л.Г.», у заводзкай характарыстыцы — «Л.Г. Освальд».

Пасьведчаньне таварыства паляўнічых і рыбаловаў выпісана на імя «Аляксей Гарвей Освальд».

У адным заводзкім дакумэнце напісана «Прозьвішча — Освальд, Імя — Лі Гарвей». Поўны варыянт «Освальд Лі Гарвеевіч» не сустракаецца.

Этымалягічныя слоўнікі тлумачаць значэньне прозьвішча як «боскую сілу, кіраваньне Бога» — таму ў адной з амэрыканскіх кансьпіралягічных тэорыяў Освальда зьвязваюць зь імем чараўніка з

Озу, які кіруе Смарагдавым горадам і знаходзіцца ў акультнай сувязі з ідэяй спыненьня жыцьця. А прозьвішча Рубі, забойцы Освальда — з рубінавымі чаравічкамі гераіні казкі Элі.

Страшна ўявіць, што будзе, калі аматары анамастыкі ўведаюць імя першай менскай перакладчыцы Освальда — яе звалі Сталінай (пасьля сьмерці «бацькі народаў» яна ператварылася ў Стэліну).

Яшчэ страшней уявіць, што было б, калі б Освальд застаўся ў Беларусі і прыйшоў атрымліваць мясцовы пашпарт: Леў Георгіевіч Асвальдчук.*

Дарэчы, прозьвішча аўтара клясычнага «Этымалягічнага слоўніка ангельскай мовы» — таксама Освальд, толькі Джон.

*Апошні тэлефонны званок у сваім жыцьці прэзыдэнт Кенэдзі зрабіў з гатэлю ў тэхаскім гарадку Форт Ворт, дзе яны з жонкаю правялі ноч перад Даласам (і дзе пахаваюць Освальда). Кенэдзі захацеў падзякаваць людзям, якія спэцыяльна ўпрыгожвалі іх нумар кветкамі, вазамі, карцінамі зь мясцовага музэю. На століку ляжаў буклет, і Кенэдзі папрасіў злучыць яго з дамай, чыё прозьвішча значылася першым, пазваніў, падзякаваў ашаломленай прэзыдэнцкім званком актывістцы. Яе прозьвішча было Джэй Лі Джонсан — сьвята анамастыкі. Джэй — так пачынаецца імя дырэктара ФБР Гувэра, адказнага за агульную бясьпеку (ФБР шчыльна цікавілася Освальдам, але ў лістападзе 1963 ніякіх дадатковых захадаў да яго не ўжывалі). Лі — імя Освальда, а Джонсан — прозьвішча віцэ-прэзыдэнта, які стаў прэзыдэнтам пасьля забойства. І гэта ня ўсё — дзявочае прозьвішча дамы было Картэр — так будуць зваць наступнага пасьля Джонсана прэзыдэнта ад Дэмакратычнай партыі.



Першая памылка КДБ

Бацька Паўла Галавачова быў лётчыкам і двойчы Героем Савецкага Саюзу, маці — хатняй гаспадыняй, якая суправаджала мужа па шматлікіх месцах службы, а сын — выключаным з камсамолу разгільдзяем, якога бацькі паслалі ў Менск, дзе ў іх была кватэра, зарабляць вытворчую характарыстыку для вучобы ў інстытуце.

Дзёньнік ЛГО
17 сакавіка — 31 красавіка 1960

Працую. Страціў сувязь з Розай пасьля пераезду ў кватэру. Я знаёмлюся з Паўлам Галавачовым. Малады чалавек майго ўзросту, прыязны, вельмі разумны, выдатны радыётэхнік. Яго бацька генэрал Галавачоў двойчы герой, камандуючы ў Паўночна-Заходняй Сібіры.

Працоўнае месца Галавачова было за пяць мэтраў ад амэрыканца. Калі сакратар парткаму Лібезін спытаўся, хто на ўчастку ведае ангельскую,

аказалася, што ўсе навокал вучылі нямецкую, адзін Павал крыху ведаў ангельскую.

— Будзеш дапамагаць, — сказаў партсакратар.

Рэч была ў тым, што ўжо ў першы дзень на заводзе Освальд ледзь не пабіўся з рабочым: той абурыўся, калі нехта, пакуль ён выйшаў з цыгарэтай, разабраў падрыхтаваны ім прэс. Той рабочы таксама толькі пачаў працу на заводзе і ня ведаў, каго ўзяў за грудкі. Сакратар парткаму потым прымусіў яго прасіць прабачэньня. Освальд ня мог патлумачыцца, патрабавалася штодзённая дапамога на месцы, тут пад руку падвярнуўся малады хлопец з ангельскай. Назаўтра са слоўнікам у кішэні ён пачаў знаёміцца з амэрыканцам.

Галавачоў узяў пачак запалак і выпусьціў з рукі: так Освальд навучыўся першаму слову — упаў, падаць.

Аднойчы падчас доўгага інтэрвію з Мэйлерам начальнік управы КДБ «Ігар» прызнаўся, што і яны рабілі памылкі — ніхто не дасканалы. І адна зь іх — дапусьцілі знаёмства і сяброўства 18-гадовага юнака — генэральскага сына з амэрыканцам.

А памылкі трэба выпраўляць. Ужо праз два тыдні пасьля першай сустрэчы з Освальдам па дарозе дадому Паўла спыніў незнаёмы чалавек, паказаў пасьведчаньне КДБ і прапанаваў пагаварыць. Стаяў мароз, Павал мёрз і запрасіў «Сьцяпана» зайсьці ў кватэру (паблізу плошчы Перамогі). Опэрработнік паказваў адзін за адным пяць фатаздымкаў і пытаўся — ведаеш? Павал нікога не пазнаў і спытаўся сам, хто гэтыя людзі. У адказ прагучала — дзяржаўныя злачынцы. Затым «Сьцяпан» дастаў фота Освальда і патлумачыў Галавачову, што цяпер яго патрыятычны доўг дапамагчы радзіме.

Ніякага асаблівага доўгу перад радзімай Галавачоў не адчуваў, але, як ён патлумачыў Мэйлеру праз тры дзесяцігодзьдзі, існаваў вельмі моцны заменьнік гэтага пачуцьця.

Страх.

Рапарт КДБ
18.02.60

Шляхам асабістага назіраньня і ў размовах «Л» не заўважыў падазроных праяваў у паводзінах Освальда. Ён ня надта цікавіўся працай і нярэдка рабіў заўвагі кшталту: «Чаму я мушу пілаваць гэты мэтал гэтай пілкай, я ж не зьбіраюся ў інжынэры. Мая сапраўдная мара — вывучыць замежныя мовы, і вывучыць добра». (Ён не ўдакладніў, якія менавіта.) У размовах стрыманы, адказвае на пытаньні коратка, упэўнена.

Аднойчы, паводле «Л», яны чыталі прамову прэзыдэнта Эйзэнгаўэра ў «Правде». У гэтай прамове Эйзэнгаўэр спрабаваў паказаць тэхнічную адсталасьць Савецкага Саюзу ў параўнаньні са Злучанымі Штатамі. Освальд адказаў, што Эйзэнгаўэр хлусіць, СССР ня менш тэхнічна разьвітая краіна, чым ЗША.

Освальд амаль ніколі не расказвае пра жыцьцё ў сваёй краіне, альбо як ён патрапіў сюды. Часам, у абед, ён абмяняецца двума-трыма словамі з маладымі людзьмі, дзяўчатамі і хлопцамі, і параўнае жыцьцё ў СССР і ЗША. Але ў такіх выпадках ён таксама выказваецца станоўча пра стан рабочых у СССР.

Насамрэч пасьля тыдня працы на заводзе Освальд заўважыў і адчуў нешта зусім іншае.

Дзёньнік ЛГО
16 студзеня 1960

Мне не падабаецца: партрэт Леніна, які глядзіць са свайго ганаровага месца, і фіззарадка з 11:00 да 11:10 штораніцы (абавязкова). Для ўсіх. (Цені Г.Уэлса!!).

Мэйлер ня піша, хто такі «Л» — бо ня ведае. Хто заўгодна мог быць.

Пасьля званка Шушкевіча ў КДБ Мэйлеру пачалі дапамагаць, але адразу папярэдзілі пра абмежаваньні:

Старшыня КДБ Шыркоўскі сказаў аднойчы, і ён ухмыляўся, калі гаварыў гэта: зразумела, мы ня можам даць вам імёны нашых крыніц.

Мэйлер патлумачыў ухмылку — Шыркоўскі таксама сказаў яму:

Але калі крыху папрацуеце, паходзіце вакол, вы зразумееце, хто яны. І мы сапраўды ўведалі.

— Калі вам давалі дакумэнты — гэта былі поўныя тэксты ці некаторыя часткі былі закрытыя?

— Яны былі вельмі асьцярожныя. Яны не хацелі ніякім чынам пашкодзіць сабе тым, што нам давалі. Як я сказаў, частку больш цікавых матэрыялаў мы атрымалі з задняга ходу, але я сапраўды не магу пра гэта расказваць.

— Яны заўсёды дапамагалі вам матэрыяламі?

— У прынцыпе, так. Празь месяц ці два супрацоўнасьць пазыцыі КДБ была — так, мы далі абяцаньне. Гэта было дурацкае абяцаньне. І цяпер, калі даводзіцца яго выконваць, гэта сапраўды

галаўны боль. І як, каб на іх халера, выканаць гэтае абяцаньне? Давайце дамо ім мінімум таго, што можна даць.

— Ці быў нейкі важны матэрыял, які вы прасілі, але не атрымалі?

— Галоўнае, чаго мы не атрымалі — імёны крыніцаў.

Іх магло быць колькі заўгодна — просьба органаў сачыць за амэрыканцам не выглядала незаконнай ці маральна сумнеўнай. Наадварот — патрыятычнай. Ні сваяк, ні зямляк, ні сябар, як зь неба зваліўся — чужы, з варожай імпэрыі. І нават пасьведчаньне ня трэба было паказваць — самі прыйдуць і раскажуць. Аднак каштоўнасьць інфарматара ўзрастала па меры яго набліжанасьці да аб'екта, таму менавіта блізкае кола мусіла цікавіць ў першую чаргу.

Як пісаў у газэце «Звязда» ў год прыезду Освальда ў Менск старшыня КДБ генэрал Пятроў:

Цесная сувязь органаў бясьпекі з народам — непарушная традыцыя савецкага грамадзтва, якая няспынна ўзбагачаецца і разьвіваецца.

Хаця што там ужо было ўзбагачаць і разьвіваць у гэтай традыцыі пасьля папярэдніх дзесяцігодзьдзяў?..

Перабольшваў генэрал. Але не пераменшваў.*

*Газэта «Известия» ў 1992-м ацэньвала колькасьць людзей КДБ вакол Освальда ў Менску на два дзясяткі чалавек. «Сьцяпан» казаў Мэйлеру, што сачэньне не каштавала зашмат — кола сяброў Освальда было невялікім, не мянялася рэзка, не ўяўляла асаблівых складанасьцяў.



Карацейшы ў 38,6 раза

Гэты кароткі разьдзел можна прапусьціць і не чытаць, настолькі ён неабавязковы, неістотны, бескарысны для тых, каго цікавіць гісторыя амэрыканскага перабежчыка.

Але калі ў папярэднім сказе паставіць кропку на два словы раней, дык чаму й не прабегчы вокам?

У студзені 1960-га, калі Освальд адчуў сябе ніякавата пад прыжмураным позіркам партрэта на сьцяне, яму магло здацца, што нябожчык уваскрэс — калі б амэрыканец чытаў мясцовы друк.

За першы месяц году ў рэспубліканскіх часопісах і газэтах было апублікавана 733 артыкулы, якія кніжная палата БССР палічыла вартымі згадкі ў «Летапісу друку».

«Топ-20» студзеня 1960-га — толькі загалоўкі (на мове арыгіналу) — выглядаў так:

1. В.И. Ленин о двух концепциях развития

2. Каштоўны ўклад у марксісцкую літаратуру

3. У.І Ленін аб перамозе камуністычнай працы

4. Ленинская идея соревнования — источник трудовых побед

5. Ленінскае адзінства партыі і сучасны рэвізіянізм

6. Як працаваў Уладзімір Ільіч

7. Встреча

8. У гуртку, якім кіраваў Ільіч

9. Бесконечно дорогое имя

10. Як Уладзімір Ільіч пісаў Дэкрэт аб зямлі

11. Вечна жывы

12. Ленін на трыбуне

13. Вялікі друг працоўнага сялянства

14. Любімы Ільіч

15. Как работал Владимир Ильич

16. Рысы генія

17. З глыбінь сэрцаў народных

18. «Вось гэта чалавек!»

19. Ленин и теперь живее всех живых, наше знанье, сила и оружие

20. Мои последние встречи с Ильичем

Гэты кароткі разьдзел мог бы быць у 38,6 раза даўжэйшым, калі б рэдактар дазволіў надрукаваць увесь сьпіс за студзень. А Освальд наракае на партрэт...*

*Дзеля справядлівасьці — далей у сьпісе ня толькі пра самага чалавечнага з усіх чалавекаў. Але і ў годзе ня толькі адзін месяц...



Аргентынскае танга на Чырвонай

Чым, апроч працы і вучобы, займаўся Освальд на заводзе першыя сто дзён, з кім яшчэ пасябраваў, як праводзіў вольны час, Мэйлер ня піша — у кнізе няма цытатаў з матэрыялаў КДБ за гэты пэрыяд (нецікавыя? Не далі?..), у «Гістарычным дзёньніку» таксама ніводнага запісу.

Матылёк не пакінуў сьлядоў.

Гістарычнае сьвятло ўключаецца 1 траўня 1960-га: хаця сьвята рабочай салідарнасьці прыпала на нядзелю, адзначалі яго два дні — у панядзелак на працу было ня трэба.

Дзёньнік ЛГО
1 траўня 1960

Першага траўня стала маім першым сьвятам, усе заводы і г.д. закрытыя. Пасьля відовішчнага вайсковага параду дэманстрацыя рабочых перад трыбунай, са сьцягамі і партрэтамі містэра Х. Па-

водле амэрыканскай традыцыі адзначаю сьвята тым, што ўсю раніцу сплю.*

Зьмена на «Гарызонце» пачыналася рана, і жаданьне 20-гадовага Освальда выспацца цалкам натуральнае.

Рапарт назіраньня КДБ
01-02.05.60
ад 07:00 да 01:50

У 10:00 Лі Гарві выйшаў з дому № 4 на вуліцы Калініна і пайшоў на плошчу Перамогі, дзе 25 хвілін назіраў за парадам. Затым пайшоў на вуліцу Калініна і гуляў уверх-уніз па ўзьбярэжнай Сьвіслачы. Вярнуўся дадому у 11:00.

Ад 11:00 да 12:00 некалькі разоў выходзіў на балькон свайго дому. У 13:35 выйшаў з дому, сеў на тралейбус № 2 на плошчы Перамогі, даехаў да Цэнтральнай плошчы, выйшаў апошнім, пайшоў уніз па вуліцы Энгельса, Маркса, Леніна ў булачную на праспэкце Сталіна.

Там купіў 200 грам ванільнага печыва, пайшоў у кафэ «Вясна», выпіў кубак кавы зь печывам і пасьпяшаў у бок кінатэатра «Цэнтральны». Пераглянуў афішу і купіў газэту («Знамя юности»), яшчэ раз зайшоў у булачную, адразу выйшаў, сеў на тралейбус № 1 і даехаў да плошчы Перамогі і быў дома ў 14:20.

---

*Пасьля таго, як адзін амэрыканскі чытач выказаў захапленьне тым, як у 1960-я ў Менску любілі апэрэту, што аж насілі партрэты пэрсанажаў «Прынцэсы цырку» на дэманстрацыі, я мушу пазначыць, што «Містэр Х.» Освальда — гэта ня Містэр Ікс Імрэ Кальмана. Гэта «Першы сакратар ЦК КПСС, старшыня Савету Міністраў СССР Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў».

У 16:50 выйшаў з дому і пайшоў на адрас Чырвоная, дом 14.

У доме 14 жыла сям'я інжынэра Аляксандра Зігера. Освальд пазнаёміўся зь ім у свой першы дзень на заводзе і стаў частым госьцем у доме.

Гэта быў незвычайны асяродак — у 1950-я хваля рэпатрыяцыі прынесла на радзіму многія тысячы сем'яў, якія пасьля 2-й сусьветнай былі раскіданыя па сьвеце. Вырашыла вярнуцца і габрэйская сям'я Зігераў — «Дон Аляксандра», як звалі яго знаёмыя — з жонкай і дзьвюма дочкамі. Зігеры прыехалі з Буэнас Айрэсу і прывезьлі ня толькі поўныя валізы рэчаў, але яшчэ й вялікі ложак і матрац, бо ведалі, што ў СССР ложкі маленькія. Іх дочкі шакавалі суседзяў, калі выйшлі на балькон загараць у бікіні. На вечарынах у Зігераў гучала музыка, была моладзь.

І там гаварылі адкрыта.

Дзёньнік ЛГО. Працяг

Увечары іду на вечарынку з дочкамі Зігера, каля 40 чалавек, многія з Аргентыны. Мы танцуем і забаўляемся і п'ем да другой раніцы, пакуль вечарына не сканчаецца. Леанора Зігер, старэйшая дачка, 26 гадоў, афіцыйна разьведзеная, таленавітая сьпявачка. Аніта Зігер, 20 гадоў, вельмі вясёлая, не такая прывабная, але мы ўпадабалі адно аднаго. Яе кавалер Альфрэд — вугорац, маўклівы і задуменны, непадобны да Аніты. Зігер раіць мне вяртацца ў ЗША. Гэта першая апазыцыйная думка, якую я пачуў. Я паважаю Зігера, ён бачыў сьвет. Ён гаворыць пра многія рэчы, пра якія ў СССР я ня ведаю. Я пачынаю адчуваць сябе ня надта, сапраўды!

Кватэру Зігераў не падслухоўвалі.* Але тое, пра што там гаварылася, можна было ўведаць і іншым спосабам.

Рапарт вонкавага назіраньня КДБ. Працяг

У 01:40 Лі Гарві зь іншымі мужчынамі і жанчынамі, сярод якіх былі дочкі Зігера, прыйшоў дадому. У гэты час назіраньне было спыненае да раніцы.

У доме аргентынца ў Освальда пачаўся лёгкі раман з адной зь сяброваК Аніты, паштаркай Альбінай, як адзначыць Мэйлер — бляндынкай. Раман вялікага разьвіцьця не атрымае, але менавіта яна ўвосені 1960-га пазнаёміць Освальда з адным з самых значных яго знаёмых у Менску, сваім аднаклясьнікам Эрыкам Цітаўцом.

Цітавец таксама будзе атрымліваць запросіны на вечарынкі да Зігераў. Але, як напіша Мэйлер, нядоўга. Пасьля загадкавага выпадку — нехта паведаміў уладам пра не зусім легальнае падарожжа сваяка Зігера зь Вільні, і потым былі непрыемнасьці зь міліцыяй — Аляксандар Зігер рэзка абмяжуе колькасьць гасьцей.

Забарона, натуральна, ня будзе тычыцца Освальда.

Пачутую параду — вяртацца ў ЗША — Освальд ні з кім не абмяркоўваў.

Але запомніў.

---

*«Цяжка паверыць!» — напісаў на палях рукапісу адзін скептычны чытач. Праверым, калі перад тым, як адкрыць, ня спаляць архівы КДБ...



«Ідэот», не ідыёт

За Освальдам сачылі ня толькі штатныя лепідаптэролягі з КДБ — яго знаёмыя таксама папаўнялі апэратыўную справу, давалі справаздачы пра свае ўражаньні ад амэрыканца. Сустрэчы праводзіў «Сьцяпан», які затым запісваў зьмест гутарак і акуратна падшываў.

Мэйлеру паказалі адзін такі дакумэнт, дзе ў якасьці крыніцы выступала перакладчыца «Таня» зь Менскага Інтурысту.

Рапарт КДБ
08.07.1960

У выніку сустрэчаў крыніца ўсталявала добрыя адносіны зь Лі Гарві. Ён разглядае крыніцу як чалавека, зь якім можна добра правесьці час. Не праяўляў цікавасьці да дэталяў біяграфіі, за выняткам узросту. Лі Гарві цалкам задаволены сваёй кватэрай і наяўнымі зручнасьцямі. Яна яшчэ не абстаўленая, але цалкам прыдатная для кавалера.

Калі крыніца была ў кватэры, Лі Гарві задаў ёй пытаньне: «Чаму ты не пытаесься пра мае ўражаньні ад Савецкага Саюзу?»

Крыніца адказала: «Я думаю, ты сам падзелісься са мной сваімі ўражаньнямі». І затым быў адказ Лі Гарві. Ён пачаў дзяліцца ўражаньнямі. Яго расказ быў поўны энтузіязму да савецкай рэчаіснасьці.

Заўважыўшы дзьве пары чобатаў, якія ён набыў, крыніца спыталася са зьдзіўленьнем: «Навошта табе чобаты?»

Ён адказаў: «Я люблю ўсё расейскае. Я хачу выглядаць як расеец».

Гаворачы пра сваіх знаёмых, ён паказаў крыніцы некалькі фатаграфіяў, на якіх ён зьняты ў кампаніі сяброў, аргентынца і яго жонкі. Адначасна ён паінфармаваў крыніцу, што мае яшчэ аднаго сябра, расейца, які працуе на радыёзаводзе.

Агульнае разьвіцьцё Лі Гарві, кола яго інтарэсаў падаюцца нашай крыніцы абмежаванымі. Ён дрэнна разьбіраецца ў мастацтве, музыцы, жывапісе, нічога ўжо ня кажучы пра марксісцка-ленінскую тэорыю. Ён імкнецца паступіць у Інстытут замежных моваў і зьбіраецца, у дадатак да ангельскай, самастойна вывучаць нямецкую.

Што да чобатаў, крыніцы можна было даваць веры, а вось дысьлексія Освальда зьбіла з тропу і крыніцу і, самае галоўнае, — КДБ. І на шмат гадоў наперад.

Освальд любіў клясычную музыку і выдатна ў ёй разьбіраўся — дома была вялікая калекцыя кружэлак, якія ён мог слухаць гадзінамі, а калі канцэрт

перадавалі па радыё, ён лёгка ўгадваў кампазытара і твор.

Яго дзёньнік сапраўды поўны граматычных памылак.

Першая кніга па-расейску, якую ён атрымаў у падарунак пасьля прыезду ад сваёй перакладчыцы з маскоўскага Інтурысту — раман Дастаеўскага «Ідыёт». У дзёньніку ён напіша — «Ідэот». Але на чытаньні дысьлексія не адбіваецца.

Гэрбэрт Уэлс — гэты пісьменьнік прыходзіць яму на памяць, калі ён піша ў дзёньніку пра парадкі на заводзе (абавязковая фіззарадка, сходы) — рабочыя як здані з раманаў Гэрбэрта Ўэлса. Верагодна, асацыяцыя са сцэнаў будучыні ў раманах «Машына часу» ці «Першыя людзі на Месяцы». Эрнэст Гэмінгуэй — урыўкі яго апавяданьняў ён начытвае ў Менску на магнітафон.

Калі двух папярэдніх пісьменьнікаў «крыніца Таня» магла чытаць, дык наўрад ці яна і «Сьцяпан» разгортвалі антыўтопію Джорджа Орвэла «1984». Гэты раман Освальд прачытаў яшчэ да паездкі ў СССР.

У сваіх нататках «Калектыў — жыцьцё расейскага рабочага» ён саркастычны ў апісаньні савецкай літаратуры:

Гісторыі пра любоў вельмі рэдкія і звычайна складаюцца з эпізодаў кшталту «хлопец любіць — трактар — дзяўчыну», альбо як Іван павялічыў прадукцыйнасьць працы, каб спадабацца Наташы, брыгадзіру.

Няблага зразумеў Освальд і савецкую выдавецкую палітыку што да замежных аўтараў:

Некаторыя з гэтых аўтараў вельмі папулярныя і ў ЗША, але ня з тых самых прычынаў. Джэк Лондан пісаў, як мы лічым, прыгодніцкія гісторыі, а расейцы думаюць, што гэта адлюстроўвае сёньняшняе жыцьцё.

Эрнэст Гэмінгуэй напісаў «Стары і мора», глыбока кранальную гісторыю барацьбы чалавека з прыродай і морам, якую тут лічаць абвінавачаньнем капіталістычнага грамадзтва, хаця Гэмінгуэй, у адрозьненьне ад Джэка Лондана, ніколі ня быў сацыялістам.

У чалавека, які чытае дэтэктыўныя гісторыі замежных аўтараў, узьнікаюць вельмі дэпрэсіўныя адчуваньні, яго прыдушвае шэрасьць і сум жыцьця, якое там апісана.

Освальд згадвае раманы нямецкага празаіка Леанарда Франка, ангельскага Ўільяма Голдынга, клясыкаў амэрыканскай і ангельскай літаратураў. Хаця кола яго чытаньня ў Менску зусім іншае.

Калі дзьве студэнткі ін'язу, зь якімі Освальд пазнаёміўся на канцэрце ў філярмоніі, упершыню прыйшлі ў яго кватэру, каб паглядзець ангельскія кнігі, яны хвалявaліся — вось зараз пабачаць кнігі Гэмінгуэя, Фолкнэра, магчыма, нешта забароненае, рэдкае.

На паліцы стаялі творы Маркса і Леніна па-ангельску.

— І ты гэта чытаеш?!.

— Вельмі цікава, праўда?

— Мы ўсё гэта вывучалі па-расейску, навошта нам чытаць тое самае па-ангельску?

— Ну, я не чытаў, і мне вельмі цікава.

«Ідэот», магчыма, так і застаўся неадоленым — але тэарэтыкаў камунізму ён чытаў.*

У сваім дзёньніку Освальд ня згадвае перакладчыцу «Таню», але піша пра перакладчыцу Розу Кузьняцову, бляндынку, ня замужам, працавала ў менскім Інтурысьце і ня раз бывала ў гасьцях у амэрыканца дома.

Яе імя ён піша без двукосься. Можа, не здагадваецца, што некаторыя асобы зь ліку яго знаёмых маюць больш за адно імя. Ці проста ня ведае граматыкі і таму з усіх знакаў прыпынку карыстаецца толькі кропкай.

Але пакуль яе ставіць было рана.

*І ня толькі іх. У 1963-м ён складзе сваю ўласную тэорыю таго, што павінна прыйсьці на зьмену адначасна капіталізму, сацыялізму і камунізму, і назаве гэта «Атэнская сыстэма». У ёй гарантуецца прыватная маёмасьць (як пры капіталізьме), уводзіцца бясплатная абавязковая адукацыя (як пры сацыялізьме), касуюцца падаткі (як абяцала КПСС), адмяняецца расавая сэгрэгацыя (як абяцала Дэмакратычная партыя ЗША), не дапускалася нацыяналізацыя і манапалізацыя (як пры камунізьме і капіталізьме), забараняўся фашызм, нацыянігілізм і выраб зброі масавага зьнішчэньня, а прэсе гарантавалася свабода (як прапаноўваў акадэмік Сахараў), уся дэмакратыя мелася ажыцьцяўляцца на мясцовым узроўні без цэнтралізаванай дзяржавы (як вучыў Аляксандар Салжаніцын). Як для самавука, дык выйшла моцна — калі б гэтыя ідэі авалодалі масамі, дык грамадзянскай вайны не пазьбегнуць было б ні ў ЗША, ні ў СССР.



Чый Освальд?

Нікому ня рана, і ніколі ня позна, як папулярна тлумачыў шлюб адзін пэрсанаж савецкага кіно, і як усе мудрыя думкі, гэтую можна прыкласьці шмат да чаго. Напрыклад, забегчы наперад дэтэктыўнага сюжэту і адразу задаць пытаньне, вынесенае ў загаловак.

Сачэньне за Освальдам у Савецкім Саюзе мела на мэце высьветліць, ці працаваў ён на ЦРУ, а ў ЗША спрабавалі разабрацца, ці не зьяўляўся ён крэатурай КДБ.

Гэтае самае пытаньне задавала і маці Освальда Маргарыта. Пасьля ліста ад сына, дзе ён парываў усякія сувязі зь сям'ёй, яна зьвярнулася да свайго кангрэсмэна, затым у Дзярждэпартамэнт — чаму сын у СССР? Як імігрант ці выконвае нейкае заданьне амэрыканскага ўраду? Іншымі словамі — ці не агент ЦРУ?

Мэйлер уключыў у кнігу эпізод, які сьведчыць ня толькі пра настойлівасьць Маргарыты Освальд, але і пра амэрыканскую дэмакратыю.

21 студзеня 1961 году маці Освальда вырашыла паехаць у Вашынгтон. Дарога заняла тры дні і дзьве ночы, і адразу з тэлефона на вакзале яна набрала нумар Белага Дому і сказала што хоча гаварыць з прэзыдэнтам Кенэдзі. Было толькі 8 раніцы, апэратар адказаў, што праца пачынаецца а 9-й. Яна перазваніла а 9-й, ёй паведамілі, што Кенэдзі на нарадзе і прапанавалі запісаць паведамленьне для яго. Яна адмовілася і папрасіла сустрэчы зь дзяржсакратаром Раскам. Узамен ёй прапанавалі сустрэчу з Дэвісам Бостэрам, высокапастаўленым дыпляматам, які займаўся справамі СССР. У той самы дзень а 2-й гадзіне яе прынялі ў Белым Доме.

Яна задала галоўнае пытаньне — ці зьяўляецца яе сын амэрыканскім агентам? Калі так, яна хоча каб яго вярнулі, бо сама хворая і патрабуе дагляду. Калі ён перабежчык, што ж — ён мае на гэта права як асоба.

Сына, які ня быў дзяржаўным агентам, ёй вярнуць не змаглі, але выслухалі і нават не абвінавацілі яго ў здрадзе:

Місіз Освальд, мы хочам, каб вы ведалі, што мы таксама так лічым.

І гэта — пра перабежчыка ў разгар халоднай вайны.

ФБР Освальдам таксама зацікавілася. Але не тады, калі ён паехаў у Маскву і адмовіўся ад амэрыканскага пашпарта, а калі ён вырашыў вярнуцца.

Камісія Ўорэна. Матэрыялы

Сьледчая справа на Освальда была заведзеная ФБР 31 траўня 1962 году. Іміграцыйная служба была абавязаная паведаміць ФБР пра яго ўезд

у краіну. Сьледзтва павінна было высьветліць, ці Освальд быў завэрбаваны савецкай разьведслужбай.

Падчас нашай тэлефоннай гутаркі Мэйлер скажа:

Яны мяне ў прынцыпе пераканалі, што КДБ не спрабаваў скарыстаць Освальда ў якасьці агента. Яны сапраўды былі вельмі разумныя, а іхныя аргумэнты доказныя. Яны казалі: паслухай, Освальд мог працаваць на нас у Японіі — ён мог супрацоўнічаць кароткі час у Японіі з камуністамі. Аднак ён траціць сваю каштоўнасьць, калі прыяжджае да нас у Маскву і заяўляе, што ён пакідае Амэрыку. Цяпер гэта не каштоўны агент, а дадатковая адказнасьць.

Чаго вартае тое, што ён спрабуе адмовіцца ад амэрыканскага грамадзянства ў амбасадзе і там паводзіць сябе вельмі вельмі гучна. Яны згадалі той факт, што ў іх былі жучкі для падслухоўваньня ў сьценах у амбасадзе. Гэта сьмеху варта. Ён гаворыць вельмі гучна, бо, верагодна, хоча, каб жучкі гэта запісалі. Калі б ён і меў нейкую карысьць для іх, усё было разбурана ягоным прыездам у Расею.

Праз год пасьля звароту Освальда па савецкае грамадзянства з такой самай заявай публічна выступілі яшчэ два амэрыканцы. У верасьні 1960-га шыфравальшчыкі Нацыянальнага агенцтва бясьпекі ЗША Ўільям Мартын і Бэрнан Мітчэл на прэсавай канфэрэнцыі ў Маскве папрасілі палітычнага прытулку і савецкага грамадзянства. У якасьці прычыны яны назвалі абурэньне мэтадамі амэ-

рыканскай разьведкі — сакрэтнымі палётамі над тэрыторыяй СССР, перахопам інфармацыі.

Яны таксама крытыкавалі ўнутраную і зьнешнюю палітыку ЗША, захапляліся Савецкім Саюзам і асабліва правамі жанчын (адзін зь іх ажаніўся ўжо праз чатыры месяцы пасьля прыезду). У амэрыканскіх газэтах пра іх пісалі пераважна як пра асобаў з сэксуальнымі адхіленьнямі.

Шкода амэрыканскай бясьпецы ад гэтых перабежчыкаў была ацэненая як вельмі вялікая.*

Мэйлер паспрабаваў спрачацца са сваімі суразмоўцамі з КДБ: маўляў, Освальд шмат што ведаў пра вайсковыя справы.

Яны рассьмяяліся і сказалі, што ў іх была вельмі добрая разьведвальная служба ў Японіі ў той час, у 1958-59, 1960-61 гадах. Нам не патрэбная была яго інфармацыя, якая да таго ж састарэла. Мы маглі распытаць яго ўскосна, праз пасярэднікаў. Але мы ніколі не распытвалі яго напрасткі, не выклікалі ў КДБ. Мы лічылі, што ня мае сэнсу яго распытваць.

Мэйлер прывёў яшчэ адзін аргумэнт КДБ, які падаўся яму вартым даверу:

Яны казалі: а што, калі ён шчыры? Мы тады хацелі верыць, што нашая сыстэма лепшая за амэрыканскую, і было б трагедыяй, калі б мы адаслалі гэтага хлопца назад. І ён сапраўды быў шчырым.

Такім чынам, пазыцыя КДБ будавалася на трох

*Абодва потым расчараваліся і спрабавалі вярнуцца ў ЗША, але былі пазбаўленыя грамадзянства. Першы памёр у Мэксыцы ў 1987-м, другі у Расеі ў 2001-м.

кітах: першы — яны ведаюць, што ён ня іх агент, другі — магчыма, ён сапраўды той, за каго сябе выдае, і трэці — ня выключана, што ён з ЦРУ.

Яны насамрэч думалі, што гэта нейкая дурацкая правакацыя ЦРУ, што ЦРУ пасылала пробны шар, каб паглядзець, як КДБ будзе рэагаваць на гэты нечаканы раздражняльнік. Яны вырашылі нічога адкрыта зь ім не рабіць, не праводзіць допыту.

З гэтага, сказаў Мэйлер, вынікала толькі адно — за Освальдам трэба было сачыць.

Яны сказалі, што хацелі трымаць яго пад наглядам, каб сачыць, што ён зьбіраецца рабіць. Але яны выключылі магчымасьць прамога кантакту з Освальдам, бо ЦРУ стала б гэта вядома, калі б, як меркавалася, Освальд інфармаваў ЦРУ пра мэтады дзейнасьці КДБ.

І яны хацелі захаваць свае мэтады ў тайне. Гэта мела сэнс, калі яны адстойвалі свой пункт гледжаньня. І сапраўды, калі паглядзець у матэрыялы справы, дык мы пабачылі, што там у асноўным спробы высьветліць, ці ён сапраўды быў тым, за каго сябе падаваў.

Калі кніга выйшла, Мэйлер патлумачыў лёгіку спэцслужбаў дзьвюх краінаў старым анэкдотам:

— Стукні мяне, — сказаў мазахіст.
— Ня буду, — сказаў садыст.

І абодва задаволеныя.



Песьня для Хрушчова

На халоднай вайне перабягалі нашмат часьцей з савецкага боку.

Невядома, ці пра перабежчыка Освальда дакладалі прэзыдэнту ЗША, а вось пра люстраны выпадак, які адбыўся на некалькі месяцаў раней за сустрэчу Маргарыты Освальд у Белым Доме, кіраўніку СССР дакладалі.

Увосень 1960-га савецкая дэлегацыя прыплыла ў Амэрыку на сэсію ААН. Мікіта Хрушчоў так узгадваў пра тое, што здарылася, калі цеплаход «Балтыка» прышвартаваўся да пірсу на ўскрайку порту (выбіралі які дзешавейшы):

Калі мы прыбылі ў Нью Ёрк, мне даклалі аб надзвычайным здарэньні. Адзін матрос пакінуў карабель і папрасіў палітычнага прытулку. Людзі, якія паведамілі мне навіну, страшэнна хваляваліся. Я іх супакоіў і папрасіў не надаваць справе вялікага значэньня: «Ну й што ж? Сышоў і сышоў. Няхай паспрабуе капіталіс-

тычных хлябоў, пачым яны ў Нью Ёрку і як на смак». Я, зразумела, ведаў, што мяне неўзабаве сустрэнуць журналісты. І сапраўды, пры першай жа сустрэчы мне задалі пытаньне. Адказваю: «Мне дакладалі пра гэта. Шкадую аб тым, што адбылося. Ён чалавек недасьведчаны, ня мае асаблівай працоўнай кваліфікацыі, і я яму спачуваю. Вельмі цяжка будзе яму прыстасоўвацца да амэрыканскіх умоваў жыцьця, бо ён нічога за душой ня мае. Глупства зрабіў, не падумаўшы. Калі б ён мне сказаў, што хоча застацца, я б аказаў яму якую-небудзь дапамогу на першы час». Увесь накал, які быў у журналістаў, адразу зьнік. Так правалілася сэнсацыя, і журналісты не змаглі зарабіць на гэтай справе.

Лішне казаць, што зрабілі б з матросам, калі б ён заікнуўся каму-небудзь на караблі пра жаданьне застацца ў ЗША. Праўда, калі б ён сказаў пра гэта самому Хрушчову, дык патрапіў бы ня ў лягер, а, хутчэй, у псыхіятрычную бальніцу. А вось людзям, якія страшэнна хваляваліся, калі дакладалі Хрушчову пра надзвычайнае здарэньне, баяцца было чаго — іх кар'еры разам з пагонамі і выслугай гадоў маглі пайсьці кату пад хвост. Анкеты і характарыстыкі ў каманды ўрадавага рэйсу правяралі і зацьвярджалі дзясяткі пільных вачэй, а вось жа прагледзелі.

Віктару Яанімэтсу было 9 гадоў, калі яго краіну ў 1940-м акупавалі савецкія войскі. Ён даўно хацеў зьбегчы з СССР, але, у адрозьненьне ад Освальда, чакаў тры гады, пакуль яго карабель не прышвартаваўся да амэрыканскага прычалу. Выхад у горад дазвалялі толькі групамі, прызначаўся старэйшы, і свой шанец Яанімэтс злавіў у перапоўненым

танным універмагу на Мангэтане. Калі група накіравалася ўжо да выхаду, ён крыкнуў, што яшчэ купіць брыльянціну, праштурхаўся праз натоўп, кінуўся да другога выхаду, выскачыў на вуліцу і пабег што было сіл.

Выпадковы суразмоўца ў бары дапамог знайсьці эстонскі клюб, і ўвечары таго самага дня служба іміграцыі ўзяла яго пад сваю апеку.

Калі савецкія дыпляматы паспрабавалі выратаваць небараку, які ня ведаў, што нарабіў, яны хутка пераканаліся, што Яанімэтс дакладна ведаў і што, і чаму:

На маёй Радзіме Хрушчова ненавідзяць. Мы ўсе пад яго жалезным кулаком. Нідзе няма свабоды. Мы яго рабы. Гэта другі Гітлер.

Яанімэтс таксама заявіў, што калі б магла, дык уцякла б палова каманды. Ньюёрскія газэты напісалі, што з гэтай высновай уцекача відавочна пагадзіліся на «Балтыцы»: усе звальненьні на бераг былі адмененыя, на палубах стаў дзяжурыць узброены патруль.

Увосень 1960-га па радыё ўпершыню прагучаў незвычайны твор — музычнае пасланьне кіраўніку СССР ад перабежчыка. Запіс адкрываў Яанімэтс, а затым працягваў вядомы амэрыканскі сьпявак і прадусар Дон Міган:

Адкрыты ліст Хрушчову

Мяне завуць Віктар Яанімэтс, і я ўцёк з расейскага карабля. У маім новым сьвеце я знайшоў спакой і надзею. Я маю ліст для Мікіты Хрушчова, які прачытае мой амэрыканскі сябар.

Далей на тле музыкі пачынаўся рэчытатыў Дона Мігана:

Дарагі містэр Хрушчоў, я цяпер жыву ў згодзе, у згодзе з сабой, у згодзе са сьветам, у згодзе з маім Стваральнікам. Вы калі-небудзь на хвіліну задумваліся, што азначае слова «згода» ці «мір», містэр Хрушчоў? Гэта цудоўнае слова з цудоўным сэнсам, але яго можна напісаць двума рознымі спосабамі.

Адзін — той, якім прымушалі шмат гадоў пісаць мяне.

Яанімэтс ужывае ангельскае слова «PEACE», якое таксама азначае «мір», і ў песьні расшыфроўваецца кожная літара. «P» азначае «persecution» — перасьлед, «E» — «evil» — зло, «A» — «atheism» — атэізм, «C»- «confusion», «conflict» — канфлікт, непаразуменьне, «E» — «earth» — Зямля.

Першая частка песьні гучыць так:

«P» — перасьледаваць, зьнішчыць любога, любую рэч ці народ, якія стаяць на шляху камунізму. «E» — зло, якое прынёс камунізм, і янавісьць ёсьць яго рухавіком. «A» — атэізм, там, дзе камунізм, няма Бога, няма законаў маралі, няма надзеі. «C»— канфлікт і непаразуменьне паміж людзьмі, «E» — Зямля, якую камунізм мяркуе заваяваць і ўсталяваць паўсюль свой перасьлед, зло, атэізм і канфлікты.

Затым Віктар Яанімэтс і Дон Міган прапануюць іншую трактоўку.

Але гэта не сапраўдны сэнс згоды, містэр Хрушчоў. Я знайшоў новы цудоўны сэнс. Мільёны

і мільёны людзей ва ўсім сьвеце чытаюць яго менавіта так.

«Р»— «Prayer» — малітва. Я магу ўкленчыць і маліцца Стваральніку ў любым месцы і ў любы час, калі пажадаю, гэтаксама як іншыя мільёны людзей. «Е» — Equality — Раўнапраўе. Усе людзі створаныя роўнымі. Яны атрымалі ад Стваральніка пэўныя неад'емныя правы. «А» — «Ashes to Ashes» — попел у попел, пыл у пыл. З пылу чалавек быў створаны, і ў пыл ператворыцца, і ён можа зрабіць шмат добрага за гэты час. «С» — «Christmas» — Раство. Урок Раства найвялікшы і самы просты з усіх: мір на Зямлі для ўсіх людзей добрай волі. «Е» — «Eternity» — Вечнасьць, дзе душа чалавека будзе заўсёды і назаўсёды. Зямля як пясчынка на марскім беразе. Вечнасьць доўжыцца і доўжыцца і доўжыцца як цудоўны Сусьвет вялікага Стваральніка.

Песьня сканчаецца зваротам:

Падумайце аб гэтым, містэр Хрушчоў, аб сапраўдным сэнсе згоды і міру. Падумайце аб гэтым.

Хрушчоў падумаў — і гэта заўважна ў яго мэмуарах, якія ён мусіў пісаць пад хатнім арыштам і потым тайна перапраўляць на Захад, абы толькі яны не патрапілі ў рукі яго таварышаў па партыі.

Па сьлядах Яанімэтса пайшлі і члены сям'і Хрушчова: сын і ўнучка перабраліся ў Амэрыку, там жывуць праўнукі. Яшчэ раней туды ж уцякла і дачка Сталіна.

Яанімэтс пражыў Освальда на чвэрць стагодзьдзя. Ён атрымаў мноства прапановаў працы

(кваліфікаваны матарыст), але спачатку аб'ездзіў Амэрыку, выступаючы з аповедам пра жыццьцё ў акупаванай Эстоніі і савецкія парадкі.

У сьнежні 1960-га часопіс «Тайм» апублікаваў нататку пад загалоўкам: «Мікіта ня змог, а перабежчык наведвае Дыснэйлэнд». Яанімэтс пасьля канфэрэнцыі ў Каліфорніі паехаў фатаграфавацца з героямі легендарнага мультфільму. У 1959-м Хрушчоў быў у Сан Францыска і адразу пасьля ад'езду заявіў, што яму не далі магчымасьці бліжэй пазнаёміцца з амэрыканскім народам і адведаць папулярны забаўляльны парк. Насамрэч парк са сьпісу выключыла савецкая служба аховы яшчэ за месяц да візыту.

Нават на волі кіраўнік краіны, куды перабег Освальд, ня быў вольны.

І няма фатаграфіі «Хрушчоў і Мікі Маўс», пад якой, напэўна, журналісты не ўстрымаліся б і зрабілі прыпіску: «Хрушчоў справа». Ці зьлева.

Свабода...



Хэлоў, карова са штату Аёва

Калі Освальд прыехаў у Менск, у Беларусі было чатыры мільёны кароў.

Так сьцьвярджае тагачасны энцыкляпэдычны слоўнік — на двух жыхароў была адна карова. Слоўнік яшчэ шмат што сьцьвярджаў: цягам дзесяцігодзьдзя СССР мусіў перагнаць Амэрыку ў вытворчасьці прадукцыі на душу насельніцтва, якое, у сваю чаргу, мусіла спалучаць духоўнае багацьце, маральную чысьціню і фізычную дасканаласьць. На старонках газэт зьявіліся загалоўкі:

«Трымайся, карова са штату Аёва!»

Так выглядала гістарычная заканамернасьць паводле савецкай энцыкляпэдыі.

Магчыма, з пункту гледжаньня марксіста, якім лічыў сябе Освальд, і яго першае лета ў Менску было проста гістарычнай заканамернасьцю. З рэалістычнага пункту гледжаньня, верагодна, больш падыходзіць жанр, у якім быў напісаны энцыкляпэдычны слоўнік — казкі.

Наступныя падзеі настолькі зьменяць оптыку, што ўжо мала хто будзе ў стане ацаніць неверагоднасьць таго, што адбылося ўвосень 1959-га.

19-гадовы дэмабілізаваны салдат з амэрыканскай правінцыі, з простай сям'і, бяз грошай, адукацыі і прафэсіі, таемна ад усіх блізкіх раптам прыяжджае ў Маскву, робіць зварот па грамадзянства, здае свой пашпарт у амбасаду, спрабуе скончыць самагубствам, у няпэўным чаканьні бавіць халодныя зімовыя дні і ночы ў самоце гатэльнага нумару і, нарэшце, атрымлівае падарунак ад улады рабочых і сялян: накіраваньне ў Менск, працу, асобную кватэру ў цэнтры і падвойную зарплату.

Да лета 1960-га, здаецца, асноўная драматычная падзея жыцьця засталася ззаду і забылася, усё ўсталявалася, вызначылася, уляглося.

Рапарты КДБ становяцца нуднымі, як кілямэтры відэастужкі з камэры тэхнічнага назіраньня: выйшаў з дому, пайшоў на прыпынак, сеў у тралейбус, выйшаў, купіў газэту, зайшоў у краму, нічога не купіў, выйшаў, сеў у тралейбус...

Спыняецца нават прыватны дзёньнік.

Потым, быццам спахапіўшыся, каб запоўніць каляндар, Освальд усё ж робіць некалькі кароткіх запісаў.

Дзёньнік ЛГО
Чэрвень — ліпень 1960

Летнія месяцы зялёнага хараства, вельмі глыбокага сасновага лесу. Я баўлю выходныя ў ваколіцах Менску зь Зігерамі, у якіх ёсьць «Масквіч». Альфрэд заўсёды ходзіць з Анітай, у Леаноры, здаецца, няма сталага кавалера, але шмат хто ёю захапляецца. У яе цудоўная гішпанская

постаць, даўгія чорныя валасы, як у Аніты. Я не зьвяртаю на яе шмат увагі, яна для мяне застарая. Здаецца, ёй не падабаецца адсутнасьць увагі з майго боку. Яна вельмі заведзеная.

Улетку Освальд уступае на тэрыторыю, на якую раней не зважаў і нават дэкляраваў сваё да яе абыякавае стаўленьне: якасьць жыцьця. Асобная кватэра, грошы толькі за тое, што ён амэрыканец — гэтага аказваецца недастаткова.

І Освальд піша ўжо ня проста пра садавіну — а пра яе адсутнасьць большую частку году.

Нават пасьля армейскай кухні ежа ў сталічным кафэ самаабслугоўваньня на плошчы Перамогі выклікае нараканьні.

Дзёньнік ЛГО. Працяг

Я прызвычаіўся да маленькага кафэ, куды хаджу вячэраць. Ежа звычайна нясмачная, і ў любым кафэ ў горадзе аднолькавае мэню. Ежа танная, і мне насамрэч усё роўна пасьля трох гадоў службы ў амэрыканскай марской пяхоце.

Освальд быццам спрабуе пераканаць сам сябе, што яму ўсё роўна, і нават знайсьці плюсы — танна. Але адначасна робіць яшчэ больш важную заўвагу — такая самая ежа, аднолькавы набор паўсюль.

Трэба сапраўды быць марксістам, каб толькі праз год пасьля прыезду ў краіну сваёй мары заўважыць яе самую адметную рысу.

Няма выбару.

Нават горш — шчасьця няма.

Адразу пасьля прыезду ў Маскву ўвосень 1959-га Освальд пісаў ужо брату, што не разьлічвае на нейкія выгоды ў СССР, бо «шчасьце не асабістая рэч,

яго не складаюць маленькі дом, браць і атрымліваць.» І ўдакладняў:

Шчасьце ў тым, каб браць удзел у барацьбе, дзе няма мяжы паміж асабістым сьветам і сьветам увогуле. Я ніколі не лічыў, што я атрымаю больш матэрыяльных перавагаў на гэтым этапе разьвіцьця Савецкага Саюзу, чым я мог бы мець у ЗША.

За дзевяць месяцаў у Менску Освальд істотна пераглядае свае погляды на шчасьце.

Дзёньнік ЛГО
Жнівень — верасень 1960

Па меры таго, як паляпшаецца мая расейская мова, я ўсё больш усьведамляю, у якім грамадзтве я жыву. Агульная фіззарадка, абавязковыя сходы пасьля працы, звычайна палітінфармацыі. Абавязковае наведваньне лекцыяў і адпраўка цэлага цэху (апроч мяне) у калгас на бульбу ў нядзелю. «Патрыятычны доўг» збору ўраджаю. Гэта вялікі галаўны боль, на думку рабочых (ня ўголас). Яны таксама ня маюць вялікага энтузіязму і да іншых «калектыўных» абавязкаў, натуральнае пачуцьцё.

А цікава было б прачытаць запіс Освальда пра ўражаньні ад паездкі на бульбу.

А потым рапарт КДБ.

І потым тлумачэньне Мэйлера амэрыканскім чытачам, што гэта такое — прымусовае выпраўленьне інжынэраў і рабочых аднаго з флягманаў савецкага навукова-тэхнічнага прагрэсу на калгасныя палеткі, дзе ўзровень мэханізацыі вымяраецца

вёдрамі і мяхамі, і як гэта стасуецца са спадарожнікам і вадароднай бомбай.

І напэўна нехта ўсклікнуў бы — і мы падчас халоднай вайны патрацілі мільярды супраць такога працаўніка?..

І адказ — так. Бо іначай самі б езьдзілі рваць кукурузу, і за надоі змагаліся б, і пасылалі б працоўныя рапарты ў Белы дом.*

Шкада ўсё ж, што не паслалі амэрыканца на бульбу.

*Штатаўская карова спалохалася, што можа патрапіць на калгасную фэрму, і за наступныя пяцьдзясят гадоў павялічыла надоі з шасьці зь лішкам да дзевяці зь лішкам тысяч кіло, а невыязная савецкая — з амаль трох да чатырох. 30.12.2006 Белта разаслала сваім падпісчыкам навіну: «Упершыню ў гісторыі Беларусі сярэдні надой малака ад каровы ў сельгасарганізацыях перавысіў 4 тыс. кг. Аб гэтым гаворыцца ў тэлеграме, накіраванай прэзыдэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку Мінсельгасхарчам».



Найважнейшае з мастацтваў

У дакумэнтах КДБ зафіксаваныя фільмы, якія Освальд глядзеў у верасьні 1960-га:

4 верасьня: «Вецер» у кінатэатры «Летні»

6 верасьня: «Бабета ідзе на вайну» ў кінатэатры «Мір»

7 верасьня: «Партызанская іскра» ў кінатэатры «Перамога»

8 верасьня: «Бабета ідзе на вайну» ў кінатэатры «Мір»

9 верасьня: «Камандзір атраду» ў кінатэатры «Летні»

Освальд хадзіў на позьнія сэансы — усе пачыналіся пасьля 8-й вечара, а французская «Бабета» ўвогуле а 10-й.

4 верасьня — нядзеля (пасьля кіно Освальд яшчэ схадзіў на танцы ў Дом афіцэраў). Затым — аўторак, серада, чацьвер, пятніца. На працягу тыдня французскую стужку Освальд глядзіць двойчы. Галоўную ролю ў камэдыі грала 25-гадовая Брыжыт Бардо, якая адразу завалодала сэрцамі ня толькі

мужчынскай часткі заляў, але й жаночай. Ня толькі фрызура «бабета» імгненна стала моднай, усё а-ля Брыжыт Бардо — лёгкасьць, манеры, усьмешка і сьмех сталі ўзорам для дзяўчат. Менск, як Освальд хутка пераканаецца, ня быў выключэньнем.

У кожным кінатэатры наведнікаў сустракала цытата Леніна: «З усіх мастацтваў для нас найважнейшым зьяўляецца кіно!».*

У кіно Освальд пачаў хадзіць адразу пасьля прыезду ў Менск — і адзін, і зь дзяўчатамі, і час бавіць, і мову вучыць. Перад сэансам круцілі чорна-белыя выпускі кіначасопісу «Савецкая Беларусь».

Там паказвалі перадавікоў семігодкі, якую тыя абяцалі выканаць за пяць гадоў, кадры зь перадавога саўгасу, асобны сюжэт быў прысьвечаны менскаму фэстывалю кінамастацтва (але давалі ня ўрыўкі зь фільмаў, а прэзыдыюм, які апэратары маглі здымаць з заплюшчанымі вачыма), расказвалі пра модны капрон, на экране бегалі футбалісты (менская «Беларусь» выйграла ў кіеўскага «Дынама»). Освальд мог пабачыць Кандрата Крапіву, які разразаў стужку на адкрыцьці музэя Янкі Купалы на беразе Сьвіслачы, новы помнік партызанам...

Адзін з выпускаў адкрываўся сюжэтам пра юбілей, як бы сёньня сказалі, гендэрнага сьвята. Раз на год дзяржава лічыла патрэбным афіцыйна заявіць, што жанчыны таксама людзі. На фоне бравурнай музыкі закадравы голас абвяшчаў:

---

*У гэтым сказе галоўнае ня дзейнік «кіно», не выказьнік «зьяўляецца найважнейшым», нават не прадказаньне палітычнай сілы ўзьдзеяньня кіно і тэлебачаньня на масавую сьвядомасьць, а брутальнае, як удар чобатам паміж ног, дапаўненьне «для нас», якое азначала акалічнасьць — дзяржаўную манаполію.

У Менску адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 50-годзьдзю міжнароднага жаночага дня.

Сход адкрыла дэпутат Вярхоўнага Савету БССР Мацюшка. Са слаўнай гадавінай беларускіх працаўніц цёпла віталі сакратар Цэнтральнага камітэту Камуністычнай партыі Беларусі Шавура, вядомы сталявар аўтазаводу Барашкін, доктар біялягічных навук Чаркасава і другія таварышы.

Камэра дае панараму прэзыдыюму, у якім пераважаюць мужчыны, і залі, дзе жанчын больш, але на першым пляне зусім не яны. Буйны плян на залю даецца двойчы, і абодва разы з адной кропкі, таму ў кадры заўсёды цалкам відаць толькі адну жанчыну гадоў трыццаці, з зачасанымі назад хвалістымі валасамі і бліскучымі завушніцамі, у чорнай сукенцы з кароткім рукавом, зь неглыбокім дэкальтэ, якое завяршае вялікая круглая брошка. Вакол яе старэйшыя таварышы — у больш строгіх сукенках з адкладнымі белымі каўнярамі і шалямі.

Жанчына з завушніцамі ведае, што яе здымаюць, і зь нечалавечай засяроджанасьцю ні разу не міргае, напружана гледзячы на сцэну.

Кадар, па ўсіх законах мантажнага кіно, перабівае цягнік. Ну, не зусім цягнік — пад бой барабанаў, са сьцягамі над галавой у праход паміж крэсламі імкліва ўрываецца і пераразае экран атрад дзяцей.

Павіншаваць жанчын прыйшлі піянэры. Яны горача віталі слаўных працаўніц, барацьбітоў за мір і шчасьце, — кажа дыктар.

Канец сюжэту — на ўсё пра ўсё 40 сэкундаў.

Аўтары клясычна выканалі задачу: тут і жанчы-

на-дэпутат, і сакратар кампартыі, перадавік цяжкай індустрыі і жанчына-прафэсар, і, канечне, дзеці — наша будучыня.

Зь піянэрамі ўсё ясна — закінулі букеты на стол прэзыдыюму, памахалі ў паветры сьцяжкамі і пайшлі, як і прысягалі, далей «горача любіць сваю Радзіму, жыць, вучыцца і бароцца, як завяшчаў вялікі Ленін, як вучыць Камуністычная партыя».

І з кіношнікамі таксама ясна — пайшлі надалей ствараць летапіс.

І з Освальдам ясна, але ня ўсё — у дзёньніку пра кіначасопіс няма ніводнага слова.

Можа, не зразумеў — дыктарскі тэкст быў беларускі.

Ці недаацаніў, прыняўшы клясыку жанру за халтуру.

А можа проста таму, што не кіно было для Освальда найважнейшым з мастацтваў.

Ён любіў клясычную музыку, і пасьля адкрыцьця сэзону ў кастрычніку стаў заўзятым наведнікам опэры і філярмоніі.

Да асабістай сустрэчы з членам прэзыдыюму жаночага сходу доктарам біялягічных навук Чаркасавай, якая верасень 1960-га праводзіла ў Нью Ёрку, заставалася паўгода.

Дзень той сустрэчы зьменіць яго жыцьцё, як палёт матылька мяняецца моцным парывам ветру.



«Аооаох!» — і міма

Сваю самую вядомую зброю, карабін Манліхер-Каркан Освальд набыў увосень 1962-га ў Тэхасе на замову праз пошту. Такія лібэральныя законы аб зброі, сьцьвярджаў шмат хто, і прывялі да амэрыканскай трагедыі.

Насамрэч гэтаксама можна было купіць зброю і ў Менску.

Ва ўсіх газэтах друкавалася рэкляма тульскай крамы «Тавары-Поштай» — правобразу пазьнейшых Інтэрнэт-крамаў — якая на выбар прапаноўвала «дробавыя, двухствольныя, курковыя паляўнічыя стрэльбы з ад'ёмнымі ствалами 16-га калібру для стральбы чорным і бяздымным порахам, папяровымі і мэталічнымі гільзамі» па 456 рублёў за звычайную стрэльбу, 624 — за арнамэнтна-чаканную, а за 848 рублёў можна было замовіць адмысловую, ручной працы, зброю.

Але Освальд на пошту не пайшоў — у жніўні 1960-га ён купіў тульскую аднаствольную стрэльбу

ў менскай краме «Рыбалоў-паляўнічы», далучыўся да заводзкага паляўнічага клюбу і з новымі калегамі выправіўся на зайца.

Рапарт вонкавага назіраньня КДБ
10.09.60
Ад 13:00 да 15:20

У 14:30 Ліхі выйшаў з працы і хутка пайшоў дадому.

У 14:55 выйшаў з дому з паляўнічай стрэльбай у чахле і сумкай з прадуктамі і прыйшоў да прахадной радыёзаводу. Там Ліхі падышоў да групы з 7 мужчын, таксама са стрэльбамі, і ўступіў у размову. Праз хвілін 13 Ліхі й іншыя селі ў машыну БО 18-89 і ў 15:20 выехалі з гораду па Старажоўскай вуліцы на Даўгінаўскі тракт.

Паводле дамоўленасьці з начальнікам аддзелу назіраньне за Ліхім у гэты момант спынена да 17 верасьня 1960 году.

КДБ ведаў, што Освальд набыў стрэльбу і зьбіраўся на паляваньне. Хто з паляўнічых сачыў за ім, невядома — рапарту Мэйлеру не далі. Затое ён запісаў успамін Леаніда Цагойкі, арганізатара і ўдзельніка гэтага паляваньня. Яны ішлі адзін за адным, Освальд са стрэльбай наперавес — перадапошні, за ім Цагойка, калі заяц выскачыў літаральна з-пад ног.

Мэйлер піша, што Освальд крыкнуў: «Аооаох!» і пальнуў у паветра.

— Божа, Освальд, ты мяне застрэліш з гэтага ружжа! — ахнуў Цагойка.

— Заяц напалохаў мяне, — патлумачыў сваю рэакцыю амэрыканец.

Пазьней ён страляў яшчэ раз і зноў прамазаў.*

Справаздача з паляваньня зьбянтэжыла КДБ: няўжо былы марскі пехацінец ня ўмее абыходзіцца са зброяй, мажа па мішэні? Маскіроўка агента, які хавае свой досьвед?.. Проста не пашанцавала ў той дзень?..

Мяркуючы са стылю рапартаў КДБ, там наўрад ці адлюстраванае рэха спалоханага выкрыку няўдалага паляўнічага пасярод беларускага поля ўвосень 1960-га.

— Аооаох!..

Зусім няблага, хаця, канечне, увесь набор эмацыйных выразаў, якія ўжываюць паляўнічыя ў падобных выпадках, больш багаты і разнастайны.

Станіслаў Шушкевіч вучыў Освальда размоўным выразам — невядома, праўда, да якой ступені. Але на заводзе любы рабочы мог навучыць амэрыканца асновам прафэсійнай лексыкі.

Былы мянчук Валеры Лебедзеў, які працаваў у політэхнічным інстытуце і ведаў Паўла Галавачова, узгадваў, як той прыводзіў Освальда на рэпэтыцыі інстытуцкага джаз-аркестру. Галавачоў загадваў радыёвузлом і, калі ламаліся мікрафоны ці ўзмацняльнікі, што здаралася часта, Освальд камэнтаваў.

---

*Раньняй вясной 1993 году гэтае паляваньне было паўторана: разам з Цагойкам і некаторымі іншымі яго ўдзельнікамі мы са здымачнай групай амэрыканскага грамадзкага тэлебачаньня выехалі ў паляўнічы домік у Менскі раён, каб адтуль выйсьці ў поле і прайсьці маршрутам 33-годовай даўніны. (Домік уяўляў сабой трохпавярховую даміну зь більярднай, саўнай, пакоямі для гасьцей). Зіма была сьнежная, і ў фільме паляўнічыя брыдуць па калена ў сумётах, чорным ланцужком на белым тле. Цагойка паказваў, як Освальд нёс стрэльбу і як зь пярэпалаху пальнуў у паветра. Агульны тон успамінаў быў крыху зьняважлівы.

Гучала, як піша Лебедзеў — «не перадаць», але ўсё ж перадаў:

Плохо советска рэйдио. Х... текник. П... твой юсилител ор дивайс-дайнемикс. Ё... твоя мат ваша лайф!

Освальд хадзіў на паляваньне яшчэ раз, нічога не ўпаляваў. Апроч трапнасьці стральбы, КДБ цікавілі яшчэ два пытаньні — ці браў ён з сабой фотаапарат і ці адставаў ад групы.

Усе тры адказы аказаліся адмоўнымі.

Матылёк не выклікаў падазрэньня, і гэта выклікала падазрэньне.

Сачэньне працягвалася.



Мэйлер і падзякі

Найлепшыя амэрыканскія дакумэнтальныя дасьледаваньні — біяграфіі, мэмуары, сацыяльныя нарысы, гістарычныя эсэ 2-й паловы XX стагодзьдзя, напісаныя літаратарамі, уражваюць аб'ёмам карпатлівай і добрасумленнай чарнавой працы і акадэмічным стандартам дакладнасьці.

У «Гісторыі Освальда» на 800 старонак тэксту прыпадае 695 спасылак на дакумэнтальныя крыніцы — публікацыі, кнігі і матэрыялы Камісіі Ўорэна з указаньнем больш чым тысячы старонак — крыніц цытатаў, фактаў, меркаваньняў. Гэта — без уліку копіяў дакумэнтаў КДБ зь менскай справы Освальда.

У разьдзеле «Падзякі» напрыканцы кнігі Мэйлер згадвае больш за сто прозьвішчаў людзей, якія так ці іначай дапамаглі ў стварэньні кнігі — ад жонкі Освальда Марыны, менскіх перакладчыкаў да амэрыканскіх дасьледнікаў і пісьменьнікаў.

У асобную групу аб'яднаныя людзі, якія ведалі Освальда ў яго «савецкі пэрыяд» і пагадзіліся

даць інтэрвію для кнігі — 44 прозьвішчы асобаў, бальшыня зь якіх жыла ў Менску падчас прыезду Мэйлера. Вось як яны пададзеныя ў кнізе:

Роза Агафонава, Люба Аксёнава, Галіна і Юры Бялянкіны, Муся Берлава, Канстанцін Бандарын, Валянцін Бараўцоў, Вольга Дмоўская, Леанід Гельфант, Эла Герман, Аляксандра Раманава, Павел Галавачоў, Людміла і Міхаіл Кузьмічы, Надзея і Дзяменці Макнавец, Галіна Макоўская, Юры і Лідзія Мержынскія, Валянцін Міхайлаў, Алег Нічыпарэнка, Стэліна Пажалуістэ, Аляксандар Піскалёў, Іна Пісенка, Галіна Пракапчук, Макс Прахорчык, Паліна і Валянціна Прусаковы, Яніна Сабела, Тамара Санкоўская, Ларыса Севасьцянава, Альбіна Шалякіна, Рыма Шыракова, Анатоль Шпанко, Станіслаў Шушкевіч, Аляксандар Сімчэнка, Соня Скопа, Міхаіл Смольскі, Натальля Цітавец, Леанід Цагойка, Раіса Ведзянеева, Інэса Яхель, Раіса Жынкевіч, Аляксандра Зігер.

У гэтым сьпісе няма двух чалавек, якія блізка ведалі Освальда. Адзін — інжынэр радыёзаводу Аляксандар Зігер, рэпатрыянт з Аргентыны, які гасьцінна прыняў Освальда ў сваю сям'ю і стаў першым, хто параіў яму вярнуцца ў ЗША. На пачатку 90-х Зігер зьехаў зь Менску назад у Аргентыну і памёр там у 1992 годзе.

Другі — чалавек, якога дасьледнікі і журналісты часам называюць «самым раньнім і блізкім сябрам» Освальда, Эрнст Цітавец застаўся ў Менску і нават сустракаўся з Мэйлерам і яго памочнікамі.

Сем разоў.

Але падзякі ў кнізе яму няма.



Мэйлер і Цітавец

Студэнт мэдычнага інстытуту Эрнст Цітавец ці Эрык, як яго ўсе звалі, пазнаёміўся з Освальдам празь сям'ю Зігераў. Яго школьная знаёмая працавала на пошце і дапамагала Зігерам у атрыманьні пасылак з Буэнас-Айрэсу.

У інтэрвію праз паўстагодзьдзя Цітавец так узгадвае знаёмства:

Неяк мне знаёмыя сказалі, што ў нашым тады яшчэ маленькім горадзе Менску, дзе не было з кім пагаварыць па-ангельску, зьявіўся амэрыканец. Я ўгаварыў пазнаёміць мяне з такім дэфіцытам. Увосені 1960-га мяне запрасілі ў госьці, дзе быў і Освальд. Ён аказаўся вельмі цікавым чалавекам, у нас зьявілася нават псыхалягічная сумяшчальнасьць, апрача таго мы былі аднагодкамі — таму пачалі мець цесныя зносіны.*

Цітавец быў апантаны ангельскай мовай, часам

*Інтэрвію Э.Цітаўца сайту «Белорусские новости» (www.naviny.by) 11 чэрвеня 2010 году.

нават выдаваў сябе за замежніка. Ён слухаў БіБіСі, займаўся самастойна і нават здаў экзамэн па мове ў мэдінстытуце за ўвесь курс наперад, каб не хадзіць на занадта прымітыўныя для яго заняткі. Освальд для яго быў каштоўнай лінгвістычнай знаходкай — як і ён для Освальда.

Дзёньнік ЛГО
Лістапад 1960

Эрык Цітавец на чацьвёртым курсе мэдычнага інстытуту. Вельмі разумны хлопец.

Мэйлер выдатна разумеў каштоўнасьць успамінаў Цітаўца для свайго дасьледаваньня — хоць праца з архіўнымі дакумэнтамі КДБ працягвалася, але іх выбарачны характар і фрагмэнтарнасьць адсунулі задакумэнтаваную гісторыю на другі плян у параўнаньні з аповедамі сучасьнікаў.

Мэйлер і яго памочнікі сустракаліся зь Цітаўцом, цяпер доктарам біялягічных навук, прафэсарам, сем разоў — але, як высьветлілася, сваю каштоўнасьць былы прыяцель Освальда ацаніў яшчэ вышэй, чым амэрыканскія госьці. Мэйлер піша, што аніводнага разу яму не ўдалося ўзяць сапраўднае інтэрвію. Цітавец уразіў яго тым, што мог гаварыць гадзінамі, але не сказаць нічога.

Былая жонка Цітаўца, якую Мэйлер таксама распытваў, апісвае мужа як чалавека «надзвычай скрытнага, халоднага, які ўсё пралічвае». Мэйлер піша:

Хаця мала хто з мужчынаў хацеў бы, каб яго ацэньвалі меркамі былой жонкі, пасьля сустрэчаў зь Цітаўцом, ладна скроеным і добра зьбітым чалавекам, з супярэчлівай аўрай, жаноцкай і

мача адначасна, стала відавочна, што ён жыў гэтаксама пранырліва і сам па сабе, як разбэшчаны гепард.*

Аднойчы Цітавец ужо пагадзіўся на інтэрвію, але на самым пачатку зазваніў тэлефон і яго выклікалі ў нейкай неадкладнай справе. Мэйлер быў упэўнены, што званок падстроіў сам Цітавец — высьлізнуў, як кот (гепард належыць да сямейства каціных).**

Мэйлер быў абражаны і раззлаваны такімі паводзінамі няўлоўнага менскага доктара і адпомсьціў па-літаратурнаму.

Не атрымаўшы ніякай зьмястоўнай інфармацыі, ён вырашыў са сьведкі ператварыць Цітаўца ў пэрсанажа і паказаць яго ў дачыненьні да іншых герояў і падзеяў.

Насадзіць на вастрыё пяра і навесьці павелічальнае шкло.

---

*Пачатак фразы цяжка ацаніць, калі ня ведаць, што Мэйлер сам быў жанаты шэсьць разоў і стаўся героем выкрывальніцкай біяграфічнай кнігі адной са сваіх жонак.

**У тэлефоннай гутарцы са мной Цітавец, наадварот, скардзіўся на Мэйлера: аднойчы яму прызначылі сустрэчу, ён прыйшоў, і мусіў чакаць пятнаццаць хвілін. Так справы ня робяцца, гэта непавага да запрошанага, і ён паведаміў амэрыканцам усё, што думае з гэтай нагоды.



Мэйлер і «Цітавец»

Пэрсанаж «Цітавец» паўстае як эгаістычная, пыхлівая, самаўпэўненая і падступная асоба.

Дзеяньні «Цітаўца» знаходзяцца на аж занадта блізкай адлегласьці ад інтарэсаў КДБ, ён выглядае выканаўцам некаторых даручэньняў, знаёмыя зьдзіўляюцца, як ён адзін здолеў захаваць свой архіў, зьвязаны з Освальдам, і зрабіў кар'еру.*

Вядомасьць у амэрыканскім сьвеце «освальдазнаўства» Цітаўцу прынесьлі перш за ўсё магнітафонныя запісы голасу Освальда. Цітавец прасіў Освальда начытаць перад мікрафонам некалькі кавалкаў прозы, каб, як ён патлумачыў, лепш адчуць амэрыканскі акцэнт. Першыя запісы рабіліся ў лінгафонным кабінэце мэдінстытуту, дзе Цітаўца добра ведалі і не пярэчылі, калі ён прывёў

*Мэйлер, аднак, нідзе наўпрост ня піша, што Цітавец быў агентам КДБ. Цікава, што ў дакумэнтах падслухоўваньня і вонкавага назіраньня КДБ, якія далі Мэйлеру, можна пабачыць і Зігераў, і Галавачова, і іншых знаёмых Освальда — але прозьвішча «Цітавец» не трапляецца ні разу.

незнаёмага чалавека для запісу. Паводле ўспамінаў Цітаўца, ён не казаў, што госьць — амэрыканец.

Для чытаньня былі выбраныя «Пігмаліён» Бэрнарда Шоў, даведнік Оксфардзкага ўнівэрсытэту, падручнік з тэкстам Шэксьпіра (Освальд чытаў маналёг Атэла з 3-й сцэны 1-га акту). Затым Освальд яшчэ начытваў асобныя гукі і словы.

Значна большую вядомасьць атрымаў другі запіс, зроблены Цітаўцом у сябе дома ў сьнежні 1961-га. Яны выбіраюць Гэмінгуэя — Освальд чытае пачатак апавяданьня «Лягер індзейцаў», затым пераключаецца на «Забойцаў». Тэксты не падабаюцца яму, і, не мяняючы інтанацыі, Освальд лаецца, абзывае Цітаўца «ё... ідыётам», усё гэта застаецца на стужцы. Цітавец не крыўдуе, бо, як потым патлумачыць, «канцэнтруецца на мове».

Генэрал КДБ «Гузьмін» казаў Мэйлеру, што, нягледзячы на хуткі прагрэс Освальда ў расейскай мове, ім трэба было мець некага побач зь ім, хто добра гаварыў па-ангельску. Але ня толькі гаварыў — хто таксама мог бавіць зь ім вольны час, сябраваць і нават разумець яго думкі.

У інтэрвію Мэйлер патлумачыў мне сытуацыю больш дэталёва:

— У КДБ быў чалавек, які доўга гутарыў зь ім па-ангельску ў Менску. Прычына — высьветліць, ці яго акцэнт быў чысты ці не? У іх быў лінгвістычны аналітык, які мусіў высьветліць, ці гэта сапраўды амэрыканскі акцэнт, ці сапраўды ён з Поўдня, і яны вывучалі яго акцэнт. І вырашылі — так, у яго паўднёвы акцэнт, ён паходзіць адтуль, адкуль ён кажа. Іхняя задача была пабудаваць сыстэму спраўджваньня, і яны гэта зрабілі.

Мэйлер цытуе фрагмэнт запісу, зробленага дома ў Цітаўца — але не літаратурны, а іншы.

Адклаўшы кнігі ў бок, Цітавец і Освальд пачынаюць імправізаваць — гуляць у інтэрвію, дзе Освальду выпадаюць ролі прафэсара, забойцы, спартовага камэнтатара, журналіста.

Эрык пытаецца, Лі адказвае:

— Раскажыце нам пра ваша апошняе забойства?

— Гэта была маладая дзяўчына пад мостам. Яна ішла і несла бохан хлеба. Я перарэзаў ёй глотку ад вуха да вуха.

— Навошта?

— Ну, зразумела, я хацеў хлеба!

— О'кэй. *(Паўза)* **А якое, на вашу думку, ваша, ваша самае знакамітае забойства ў вашым жыцьці?**

— Ну, гэта калі я забіў восем чалавек у Баўэры, на ходніку.* Яны стаялі там, бавілі час, і мне не спадабаліся іх твары, і я ўзяў і расстраляў іх з кулямёта. Гэта было знакаміта, усе газэты напісалі (*сьмех*).

Гэты сьмех мільёны амэрыканцаў упершыню пачулі ў лістападзе 1993-га.

Цітавец прадаў гэты запіс амэрыканскай тэлекампаніі PBS, якая здымала ў Менску дакумэнтальнае кіно «Хто быў Лі Гарві Освальд». Мэйлер узяў тэкст зь фільму. Адразу пасьля дыялёгу з архіўным сьмехам Освальда ў амэрыканскім тэлеэфіры прагучала тлумачэньне прафэсара Цітаўца:

---

*Ньюёрская вуліца на Мангэтане, вядомая тэатрамі і танцавальнымі залямі, у 1950-я гады месца збору бяздомных і алькаголікаў.

— Мы проста добра бавілі час і насамрэч мы паміралі са сьмеху.

Калі паспрабаваць перадаць ньюарлеанскі акцэнт у перакладзе на беларускую мову, дык можна, напрыклад, напісаць па-палеску:

«Ну, то было колы я забыв восім чоловік в Бавэры на ходныку. Воны там стоялы, бавылыся, мні іх твары ну нэ сподобалыся, я взяв і постриляв іх з кулімёту. Аж всі газэты напысалы».

Цікава, ці ФБР і ЦРУ таксама б вызначылі, зь якога рэгіёну Беларусі гаворка?*

*Не скажу пра ФБР, а беларускі КДБ тады дык пэўна не расшыфраваў бы. У 1950-я гады, пасьля арышту амэрыканскага парашутыста Янкі Філістовіча, там доўга і беспасьпяхова ламалі галаву над расшыфроўкай яго запісу «у горадзе в.ш. войска». Што за загадкавы горад схаваны за скаротамі? Філістовіч гаварыць адмаўляўся, з Масквы ціснулі, начальства нэрвавалася, пакуль арыштаваны не пашкадаваў сьледчага, які быў родам з Асэтыі: «Вам скажу, бо вы каўказец — в.ш. — вельмі шмат» — так на пачатку 1990-х, падчас працы над кнігай «Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста» расказваў мне палкоўнік у адстаўцы Рыгор Трапш, каўказец, які вёў справу.



Гепард з хуткасьцю чарапахі

Сваё нежаданьне адкрыць карты Эрнст Цітавец тлумачыў Мэйлеру цалкам рацыянальна — ён сам зьбіраецца напісаць кнігу пра Освальда.*

І ён сапраўды выдаў сваю кнігу — праз 17 гадоў пасьля сустрэчы з Мэйлерам.

Прычым адразу па-ангельску: «Oswald. Russian Episode» — «Освальд. Расейскі эпізод». Кніга была надрукаваная ў Беларусі, аўтар пачаў рассылку, спрабуючы зацікавіць буйныя выдавецтвы, якія б дадрукавалі наклад і арганізавалі продаж.

На заднюю вокладку вынесеныя тры цытаты, якія маюць на мэце сьцьвердзіць паўнамоцтвы аўтара:

«Эрык... мой найстарэйшы існуючы знаёмы... мой сябар, які вельмі добра гаворыць па-ангельску». Лі Гарві Освальд, «Гістарычны Дзёньнік»

---

*У сваёй кнізе Цітавец публікуе іншую вэрсію: ён не захацеў нічога расказваць, бо калега Мэйлера Лорэнс Шылер перадузята ставіўся да Освальда.

«Эрык Цітавец, як выглядае, быў самым раньнім і, магчыма, самым блізкім сябрам Освальда ў СССР». Эдвард Эпстайн, «Хронікі Забойства»

«[Эрнст Цітавец] найбліжэйшы сябра Освальда ў Менску». Норман Мэйлер, «Гісторыя Освальда»

Гэтыя цытаты патрабуюць удакладненьня.

Цітавец пазнаёміўся з Освальдам толькі ўвосень 1960-га. Але яшчэ ў студзені ў Освальда зьявіліся два знаёмыя, зь якімі ён будзе сябраваць, сустракацца, бавіць час да самага ад'езду зь Менску — гэта Павал Галавачоў і Аляксандар Зігер.

Трэцяя цытата цікавая тым, што ўзятая з таго самага абзаца ў дадатку да кнігі Мэйлера, дзе ён параўноўвае Цітаўца з разбэшчаным катом.

Гепард, праўда, лічыцца самай хуткай наземнай жывёлай на сьвеце — хуткасьць Цітаўца-мэмуарыста хутчэй чарапахавая.

Ён скардзіўся, што скончыў кнігу ў 1999-м, але ніяк ня мог знайсьці выдаўца і тлумачыў гэта зьместам кнігі — маўляў, яго вэрсія падзеяў не супадае з афіцыйнай:

— Адразу пасьля напісаньня кнігі я, на параду сяброў, зьвяртаўся да ангельскіх літаратурных агентаў, якія напачатку зацікавіліся кнігай, а потым пачыналі нешта муціць і цягнуць. Вось тады я і зразумеў, што на Захадзе гэтая кніга ніколі ня выйдзе менавіта з-за тых высноваў, якія там зробленыя.*

*Інтэрвію Э.Цітаўца сайту «Белорусские новости» (www.naviny.by) 11 чэрвеня 2010 году.

Публікацыяў, дзе даводзіцца, што Освальд ня мог быць і ня быў забойцам — тысячы, і ўсе яны на Захадзе. Фактычна, усю апублікаваную на Захадзе літаратуру можна падзяліць на дзьве часткі: адна адказвае «так», другая «не» на тое самае цэнтральнае пытаньне і ніяк не абмінае яго.

Аднак доктар біялягічных навук Цітавец запэўнівае:

— Гэта не параноя, а рэальныя факты, што складваюцца ў вельмі цікавую гісторыю вакол гэтага выданьня, якая яшчэ ня скончылася. Мяне адсочвалі, з майго кампутара праз інтэрнэт былі сьцёртыя ўсе файлы, якія мелі дачыненьне да Освальда, а затым была адхіленая мая прапанова прыехаць з дакладам на канфэрэнцыю ў Даласе, прысьвечаную забойству Кенэдзі, мяне прасілі прадаць мае магнітафонныя запісы дыялёгаў з Освальдам.*

Але кніга ўсё ж выйшла — і на амаль пяцістах старонках аўтар дае сваю вэрсію і ацэнкі часу і падзеяў.

Цітавец выступіў адразу ў дзьвюх ролях. Адна — традыцыйнага дасьледніка, які, як Мэйлер, вывучае і аналізуе ўсю гісторыю Освальда на падставе дакумэнтаў Камісіі Ўорэна, публікацыяў, размоваў

*Тут што ні сьцьверджаньне, то пытаньне: што значыць адхіленая «прапанова» прыехаць у Далас — аўтар прапанаваў арганізатарам запрасіць сябе? На якіх умовах — аўтар хацеў, каб яму аплацілі падарожжа і далі ганарар за выступ? Гарантавалі выданьне кнігі? Ці арганізатары папрасілі прыслаць тэкст выступу? Хто яны — школьны гістарычны клюб, аматарскі гурток пры бібліятэцы, універсытэт, мясцовае аддзяленьне Ротары?.. І, прынамсі, частку магнітафонных запісаў Цітавец прадаў амэрыканскаму тэлебачаньню, і яны даўно даступныя ў Інтэрнэце...

са сьведкамі, і другая — мэмуарыста, непасрэднага ўдзельніка падзеяў, які ўспамінае, як што было.

Гэта спалучальныя, але розныя задачы. Цяжка знайсьці нешта сваё на пратаптаных сотнямі дасьледнікаў палетках, яшчэ цяжэй дамагчыся, каб гэта заўважылі. Нюансы інтэрпрэтацыяў цікавяць толькі зацятых заўзятараў.*

Асабістыя ўспаміны, з другога боку, могуць быць унікальнымі — але могуць і ня быць. Аўтар не адзіны, хто ведаў героя, і нават не найбліжэйшы да яго чалавек — аповеды жонкі ці запісы КДБ даюць зусім іншую ступень набліжанасьці і нават інтымнасьці.

Цітавец прызнаецца, што зь некаторымі знаёмымі Освальда ўпершыню сустрэўся толькі ў 1990-я. І толькі тады пачаў высьвятляць некаторыя сюжэты, цэнтральныя для сваёй кнігі. Сваіх галоўных канкурэнтаў на блізкае сяброўства з амэрыканцам Цітавец згадвае мінімальна: Зігера нэўтральна, Галавачова звысоку і непаважліва.

Што ж, кожны піша сваю кнігу і піша, як можа і як памятае. Цітавец памятае свой час з Освальдам выразна і падрабязна, ня толькі падзеі, але й пачуцьці, ня толькі дыялёгі, але й думкі.

Вось яны ўпершыню ідуць у Опэрны тэатар, і Освальд кідае сьмецьце пад крэслы і тлумачыць —

---

*Значную частку кнігі займае апісаньне палітычнай сытуацыі, халодная вайна, марксізм і сацыялізм, цытаты з тагачаснага англамоўнага савецкага тыднёвіка «Moscow Times», разважаньні пра тое, чаму Освальд ня мог быць забойцам і па вяртаньні ў Амэрыку ня стаў ім, аналіз яго амэрыканскіх рукапісаў. На ангельскай мове падобнага напісана і апублікавана столькі, ад студэнцкіх рэфэратаў да паліталягічных кніг, што сам зварот да такога матэрыялу пакідае ўражаньне другаснасьці, маргінальнай аматарскай спробы.

каб была праца для прыбіральшчыц. Вось дурэюць у яго кватэры, гуляючы ў амэрыканскіх салдат, і Эрык старанна выконвае каманды Лі: «Направа! Кругом! Налева! Зважай! Вольна!»

Вось ладзяць эратычную вечарынку зь дзьвюма студэнткамі (Лі з адной дзеўчынай зачыняецца на кухні, Эрык нясьмела гладзіць сваю дзяўчыну ў пакоі, усё сканчаецца сканфужаным сьмехам).

Вось едуць у Ждановічы на рыбалку, вось робяць знакамітыя магнітафонныя запісы, вось спрабуюць сканструяваць гранату з украдзеных на заводзе двух мэталічных цыліндраў, вось прарываюцца ў інтэрнат ін'язу...

Абодва пэрсанажы выглядаюць сымпатычнымі прыяцелямі, якія маюць крыху больш за 40 гадоў на дваіх, яны жывуць там, напачатку 1960-х, яшчэ ўсё ў іх наперадзе... Гэтыя сцэны дапаўняюць партрэт Освальда, створаны за апошнія паўстагодзьдзя, — але не мяняюць яго.

Цітавец паведамляе, што першае ангельскае выдавецтва, якое патрымала і не надрукавала кнігу, патлумачыла, што рынак перанасычаны. Другое, пасьля вывучэньня тэксту, таксама адмовілася выдаваць і параіла аўтару перадаць рукапіс у Бібліятэку Кангрэсу ЗША.

Іншымі словамі, рэдактары далі зразумець аўтару, што знаёмства са знакамітасьцю не азначае аўтаматычнай вартасьці ўспамінаў.

Мэмуарыст выбраў ня тую мову, ня тых чытачоў, ня той фокус, ня той час.

Спазьніўся.



Ці ведаў Освальд Цітаўца?

Лёгіка датаў і пасьлядоўнасьці ў любым аповедзе мае сэнс, толькі калі яна парушаецца: у гістарычным люстэрку задняга бачаньня некаторыя адказы стаяць побач з пытаньнямі, а часам нават перад імі.

Прафэсар Цітавец сапраўды мае падставы сьцьвярджаць, што ён ведаў Освальда, яго менскі побыт, браў удзел у важных падзеях яго жыцьця.

Ці ведаў Освальд Цітаўца?

Увесну 1962-га завяршаецца больш чым гадавая барацьба Освальда за вяртаньне ў Амэрыку — першы ліст у амбасаду з просьбай вярнуць пашпарт на пачатку лютага 1961-га, сакрэтны палёт на тыдзень у Маскву ў амбасаду, ліставаньне, высьвятленьне, ці не арыштуюць яго за здраду, спробы атрымаць гарантыі ад Дзярждэпартамэнту, хадайніцтвы маці, зарука будучага працадаўцы, паездка ў Маскву жонкі і выключэньне яе з камсамолу ў Менску, ізноў перапіска з амбасадай ЗША, напружанае чаканьне адказаў, бясконцыя абмеркаваньні

і спрэчкі з жонкай, размовы на гэтую тэму зь Зігерамі і Паўлам Галавачовым, а таксама зь дзядзькам і цёткай Марыны.

У адным з самых апошніх запісаў у «Гістарычным дзёньніку» Освальд згадвае Цітаўца.

Дзёньнік ЛГО
Сакавік 1962

Апошнія абмены камунікацыямі паміж мной і амбасадай. Прыходзяць лісты ад маці і брата ў ЗША. Я яшчэ не сказаў Эрыку, які зьяўляецца маім самым старым існуючым знаёмым, што мы зьбіраемся ў Штаты. Ён — ОК, але я баюся, што ён занадта добры член камуністычнага саюзу моладзі, таму я пачакаю да апошняй хвіліны.

Чаго ці каго баяўся Освальд?

Цітаўца, які як ляяльны грамадзянін паведаміць уладам пра намер перабежчыка вярнуцца ў ЗША?

Ці Цітаўца, які праз свае ідэалягічныя перакананьні асабіста абурыцца і пакрыўдзіцца на рашэньне амэрыканца зьехаць з СССР, пачне адгаворваць?

Ці Цітаўца, які ўяўляе нейкую іншую небясьпеку, і яму нельга давяраць?

Цітавец у сваіх успамінах намалюе сцэну, дзе ён так горача даводзіць Освальду перавагі сацыялізму, што той выбухае і кажа свайму суразмоўцу — вы жывяце як рабы!

Освальд напісаў тое, што напісаў.

Эрык — ОК, а ўсё астатняе — як той казаў, кантэкст.

Сам Цітавец потым у газэтных інтэрвію і кнізе патлумачыў гэты запіс жаданьнем Освальда выгарадзіць яго такім чынам перад савецкімі ўладамі.

Дзеля чаго трэба зрабіць адно дапушчэньне і пагадзіцца з высновай, якая зь яго вынікае.

Трэба дапусьціць, што Освальд чамусьці ведаў, што яго дзёньнік патрапіць у рукі савецкіх спэцслужбаў і гэтак хацеў абараніць Цітаўца. І непазьбежная выснова — што тады такім чынам ён сьвядома «здае» спэцслужбам іншых сваіх знаёмых, пра якіх піша ў дзёньніку прыхільна — Аляксандра Зігера, які раіў яму зьяжджаць, Паўла Галавачова, які пастаянна вядзе антысавецкія размовы, дзяўчат, якія занадта блізка сыходзяцца з амэрыканцам.

Падставаў для такіх высноваў і такога дапушчэньня Освальд нідзе ніколі не даваў.

Калі праз два месяцы амэрыканец зь сям'ёй назаўсёды будзе ад'яжджаць зь Менску, сябры прыйдуць на вакзал.

Цітаўца сярод іх ня будзе.

Як ён тады патлумачыць Паўлу Галавачову — ня ведаў.*

*Пра гэтую вэрсію Цітаўца тады ж, у 1962-м, Галавачоў напісаў Освальдам у Амэрыку, яго ліст захоўваецца ў матэрыялах Камісіі Ўорэна. Тое самае — што Освальд зьбіраўся сказаць Цітаўцу пра ад'езд толькі напярэдадні і нават пайшоў да яго дадому, але не засьпеў, і Цітаўца не было на вакзале, Марына ў 1964-м расказала Прысцыле МакМілан, і так гэта прадстаўлена ў яе кнізе, выдадзенай у 1977-м. Сам Цітавец цяпер у кнізе, надрукаванай у 2010-м, сьцьвярджае, што разьвітаўся з Освальдам за дзень да ад'езду таго зь Менску, а на вакзал не прыйшоў, бо не любіў доўгія разьвітаньні.



«Здрастуй!» І бывай...

У разьдзеле «Падзякі» Мэйлер згадвае Іну Андрэеўну Пісенку — і ў дужках пазначае, што ёй належыць асаблівая ўдзячнасьць за дапамогу зь перакладамі спэцыяльных праектаў.

Некалькі пакаленьняў студэнтаў ін'язу былі таемна закаханыя ў бліскучую і элегантную Іну, двайную чэмпіёнку Беларусі ў плаваньні (фрыстайл і батэрфляй), выкладчыцу з абсалютным фанэтычным слыхам і выдатную сынхраністку.

Яна адказвала на мае пытаньні пра сустрэчы з Мэйлерам, а потым спыталася — а пра Освальда нецікава?

— А Вы што, яго ведалі?! —

— Вельмі добра. Нават дадому прыводзіла.

Маёй суразмовіцы сапраўды быў прысьвечаны разьдзел у кнізе Мэйлера, але там яна фігуравала пад дзявочым прозьвішчам, і яе знаёмства з Освальдам было для мяне нечаканасьцю.

— Мы пазнаёміліся ў філярмоніі, у мяне быў гадавы абанэмэнт і я хадзіла на ўсе канцэрты. У

перапынку я пачула ангельскую мову — а гэта была такая рэдкасьць у Менску, і мы зь сяброўкай падышлі пазнаёміцца.

— А што гралі ў той дзень?

— Першы канцэрт Мэндэльсона з аркестрам.

Мэйлеру пашанцавала — чалавек, які памятае рэпэртуар філярмоніі праз паўсотні гадоў, памятае і шмат чаго іншага. Памяць, канечне, патрабуе падказак — Іна Маркава расказвала, як уніклівыя пытаньні Мэйлера і яго памочнікаў, па-майстэрску сфармуляваныя і падабраныя, дапамагалі ўспомніць даўно, здавалася, забытыя рэчы, акалічнасьці, дэталі.

Эрык Цітавец, які быў з Освальдам на канцэрце, таксама паспрабаваў выдаць сябе за замежніка, але дзяўчаты не далі веры. І Освальд не падтрымаў гульні — сказаў, што толькі ён амэрыканец.

Пасьля канцэрту новыя знаёмыя прагуляліся да плошчы Перамогі, Іна дала свой тэлефон, і ўжо назаўтра, у нядзелю, пазваніў Цітавец і спытаўся, ці можна ім прыйсьці ў госьці.

Мэйлер піша:

Бацька Іны займаў высокую партыйную пасаду і быў палкоўнікам. Вельмі патрыятычны чалавек. Ён не пацярпеў бы, каб у яго доме быў хто-небудзь з-за мяжы.

У перакладзе гэта можа значыць, што палкоўнік быў нармальным савецкім чалавекам, які баяўся, вядома, не замежнікаў, а суседзяў, якія маглі данесьці, і начальства, якое магло сапсаваць кар'еру. Помнік Сталіну па-ранейшаму ўзвышаўся ў цэнтры Менску, вуліцы, заводы і калгасы па-ранейшаму насілі імя генэралісімуса.

Але дома была толькі маці, і Іна запрасіла на сустрэчу таксама сяброўку, зь якой была ў філярмоніі.

Візыт быў нядоўгім — з-за граматыкі.

Освальд сказаў маці Іны: «здрастуй» замест «здравствуйте», тая выклікала дачку на кухню і пачала ўшчуваць, што гэта за нявыхаваных грубіянаў, якія ня ведаюць як зьвяртацца да старэйшых, прыводзіць тая дадому.

— Мама, ён ня рускі. Ён амэрыканец.

Маці зьбялела і сказала — забяры яго, хутка вернецца бацька.

Але дачка ўгаварыла ўстрывожаную жанчыну, і госьці засталіся, пілі чай і слухалі музыку.

Больш сюды Освальд не прыходзіў.

Наступны раз дзяўчаты сустрэліся ў Освальда дома — яны прыйшлі паглядзець яго бібліятэку, якую, на іх зьдзіўленьне, складалі не амэрыканскія аўтары, а Маркс і Энгельс.

Пасьля гэтага сустрэчы адбываліся на новым месцы, на нэўтральнай тэрыторыі — калі так можна назваць пакоі з кратамі на вокнах, куды ўваход дазваляўся па прапусках і ахоўваўся кругласутачнай вахтай.

У студэнцкім інтэрнаце.



Паходы ў манастыр

Новае месца было зусім блізка ад плошчы Перамогі. Адрас — Омскі завулак, 13, на шыльдзе было пазначана — інтэрнат.

Дзёньнік ЛГО
15 лістапада 1960

У лістападзе я пазнаёміўся з чатырма дзяўчатамі, якія жывуць у інтэрнаце Інстытуту замежных моваў. Нэлі вельмі цікавая, таксама як і Томка, Томіс і Ала. Я звычайна хаджу ў інстытуцкі інтэрнат зь сябрам, які вельмі добра гаворыць па-ангельску. Эрнст Цітавец на чацьвёртым курсе мэдінстытуту. Вельмі здольны хлопец. У інтэрнаце мы шасьцёра сядзім і гаворым гадзінамі па-расейску і па-ангельску.*

*Ня ведаю, наколькі зразумелае гэтае жаданьне сёньня, але за савецкім часам студэнты ін'язу аж млелі ад магчымасьці пагаварыць з «носьбітам мовы», як называлі замежнікаў. Ін'язаўцаў цікавілі не біяграфія, не прафэсія, ня сам чалавек і нават ня тое, што ён кажа — а як гаворыць, яго вымаўленьне, ідыёмы, слэнг.

Каб прайсьці ў інтэрнат, пропуск патрабаваўся нават насельнікам, гасьцей запісвалі ў адмысловую кнігу, патрабавалі дакумэнты ў заклад, па пакоях хадзілі праверкі, не дазвалялі заставацца позна.

Калі пра гэтую працэдуру расказалі Мэйлеру, ён быў так уражаны, што напісаў наступную фразу:

Да дзяўчат, якія вучыліся ў ін'язе, ставіліся як да юных лэдзі ў манастыры.

Юныя лэдзі, аднак, манашкамі зусім не былі, а іх кавалераў не спынялі жалезныя краты на вокнах першага паверху: пруткі можна было разагнуць, мацаваньні расхістаць, былі пажарныя лесьвіцы, вадасьцёкавыя трубы, па якіх можна было залезьці адразу на другі паверх.

Освальд зайшоў у інтэрнат праз уваход.

Адна дзяўчына сказала, што на вахце працуе яе сваячка і прапусьціць, у пакоі замкнулі дзьверы — сапраўдны амэрыканец, як цікава. За першым візытам пайшлі новыя.

Генэрал КДБ «Ігар Гузьмін» так тлумачыў Мэйлеру бесьперашкодныя паходы Освальда ў інтэрнат:

Мы былі таксама гатовыя шукаць людзей у нашым Інстытуце замежных моваў. Як Вы можаце здагадацца, дзяўчаты з інстытуту былі ў стане інфармаваць нас пра паводзіны Освальда. Контраразьведка манітаравала ўвесь гэты працэс і была пра ўсё паінфармаваная.

Размаўлялі, распытвалі, жартавалі, часам зьбіралася па шэсьць дзяўчат, стараліся гучна не сьмяяцца. Адкрывалі тлумачальны слоўнік ангельскай мовы, выбіралі любое слова — і калі дзяўчаты не

маглі здагадацца пра яго значэньне, Освальд заўсёды сьмяяўся — ён ведаў!

Сустрэчы працягваліся пару месяцаў, часам з удзелам Цітаўца, часам без. Аднойчы Освальд патрапіў у сытуацыю, пра якую потым напіша ў рукапісе «Калектыў»:

У 1961 годзе кітайская дэлегацыя прыехала ў Менск, і яе павезьлі з вакзалу ў гатэль. Хаця было ўжо 10:30 ночы, па ўсім шляху супрацоўнікі МУС (бясьпекі) забягалі ў дамы й інтэрнаты і загадвалі людзям выходзіць на вуліцу вітаць гасьцей. Хаця загадзя не было ніякага паведамленьня пра дэлегацыю, яшчэ адзін спантанны прывітальны камітэт сустрэў кавалькаду чорных лімузынаў і паслухмяна памахаў рукамі зацямнёным машынам, зь якіх крыху высоўваліся жаўтаватыя далоні. Я сам быў у гасьцях у сяброў у інтэрнаце, калі супрацоўнік бясьпекі выклікаў нас дзеля гэтага. Я адразу пайшоў разам з усімі ў натоўп, і ведаю, што гэта ня проста праўда, а стандартная працэдура.

Дзяўчаты да Освальда прывыклі і нават пачыналі нудзіцца — яго гісторыі паўтараліся, жарты былі ўжо ня сьмешныя, сам ён нягеглы, нехта нават сказаў, што ён ходзіць сюды, бо дзяўчаты больш нідзе зь ім не захочуць сустракацца.

Мэйлер, аднак, прыйшоў да высновы, што менавіта ў ін'язаўскім манастыры Освальд знайшоў сабе каханку.

Як бы гэта далікатней удакладніць: ня першую.



«Заўважана імкненьне знаёміцца з бляндынкамі»

Інтымнае жыцьцё Освальда вывучана двума дасьледнікамі, КДБ і Мэйлерам. Ад Мэйлера можна даведацца, што першай жанчынай Освальда была японка (амэрыканскія салдаты на базе Акінава свабодна наведвалі бардэлі), ні разу не было амэрыканкі.

Ад КДБ — што яму падабаліся бляндынкі. Так, прынамсі, сьцьвярджала ў справаздачы «Сьцяпану» крыніца «Таня», перакладчыца Менскага Інтурысту.

Рапарт КДБ
08.07.60

У паводзінах Лі Гарві было заўважана імкненьне знаёміцца з дзяўчатамі, перш за ўсё з бляндынкамі, якія гавораць па-ангельску, адначасна з разьлікам, які мяжуе са сквапнасьцю. Напрыклад, ён можа пайсьці на спатканьне зь дзяўчынай, а потым пайсьці ў рэстаран адзін,

бо лічыць, што аднаму таньней. Ён шмат разоў арганізоўваў сустрэчы з крыніцай, бо можа прыйсьці ці пазваніць ёй на працу.

Крыніца схільная думаць, што Лі Гарві апошнім часам астыў у сваіх заляцаньнях, бо яго патрабаваньне, што ён заслужыў пацалунак пасьля шасьці месяцаў сустрэч, не было задаволенае. Ён прыкінуўся, што расчараваны ці пакрыўджаны і пасьля гэтага стаў сустракацца з крыніцай ня так часта.

Трэцяй крыніцай інтымнай інфармацыі стаў сам Освальд.

Дзёньнік ЛГО
Дадатковая старонка. Бяз даты.

Іна Т.*

Я сустрэўся зь ёй у 1960-м у Зігераў, яе сям'я, якая паслала яе ў Менск, відавочна, заможная. Іна любіць моднае адзеньне, добры абутак і бялізну. У кастрычніку 1960 году мы становімся вельмі блізкія, кульмінацыяй стаў палавы акт 21 кастрычніка. Яна была цнатлівая і вельмі цікавая. Мы сустракаліся такім чынам 4 ці 5 разоў, апошні — 4 лістапада 1960-га. Па заканчэньні апошняга курсу Менскай кансэрваторыі яна зьехала зь Менску ў Рыгу.

Што менавіта запісана ў матэрыялах праслухоўваньня КДБ 21 кастрычніка 1960 году, Мэйлеру не паказалі.

---

*У «Дзёньніку» імёны дзяўчат Освальд піша цалкам і так, поўнасьцю, падае іх Мэйлер у сваёй кнізе. Калі каму моцна карціць, могуць самі пайсьці ў бібліятэку і замовіць «Гісторыю Освальда».

Дзёньнік ЛГО
Сьнежань 1960

У мяне лёгкі раман з Нэляй К.

Нэля К. Высокая, 5 футаў 11 цаляў, 150 фунтаў, добрыя прапорцыі, вялікія высокія грудзі, шырокія і прыгожыя сьцёгны, прапарцыйныя, сама зь вёскі непадалёку ад польскай мяжы, чыста расейскага вясковага паходжаньня. Далікатная, добрая, жаноцкая і ўсё разумее, з гарачым і строгім сэрцам. Яна спалучала ўсе найлепшыя жаночыя рысы з добрым, вялікім расейскім сэрцам. Я пазнаёміўся зь ёй праз суседку ў пакоі Томку. Нэлі і Томка і яшчэ тры дзяўчыны жылі разам у пакоі інтэрната Інстытуту замежных моваў каля плошчы Перамогі. Я пачаў сур'ёзна зьвяртаць увагу на Нэлю, калі разышоўся зь Інай Т.

Пазьней на асобным аркушы Освальд дапісвае:

Нэля напачатку не зьвяртае на сябе вялікай увагі, яна проста выглядае і надта вялікая, але я адразу адчуў, што яна добрая і яе жарсьці адпавядаюць яе памерам, што ўдалося высьветліць толькі пасьля доўгага вывучэньня прадмету. Пасьля лёгкага раману, які цягнуўся да студзеня і нават лютага, мы падтрымлівалі сяброўства, але нічога больш аж да траўня 1961-га, і пасьля жаніцьбы больш не сустракаліся.

Гэты запіс, зроблены, верагодна, ужо пасьля вяртаньня ў Амэрыку, Мэйлер называе адзіным, апроч радкоў пра студэнтку кансэрваторыі, канкрэтным сьведчаньнем сэксуальнага жыцьця Освальда ў Менску да жаніцьбы.

Канкрэтыкі у гэтым выпадку якраз і няма. Ёсьць крыху нацяжная спроба гумару.

Восеньню 1960-га ў Освальда разьвіваецца нашмат больш сур'ёзны трэці раман, які завершыцца прапановай рукі і сэрца.

Дарэчы — брунэтцы.



КДБ і «мужчыны зь вялікай задніцай»

Сэксуальнае жыцьцё Освальда цікавіла шмат каго.

Будучы прэзыдэнт ЗША Форд, сябра Камісіі Ўорэна, таксама зрабіў унёсак у гэтую тэму, спытаўшы, ці ня быў Освальд «імпатэнтам». Жонка Освальда ў адказ заявіла, што не разумее, як такі чалавек мог стаць прэзыдэнтам.

Аднак чытаючы Мэйлера, можна ўявіць, што пытаньні, якія ён высьвятляе, сфармуляваныя ў аддзеле маркетынгу выдавецтва. Напрыклад — ці быў Освальд гомасэксуалістам?

Генэрал «Гузьмін» цьмяна заявіў, што Освальд быў «нячысты і карыстаўся сытуацыяй, калі яна зьяўлялася».

Але непасрэдны куратар «Сьцяпан» катэгарычна абвергнуў гэта. Освальд часам прыводзіў дзяўчат дадому, і «Бог ведае што яны там рабілі». Верагодна, гэта было да ўсталяваньня прамога назіраньня ў кватэры, бо потым КДБ ведаў шмат чаго даволі дакладна.

З расшыфроўкі падслухоўваньня КДБ
26 ліпеня 1961

21:50 ЛГО ідзе на кухню, вяртаецца.
22:10 Яны кладуцца ў ложак.
22:15 Інтымная гутарка.
22:30 Ціха, яны сьпяць.
23:00 Назіраньне завершана.

Як тлумачыў «Сьцяпан», у КДБ не было правілаў, як запісваць інтымныя моманты. Звычайна чалавек, які расшыфроўваў запіс, пазначаў, што акт адбыўся, але не даваў дэталяў.

Але на практыцы гэта залежала ад задачы:

— Уявіце, што я працую ў ФБР ці ЦРУ і хачу завэрбаваць савецкага інжынэра. Мне давялося шукаць на яго кампрамат, перш і важней за ўсё — сэксуальныя рэчы. Як аналітык я б загадаў: запісвайце ўсё як найпадрабязьней. Усе сэксуальныя працэсы. Рабіце фота. Усё залежыць ад мэты.

«Сьцяпану» даводзілася весьці справу, па якой праходзілі гомасэксуалісты — за крымінальнае злачынства «мужаложства» прадугледжвалася пакараньне да пяці гадоў турмы. Ён патлумачыў Мэйлеру, як гэта выглядала вачыма КДБ 60-х гадоў:

— Звычайна ў гомасэксуаліста тонкі голас, нешта жаноцкае, ён цікавіцца жанчынамі толькі фармальна, але яго вочы загараюцца, калі ён бачыць мужчыну, асабліва — прабачце — зь вялікім задам. Яго пастаянна можна бачыць у грамадзкіх прыбіральнях, і часта там яны і зьдзяйсьняюць акты. Такім чынам, у гомасэксуаліста ёсьць пэўныя выразныя рысы, паводле якіх яго можна

выявіць, і такіх рысаў мы за Освальдам не назіралі.

Дзяржаўную бясьпеку аднаполае каханьне падрывала да 1993-га, калі яно фармальна і афіцыйна перастала быць злачынствам.



Мэйлер і гіганты сэксу

У 2007 годзе апошні раман Мэйлера «Замак у лесе» пра дзяцінства Гітлера атрымаў шырока вядомы ў амэрыканскім прыгожым пісьменстве прыз часопісу Literary Review «За дрэнны сэкс у мастацкай літаратуры».

Назвы ранейшых твораў гавораць самі за сябе: «У палоне сэксу», «Геній і жарсьць», «Прывід прасталыткі», крыху менш кідаюцца ў вочы «Пра жанчын і элегантнасьць» і «Мэрылін», але дзеля справядлівасьці трэба сказаць, што самы першы раман «Голыя і мёртвыя» не пра тое, што можна падумаць, калі прачытаць усе загалоўкі разам.

Мэйлер лёгка пераплюнуў КДБ у асьвятленьні менскага сэксуальнага жыцьця (без уліку таго, што там яшчэ схавана ў архівах, вядома).

Так, у кнізе знаёмы Освальда Юры Меражынскі, сын доктара біялёгіі Чаркасавай (якая час ад часу выскоквае паміж літараў у самых нечаканых месцах), прадстаўнік «залатой моладзі» 1960-х, а на пачатку 1990-х, паводле апісаньня Мэйлера,

заслужаны алькаголік, тлумачыць амэрыканскаму чытачу менскія норавы і тыпы на прыкладзе свайго знаёмага:

Ён быў вышэйшы і большы за мяне. Яго мянушка была «Ган-дон-чык», ад слова гандон, шырокі гандон. Ён скупляў гандоны па 4 капейкі за штуку, і купляў адзежныя шчоткі. Прабіваў чатыры дзірачкі ў гандоне, даставаў шчаціну са шчоткі і ўстаўляў у дзірачкі, а зьверху нацягваў яшчэ адзін гандон. І прадаваў прастытуткам, і шмат народу купляла. За вялікія грошы. Таму яго празвалі «Гандон-чык», таму што ён рабіў жанчын шчасьлівымі, так. У той час можна было мець нават гандон з вусамі. Ну, і такая мянушка. Гандон-чык, Ган-дон-чык. Вялікі даход, канечне. Яго вельмі любілі жанчыны.

Разьдзел кнігі «Закаханы ў Элу» Мэйлер пачынае з аповеду Паўла Галавачова, які працаваў на заводзе разам з Освальдам і Элай Герман і бачыў пачатак іх раману.

Лі ня надта паказваў свае пачуцьці. Фактычна, ён ніколі не казаў, што ён зь некім пераспаў. Напрыклад, была Магда, вялікая, як кабыла. Яна лёгка давала. Людзі казалі, што гэта муж зрабіў яе такой. На начной зьмене мужыкі нават спрачаліся, чыя чарга кінуць палку. Яна важыла 120 кіляграмаў. Яе звалі «Наша кабыла», «Наш халадзільнік».

Наконт халадзільніка: у 1950-я Мэйлер, як і шмат хто, захапляўся вучнем Зыгмунда Фройда Вільгельмам Райхам, якога называюць бацькам сэксуальнай рэвалюцыі. Яшчэ на пачатку 1930-х ён злучыў

вучэньне Маркса і Фройда і заснаваў «Сэкспол» — Нямецкую асацыяцыю Пралетарскай Сэксуальнай Палітыкі, якая неўзабаве налічвала 40 000 членаў. Райх лічыў аргазм панацэяй, і празь яго вынайшаў першасную касьмічную сілу — «энэргію аргону». Пасьля эміграцыі ў Амэрыку ён пабудаваў акумулятар аргону, які стаў вядомы як «аргазматрон». «Аргазматрон» уяўляў сабой драўляную скрыню з фэрамагнітнымі ўстаўкамі і зьбіраў «аргон» з атмасфэры. «Аргон», са словаў Райха, дапамагаў ня толькі ад імпатэнцыі і фрыгіднасьці, але лячыў ад раку і радыяцыі. У патэнце Райху адмовілі, але сярод тых, хто паспрабаваў на сабе дзеяньне «аргазматрона», апроч Мэйлера, былі Джэром Сэлінджэр, Сол Бэлоў, Алэн Гінзбург і першы Джэймс Бонд — Шон Конэры. Прэса пісала пра некантраляваныя эрэкцыі ў сэкс-скрынях, папулярнасьць набылі ручныя пераносныя акумулятары таямнічай энэргіі, Райх нават пабудаваў аргонную ўстаноўку для выкліканьня дажджу, і, калі верыць публікацыі ў мясцовай газэце штату Мэйн, атрымаў за гэта грошы ад шчасьлівых фэрмэраў.

З Райхам зьвязваюць знакаміты пастулят з раману «1984» Джорджа Орвэла: «Мы скасуем аргазм». Мэйлер, здаецца, гатовы быў шукаць аргазм нават у халадзільніку. У пасьляслоўі ён бярэ імя «Магда» ў двукосьсе, што азначае — псэўданім. Увесь анэкдот спатрэбіўся амэрыканскаму аўтару, каб напісаць:

Павал ня думае, што Лі што-небудзь рабіў з Магдай.

Больш гіганты менскага сэксу 1960-х «Гандончык» і «Магда» нідзе ў кнізе не ўсплываюць.

Але тэма сэксу на гэтым не сканчаецца.



Цнота

Былі, былі ў 1960-м у Менску і цнатлівыя людзі.

Дзёньнік ЛГО
Дадатковая старонка. Чэрвень 1960

Эла Герман — прыгажуня-габрэйка з чорнымі ядвабнымі валасамі, з прыгожымі цёмнымі вачыма і скурай белай, як сьнег; цудоўная ўсьмешка і добры, але непрадказальны характар. Яе адзіны недахоп — у свае 24 гады яна захавала цноту, бо так сама пажадала. Я сустрэў яе, калі яна пачала працаваць на заводзе. Я яе пабачыў і, магчыма, закахаўся зь першага погляду.

На заводзе ў Освальда былі тры канфліктныя сытуацыі: калі ён разабраў падрыхтаваны да працы чужы прэс, калі аднойчы задзёр ногі на стол і абвясьціў, што гэта сядзячая забастоўка, і трэцяя — з-за Элы. Ён дапамагаў ёй з ангельскай у пакоі адпачынку і выключыў радыё. Іншы рабочы ўстаў

і зноў уключыў. Освальд ізноў выключыў і сказаў: «Расейская сьвіньня!»

І не атрымаў у адказ па пысе. Хутчэй за ўсё, не таму, што Макс Прахорчык, як звалі рабочага, ня быў расейцам, а таму што аднойчы ён ужо сутыкнуўся з Освальдам і потым быў вымушаны выбачацца — гэта ён некалі ўзяў Освальда за грудкі ў спрэчцы за прэс. Рабочы пакінуў пакой.

Апроч недарэчнай абразы па нацыянальнай прыкмеце свайго будучага мужа (Прахорчык ажаніўся з Элай Герман ужо пасьля ад'езду Освальда), Эла ўзгадала, а Мэйлер цытуе яшчэ некалькі выказваньняў Освальда:

Я багаты жаніх — у мяне кватэра!

Калі ў будучыні нам што-небудзь спатрэбіцца, я магу пайсьці да мэра. Мы атрымаем, што трэба.

У траўні 1960 году над Уралам быў зьбіты амэрыканскі самалёт-разьведчык У-2, і жывым захоплены пілёт Фрэнсіс Гэры Паўэрс:

Эла, думаеш мне гэта пашкодзіць, бо я амэрыканец?

Тут, у Менску, мяне не відаць. Але калі я прыехаў у Маскву, я сапраўды вылучаўся.

І апошняе:

Калі я вярнуся ў Амэрыку, мяне заб'юць.

Ня самы спакойны душэўны стан.

Але наўрад ці прароцтва. Усё ж гэта ўспаміны Элы пасьля таго, як усё адбылося, і нагаворана і напісана было шмат усяго і усялякага.

І ўсё ж...



Халтуршчыкі з КДБ

Аднойчы, калі Освальд праводзіў Элу дадому, да іх падбегла дзяўчына, у якой вырвалі сумачку. Освальд не пабег за злодзеем, а спытаў у Элы, ці нельга прайсьці іншай вуліцай. І яны пайшлі іншай дарогай. Ахоўнікі законнасьці з КДБ у такія сытуацыі ня ўмешваліся.

Рапарт вонкавага назіраньня КДБ
02.07.60
Ад 12:00 да 24:00

У 14:30 Лі Гарві выйшаў з працы і пайшоў на абед у кафэ самаабслугоўваньня на плошчы Перамогі. Пад'еў, быў дома ў 15:00.

У 16:00 выйшаў з дому, сеў на тралейбус № 1 на плошчы Перамогі і паехаў да Цэнтральнай плошчы без аплаты праезду. Выйшаў праз заднія дзьверы і пайшоў у краму саюздруку № 1 на вуліцы Маркса.

Там купіў некалькі газэт і пайшоў у гастраном № 13 на праспэкце Сталіна. Нічога не купіў, вый-

шаў, пайшоў у ГУМ. Паглядзеў тавары ў аддзеле пластмасы, нічога не набыў і пайшоў у кветкавую краму, затым у булачную, потым у кафэ «Вясна». Выйшаў з кафэ праз 5 хвілін, на прыпынку «Камсамольская» сеў на тралейбус № 1, выйшаў на плошчы Перамогі і быў дома ў 16:50.

У 20:20 Лі Гарві выйшаў з дому і хутка пайшоў да Опэрнага тэатру. Там пачаў хадзіць туды-сюды каля цэнтральнага ўваходу. Праз 10 хвілін пайшоў у бок сквэру і на галоўнай алеі сустрэўся зь незнаёмай жанчынай, мянушка «Дора». Яны павіталіся поціскам рук і пачалі гаварыць. Пагаварыўшы хвіліны тры, яны разышліся, не разьвітаўшыся. «Дора» пайшла ў жылы дом на Лаўска-Набярэжнай вуліцы, а Лі Гарві застаўся на плошчы. Праз 20 хвілін «Дора» вярнулася, нешта сказала, і яны, узяўшыся за рукі, пайшлі да цырку.

Паглядзелі на рэкляму ў вітрынах, пасьля гулялі па праспэкце Сталіна каля 35 хвілін і гаварылі пра нешта.

У 21:45 Лі Гарві і «Дора» пайшлі ў цырк. Лі Гарві прад'явіў квіткі, і яны занялі свае месцы ў 10-м радзе і пачалі глядзець амэрыканскі фільм «Лілі». У 23:45, пасьля заканчэньня фільму, яны павольна пайшлі да дому № 22 на Лаўска-Набярэжнай, там спыніліся, пагаварылі хвілін 15, пасьля разьвіталіся. «Дора» ўвайшла ў свой дом (асоба высьвятляецца), а Лі Гарві пайшоў дадому і быў там у 24:00. Назіраньне ў гэты момант было спыненае да наступнай раніцы.

Самае цікавае ў гэтым рапарце — дата.

Освальд пазнаёміўся з Герман яшчэ зімой, у першыя дні на заводзе.

І гэтае знаёмства заставалася невядомым для КДБ паўгода! Прынамсі, для групы вонкавага назіраньня.

Во засакрэцілі.



Разьбітае сэрца Освальда

Увосень 1960-га Освальд круціць раманы адразу з чатырма дзяўчатамі: Інай з кансэрваторыі, Нэляй з ін'язу, Розай з Інтурысту і Элай з заводу. Але Менск горад маленькі, і здараецца непазьбежнае — яны сустракаюцца.

Дзёньнік ЛГО
18 кастрычніка 1960

Мой 21-ы дзень нараджэньня, сустракаю з Розай, Паўлам, Элай маленькім сьвяткаваньнем у мяне ў кватэры.

Эла вельмі прыгожая расейская габрэйка, зь якой я апошнім часам гуляю, працуе таксама на радыёзаводзе. Роза і Эла раўнуюць адна адну, і гэта абуджае ў мяне цёплыя пачуцьці. Абедзьве ўпершыню ў мяне. Эла і Павал дораць мне папяльніцы (я не палю), сьмяемся.

Освальд ня піша, што потым на вечарынцы зьяўляецца трэцяя госьця — Іна, што пасьля вы-

клікае бурную размову з Элай. У выніку Освальд разьвітваецца з музыканткай, спыняе паходы ў інтэрнат да студэнткі, ня звоніць перакладчыцы і выбірае Элу.

Толькі, магчыма, ня так хутка і не ў такой пасьлядоўнасьці — вернемся на пару дзёньнікавых старонак назад.

У кастрычніку 1960 году мы становімся вельмі блізкія, кульмінацыяй стаў палавы акт 21 кастрычніка. Яна была цнатлівая і вельмі цікавая. Мы сустракаліся такім чынам 4 ці 5 разоў, апошні — 4 лістапада 1960-га.

Гэтак Освальд піша пра Іну.

Але далей з Элай усё адбываецца хутка. Нават вельмі хутка.

Дзёньнік ЛГО
1 студзеня 1961

Новы год сустракаю ў доме Элы Герман. Думаю, я закахаўся. Яна адхіліла мае менш высакародныя заляцаньні, мы п'ем і закусваем у прысутнасьці яе сям'і ў вельмі гасьціннай атмасфэры. Потым я іду дадому п'яны і шчасьлівы. Ідучы ўздоўж рэчкі дадому, я вырашаю зрабіць Эле прапанову выйсьці замуж.

Праз тры дзесяцігодзьдзі Эла Герман пераказала Мэйлеру словы, якія пачула ад сваёй маці раніцай 1 студзеня 1961 году:

— Эла, гэта твая справа — ты сама выбірай. Але я нешта хачу табе сказаць: у 1939-м цябе маглі арыштаваць толькі за тое, што ты нарадзілася ў Польшчы.

У сталінскім СССР арыштоўвалі ня толькі за тое, што нарадзіўся ў няправільнай краіне, але й за тое, што ў няправільнай сям'і ад няправільных бацькоў. Але Эла разумела, што маці казала не пра мінулае, а пра будучыню.

Дзёньнік ЛГО
2 студзеня 1961

Пасьля прыемнай прагулкі пад ручку ў мясцовы кінатэатар мы вяртаемся дадому, і на прыступках я раблю прапанову выйсьці замуж. Яна вагаецца, потым адмаўляе. Маё каханьне сапраўднае, а ў яе яго няма. У яе іншыя прычыны, апроч адсутнасьці каханьня: я амэрыканец, і аднойчы мяне могуць арыштаваць, проста таму, як, напрыклад, польская інтэрвэнцыя ў 1920-я прывяла да арышту ўсіх грамадзянаў Савецкага Саюзу польскага паходжаньня. «Ты разумееш, якое міжнароднае становішча, зашмат усяго супраць цябе, і ты нават пра гэта ня ведаеш».


Я ў шоку. Яна фыркае з маёй някемлівасьці і паварочваецца, каб ісьці. (Я занадта ўражаны, каб думаць!) Я разумею, што яна ніколі не ўспрымала мяне сур'ёзна, а толькі карысталася з таго, што я амэрыканец, каб іншыя дзяўчаты, якія лічылі мяне не такім, як астатнія расейскія хлопцы, зайздросьцілі. Я ў адчаі.

Мэйлеру расказвалі, што калі Освальд ішоў па цэху на сваё працоўнае месца, дзяўчаты-зборшчыцы сапраўды наперабой віталі яго «Алік, Алік!» І будучы муж Элы сапраўды зьвярнуў увагу на яе пасьля канфлікту з Освальдам з-за ўключанага радыё.

Аднойчы на беразе Сьвіслачы Освальд і «Дора» паспрачаліся, як правільна пяюць жабы. Эла казала — «ква», Освальд — «фрок».

Не паразумеліся.

У Беларусі жабы крэкчуць.



«Я — амэрыканскі грамадзянін»

Галоўную падзею пачатку 1961-га — грашовую рэформу, якая скасавала адзін нуль на грошах, заробках і цэнах, Освальд не заўважыў ці не палічыў дастаткова істотнай, каб занесьці ў дзёньнік.

Думкі ў яго былі пра іншае.

Дзёньнік ЛГО
3 студзеня 1961

Я ў адчаі ад Элы. Я кахаю яе, але што зробіш? Гэты стан страху заўсёды быў у Савецкім Саюзе.

КДБ насьцярожыўся, але потым расслабіўся: як генэрал «Гузьмін» патлумачыў Мэйлеру, Освальд засмуціўся, але не парэзаў ізноў вены, ня кінуў працу, не захварэў, ня стаў піць, не рабіў нічога рызыкоўнага. Не было ніякіх падставаў для дадатковых захадаў.

КДБ не памыліўся ў ацэнцы псыхалягічнага стану Освальда. Ён думаў зусім пра іншае.

Дзёньнік ЛГО
4 студзеня 1961

Праз год пасьля таго, як я атрымаў дазвол на жыхарства, мяне выклікалі ў пашпартны стол і спыталі, ці хачу я атрымаць грамадзянства. Я сказаў — не, проста працягніце мой часовы пашпарт. Пагадзіліся, і мае дакумэнты працягнутыя да 4 студзеня 1962.

31 студзеня 1961

4-31 студзеня я пачынаю пераглядаць сваё жаданьне застацца. Праца нудная, грошы, якія я атрымліваю, няма на што патраціць. Ні начных клюбаў, ні боўлінгу. Ні месцаў адпачынку, апроч танцаў у клюбе прафсаюзаў, якіх мне ўжо было досыць.

1 лютага 1961

Раблю першы запыт у амэрыканскую амбасаду ў Маскве для перагляду сваёй пазыцыі: я заявіў, што «хацеў бы вярнуцца ў ЗША».

28 лютага 1961

Атрымаў ліст з амбасады. Рычард Снайдэр піша, што «я магу прыйсьці на інтэрвію ў любы час, калі захачу».

16 сакавіка 1961

1-16 сакавіка жыву ў чаканьні вяртаньня ў ЗША. Я расказаў Зігеру, ён падтрымаў маю ацэнку, але параіў нікому з расейцаў не казаць пра маё жаданьне вярнуцца. Я разумею, чаму.

Освальд пачаў абмяркоўваць жаданьне зьехаць

зь Менску яшчэ у мінулым годзе — з Элай Герман. Але напачатку гаворка ішла не пра Амэрыку, а пра іншую сацыялістычную краіну — Чэхаславакію. Ці не пагадзілася б яна жыць у Празе?..

Але гэтыя гутаркі вяліся на вуліцы і заставаліся ў сакрэце ад КДБ.

Рапарт вонкавага назіраньня КДБ
23.12.60
08:00-24:00

У 20:45 аб'ект выйшаў з дому і пайшоў на ўсход да дому № 22, кв. 2 на Лаўска-Набярэжнай вуліцы. Праз 10 хвілін ён выйшаў з кантактам «Дора», і яны разам, пра нешта размаўляючы, пайшлі ўздоўж набярэжнай Сьвіслачы і ў 21:15 прыйшлі да кватэры аб'екта.

Уведаць пра намеры Освальда КДБ мог альбо ад свайго чалавека, якому той давяраў, альбо шляхам праслухоўваньня яго размоваў.

Але Освальд жыў адзін, тэлефона не было, а праслухоўваньне мае сэнс толькі калі ў кватэры ёсьць нехта яшчэ.

Заставаліся лісты. СССР падпісаў Жэнэўскую канвэнцыю, якая не дазваляла пэрлюстрацыю пошты, але гэта нікога ня ўводзіла ў зман.

Першы ліст Освальда ў амбасаду ЗША быў адпраўлены зь Менску 5 лютага — у Маскве яго атрымалі толькі праз восем дзён.

Тыя, хто яго раскрыў у Менску, пабачылі недвухсэнсоўны тэкст:

Прашу разгледзець маю просьбу пра вяртаньне майго амэрыканскага пашпарта. Я жадаю вярнуцца ў Злучаныя Штаты пры ўмове, што

мы дасягнем пэўнага пагадненьня адносна спыненьня любога юрыдычнага перасьледу супраць мяне. Калі так, тады я змагу зьвярнуцца да расейскіх уладаў, каб яны дазволілі мне зьехаць. Калі я змагу прад'явіць ім мой амэрыканскі пашпарт, я лічу, што мне дадуць выязную візу. Яны ніколі не настойвалі, каб я прыняў расейскае грамадзянства. Я жыву тут з часовымі паперамі для замежніка. Я не магу пакінуць Менску без дазволу, і таму пішу, а не зьявіўся асабіста. Спадзяюся, што, аднаўляючы маю адказнасьць перад Амэрыкай, вы будзеце памятаць пра сваю, каб зрабіць усё магчымае і дапамагчы мне, бо я амэрыканскі грамадзянін.

Гэта пачатак вялікай перапіскі пра вяртаньне, у якой будуць удзельнічаць амэрыканская амбасада ў Маскве, Дзярждэпартамэнт у Вашынгтоне і Освальд у Менску.

Мэйлер адзначае агрэсіўную настойлівасьць Освальда — ён умела выкарыстоўвае дэмагогію, цісьне на свае правы амэрыканскага грамадзяніна і патрабуе, вымагае, дамагаецца пашпарта, гарантыяў, грошай — аж пакуль не атрымае. Але на гэта спатрэбіцца больш за год.

Освальд будзе рабіць выгляд, што яму ўсё падабаецца, і ні з кім больш не загаворыць пра прынятае рашэньне аж да канца чэрвеня.

Гэтае маўчаньне стане глебай для наступных падзеяў, якія хутка ўцягнуць у свой вір зусім новыя пэрсанажы і непазнавальна і назаўсёды зьменяць іх жыцьцё.



На танцы

Тэлевізара ў Освальда не было, ён пераслухаў увесь опэрны рэпэртуар, спыніў візыты ў інтэрнат да студэнтак ін'язу, перастаў вітацца з Элай і нават на танцы хадзіў без ахвоты — больш проста не было куды.

Дзёньнік ЛГО
17 сакавіка 1961

Я і Эрык пайшлі ў прафсаюзы на танцы. Нудна, але ў апошнюю гадзіну мяне пазнаёмілі зь дзяўчынай з французскай стрыжкай, у чырвонай сукенцы і белых туфлях. Мы танцуем, і я прашу дазволу правесьці яе. Праводжу, разам зь яшчэ пяцьцю кавалерамі. Яе завуць Марына. Мы адразу адно аднаму спадабаліся. Яна дае мне нумар тэлефона і ад'яжджае ў таксі зь не такім новым, як я, сябрам. Я іду дамоў пешкі.

У пісьмовым пераказе свайго менскага жыцьця

для ФБР Марына Прусакова падрабязна апісвае вечар знаёмства на танцах у Палацы прафсаюзаў.

Спачатку плянавалася лекцыя пра Амэрыку — выступала прафэсар Лідзія Чаркасава, тая самая, якую Освальд мог бачыць у кіначасопісе пра жаночы дзень. Паводле таго самага прынцыпу, з-за якога яе саджалі ў прэзыдыюм юбілейных сходаў, яна была ўключаная ў склад дэлегацыі БССР на 15-ю сэсію ААН, плыла разам з Хрушчовым на цеплаходзе «Балтыка» праз Атлянтыку ў Нью Ёрк, прывезла фота — на палубе яна сядзіць леваруч ад кіраўніка партыі, разам зь іншымі сябрамі дэлегацыі.

Марыну танцы заўсёды цікавілі больш за міжнароднае становішча. Яна скончыла фармацэўтычную вучэльню і пачала працаваць у Ленінградзе, дзе жыла з айчымам, але жыцьцё там ня ладзілася, і яна пераехала да дзядзькі ў Менск. У падпалкоўніка міліцыі Ільлі Прусакова і яго жонкі Валі сваіх дзяцей не было, кватэра была вялікая, і пляменьніца пачувалася як дома.

На вечарыну яе запрасіў закаханы ў яе студэнт мэдінстытуту Аляксандар Піскалёў. У той сакавіцкі дзень яна затрымалася на працы ў аптэцы 3-й клінічнай бальніцы, потым дзьве гадзіны пераадзявалася і сядзела перад люстэркам, зрабіла прычоску а-ля Брыжыт Бардо, затым страціла жаданьне і пераадзелася ў хатнюю сукенку. І тут яе дзядзька пачаў кпіць, маўляў, ці варта дзеля гэтага было дзьве гадзіны тырчэць перад люстэркам. Яна потым скажа:

І нарэшце, нешта проста пацягнула мяне на тую вечарыну, нават супраць маёй волі. Я магу

шчыра сказаць — я адчувала нешта незвычайнае ў той вечар, але не надала гэтаму ўвагі.

З холаду, сьвежая, эфэктная, яна ўваходзіць у залю напрыканцы вечарыны ў суправаджэньні Піскалёва, які выбягаў сустракаць яе кожныя дзесяць хвілін. Адразу даведваецца, што іншы хлопец, які ёй падабаўся, сышоў, як толькі пабачыў яе зь Піскалёвым. Яшчэ адзін студэнт-мэдык, душа кампаніі Юры Меражынскі, сын прамоўцы — прафэсара Чаркасавай, знаёміць яе з Алікам, якога яна прыняла за жыхара Прыбалтыкі. У танцы яны застаюцца сам- насам.

Але далей яе ўспаміны пра тое, як скончыўся вечар, адрозьніваюцца ад запісу ў дзёньніку Освальда.

Зь пісьмовага сьведчаньня Марыны Освальд для ФБР:

Пасьля танцаў мы ўсе групай пайшлі дадому да Юрыя, чыя маці была ў ЗША. Я памятаю, што яны паспрачаліся крыху з Алікам, бо Алік гаварыў вельмі станоўча пра сваю краіну і вельмі цікава. Мне было вельмі прыемна, што ён стараўся прадставіць сваю краіну зь лепшага боку.

Запісаў амэрыканскай лекцыі прафэсара Чаркасавай і яе спрэчак з Освальдам няма. Освальд яшчэ некалькі разоў адведваў яе дома, глядзеў фатаграфіі, размаўлялі — пакуль муж, таксама прафэсар мэдінстытуту Меражынскі, напалоханы візытамі амэрыканца, не запатрабаваў іх спыніць.

Мэйлер сустракаўся з Чаркасавай і яе сынам Юрыем і ў яе прысутнасьці спрабаваў высьветліць, наколькі праўдзівы аповед яе сына. Юры хваліўся,

што спаў з Марынай перад шлюбам і пасьля, расказваў, як гадзінамі потым яго цягалі на допыты, як хаваўся ў Маскве ад менскага КДБ. Маці спрабавала пярэчыць, расказвала Мэйлеру пра іншую прычыну ад'езду зь Менску — лячыць сухоты, сын абзываў яе сталіністкай, і ўвесь скандал, падрабязнае апісаньне якога займае старонкі кнігі Мэйлера, нагадвае вартае жалю трызьненьне дэградаванага алькаголіка, ніводнаму слову якога нельга даваць веры.

Са сьведчаньня Марыны Освальд для ФБР:

У той вечар Саша і Алік правялі мяне дадому. Мы засталіся адны на вуліцы на нейкі момант, і Лі спытаўся, калі яшчэ можа сустрэцца. Я сказала, што, магчыма, зноў прыйду на танцы туды, дзе мы сустрэліся, але дакладна не абяцала. Але калі потым праз тыдзень я пайшла зь сябрам на танцы — Лі быў там. У той вечар ён прыйшоў са мной дадому, і я прадставіла яго сваёй цётцы. Цётцы спадабаліся яго сьціпласьць і ветлівасьць, а таксама тое, што ён быў вельмі акуратны. Яна сказала мне са сьмехам, што ў маёй калекцыі не было толькі амэрыканца.

Хто больш дакладна запомніў пачатак знаёмства — Освальд, які датаваў свае запісы досыць вольна і часам сумяшчаў падзеі, ці Марына, якая пісала сваё сьведчаньне амаль праз тры гады пасьля сустрэчы, ня так і важна.

Сустрэліся.



Дэман амнэзіі

Праз чатыры дзесяцігодзьдзі пасьля таго, як музыканты склалі свае трубы і кантрабасы, як апошні наведнік пакінуў Палац прафсаюзаў, як пагасла сьвятло і адзіны, хто заставаўся на пляцы перад палацам, быў помнік Сталіну, у залю вярнуўся адзін з танцораў.

Разьдзел кнігі Эрнста Цітаўца, прысьвечаны танцам, называецца «Лі сустракае сваю будучую жонку». У эпіграф вынесеныя словы Льва Талстога:

Дзіўная рэч, якая поўная бывае ілюзія таго, што прыгажосьць ёсьць дабром.

Цітавец піша:

Вечар 17 сакавіка 1961 году стаў гістарычным момантам жыцьця Лі. У той вечар ён сустрэне прыгожую расейскую дзяўчыну, якую звалі Марына Прусакова, якая неўзабаве стане яго жонкай. Гэта здарылася падчас танцавальнай ве-

чарынкі і, пры блізкім разглядзе, адкрыла шэраг цікавых супадзеньняў. Супадзеньняў, якія даюць падставу думаць, што ў рух былі прыведзеныя большыя сілы, чым выпадковая рамантычная сустрэча маладога чалавека і дзяўчыны.

Далей на 41-й старонцы (гэта другі па памеры разьдзел кнігі, большая толькі заключная частка) аўтар дасьледуе гэтыя сілы.

Дакладней — дасьледуе, здаецца, усё, апроч гэтых сілаў. Спачатку гаворка ідзе пра прафэсара Чаркасаву і яе вывучэньне гіпаглікемічнага інсулінавага шоку ў псыхіятрычных пацыентаў, пра яе мужа прафэсара Міражынскага, пра іх дачу ў Ждановічах, пра паездку Чаркасавай у ААН, пра яе грошы, пра яе сына Юрыя, пра яго хваробу, пра яго дзяўчат, пра яго сяброў, пра сваякоў яго сяброў...

Далей ідзе блізкі, праз сорак гадоў, разгляд атмасфэры — выкладчыкі бязь белых халатаў, студэнты бяз гальштукаў, дзяўчаты, якія танчаць адна з адной — не лесьбіянкі, а наступствы вайны, праход з Освальдам па калідорах і лесьвіцах, разглядваньне дзявочых твараў, зазіраньне ў пыльныя каморкі за сцэнай, і расставаньне — амэрыканец ідзе слухаць лекцыю, а Цітавец, як тады казалі, сачкуе.

Пасьля лекцыі пачынаюцца танцы, падчас якіх Освальд зноў знаходзіць Цітаўца і просіць дапамагчы паразумецца зь дзяўчынай, зь якой толькі што пазнаёміўся. На дзьвюх старонках аўтар апісвае, як яны ідуць праз залю і што ён пры гэтым думае, а на трэцяй старонцы паведамляе, што менавіта перакладаў: нумар тэлефона і адрас.

Гэта ўсё.

Так, прынамсі, піша сам Цітавец:

Лі ўважліва ўслухоўваўся праз танцавальны пандэмоніюм у залі, што я яму перакладаў. Аказалася няшмат. Марына дала свой хатні нумар тэлефону і сказала яму, дзе жыве. Ён папрасіў мяне паўтарыць, я паўтарыў. Аказалася, што гэта ўся інфармацыя, якую Лі хацеў ведаць дакладна.

Больш Цітавец у гэты вечар з Освальдам і Марынай ня бачыцца.

Пандэмоніюмам называецца месца ў пекле, дзе жывуць дэманы. На наступных трох дзясятках старонак аўтар выпускае сваіх дэманаў на волю: дэман рэўнасьці, дэман падазронасьці, дэман канспіралёгіі, дэман недаверу, дэман двухсэнсоўнасьці, дэман здрады, — як гіганцкія матылькі, яны запаўняюць танцавальную залю і гістарычную прастору вакол яе ў Менску і Амэрыцы.

Гаворка, канечне, пра дэманічны КДБ — пра тое, як загадзя былі расьпісаныя ролі ўсіх, хто быў на танцах, як арганізаваная харэаграфія знаёмства, як марыянэткі танчылі пад чужую дыктоўку. І выснова — з сэнсам, няўлоўным, як матылёк:

Хоць амаль кожны вакол Освальда, здавалася, працаваў узгодненым чынам, каб зьвесьці амэрыканца і Марыну разам, малаверагодна, што хто-небудзь ведаў, каго яшчэ кантралюе КДБ, а хто проста на падхваце.

Іншымі словамі, мала таго, што ўся кампанія дружна займалася зводніцтвам, але яшчэ й ня ведала, што рабіла. А Цітавец ведаў:

Такім чынам прафэсіяналы КДБ дамагаліся сваіх мэтаў.

Для гэтага дэтэктыўнага разьдзелу больш пасаваў бы эпіграф з трагедыі «Атэла» Шэксьпіра, чым з «Крэйцаравай санаты» (менавіта там Цітавец знайшоў эпіграф пра падступную небясьпеку прыгажосьці). Хоць зварот да самага жанчынаненавісьніцкага твору Талстога зь яго лютым антысэксуалізмам таксама небеспадстаўны. Цітавец піша, што падчас знаёмства чары Марыны яго ня ўразілі, яна гэта заўважыла і потым казала, што ён ёй напачатку не спадабаўся.

Але прызнае:

Ад гэтай дзяўчыны зыходзіла жывёльная сэксуальнасьць, якая адштурхоўвала мяне, але, магчыма, менавіта гэтая рыса прыцягнула Лі.

Літаратуразнаўцы лічаць, што «Крэйцарава саната» была вельмі асабістай выявай драмы, якую перажываў аўтар.

Свой аповед Талсты адкрывае эпіграфам з Эвангельля паводле Мацьвея:

Я ж кажу вам: кожны, хто з пажадлівасьцю глядзіць на жанчыну, ужо ўчыніў зь ёю распусту ў сэрцы сваім.

Цітавец памятае, што ў сакавіку 1961-га ад Марыны крыху пахла віном і цыгарэтамі, памятае фрызуру а-ля Брыжыт Бардо, памятае яе вялікія шэрыя вочы, памятае яе вусны і асаблівасьці ўсьмешкі, памятае нізкі выраз сукенкі, які падкрэсьліваў грудзі, памятае яе белыя басаножкі на высокіх абцасах, памятае яе крыху сутулую фігуру, памятае, як яна глядзела на яго, як глядзелі на яе.

Што адбывалася ў сэрцы яго ў тым сакавіку, Цітавец ня піша. Можа таму, што ня памятае.

Забыўся дасьледнік дэманаў з КДБ, што гэта ён сам здабыў у інстытуцкім камітэце камсамолу запрашальныя білеты на дваіх і прывёў Освальда на танцы.

Дэман амнэзіі праляцеў.



З танцаў

Першы раз у кнізе Мэйлера імя Освальда згадваецца на 25 старонцы і зноў зьнікае, каб зьявіцца ўжо толькі праз паўтара дзясятка старонак у другой частцы, якая пачынаецца яго прыездам у Маскву зь Фінляндыі.

Першая частка называецца «Прыгоды Валі» і цалкам прысьвечаная менскай цётцы будучай жонкі Освальда Валянціне Прусаковай. Цёткі ня роднай — Марына была пляменьніцай яе мужа, падпалкоўніка МУС Ільлі Прусакова.

Так пачынаюцца многія раманы XVIII—XIX стагодзьдзяў, з доўгай экспазыцыі, гістарычнага фону, філязофскіх адступленьняў, ляндшафтных дэталяў, батанічных зьвестак, мэтэяралягічных зводак і падрабязнай, не раўнуючы як у Кнізе Быцьця, радаслоўнай героя: прапрадзед Томас Гепварт Освальд нарадзіў Уільяма Освальда, які нарадзіў Робэрта Эдварда Лі Освальда, які нарадзіў Лі Гарві...

Але героем кнігі была зусім іншая асоба. «Валя»

— пабочны пэрсанаж, сустракаецца з Освальдам, калі тэрмін яго знаходжаньня ў Савецкім Саюзе пераваліў за палову, у ніякіх драматычных падзеях у гэты час яна ня ўдзельнічае.

Гэта таксама не прыём мадэрнізму — стыль напачатку нагадвае расьцягнутае дакумэнтальнае журналісцкае расьсьледаваньне ўперамешку з эсэістычнымі адступленьнямі і жаданьнем упіхнуць усё, што ўдалося ўведаць. Але хоць клясычныя жанры ня скончыліся разам з эпохай клясыцызму, пытаньне, што ёсьць клясыкай, даўно ўжо саступіла месца новаму, больш важнаму пытаньню — што працуе, што не.

Як, напрыклад, працуе аповед знаёмай Освальда супрацоўніцы Інтурысту Стэліны пра гатэль «Менск».

Прыехала пара, канадыец зь сяброўкай, якая была мадэлькай і мела вугорскі пашпарт, але адміністратар адмовілася пасяліць іх у адным пакоі бяз штампу ў пашпарце. Канадыец не хацеў скандалу, але вугорская дзяўчына надта раззлавалася.

Калі ён пайшоў у свой нумар, гэтая мадэлька выцягнула са свайго нумару ложак на калідор, разьдзелася, легла голая на пакрывала, запаліла цыгарэту і пачала вішчаць на ўвесь голас.

У гатэлі было поўна фінаў, якія пілі так шмат, што ня мелі ніякіх комплексаў. Тэрмінова выклікалі Стэліну, на калідоры вакол голай мадэлькі ўжо сталі зьбірацца фіны.

Калі перакладчыца папрасіла яе адзецца, у адказ пачула:

«Б...ь! Калі мой сябар ня возьме мяне ў свой

нумар, няхай тады гэтыя фіны трахнуць мяне, усе разам!».

Грахоўных падарожнікаў выселілі з гатэлю.*

У інтэрвію пасьля публікацыі Мэйлер адказваў на пытаньне — чаму ён так пачаў кнігу?

— Я пачаў кнігу зь цёткі, якая мела надзвычайны досьвед падчас вайны, і я адчуваў, што гэта задасьць рамкі. Яе (Марыны) цётка — цудоўная жанчына, соль зямлі, якая пераказвала неверагодныя падзеі зь дзіўным, прыемным пазытыўным стаўленьнем. Марына была больш складаная, чым цётка, я не скажу — хваравітая, гэта будзе няслушна, зьняважліва, але жыцьцё яе больш перакруціла. Яна была больш злая, больш ускладнёная, яе турбавала нашмат больш рэчаў. Кніга пачынаецца зь цёткі Валі, яе дзяцінства, вайны, прымусовай працы ў Нямеччыне, сустрэчы з будучым мужам, а потым прыяжджае пляменьніца зь Ленінграду, у якой праблемы. Так пачынаецца кніга, і ў канцы доўгай першай часткі Марына аднойчы ўвечары вяртаецца да-

*Чаму Мэйлер уключыў гэтую гісторыю ў кнігу? Першапачатковае адчуваньне, што проста бракуе рэдактуры — і ня толькі ў гэтым месцы. Але потым у Вікіпэдыі я пабачыў, што ўсё гэта мае прыстойную назву «New Journalism» — новая журналістыка, і што менавіта Мэйлер разам з Томам Вулфам, Трумэнам Капотэ, Гунтарам Томпсанам быў яе заснавальнікам. Гэтыя аўтары выкарыстоўвалі журналісцкую тэхніку і бачаньне для вырашэньня літаратурных задачаў. Расплывістая тэрміналёгія такога тыпу (як тут не згадаць «звышлітаратуру» Алеся Адамовіча) звычайна сьведчыць пра дзьве рэчы. Першая — аўтар на парозе нечага невядомага, якое яшчэ толькі мае быць знойдзеным, і таму зь літаратуры залез па тлумачэньні ў філязофію. Другая — новы тэрмін апраўдвае хістаньні стылю і хаос, зь якога нараджаецца нешта новае.

дому і кажа цётцы: «Валя, уставай. Адзявайся. Я прывяла амэрыканца. Звары кавы. Культурна прымі яго».

Фактычна дзеля апошняй фразы Мэйлер піша папярэднія 25 старонак.

Дарма, выходзіць, мэр Шарапаў папярэджваў амэрыканца пра некультурных людзей у Менску. Ну, можа прыежджыя. А свае — з ложка ўстануць, каб госьцю кавы зрабіць.

І нават адзенуцца.



Allegretto, allegro, allegrissimo

Освальд зробіць прапанову, а Марына прыме яе менш чым празь месяц пасьля першай сустрэчы.

Дзёньнік ЛГО
18 сакавіка 1961

Мы гуляем, я крыху расказваю пра сябе, яна шмат гаворыць пра сябе. Яе завуць Марына М. Прусакова.

30 красавіка 1961

1-30 красавіка стасункі разьвіваюцца роўна, і я вырашаю, што мне трэба яе мець, яна *(нечытэльна)* **адсылае мяне прэч, тады 15 красавіка я** *(нечытэльна)*, **яна пагаджаецца.**

Освальд крыху блытае даты.

З 29 сакавіка да 11 красавіка амэрыканец ляжаў у 4-й клінічнай бальніцы з запаленьнем вуха. Адтуль ён пазваніў па тэлефоне, які дала яму Марына. Адказала цётка. Набліжаўся Вялікдзень, і цётка настаяла, каб пляменьніца схадзіла ў адведкі — усё

ж сьвята. Марына апранала свой белы халат фармацэўта і магла бесьперашкодна адведваць хворага.

Менавіта ў бальніцы Освальд упершыню зрабіў Марыне прапанову. Яна не адмовіла, хаця не ўспрыняла сур'ёзна. Пасьля выпіскі Освальд зноў быў госьцем і спадабаўся ня толькі цётцы, але й дзядзьку, які нават папрасіў яго прыглядаць за пляменьніцай, бо ў яе вецер у галаве. Апроч таго, ён быў вельмі акуратны і ў яго была свая кватэра.

Дзёньнік ЛГО

30 красавіка, пасьля 7 дзён адтэрміноўкі шлюбу ў загсе з-за майго незвычайнага пашпарта, нам дазваляюць зарэгістравацца як мужу і жонцы. Дзьве сяброўкі Марыны выступаюць у ролі сьведак нявесты.

Мы ўзялі шлюб. У хаце яе цёткі спраўляем вясельле, на якім прысутнічаюць каля 20 сяброў і суседзяў. Яны жадаюць нам шчасьця, нягледзячы на маё паходжаньне і акцэнт, якія агулам бянтэжаць расейцаў. Бо замежнікі вельмі рэдкія ў Савецкім Саюзе, нават турысты. Пасьля вечара выпіўкі і закускі дзядзька Вузэр распачаў бойку, потым перагарэў засьцерагальнік і адключылася сьвятло, мы выйшлі і за 15 хвілін дайшлі да дому. Мы жылі побач, і апоўначы былі дома.

І тут Мэйлер робіць тое, што звычайна робіць каманда КДБ: наводзіць павелічальнае шкло на прыватнае жыцьцё маладой пары, нават, трэба прызнаць, больш пільна, чым КДБ.

Разьдзел «Шлюбная ноч» прысьвечаны высьвятленьню пытаньня, ці была Марына Прусакова цнатліўкай, калі выйшла за Освальда.

Мэйлер пералічвае чуткі пра яе бурную маладосьць у Ленінградзе. Пакаёўка ў гатэлі «Менск» называе яе «папсаванае дабро», «ленінградзкая вулічная прастытутка», перакладчыца Інтурысту згадвае шок, калі Освальд на яе пытаньне, як яны разумеюцца з жонкай безь перакладчыка, прывёў словы Марыны «Выключы сьвятло» і «Пацалуй мяне, калі ласка».

Прыстойныя маладыя дзяўчаты так не гавораць, патлумачыла яна Мэйлеру. Выхаваньне не дазваляе праяўляць ініцыятыву з мужчынамі. Сэкс — гэта сяброўства, клопат, частка вялікага пачуцьця. Многія жанчыны ніколі ня чулі пра жаночы аргазм — навошта?*

Пасьля апытваньня мноства знаёмых і напаўзнаёмых Мэйлер нарэшце дае слова самой Марыне. Дае — гэта фігуральна, больш дакладна — выцягвае, выкручвае, выціскае словы з Марыны падчас пяцідзённага інтэрвію ў яе амэрыканскім доме ў Тэхасе.

Інтэрвіюер: Адзін чалавек сказаў: яна не была цнатліўкай у вясельную ноч. Яна хвалявалася,

---

*Бібліяй сямейнага жыцьця ў БССР пачатку 1960-х была «Кніга карысных парадаў», якая пісала:

«Толькі пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі полавае жыцьцё людзей ушчыльную наблізілася да тых ідэалаў, пра якія даўно марыла чалавецтва. Як і ва ўсім сваім жыцьці, гэтак і ў полавым жыцьці чалавек ня можа забыцца аб тым, што ён удзельнік нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Вырашальнымі заўсёды будуць агульныя здольнасьці чалавека, яго палітычнае і маральнае аблічча, яго разьвіцьцё, яго працаздольнасьць, яго сумленнасьць, адданасьць сваёй радзіме, яго любоў да грамадзтва. Любое ўхіленьне чалавека ад правільных грамадзкіх паводзінаў абавязкова прыводзіць да бязладных паводзінаў у грамадзтве, у т л. прыводзіць да распуснага полавага жыцьця».

што Лі ўведае, пайшла ў аптэку і нешта купіла, каб абараніць шлюб.

Марына: ОК.

Інт.: Дакладна так было сказана.

М.: ОК. Гэта праўда. І што? Трэба быць сэксуальным вычварэнцам, каб пяць дзён распытваць пра гэтую тэму. Хіба ня досыць?

Інт.: Павал казаў пра выпадак на заводзе, калі хлопцы падышлі да Лі і пачалі падколваць: ну што, была твая жонка цэлка ці не? Колькі крыві было на прасьціне? Але мы ня ведаем, што Лі адказаў.

М.: Я ня ведаю.

Інт.: Ніхто ня памятае адказу. Мы ня ведаем, можа, яго нешта турбавала. Важна ведаць. Калі ён не пагаджаўся з Вамі ці калі вы сварыліся.

М.: Ваша здагадка ня горшая за маю.

Інт.: Мы не цікавімся сэксам самім па сабе, а тым, што Лі ведаў пра Ваша мінулае. Як гэта на яго ўплывала?

М.: Я сур'ёзна ставілася да шлюбу. Я хацела мець сям'ю.

Інт.: Давайце я скажу як ёсьць, каб не было адчуваньня, што нехта нешта хавае. Інэса сказала, зь любоўю і пяшчотай да Вас, што ў Вас быў цяжкі багаж зь Ленінграду. Пра тое, як цяжка Вам жылося ў Ленінградзе з айчымам, і што Вам не выпадала ганарыцца сваім жыцьцём там.

М.: Гэты быў ня мой выбар.

Інт.: Інэса патлумачыла, што Вы пачуваліся вельмі дрэнна і моцна перажывалі з-за такога жыцьця ў Ленінградзе, што Вам прыходзілася шукаць розныя спосабы, каб выжыць, есьці, знайсьці дзе пераначаваць.

М.: Ні разу ў жыцьці мне не плацілі грошы.

Інт.: Канечне.

М.: Я шукала каханьня ня там, дзе варта, і часам мусіла за гэта заплаціць. Мяне нават аднойчы згвалціў замежнік.

Інт.: Што?

М.: Я затрымалася ў пакоі. Ён замкнуў дзьверы. Ведаеце, як на кожным паверсе сядзіць дзяжурная з ключамі для насельнікаў? Я не магла крычаць. Я думала, што яна пра мяне падумае? Тады я змагалася з тым мужчынам. Але ўрэшце ён кінуў мяне пад сябе. Ён сказаў: калі б я ведаў, што ты цэлка, я б да цябе не дакрануўся.

Ужо пасьля выхаду кнігі ў тэлевізійным інтэрвію Мэйлер скажа, што ён быў вельмі зьдзіўлены тым значэньнем, якое Марына надала згвалтаваньню ў 17 гадоў — ён чакаў нейкага выкрыцьця, неверагодна ганебнага аповеду, а ўсё аказалася нашмат прасьцей. Такую гісторыю, на яго думку, маглі б расказаць сто тысяч амэрыканскіх дзяўчат.

М.: Лі не пытаўся, але ў шлюбную ноч я прыкінулася. Мне было страшна, я пытала ў сябе: калі ноч прыйдзе, што рабіць? Што? Ад гэтага моманту — чыстае жыцьцё, я хачу быць сур'ёзнай і я была ў жаху. Але Лі не спытаўся.

Інт.: Ён ніколі не пытаўся, ці Вы дзяўчына?

М.: Ён падзякаваў мне за гэта. І я падумала: «Божа. Пранесла, я ізноў сьвятая».

Выключы сьвятло і пацалуй — лёгкая фраза ў выпадковай размове, якая ўсплыла праз тры дзесяцігодзьдзі, каб асьвятліць інтымнае жыцьцё 1960-х у краіне, дзе сэксу, як лічылася, няма.

Мэйлер на гэтым ня спыніцца. Падчас пяцідзённай гутаркі Марына раскажа і пра апошнюю ноч у ложку з Освальдам. Освальд працаваў на кніжным складзе, жыў на кватэры ў Даласе і звычайна прыяжджаў на выходныя, але ў той чацьвер вярнуўся, каб узяць карабін, які захоўваўся дома. Увечары спрабаваў угаварыць яе, яна сказала «не падлізвайся!», бо хацела правучыць яго пасьля чарговага скандалу. Ён лёг першы, і калі прыйшла яна, ужо спаў — ці прыкідваўся. Раніцай 23 лістапада ўстаў першы, зрабіў распушчальную каву ў пластыкоўцы і ціха выйшаў, несучы загорнуты ў дзіцячую коўдру Манліхер-Каркан.

Калі пасьля забойства Кенэдзі паліцыя правядзе ператрус у доме, возьме рэчы Освальда і сыдзе, Марына пабачыць, што паліцэйскія не забралі маленькі парцалянавы кубачак, які належаў яе бабулі. Кубачак быў тонкі і празрысты на сьвятло.

Яна ўзяла яго — на дне ляжаў мужаў шлюбны пярсьцёнак зь Менску.



Тайна мядовага месяца

Наступныя запісы ў дзённіку Освальда ўражваюць як датай, гэтак і зьместам.

Дзённік Освальда
1 траўня 1961

Думаем пра сваю будучыню. Нягледзячы на тое, што я ажаніўся з Марынай, каб насаліць Эле, я закахаўся ў Марыну.

Марына раўнавала Освальда — але не да Элы.

З успамінаў Марыны Освальд

Травень быў мядовым месяцам. Вядома, мы абое працавалі, але былі вольныя пасьля 5 вечара і ў нядзелі. Хадзілі ў рэстараны, па-першае таму, што я ня мела часу гатаваць і, па-другое, ня ўмела. Ён і я любілі клясычную музыку. У нас было шмат кружэлак Чайкоўскага, ён быў улюбёным кампазытарам Лі, а таксама Грыга, Ліста, Рымскага-Корсакава, Шумана. Улюбёная опэра

Лі была «Пікавая дама»... я нават раўнавала яго да гэтай опэры.

Пасьля працы ён адразу ставіў кружэлку ня раз, а некалькі разоў.

Освальд таксама запісаў свае травеньскія перажываньні — але музыку ня згадваў.

Дзёньнік ЛГО
Канец траўня 1961

Пераход ад стану поўнай закаханасьці ад Элы да Марыны быў вельмі балючы, асабліва таму, што я штодня бачыўся з Элай на заводзе. Але міналі дні і тыдні, і я ўсё больш псыхалягічна прызвычайваўся да сваёй жонкі. Я яшчэ не сказаў жонцы пра жаданьне вярнуцца ў ЗША. Яна страшэнна ў мяне закаханая зь першага позірку. Катаньні на лодцы па Менскім возеры, прагулкі па парках, вечары дома ў цёткі Валі вызначаюць травень.

У траўні прыйшла адмова з Унівэрсытэту дружбы народаў, куды Освальд спрабаваў паступіць — унівэрсытэт браў студэнтаў з краінаў трэцяга сьвету, Освальду рэкамэндавалі зьвяртацца ў любую іншую ВНУ. Але навучаньне яго ўжо не цікавіла. Ён зрабіў іншы выбар і трымаў яго ў таямніцы.

Освальд маўчаў пра намер як мага хутчэй зьехаць у ЗША і перад вясельлем, і два месяцы пасьля.

Мэйлер назаве рашэньне нічога не сказаць пра гэта Марыне і яе сваякам самым вялікім падманам Освальда.

На гэта сумнеўнае першынство зь ня меншым правам прэтэндуе і маўчаньне пра маці і брата — Освальд казаў Марыне, што ня мае сваякоў.

Дзёньнік ЛГО
Чэрвень 1961

Працяг траўня, з той розьніцай, што мы становімся бліжэйшымі і бліжэйшымі, і я вельмі мала думаю цяпер пра Элу. Напрыканцы месяца я адкрываю сваё жаданьне вярнуцца ў Амэрыку. Мая жонка трохі зьдзіўленая. Але затым падтрымлівае мяне, каб я рабіў, што хачу. У ліпені я вырашыў узяць два тыдні адпачынку і паехаць у Маскву (без дазволу міліцыі) у амэрыканскую амбасаду. Каб уведаць наконт атрыманьня майго амэрыканскага пашпарту і зрабіць захады, каб мая жонка магла зьехаць у Злучаныя Штаты са мной.

КДБ не перашкаджаў Освальду. Усё роўна той не хацеў браць савецкага грамадзянства — так генэрал «Гузьмін» патлумачыў Мэйлеру.

Дзёньнік ЛГО
8 ліпеня 1961

Я лячу самалётам ІЛ-20 зь Менску, праз 2 гадзіны 20 хвілін пасьля сьлёзнага і нэрвовага разьвітаньня з жонкай я прылятаю ў Маскву, аўтобусам ад аэрадрому дабіраюся да цэнтру. Зь цяжкасьцю рухаючыся праз запораныя вуліцы, дабіраюся да амбасады толькі а 3:00.

Сёньня субота, што, калі закрыта? Офісы пустыя, але мне ўдаецца зьвязацца са Снайдэрам па тэлефоне (усе супрацоўнікі жывуць у тым самым будынку). Ён спускаецца павітацца, цісьне руку, пасьля гутаркі кажа прыйсьці адразу з раніцы ў панядзелак.

Інтэрвію. 9 ліпеня атрымліваю пашпарт. Выклікаю Марыну таксама ў Маскву.*

Амэрыканская амбасада ў Маскве — Дзярждэпартамэнт, Вашынгтон
11.07.61

Тэма: Грамадзянства і пашпарт Лі Гарві Освальда

Дваццаць месяцаў рэаліяў савецкага жыцьця яўна дапамаглі Освальду пасталець. Ён адкрыта сказаў, што гэта для яго быў цяжкі ўрок, атрыманы цяжкім спосабам, і што ён цалкам пазбавіўся ілюзіяў адносна Савецкага Саюзу і адначасна набыў новае разуменьне і ацэнку Злучаных Штатаў і сэнсу свабоды. Задзірыстасьць і бравада, якія характарызавалі яго падчас першага візыту ў амбасаду, здаецца, пакінулі яго.

Пасьля пасьпяховага інтэрвію ў амбасадзе Освальды вярнуліся ў Менск.

Дзёньнік ЛГО
15 ліпеня 1961

Марына на працы ў шоку — аказваецца, на працы ўсе ведаюць, што яна была ў амбасадзе ЗША. Ім пазванілі з Масквы, нейкае начальства. Кіраўніцтва правяло сход, на якім ёй моцна перапала. Першая з мноства «прапрацовак».

Ліст ЛГО ў амбасаду ЗША ў Маскве
15.07.61

Як мне было сказана, я пішу, каб паведаміць аб тым, як ідзе атрыманьне візы. Мы наведалі

*Памылка. Правільна 10 ліпеня.

мясцовы АВІР, і вынікі небезнадзейныя. Аднак, на месцы працы маёй жонкі адбылося некалькі незвычайных і жорсткіх падзеяў. Пакуль мы былі ў Маскве, начальству паведамілі, што мы хадзілі ў амэрыканскую амбасаду па візы. Затым адбыўся сход паводле звычайнага ўзору «вораг народу», на якім яна адсутнічала, але была асуджаная, а яе сябровак на працы папярэдзілі, каб не размаўлялі зь ёй. Аднак гэтая тактыка не дала выніку, і мая жонка добра трымалася, ня лезучы на ражон.

Марыну ня звольнілі. Яна працягвала хадзіць на працу ў 3-ю клініку — яна была членам калектыву, членам прафсаюзу, членам камсамолу.

Зь ёй трэба было «працаваць». Але мэтамарфозу, якая пачалася, ужо нельга было спыніць. На мове энтамалёгіі гэта называецца «імага» — дарослая, дэфінітыўная стадыя разьвіцьця, калі крылы матылька распраўляюцца, цьвярдзеюць і набываюць канчатковую афарбоўку.

Замест нерухомай, уразьлівай, лёгкай для здабычы кукалкі — палёт.



Роля дзірачак у гісторыі

Марына выключыла ўсюды сьвятло. Освальд узяў ліхтарык. Яны падышлі да электралічыльніка. Колца круцілася.

— Нашу кватэру праслухоўваюць!

Аднак нават праз тры дзесяцігодзьдзі пры сустрэчы з Мэйлерам Марына не была цалкам упэўненая, чаму Освальд так сказаў. Можа, ён проста забаўляўся, драматызаваў сытуацыю. Насамрэч не была цалкам упэўненая і яна сама. Падазрэньне выклікала шчыліна над лямпай у столі, але яна была так высока, што ніхто туды не зазірнуў.*

Калі дакладна пачалося падслухоўваньне кватэры Освальда, Мэйлеру не сказалі. Першыя расшыфроўкі падслуханых КДБ размоваў, якія атрымаў Мэйлер, датуюцца сярэдзінай ліпеня 1961-га.

---

*Суседзі зьверху, Мая і Сямён Гярцовічы, расказвалі на пачатку 1990-х журналістам, што на некалькі дзён вызвалілі сваю кватэру для КДБ. Мяркуецца, што тады і была ўсталяваная апаратура.

У гэтых архіўных дакумэнтах, афармленых паводле стандарту, Освальд менаваўся «Аб'ект: ОЛГ-2658», пазначалася дата і час назіраньня, напрыклад «Дата: 24 ліпеня 1961» і «Час: 21:20».

З расшыфроўкі падслухоўваньня КДБ
24.07.61
21:20

Жонка: Алік! Паслухай, я забылася адпрасаваць прасьціны. Алік! Паглядзі, як гараць мае вушы!

(жартуюць і сьмяюцца)

ЛГО: Неблагія песьні сьпяваюць.

Жонка: Праходзіць нейкі фэстываль. Усе едуць у Маскву, і людзі могуць гаварыць, што хочуць. Раней нічога нельга было казаць: ні на вуліцы, ні ў трамваі, ні ў тралейбусе. Калі Сталін быў жывы, у кожным доме быў мікрафон і нічога нельга было казаць. Цяпер іншая рэч.

ЛГО: Так, так, сястра мая.

Наўрад ці магнітафон КДБ быў падключаны да электраправодкі ў кватэры Освальда. Маглі застацца ўключанымі іншыя электрапрылады. Але выснова была слушная.

Абмяркоўваць ад'езд у Амэрыку і справы свайкоў жыхары кватэры пачалі на бальконе; туды ж з цыгарэтай пагаварыць выходзілі асьцярожныя госьці.

Праз трыццаць гадоў сябар Марыны Аляксандар Піскалёў узгадваў, як аднойчы пасьля вечара ў кватэры Освальдаў ён вярнуўся дадому, а там чакала машына каля пад'езду. Прывезьлі ў жоўты дом з калёнамі, адвялі ў сутарэньне. Яму пракруцілі маг-

нітафонны запіс гутаркі, якая толькі што адбылася, і сказалі быць гатовым падрабязна інфармаваць КДБ. Дахаты ён вяртаўся пешкі. Мэйлер піша, што Піскалёў і яго сябры амаль перасталі сустракацца — бо ўсе патрапілі ў такую сытуацыю і не хацелі даносіць адзін на аднаго.

Мэйлер скардзіцца, што ў расшыфроўках праслухоўваньня, якія яму выбарачна давалі, усё часьцей пачала сустракацца пазнака «неразборліва», «гучнае радыё», «не чуваць». На кухні мікрафоны запісвалі водаправод. Часам Марына сама ня чула Освальда, і тады ён мусіў крычаць, каб перакрыць радыё, уключанае на поўны гук, ці ваду, якая пад напорам біла ў чыгунную кухонную чарупіну.

Мэйлеру патлумачылі, што спачатку праслухоўваньне вялося з кватэры зьверху. Затым з суседняй кватэры была прабітая дзірачка для візуальнага назіраньня.

Невядома, ці мікрафоны КДБ падхапілі фразу Освальда, калі той у цемры, асьветленай толькі ліхтарыкам, драматычна ўсклікнуў — нас праслухоўваюць!

Калі так, невядома, ці расшыфроўшчык пачуў яе на стужцы.

Калі так, невядома, ці запісаў.

І невядома, што больш пацешыла КДБ — гэтая фраза ці меркаваньне, што пасьля Сталіна падслухоўваць перасталі.

Освальдаў ня толькі падслухоўвалі, за імі ня толькі сачылі на вуліцы, ня толькі іх знаёмых прымушалі інфармаваць пра пачутае, ня толькі іх пошту чыталі — за імі падглядалі.

У дзірачку.

Як з гонарам патлумачыў Мэйлеру генэрал «Ігар», з выкарыстаньнем найноўшай тэхналёгіі — аптычнага валакна дыямэтрам 1/100 мілімэтра.*

Аптычнае валакно тады толькі зьявілася і не фігуравала нават у фільмах пра Джэймса Бонда. У 1963-м у фільме «З Расеі зь любоўю» герой назірае за падзеямі ў офісе савецкага рэзыдэнта з дапамогай пэрыскопа, зьнятага з падлодкі.

У дзірачку глядзелі, як піянэры ў грамадзкай прыбіральні. Нават калі і праз шкло якое.

Свайго ж падводнага флёту ў БССР не было.

---

*Савецкі перабежчык палкоўнік КДБ Алег Гардзіеўскі апісвае падобную апэрацыю сачэньня ў Маскве за палкоўнікам ГРУ Алегам Пянькоўскім, што працаваў на брытанцаў і амэрыканцаў, якраз у той самы час, што і за Освальдам у Менску. Жыхароў зьверху выправілі ў адпачынак на мора, прасьвідравалі дзірку ў столі і паставілі камэру памерам з галоўку шпількі, з дапамогай якой пабачылі працу Пянькоўскага з фотаапаратам і шыфрамі. Тут істотна, што запісваць відэа тады яшчэ не маглі, таму назіраньне вялося ў рэжыме рэальнага часу, дзеля чаго сям'ю зьверху і адправілі аж на Чорнае мора. Суседзяў Освальда выселілі толькі на пару дзён.

Чарговы гістарычны абэртон: беларускую вайсковую акругу, від на штаб якой адкрываўся з кватэры Освальда, на пачатку 1960-х узначаліў генэрал Валянцін Пянькоўскі, які, як сьцьвярджаў Алег Пянькоўскі, быў ягоным дзядзькам.



Рэцэпт драмы

Усё зьмяшалася ў доме Освальдаў ужо праз два месяцы пасьля вясельля.

З расшыфроўкі падслухоўваньня КДБ
17.07. 61

ЛГО: Я не магу казаць табе, што рабіць. Рабі, што хочаш. Калі хочаш, можаш ехаць са мной.

Жонка: Не хачу.

ЛГО: Чаму?

Жонка: Я проста баюся.

ЛГО: Канечне, ты баісься.

Жонка: Я ня ведаю Амэрыкі, я ведаю толькі Расею. Ты можаш вярнуцца да свайго народу. Я ня ведаю, як там будзе. Дзе ты знойдзеш працу?

ЛГО: Я ўсё знайду, усё. Я ўсё зраблю. Гэта мая справа.

Жонка: Як там да мяне будуць ставіцца?

(радыё заглушае размову; зусім немагчыма зразумець)

Выдадзеная ў Менску напачатку 1960-х «Кніга

карысных парадаў» атрымала велізарную папулярнасьць і шмат разоў перавыдавалася.

У ліпені Освальд падарыў Марыне тоўсты фаліянт, пад тысячу старонак, які тлумачыў, як накрываць на стол, шыць, чысьціць, рамантаваць, апранацца, рыхтаваць кансэрвы на зіму, выводзіць бародаўкі і шмат чаго яшчэ. Першая чвэрць «Кнігі карысных парадаў» была прысьвечаная гатаваньню сьняданку, абеду і вячэры.

З расшыфроўкі падслухоўваньня КДБ 19.07.61

Жонка: Адзінае, што ты ўмееш — гэта катаваць.

(ЛГО выходзіць з пакою, нешта крычыць з кухні)

Жонка: Ідзі знайдзі сабе дзеўку, якая ўмее гатаваць. Я працую, у мяне няма часу гатаваць табе катлеты. Ты ня хочаш супу, ня хочаш кашы, толькі смачныя кавалачкі, калі ласка!

ЛГО: Я магу хадзіць есьці ў рэстаран.

Жонка: Ідзі да д'ябла! Калі ты ўжо пакінеш мяне ў спакоі! Я, відаць, не дажыву да таго дня, калі ты пакінеш мяне ў спакоі!

ЛГО: Але ж ты ня ўмееш нічога рабіць.

Жонка: Пакінь мяне ў спакоі!

Жонка, верагодна, проста не дачытала яшчэ падарунак Освальда да 40-й старонкі, дзе быў рэцэпт закускі, здольнай улагодзіць любога, самага патрабавальнага мужа. Перад тым, як падаць першую, другую і трэцюю страву, як раіла кніга, жонка перад ім паставіла б страву, прыгатаваную паводле самага першага рэцэпту разьдзелу «Закускі зь мяса»:

Парася заліўное

Парася нацерці мукой і апаліць, выдаліць вантробы, надсекчы хрыбетнік, прамыць халоднай вадой і, загарнуўшы ў сурвэтку, паставіць варыць у закрытай каструлі, наліўшы ў яе халоднай вады.

Зробім кароткую паўзу і, наліўшы вады, працягнем чытаньне:

У працэсе кіпячэньня здымаць пену, трымаць каструлю на слабым агні каля 1 гадзіны. Затым зьняць з пліты, булён пасаліць, крыху ахаладзіць. Парася пакласьці на разьдзелачную дошку, а булён зноў паставіць на гарачую пліту, дадаць у яго нарэзанае карэньне, цыбулю і прыправы. Прыгатаваць жэле.

Ва ўсім павінна быць мяжа і мера, таму рэцэпт, як гатаваць жэле, ня быў уключаны непасрэдна ў тэкст. А замест гэтага зроблена спасылка на старонку, дзе яго можна было вывучыць асобна — таму і Марына, верагодна, адразу яго чытаць ня стала б.*

Зваранае і ахалоджанае парася насекчы невялікімі кавалкамі, раскласьці на талерку, упры-

*Каб не адсылаць у бібліятэкі адчайных гаспадыняў, якія вырашаць прыгатаваць гэтую закуску, вось клясычны рэцэпт жэле зь легендарнай кнігі: «Каб булён добра застыў, на кожную шклянку яго трэба дадаць ад 1 да 3 лісткоў жэлятыну. Жэлятын папярэдне трэба замачыць у халоднай вадзе, адціснуць і толькі пасьля гэтага пакласьці ў гарачы булён і даць яму закіпець. Жэле з такога булёну атрымаецца смачнае, але не зусім празрыстае». У кнізе прыводзіцца і поўны, як збор твораў клясыкаў марксізму-ленінізму, рэцэпт, як зрабіць жэле празрыстым, але тут абмяжуемся проста смачным.

гожыць кружкамі вараных яек, лустачкамі цытрыны, зелянінай пятрушкі, асьцярожна заліць жэле і падаць на стол у застылым выглядзе.

Нават такі гурман, як Освальд, ужо, напэўна, задаволіўся б, але карысныя парады на гэтым не спыніліся:

Да заліўнога парасяці падаюць зялёную салату, салату з чырвонакачаннай альбо белакачаннай капусты, карнішоны, пікулі. Асобна падаецца сьмятанны соўс зь цёртым хрэнам альбо цёрты хрэн з воцатам.

Любы, нават не псыхоляг, скажа, што пасьля прыгатаваньня такой закускі сямейныя сваркі і скандалы немагчымыя ў прынцыпе: у мужа на тое ня будзе жаданьня, у жонкі сіл.

З расшыфроўкі падслухоўваньня КДБ 21.07.61

ЛГО: Ну, што ты плачаш? Я казаў, сьлёзы ні да чаго добрага не прывядуць.

(жонка плача)

Ты ж ведаеш, я ніколі не сьцьвярджаў, што я вельмі добры чалавек.

(жонка зноў плача, ЛГО суцяшае)

Жонка *(скрозь сьлёзы)***: Чаму я выйшла замуж? Ты мяне падмануў.**

Усе шчасьлівыя сем'і падобныя адна да адной. І нешчасьлівыя таксама.



Камсамольская любоў

Шчасьлівыя сем'і ўсё ж шчасьлівыя часам парознаму — прынамсі, з розных прычынаў.

Жыць і ніколі не сказаць лішняга слова, бо яно можа быць падслуханым і запісаным — для гэтага трэба быць альбо прафэсіяналам, альбо моцна запалоханым чалавекам. Освальды не былі ні першымі, ні другімі і, нягледзячы на падазрэньні, паводзілі сябе, як маладыя жонка і муж паводзяць сябе ў стрэсавай сытуацыі — сварыліся і мірыліся.

Дзёньнік ЛГО
15 ліпеня — 20 жніўня 1961

Мы высьветлілі, якія фармуляры і дакумэнты патрабуюцца для візы — каля дваццаці папераў: пасьведчаньні аб нараджэньні, афідэйвіты, фатаграфіі, даведкі, іншае. 20 жніўня мы здаем усе паперы. Нам кажуць, што адказ — ці выпусьцяць нас, будзе праз тры з паловай месяцы. Тым часам Марыне давялося прайсьці праз чатыры розныя сходы на працы, якія праводзіла начальства

пасьля ўказаньня ад «некага» па тэлефоне. Яе таксама выклікалі ў райкам камсамолу, і яна мусіла ісьці на гутарку да іх на паўтары гадзіны. Мэта (абвешчаная) — пераканаць яе ня ехаць у ЗША. Вынік: яна становіцца толькі больш упартай у сваім жаданьні ехаць. Марына цяжарная; мы спадзяемся толькі, што візы хутка прыйдуць.

Камсамол і начальства на працы зрабілі тое, што заўсёды робіць вонкавая пагроза: Освальды атрымалі агульнага праціўніка, які паспрыяў іхнаму паразуменьню паміж сабой.

З расшыфроўкі падслухоўваньня КДБ
26.07.1961

ЛГО: Ну дык што, быў сход?
Жонка: Так, сход быў.
ЛГО: Дзе?
Жонка: У нашай паліклініцы. Ведаеш, іх бы задаволіла, калі б я сказала — не, я ня еду, я не пакіну Радзіму. Ніколі не гавары ім праўду. Папраўдзе, мне ня трэба было нічога ім казаць увогуле. Трэба было сказаць, што мая сытуацыя такая, што я ня ведаю, што рабіць.
ЛГО: А што яны сказалі?
Жонка: Яны сказалі, што я грублю. Ну, я сказала, што мне не патрэбная добрая характарыстыка, мне ўсё роўна. Я паеду і з дрэннай характарыстыкай, калі трэба. Я сказала ім, што я не такі ўжо злосны злачынец. Я сказала, што я люблю дзяўчат з аптэкі як сваіх сябровак, і што я неблагі сябар, і я ўсё гатовая аддаць дзяўчатам, бо яны простыя, добрыя дзяўчаты.
(*Паўза.*)

Я адразу гэта сказала. Калі я вам не падабаюся — мне пляваць.

ЛГО: І ты... (*не канчае сказу*)

Жонка: Яны мяне выкінуць. Яны сказалі, што такія, як ты, не належаць да камсамолу, што мяне трэба выключыць. Я сказала — добра, вельмі цешуся. Чаму ты ня хочаш быць членам, — яны мільён разоў у мяне гэта пыталі. Ну, таму што мне не падабаецца, таму што сумна. А чаму ты раней не гаварыла? Бо я не хацела, каб людзі думалі, што я не такая, як усе. Я сказала шмат рэчаў, якія, верагодна, ня трэба было, але не магла стрымацца. Што ты думаеш пра камсамол? Я адказала: камсамол ёсьць камсамол.

(*Паўза.*)

Насамрэч, я — антысавецкі элемэнт. Трэба ім аблегчыць зрабіць выснову.

А потым, ведаеш, ён у мяне пытаецца — якія ў вас адносіны з тым чалавекам, зь якім вы езьдзілі ў Маскву. А нехта кажа — гэта яе муж.

ЛГО: (*сьмяецца*)

Жонка: І хто ваш муж, што за чалавек? Я кажу, вам лепш запытацца ў МУС. Чаму МУС, калі можам запытацца ў цябе? І я кажу, бо я магу вам і не адказаць.

ЛГО: Яны ведаюць самае галоўнае, што я хачу зьехаць.

Жонка: Ён хоча на сваю радзіму, я сказала ім, усе хочуць на сваю радзіму. А ты не спрабавала пераканаць яго застацца тут? Не, я сказала. Потым. Я кажу, я ня думаю, што там будзе лепш, не таму, што я шукаю што-небудзь лепшае. Я проста еду са сваім мужам. Магчыма, там будзе горш. Я

кажу, ведаеце, я там не была і вы там не былі, дык як мы можам даваць ацэнкі?

(*Паўза.*)

Я сказала, што не пакіну мужа. Ён добры чалавек і я ім задаволеная. Ён больш дарагі для мяне, чым іхныя ацэнкі. Я паводзіла сябе груба, вельмі груба. Я сказала, што вы зьбіраецеся рабіць, пакараць людзей, якія давалі мне добрыя характарыстыкі, накрычаць на іх? Прашу не перасьледаваць іх, лепш зрабіце вымову мне. Мы цябе паважаем, мы цябе любім, яны казалі. У цябе ня будзе такіх сяброў, як мы, гаварылі яны. Я не хачу мець такіх сяброў, як вы. Я бачу, як вы мяне любіце.

ЛГО: Не хвалюйся, усё будзе файна.

(*Паўза.*)

Жонка: Самае галоўнае цяпер — зьехаць.

ЛГО: Я ведаю. Мы ад'яжджаем, ня трэба скандалаў.

(*Паўза.*)

Жонка: Не шукай праўды, усё роўна ня знойдзеш. Так маці казала мне.

ЛГО: Усё будзе файна.

Жонка: Ты думаеш?

(*Паўза.*)

Чаму мне сумна? Мой муж ня выгнаў мяне з дому.

ЛГО: Я цябе кахаю.

Жонка: Гэта цяпер ты так кажаш, а потым скажаш, што не кахаеш.

ЛГО: Твой муж цябе кахае.

Праз чатыры дні пасьля камсамольскага сходу ў СССР абвясьцілі эру камунізму. Дакладней, 30

ліпеня была надрукаваная праграма КПСС, якая вызначыла дату — праз 20 гадоў цяперашняе пакаленьне будзе жыць пры камунізьме.

Абвестка ніяк не паўплывала на рашэньне маладой сям'і жыць пры капіталізьме.



П'еса «Маладыя». Акт 1

Калі Марына Освальд пагадзілася на інтэрвію для кнігі Мэйлера, яна ведала, што пытаньні будуць пра мужа, пра Менск, пра сям'ю — зрэшты, менавіта гэтаму была прысьвечаная цэлая кніга Прысцылы МакМілан «Марына і Лі».

Але, напэўна, яна не магла прадбачыць пытаньня, якое пачуе падчас новай сустрэчы.

Інтэрвіюер: Ці вы калі сварыліся з-за мыцьця падлогі?

Марына: Не.

Інт.: А ён калі-небудзь скардзіўся пра падлогу?

М.: Ня памятаю. Але ня думаю.

Інт.: Вы калі-небудзь спрачаліся пра ўборку дому?

М.: Мы, верагодна, спрачаліся нават пра катоў на даху.

Пытаньне было падказанае архіўнымі дакумэнтамі КДБ.

З расшыфроўкі падслухоўваньня КДБ
03.08.61

18:24 *(уваходзяць у пакой)*

Жонка *(крычыць)*: **Я стамілася ад усяго гэтага! А што ты? Ты ня можаш сам памыць? Ты, відаць, хочаш, каб я мыла падлогу кожны дзень?**

ЛГО: Так, мый падлогу штодня!

Жонка: Ты нічога ня робіш, а я мушу прыбіраць цэлы дзень. Прыстойны чалавек дапамог бы. Памятаю, як ты казаў: я буду дапамагаць! Аднойчы ты сапраўды памыў, і цяпер бясконца пра гэта гаворыш, а я мыю наша адзеньне кожны раз і гэта зусім ня лічыцца.

ЛГО: Ты мусіш прыгатаваць нешта зьесьці!

Жонка *(крычыць)*: **Я не магу. Я не зьбіраюся гатаваць.**

ЛГО: Ты можаш зрабіць катлеты, паставіць ваду на чай. Я кажу, я ж купіў усё, усё.

Жонка: Я ня буду.

ЛГО: Ты нічога не зрабіла.

Жонка: Ну, а што ты для мяне зрабіў?

ЛГО: Ціха!

Жонка: Я ня буду жыць з табой.

ЛГО: Дзякуй Богу!

Жонка: Паглядзі на сябе! Акуратны! Ды ты ў дваццаць разоў бруднейшы за мяне. Паглядзі на сваю падушку; ты толькі раз на ёй спаў, а яна ўжо брудная.

ЛГО: Ты ніколі нічога ня робіш!

Жонка: Правільна, я толькі хаджу на гулянкі, прапіваю сваё здароўе.

ЛГО: Ты нічога ня робіш.

Жонка: Ты хоць раз прыбраў гэтую кватэру?

Я гэта рабіла дваццаць адзін раз. Ты сам зрабі, а потым гавары пра гэта цэлы дзень.

ЛГО: Гэты дом трэба прыбіраць кожны дзень. На кухні бруд, брудна ўсюды. Што тут добрага? Ты сьпіш да 10-й раніцы і нічога ня робіш. Магла б у гэты час прыбіраць.

Жонка: Мне трэба спаць. Калі табе не падабаецца, можаш ехаць у сваю Амэрыку.

ЛГО *(спакойна)*: **Калі ласка, дзякуй.**

Жонка: Ты заўсёды знаходзіш хібы; цябе нічога не задавальняе, усё дрэнна.

ЛГО: Ты дурная. Лянівая і грубая.

Жонка: Я хачу, каб ты адчуў, што такое быць адзін дзень на маім месцы.

(пасьля паўзы яна пачынае плакаць)

ЛГО: Ну, што здарылася?

Жонка: Ідзі прэч! Я табе не прыслуга. Дай мне нармальныя ўмовы.

ЛГО: Ня плач. Я толькі кажу, што ты нічога ня хочаш рабіць.

Жонка: Так? Я ніколі ня мыла падлогу?

ЛГО: Ты — нядобрая хатняя гаспадыня, не, нядобрая хатняя гаспадыня.

Жонка: Трэба было ажаніцца з добрай.

(яны маўчаць)

Жонка: Калі табе не падабаецца, можаш каціцца ў сваю Амэрыку.

ЛГО: Я даўно табе казаў, што ты нічога ня робіш.

Жонка: Я мыю падлогу кожны дзень.

ЛГО: Яна брудная.

Жонка: Табе брудная, а мне чыстая. Я ўчора памыла падлогу, а ты ўсюды топчасься ў чаравіках.

ЛГО: Там бруд і пыл, бо ты адчыняеш дзьверы на балькон.

Жонка *(крычыць)*: **Ён быў зачынены ўвесь дзень. Ты нічога не разумееш.**

ЛГО: Ня плач.

Жонка: Няўжо ты ня бачыш, што я выціраю пыл штодня?

ЛГО: Ты не выціраеш там, на стале.

Жонка: Ага, ага, я там пэцкаю. Я двойчы яго мыла, а ты нават аднаго разу не памыў.

ЛГО: Супакой свае нэрвы.

Жонка: Скажы проста: «Марына, гэта трэба зрабіць». Не крычы; гэта крыўдна. Алька, ты мяне ненавідзіш, калі крычыш на мяне?

ЛГО: Так.

Жонка: Так?

ЛГО: Так.

Жонка: Чаму ты баісься людзей? Што цябе напалохала?

ЛГО *(крычыць злосна)*: **Заткніся, заткніся. Ты толькі й ведаеш, што балбатаць.**

Жонка: Ты ўсіх баісься!

ЛГО: Заткніся!

Жонка: Ты баісься, што ў цябе ўсё скрадуць, твой гаршчок золата? *(сьмяецца)* **У такія моманты ты мяне можаш забіць. Табе трэба мець моцную сілу волі.**

ЛГО: Як наконт трохі бульбы?

Жонка: Яна яшчэ не гатовая, што я зраблю?

22:37 *(яны ідуць на кухню)*

22:40 *(жонка прымушае ЛГО вымыць ногі)*

23:00 *(у пакоі ціха; размовы няма)*

У КДБ, калі чыталі сьвежы запіс п'есы «Маладыя»,

як называе гэтую расшыфроўку Мэйлер, зьвярнулі ўвагу і падкрэсьлілі тры фразы Марыны:

— Я ня буду жыць з табой.

— Калі табе не падабаецца, можаш ехаць у сваю Амэрыку.

— Ты ўсіх баісься!..

У Освальда — толькі адну фразу:

— Ня плач.*

Словы Марыны «**у такія моманты ты мяне можаш забіць**» нічыёй увагі не прыцягнулі.

*Падкрэсьліваньні КДБ у далейшых тэкстах расшыфровак пазначаныя ў тэксьце.



П'еса «Маладыя». Акт 2

Другі акт адбыўся праз тыдзень, і хаця героі тыя самыя, спрэчка ідзе пра рэчы нашмат больш сур'ёзныя за падлогу.

З расшыфроўкі падслухоўваньня КДБ
Дата: 11.08.61

ЛГО: Калі ты мяне не кахаеш, як ты можаш жыць са мной? Я даю і буду даваць табе ўсё, што толькі магчыма. Чаго ты хочаш? То ты кажаш, што хочаш ехаць са мной, праз хвіліну, што ня хочаш.

Жонка: Часам я баюся ехаць з табой. Я не хачу спрабаваць давесьці табе, што тут усё выдатна, а там усё дрэнна. Але нават калі тут я нічога ня маю і ня буду мець, тут дом.

ЛГО: Ты тут нічога ніколі ня будзеш мець, але там у цябе будзе муж і ўсё.

Жонка: Што я там буду рабіць? Я буду ўвесь час сядзець дома, і на гэтым усё.

ЛГО: Але ты будзеш са мной. У цябе будзе ўсё.

Жонка: Я не шукаю ніякіх матэрыяльных выгадаў. Грошы мяне зусім не цікавяць. Гэта ня важна. Самае важнае для мяне, як ты да мяне ставішься.

ЛГО: Ну, тады ўсё ў парадку.

Жонка: У мяне няма гарантыі, што ты мяне там не пакінеш. Што тады я буду рабіць?

ЛГО: Калі ты мяне не кахаеш — ня едзь.

Жонка: Не, я баюся, што ты мяне кінеш. Ты ж тут усё пакідаеш, урэшце.

ЛГО: Я пакідаю?!

Жонка: Бачыш, ты ўжо крычыш, а як там будзе?

ЛГО:. Што ў цябе тут ёсьць? Нічога. Адзін пакой. Гэта шмат? Адзін пакой, які табе нават не належыць.

Жонка: Мы тут жывем, гэта наша.

ЛГО: Ты лічыш, гэта маё? А я зусім не адчуваю, што гэта мая маёмасьць. Я не адчуваю, што гэта маё.

(*Паўза.)*

Жонка: Ты мяне мучыш.

ЛГО: Не магу цярпець, калі ты такая, як цяпер. Я кажу адно, ты другое.

(*Паўза.)*

Жонка: Сьпі ціха.

ЛГО: Як я магу спаць ціха, каля я ня ведаю, што ты пра мяне думаеш? У цябе ўсё заўсёды залежыць ад настрою. Трэба раз і назаўсёды вырашыць.

Жонка: Ідыёт, ты нічога не разумееш. *(Дражніць яго.)* **Маёмасьць, маёмасьць.**

ЛГО: Ты не разумееш канцэпцыі маёмасьці. Ты сама ня ведаеш, чаго хочаш. Я хачу там жыць, бо там высокі ўзровень жыцьця.

Жонка: А ты думаў, ты сюды прыедзеш і зусім ня трэба будзе працаваць, жыві толькі? Чаму ты не вучыўся? Ты мог вучыцца, ты проста гультай.

ЛГО: Ты нічога не разумееш. Мільёны людзей увесь час пакідаюць гэтую краіну. Тут грубыя людзі.

Жонка: Ты на нас глядзіш праз чорныя акуляры.

ЛГО: Якія чорныя акуляры? Гэта няпраўда.

Жонка: Я, напрыклад, не кажу дрэнна пра Амэрыку. Гэта непрыстойна.Трэба быць сапраўднай свіньнёй, каб дрэнна казаць пра краіну, якую ня ведаеш. І я так не раблю.

ЛГО: Можа быць, але ты будзеш там жыць. Там высокі ўзровень жыцьця.

Жонка: Ты не разумееш. Гэта ня мой дом. Я там не пачую расейскай мовы.

ЛГО: Калі ты хочаш ехаць — едзь. Калі не, тады не.

Жонка: Я не паеду. Я баюся. Нават цяпер, калі прыходзіць Эрык і вы гаворыце па-ангельску, я не магу гэта пераносіць.

ЛГО: Ты гаворыш, як нейкая старая вясковая цётка.

Жонка: Мы ніколі ня зможам зразумець адно аднаго.

ЛГО: Калі ты хочаш ехаць, ты паедзеш!

Жонка: Не крычы.

ЛГО: Ты мяне прымушаеш крычаць. Я не грублю. Ты стала непрыстойная і дрэнная.

Жонка: Ты.

ЛГО: Не, я быў прыстойны і добры, калі мы сустрэліся. Але ў цябе было шмат непрыстойнасьці.

Жонка: Я так не лічу. Я нават ні разу не пацалавала Сашу. Ніхто не называў мяне непрыстойнай. Я не паводзіла сябе як іншыя дзяўчаты. У мяне не было маці, якая б накіравала мяне на правільны шлях. Раз на тыдзень я паводзіла сябе па-дурному.

ЛГО: Я разумею.

Жонка: Табе трэба, каб усё было памяркоўна. Калі б я толькі ведала!

ЛГО: За апошні месяц ты зусім зьмянілася. Ні пяшчоты, нічога. Калі б ты не была цяжарнай. Я не магу крычаць на цябе ў прысутнасьці іншых людзей, але ты заўсёды пра мяне рознае гаворыш, калі вакол людзі. А потым ты кажаш казкі пра тое, што я ад'яжджаю, пакідаю цябе і ва ўсім вінаваты. Але нават калі так, я хачу, каб ты была са мной. Я разумею, што ты такая, якая ёсьць і ня можаш быць іншай. (*паўза*) Чаму ты прыкідваесься, што цябе так пакрыўдзілі? Самая няшчасная дзяўчына на сьвеце. Ты нясеш лухту.

Жонка: Ідзі да д'ябла!

ЛГО: Ты мяне не паважаеш.

Жонка: Алік, мы ўжо дастаткова сварыліся. І цяпер зноў.

ЛГО: Раней ты не была такой.

Жонка: Ты таксама.

23:35 (*ціха; яны сьпяць)*

Марына цяжка пераносіла першыя месяцы

цяжарнасьці — яе раздражнялі пахі на вуліцы, у кватэры, нават на бальконе, пах мужа, пах ежы.

Плюс стрэс і страх — намер паехаць у Амэрыку ўспрымаўся як здрада радзіме.

Тут заплачаш.*

*П'еса аказалася трох- ці нават чатырохактавай. Трэці акт — жыцьцё з Освальдам у Амэрыцы. Пасьля сэрыі скандалаў з гвалтам (Освальд яе зьбіваў) у лютым 1963-га Марына напісала ў савецкую амбасаду першы ліст пра вяртаньне, у сакавіку — другі. Яна зноў была цяжарная і спадзявалася зьехаць да нараджэньня дзіцяці, і прасіла вярнуцца ня ў Менск, а ў Ленінград. Аднак з савецкай амбасады паведамілі, што афармленьне папераў можа заняць 5-6 месяцаў. Освальд чакаў сына і нават выбраў яму імя Фідэль, у гонар Кастра. У кастрычніку нарадзілася дачка, якую назвалі Рэйчал. Освальд, які таксама напісаў запыт на савецкую візу, мяняў месцы працы і, нарэшце, у лістападзе зьехаў з тэхаскага гораду Форт Ворт у Далас, пакінуўшы замест адрасу нумар паштовай скрынкі. Чацьверты акт — пасьля забойства Кенэдзі. Расьсьледаваньне зрабіла Марыну вядомай на ўсю Амэрыку — яна давала інтэрвію, пра яе пісалі кнігу, зьявіліся грошы, і яна «загуляла» — стала праводзіць дні ў боўлінгу, начных клюбах, на вечарынках, атрымала мноства прапановаў выйсьці замуж — паўтарыла, як сама казала, свой «ленінградзкі пэрыяд». У 1965 годзе яна выйшла замуж за мясцовага ўладальніка ранча Кенэта Портэра, нарадзіла сына Марка, разьвялася з Портэрам празь дзесяць гадоў, але засталася жыць разам зь ім.



Талстаеўскі

Мэйлер паталягічна скрупулёзна вывучаў менскае жыццё Освальда. Ён пераглядаў шматлікія здымкі і дакумэнты, сабраныя Камісіяй Ўорэна, з рапартаў КДБ мог намаляваць падрабязныя маршруты яго перамяшчэньняў па горадзе, з расказаў знаёмых і Марыны дакладна ведаць, дзе ў кватэры стаялі чобаты, ляжала паляўнічая стрэльба, якія кнігі былі на паліцах — але ўсярэдзіне ня быў.

Чаму — магчыма, таму, чаму мне самому не прыйшло ў галаву задаць яму гэтае пытаньне. Таму што не хацеў, бо якое гэта мае значэньне. Таму што хацеў, але не пасьпеў ці ня змог. Таму што той, хто там жыў, не пусьціў. Таму што Мэйлера называлі амэрыканскім Талстым.

Апошняя, літаратурная вэрсія вымагае тлумачэньня.

Нагадаем сюжэт: малады чалавек шукае сэнс жыцьця, прагне справядлівасьці, бачыць вакол шмат зла, лічыць сябе адрозным ад іншых і ні з кім блізка не сыходзіцца, гатовы разарваць сувязі

зь сям'ёй і забіць нават брата, калі той стане на яго шляху, нават ад блізкіх знаёмых хавае свае пляны і намеры, расчароўваецца ў ідэале, перакананы, што ён не такі, як усе, і дзеля вышэйшай мэты мае права і можа забіць.

Гэта апісаньне ня Освальда, а Раскольнікава, а таксама тэорыяў і матывацыяў герояў Дастаеўскага з раманаў «Бесы», «Браты Карамазавы». «Бесы», дарэчы, у ангельскім перакладзе называюцца «Posessed» — «Апантаныя».

Дастаеўскі сапраўды некалькі разоў зьяўляецца ў «Гісторыі Освальда»: на сваё 20-годзьдзе герой атрымлівае ў падарунак раман «Ідыёт», уведаўшы, што Освальда ў Менску пачынаюць зваць «Алёша», Мэйлер адразу ўдакладняе — таму што так звалі аднаго з братоў Карамазавых? Але, магчыма, прычына яшчэ больш простая: Мэйлер мог адчуваць, што яго герой насамрэч герой не Талстога, а Дастаеўскага. Дэтэктыўны сюжэт з забойствам, якое зьдзяйсьняе «малы» чалавек, які адчувае сваё пакліканьне — клясыка клясыка расейскай літаратуры.

Пайсьці ў менскую кватэру Освальда было б тым самым, што пайсьці на месца забойства ў Даласе, цытатай са «Злачынства і пакараньня» — і рэч ня ў тым, што цытата, а ў тым, што занадта блізкая, і таму не мастацкая, а Мэйлер усё ж пісьменьнік.

«Гісторыя Освальда» Мэйлера сапраўды выглядае як раманы Дастаеўскага: гісторыя, на якую хапіла б і двухсот старонак, займае ўчацьвёра болей, структурныя часткі непрапарцыйныя, не зьвязаныя, унутраную лёгіку замяняе ідэя мазаічнай стракатасьці пэрсанажаў, колькасьць якіх сягае за тысячу, большасьць зь іх не патрабуюцца для сюжэту, але маюць цікавую ўласную біяграа-

фію і перажываньні, ролю ўнутраных маналёгаў і бясконцых дыялёгаў выконваюць расшыфроўкі падслухоўваньня КДБ, а 17 афіцэраў і генэралаў, якіх распытваў аўтар, увасабляюць калектыўнага сьледчага Парфірыя Парфір'евіча.

Адна з адметнасьцяў Мэйлера — яго бязьлітасная фіксацыя на сэксуальным жыцьці герояў. Характэрны прыклад — кніга пачынаецца з гісторыі Валянціны Прусаковай, жонкі Марынінага дзядзькі палкоўніка МУС Ільлі Прусакова. Мэйлер запісвае яе даўгі аповед пра страшнае савецкае жыцьцё, ГУЛАГ і вайну, прымусовую працу ў Нямеччыне, знаёмства зь лейтэнантам — будучым мужам, які быў на 15 гадоў старэйшы, яго сухасьць і стрыманасьць, дысцыпліну, такт, элегантнасьць, павагу да яе і іншых (дастаеўская дэталь: перад сьмерцю ён хварэў, і калі «хуткая» прыехала, ён спытаўся — думаеш, трэба гальштук надзець?), і потым згадвае, як пасьля яго сьмерці яна разьбірае рэчы і знаходзіць — яшчэ больш дастаеўская дэталь — пачак фатаздымкаў з голымі жанчынамі. І ўздыхае — мужчыны ёсьць мужчыны.

Гэтая пасьмяротная маленькая прыватная таямніца пабочнага пэрсанажа, зь якім аўтар нават не сустракаўся, не патрэбная ні для разьвіцьця сюжэту, ні для тлумачэньня характару галоўных герояў, ні для кантэксту — але як любы схаваны грэх, яна арганічная для паэтыкі Дастаеўскага (напрыклад, разьдзел «У Ціхана» ў «Бесах»).

Больш за ўсіх ад гэтай паэтыкі пацярпела Марына. Усіх, каго можна, Мэйлер распытваў пра яе бурную маладосьць у Ленінградзе, запісваў падрабязную пахвальбу менскага знаёмага, які хваліўся, што меў сэкс з Марынай перад вясельлем, пасьля

вясельля, увесь час. Мэйлер распытваў сяброўак з аптэкі — што яны ведалі пра мінулае Марыны. Ён цытуе перакладчыцу Інтурысту, якая, пачуўшы навіну пра шлюб Освальда, называе яго жонку вулічнай прастытуткай. І апатэоз — пяцідзённае інтэрвію з самой Марынай у Тэхасе, дзе яна прызнаецца, што яе згвалціў багаты замежнік, у гатэлі, яна не магла крычаць, бо баялася дзяжурную на калідоры.

Ёй было 17 гадоў, жыла бяз маці, з айчымам, які яе ледзьве цярпеў. І ўсё гэта адбывалася ў горадзе Дастаеўскага, зь белымі начамі, беднымі людзьмі, разьбітымі лёсамі.

Сонечка Мармяладава са «Злачынства і пакараньня». Марушка зь «Бесаў», Наташа з «Прыніжаных і зьняважаных».

Падчас гутаркі я спытаўся ў Мэйлера, як Марына рэагавала на публікацыю падрабязнасьцяў яе прыватнага жыцьця ў інтэрпрэтацыі КДБ і з дэталямі, якія здабыў сам аўтар?

— Адбылося наступнае. Шылер, як я казаў, вялікі гандляр. Калі ён пераконваў Марыну даць мне інтэрвію, ён сказаў у якасьці аргумэнту: вы мусіце гэта зрабіць. Гэта гісторыя. Норман Мэйлер ёсьць нашым амэрыканскім Талстым! Ужо пасьля таго, як кніга выйшла, ён пазваніў ёй і спытаўся пра ўражаньні і яна сказала:

— Ніякі ён не Талсты!

У амэрыканскіх унівэрсытэтах кажуць — «Tolstojevsky».



Освальд і Пушкін

Апошняя восень у Беларусі для Освальда пачалася з таемнага візыту ў Маскву. Таемнага, бо пра яго нідзе няма зьвестак — ні ў матэрыялах КДБ, якія атрымаў Мэйлер, ні ў дакумэнтах амэрыканскай амбасады, ні ў ліставаньні Освальда зь сям'ёй, ні ў яго «Гістарычным дзёньніку».

Дзёньнік ЛГО
21 жніўня — 21 верасьня, 1961

Хаджу ў пашпартны стол у аддзел візаў, таксама ў міністэрства замежных справаў у Менску, таксама ў міністэрства ўнутраных справаў, ад якіх залежыць рашэньне аб візе.

Адзіным сьведчаньнем паездкі ці палёту ў Маскву стаў рэчавы доказ 374 Камісіі Ўорэна: падчас пратрусу пасьля забойства сярод асабістых рэчаў Освальда паліцыя канфіскавала яго «Білет чытача № 3095/к» Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У.І. Леніна. Білет на імя «Освальда Лі Гарві» ў навуко-

вую чытальную залю № 1 быў выпісаны ў чацьвер, 7 верасьня 1961 году, тэрмінам на адзін месяц.

Што рабіў, дзе быў, дзе спыняўся, колькі дзён правёў Освальд у Маскве падчас той паездкі — не вядома нічога, апроч візыту ў бібліятэку. Картатэка заказаў чытачоў даўно зьнішчаная, і што ён чытаў у навуковай залі — амэрыканскую прэсу, зборнік законаў ці творы Леніна, невядома.*

Але гэта не адзіная загадка апошняй восені.

Дзёньнік ЛГО
Верасень — 19 кастрычніка 1961

Нічога не чуваць зь міністэрстваў («Яны нам самі пазвоняць»). Марына цягніком едзе зь Менску да цёткі ў горад Харкаў на Ўрал на 4 тыдні. У гэты час я адзін, але разам з Эрыкам хаджу на танцы і ў іншыя грамадзкія месцы на забавы. Ужо некалькі месяцаў не рабіў гэтага. Дзень нараджэньня праводжу адзін у опэры, гляджу маю любімую «Пікавую даму». Мне споўнілася 22 гады.

Мэйлер пакідае геаграфічную памылку без агаворкі, магчыма, сам не заўважыўшы яе ці палічыўшы, што ўкраінцы не пакрыўдзяцца. Ён робіць важнае назіраньне — восеньню, пасьля ўсіх спрэчак і сварак, у Освальдаў настаў час пэўнага ахаладжэньня. Лісты зь Менску ў Харкаў сухія, кароткія, і раптам нешта мяняецца, мяняюцца лісты — іх піша быццам іншы чалавек.

---

*Освальд таксама быў чытачом галоўнай бібліятэкі Беларусі, «Ленінкі» — але картатэка таксама не захавалася.

18 кастрычніка:

Ну, хутка ты вяртаесься назад. Я буду вельмі рады цябе зноў бачыць — як я буду цябе любіць!..

22 кастрычніка:

Мая мілая дзяўчынка! Сёньня я атрымаў тваю паштоўку; дзякуй, мілая, толькі мне не падабаецца, што ты балбочаш, што ты прадчуваеш, што згубіш мяне. Ты ніколі ня згубіш мяне, і ўсё! Ты ня кажаш, калі вяртаесься. Скажы як найраней. Ты хутка будзеш дома. Будзе так добра зноў быць з табой.

У матэрыялах Камісіі Ўорэна захоўваецца аркуш, знойдзены падчас ператрусу дома ў Освальда. На ім рукой Освальда па-расейску даволі дакладна і падрабязна запісаны словы любоўнай арыі з другога акту «Пікавай дамы».

Я вас кахаю так адчайна,
Бяз вас мне не пражыць і дня.
І подзьвіг сілы надзвычайнай
Для вас гатовы зьдзейсьніць я.*

Мэйлер цытуе 24 радкі арыі і робіць выснову:

Пушкіну і Чайкоўскаму ўдалося вярнуць яго да каханьня.

Выключна дзеля пэдантычнасьці — паэма Пушкіна, але словы лібрэта належаць не паэту, а брату кампазытара Мадэсту.

---

*Тэкст для Камісіі Ўорэна быў перакладзены на ангельскую і так даецца ў кнізе Мэйлера. Пераклад на беларускую з расейскага арыгіналу.

І дзеля дакладнасьці: паводле архіваў Вялікага тэатру опэры і балету БССР (званьне «акадэмічнага» было нададзена пазьней), 18 кастрычніка, у дзень народзінаў Освальда, «Пікавую даму» на яго сцэне ня гралі. У тэатральным архіве ў журналах рэгістрацыі пазначана, што 7 кастрычніка на сцэне адбылася прэм'ера опэры Яўгена Глебава «Мара», і больш нічога. Як патлумачылі супрацоўніцы архіву, далей тэатар быў на гастролях.

Застаюцца тры магчымасьці. Першая — Освальд несьвядома памыляецца, бо піша ці перапісвае дзёньнік нашмат пазьней і блытае год («Пікавую даму» гралі ў кастрычніку 1960-га, праўда не 18-га, а 15-га); другая — Освальд сьвядома робіць непраўдзівы запіс, матывацыя незразумелая; трэцяя — тэатральныя архівы памыляюцца.

Была яшчэ чацьвёртая магчымасьць — Освальд сапраўды слухаў Чайкоўскага, але ня ў опэрным тэатры, а ў кінатэатры. У 1960-м на экраны выйшаў фільм-опэра »Пікавая дама». Марына ўжо ў Амэрыцы пісала ў сваіх паказаньнях для ФБР:

Улюбёная опэра Лі была «Пікавая дама». У Расеі зрабілі фільм па гэтай оперы, цудоўны фільм. Лі хадзеў глядзець яго чатыры ці пяць разоў...

Высьветліць, куды мог пайсьці адзінокі малады чалавек у Менску ў 1961 годзе, каб задаволіць свае культурныя патрэбы, не лягчэй, чым аднаму літаратурнаму герою было знайсьці дванаццатае крэсла — горад яшчэ ня меў сваёй газэты, а афішы з тумбаў і рэклямных шчытоў даўно абарваў вецер гісторыі.

Але паспрабаваць можна. Галоўная рэспубліканская газэта «Звязда» друкавала ня толькі абавязко-

выя пастановы партыі і ўраду, але і рэпэртуарную афішу сталіцы.

З тэатрам опэры і балету ўсё проста — там неахайна ці, прынамсі, вельмі спэцыфічна вялі архівы. Насамрэч да ад'езду на гастролі ў канцы месяца трупа была ў Менску да 25 кастрычніка і сыграла паўтара дзясятка спэктакляў — усе абвесткі спраўна друкавала «Звязда». Але «Пікавай дамы» сярод іх не было.

У 1961-м у Менску было 17 кінатэатраў, іх рэпэртуар таксама друкавала газэта — але цягам кастрычніка нідзе ні разу не круцілі фільм-опэру.

Ні разу, ні ў тэатры, ні ў кіно ў тым кастрычніку ў Менску не гучала знакамітая арыя пра ўдачу і няўдачніка, доля якога, як вядома, плакаць. За адным магчымым выняткам.

Напярэдадні дня народзінаў Освальда, 17 кастрычніка, у Маскве адкрыўся 22-гі партзьезд, і ў наступны дзень газэты мусілі друкаваць гіганцкую прамову Мікіты Хрушчова, якая заняла ўвесь здвоены нумар і не пакінула месца ні для радка пра надвор'е, ні для шахматнага эцюду, ні для кіна-канцэртнага і тэатральнага рэпэртуару дня.

Рэпэртуарная дата 18 кастрычніка ня выплыла з пажоўклых старонак фрагмэнтарнага тэатральнага архіву, а ў газэтах была пахаваная пад татальным шматслоўем партыйнага правадыра.


У той дзень можна было ўведаць, што Сталін яшчэ большы злачынца, чым сказалі пра гэта пяць гадоў таму на такім самым зьезьдзе, што да антыпартыйнай групы Малянкова далучыўся рэдактар «Правды» Шапілаў і на ўсё жыцьцё атрымаў тытул «и примкнувший к ним», так, відаць, і на помніку на могілках напісалі, а маршал Варашылаў проста

зьбіўся з тропу, і што камунізм пабудуецца праз дваццаць гадоў, і шмат яшчэ чаго.

Але пра «Пікавую даму» нічога ў той дзень ня ўведаеш, апроч як з запісу Освальда.

І толькі на шпацыры па гарадзкіх вуліцах патрапіць раптам на вочы старая шыльда «Дом культуры», і прыйдзе ў тлумную галаву неабавязковая думка — фільмы ж яшчэ круцілі ў заводзкіх клюбах і прафсаюзных палацах культуры, а іх рэпэртуар газэты не друкавалі.

Мог, мог Освальд злавіць «міг удачы» ў свой апошні дзень нараджэньня ў Менску.



Дагнаць Амэрыку

У канцы 1961-га на заводзе мянялі наглядную агітацыю — на стэндах вывесілі «Маральны кодэкс будаўніка камунізму»* і сьвежыя цытаты з выступу на партыйным зьезьдзе Хрушчова:

Цяперашняе пакаленьне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізьме!

Дагонім і перагонім Амэрыку!

Нашы мэты ясныя, задачы вызначаныя, за працу, таварышы!

---

*Тэкст па рэалістычнасьці нагадваў «Атэнскую сыстэму» Освальда, але ўпор рабіўся на градацыю пачуцьцяў: любіць патрабавалася сацыялістычную радзіму і краіны сацыялізму, да працоўных усіх краінаў рэкамэндавалася праяўляць салідарнасьць, да справы камунізму — адданасьць, да агульнай маёмасьці — клопат, да грамадзкага абавязку — сьвядомасьць, да членаў сям'і — павагу, да дармаедзтва — непрымірымасьць, да ворагаў міру — нецярпімасьць, да асабістага жыцьця — прастату. Кодэкс, як успамінаў адзін з аўтараў, быў напісаны за паўтары гадзіны групай сьпічрайтараў ЦК, якія адыходзілі пасьля цяжкай п'янкі напярэдадні (часопіс «Российский адвокат», http://gra.litsa.ru/magazine.php?m=60&a= 3).

У адзіны лістападаўскі запіс Освальда ў дзённіку, аднак, гэтыя слоганы не патрапілі.

Дзённік ЛГО
2 лістапада 1961

Вяртаецца Марына, вясёлая, прывезла некалькі слоікаў закансэрваванай гародніны для мяне ад сваёй цёткі з Харкава.

Даганяць Амэрыку Освальды вырашылі самі. Аднак спробы пераканаць іх дачакацца камунізму працягваліся.

Рапарт КДБ
20.11.61

Падчас сустрэчы 20 лістапада 1961 году Прусакоў І.В. патлумачыў, што цягам апошняга часу двойчы гаварыў са сваёй пляменьніцай Марынай і яе мужам Освальдам Л.Г. Як сваяк жонкі Освальда, Прусакоў выказаў меркаваньне, што рашэньне Освальда вярнуцца ў Амэрыку можа быць памылковым. Прусакоў гаварыў зь ім пра складанае міжнароднае становішча, а таксама пра магчымасьць яго прызыву ў амэрыканскае войска, праблемы з працай у Амэрыцы, а таксама пра пэўную магчымасьць яго арышту там.

Освальд патлумачыў Прусакову, што наўрад ці яго прызавуць на вайсковую службу, бо ён ужо адслужыў свой тэрмін. Што датычыцца магчымага арышту — ён ня думае, што супрацоўнікі амбасады сталі б яму хлусіць. Тым ня менш, Освальд паабяцаў яшчэ раз узважыць усе гэтыя акалічнасьці, датычныя яго вяртаньня ў Амэрыку.

Далей Прусакоў патлумачыў, што ён таксама спрабаваў пераканаць сваю пляменьніцу Марыну, што ехаць у ЗША немэтазгодна. Такі самы ўплыў на яе рабіла яе цётка Паліна, якая жыве ў Харкаве. У выніку гэтых гутарак Прусакоў вырашыў, што Марына ня надта хоча ехаць. Аднак яна была вельмі заклапочаная тым, як жыць далей, калі ў яе будзе дзіця ад Освальда.

Прусакоў даў абяцаньне працягваць працу па пераканаьні Освальда і яго жонкі, каб тыя зьмянілі сваю думку наконт паездкі ў Амэрыку. Прусакоў не згадаў якіх-небудзь падазроных момантаў у паводзінах Освальда.

Мэйлеру Марына прыгадала, што харкаўская цётка сапраўды адгаворвала яе ад Амэрыкі. Але цётчын сын сказаў — слухай сваё сэрца і рабі, як трэба табе.

Дзёньнік ЛГО
Сьнежань 1961

Затрымка пачынае раздражняць. Марына пачынае сумнявацца, ці варта ехаць у ЗША. Верагодна, з-за напружаньня і ад цяжарнасьці, мы сварымся і ўсё ня так ужо і добра, асабліва з надыходам суровай расейскай зімы.

У сьнежні Марыне пазванілі на працу і сказалі прыйсьці ў МУС-КДБ — абедзьве ўстановы месьціліся ў адным будынку, і яна не была ўпэўненая, калі расказвала Мэйлеру пра сустрэчу сам-насам зь сівым чалавекам у форме, ці быў ён з АВІРу ці з КДБ. Гаворка ішла пра ад'езд — матывы, намеры, ці добра падумала, ці не нашкодзіць сваякам, ці ўпэўненая ў сваім жаданьні, затым суразмоўца пе-

раключыўся на нефармальны тон і пачаў гаварыць як чалавек, які па ўзросьце даводзіцца ёй дзедам, бо хто яго ведае, як там складзецца шлюб і жыцьцё. Яна запомніла, што пагрозаў не было.

Гэта была апошняя спроба паўплываць на рашэньне Марыны.

У храналёгіі КДБ 6 сьнежня 1961 году Освальд зьвярнуўся да амэрыканскага сэнатара Джона Таўэра па дапамогу ў вяртаньні ў ЗША. Мэйлеру далі копію перакладу гэтага ліста на расейскую.

Дарагі сэнатар Таўэр!

Мяне завуць Освальд. Калі я прыехаў у Савецкі Саюз, я прад'явіў дакумэнты, што я — амэрыканскі грамадзянін і прыехаў у Савецкі Саюз часова. Амэрыканская амбасада ў Маскве знаёмая з маёй справай.

Пачынаючы зь ліпеня я спрабаваў беспасьпяхова атрымаць выязную візу, каб паехаць у ЗША, але савецкія ўлады адмаўляюць у дазволе мне і маёй жонцы выехаць.

Я грамадзянін Злучаных Штатаў (пашпарт № 1733242, 1959) і я прашу Вас дапамагчы мне, таму што савецкія ўлады трымаюць мяне супраць маёй волі.

Освальд, вядома, ня мог ня памятаць, што адбылося падчас яго першага паходу ў амэрыканскую амбасаду ў Маскве — а калі б і забыўся, пад рукой быў «Гістарычны дзёньнік».

Дзёньнік ЛГО
31 сьнежня 1959

У 12:30 я прыяжджаю ў амэрыканскую амбасаду, заходжу і кажу дзяжурнай «я хацеў бы

бачыць консула», яна паказвае на вялікі журнал і кажа, «калі вы турыст, калі ласка, зарэгіструйцеся». Я дастаю мой амэрыканскі пашпарт і кладу яго на стол, я прыйшоў скасаваць сваё амэрыканскае грамадзянства, кажу я звычайным тонам.

Яна ўстае й ідзе ў кабінэт Рычарда Снайдэра, генэральнага консула ў той час. Ён запрашае сесьці. Сканчае ліст, які друкаваў, і пытаецца, чым можа дапамагчы. Я кажу, што хацеў бы ўзяць савецкае грамадзянства і хацеў бы скасаваць амэрыканскае. Яго памочнік (цяпер генэральны консул) МакВікерс падымае галаву ад папераў. Снайдэр кажа — запісвае асабістую інфармацыю, папярэджвае, каб я не рабіў ніякіх крокаў перад тым, як саветы мяне возьмуць, кажа, што я «дурань», і кажа, што паперы на выхад з грамадзянства патрабуюць шмат часу на падрыхтоўку (іншымі словамі, адмаўляе мне ў скасаваньні грамадзянства ЗША).

Я заяўляю, што прыняў рашэньне. З гэтага дня і ў будучыні я не лічу сябе грамадзянінам ЗША. Я праводжу ў амбасадзе 40 хвілін, пакуль Снайдэр ня кажа: «Калі вы ня хочаце больш падрабязна расказаць пра свае марксісцкія перакананьні, дык можаце ісьці». Я хачу пазбавіцца ад амэрыканскага грамадзянства, а ён фактычна кажа — ня сёньня. Я іду з амбасады, прыўзьняты ад гэтага супрацьстаяньня, і калі вяртаюся ў гатэль, адчуваю, што патраціў свае сілы недарэмна. Я ўпэўнены, што расейцы мяне прымуць пасьля такой дэманстрацыі маёй веры ў іх.

Даволі дакладна вядома, што падумалі ў КДБ як пасьля дэманстрацыі ў амбасадзе ў сьнежні

1959-га, гэтак і пасьля дэманстратыўнага абвінавачаньня савецкіх уладаў у гвалтоўным трыманьні амэрыканскага грамадзяніна ў сьнежні 1961-га — і ў першым і ў другім выпадках пахла міжнародным скандалам.

Як патлумачылі Мэйлеру, першы скандал, падслуханы і запісаны КДБ у амбасадзе, быў настолькі гучны — Освальд павышаў голас, крычаў, што раскажа ўсе вайсковыя сакрэты — што адначасна разглядалі вэрсіі, што гэта «легенда» ЦРУ, нават двайнога характару (спэцыяльна ўсё так апэрэтачна-непраўдападобна, каб падмануць КДБ і пераканаць, што ЦРУ так тапорна не зрабіла б — нешта такое).

Пасьля сачэньня за жыцьцём Освальда ў Менску і зьняцьця копіі зь ліста да сэнатара Таўэра ў КДБ пабачылі, што скандал можа быць, але зь іншай прычыны. Канчаткова справа вырашалася ў Маскве, і туды былі пасланыя заключэньні менскага КДБ і іншыя паперы, у тым ліку — характарыстыка Освальда для гараддзелу міліцыі, падпісаная дырэктарам заводу і начальнікам аддзелу кадраў.

Менскі радыёзавод
11.12. 61

Характарыстыка

Лі Гарві Освальд быў прыняты на працу ў якасьці рэгуліроўшчыка экспэрымэнтальнага цэху гэтага заводу 13 студзеня 1960 году. Падчас працы рэгуліроўшчыкам яго праца была нездавальняючай. Не праяўляе ініцыятывы дзеля падвышэньня майстэрства рэгуліроўшчыка.

Грамадзянін Лі Гарві Освальд балюча рэагуе

на заўвагі майстра і неахайны ў працы. Грамадзянін Л.Г. Освальд не бярэ ўдзелу ў грамадзкім жыцьці нашага заводу і пераважна паводзіць сябе няшчыра.

Аднойчы а 7-й раніцы ў нядзелю 18 сьнежня 1961 году Освальдам у дзьверы пазванілі — усе на выбары! У гэты дзень выбіралі судзьдзяў. Освальд не адчыніў. Потым прыйшлі зноў. І Освальд пачаў крычаць праз зачыненыя дзьверы — гэта свабодная краіна! Так напісана ў Канстытуцыі. Ён прачытаў напалоханай Марыне цэлую лекцыю на гэтую тэму — у свабоднай краіне не прымушаюць людзей хадзіць на выбары.

Невядома, крычаў Освальд і спасылаўся на сталінскую канстытуцыю як марксіст, які яе вывучаў, ці пратэставаў як чытач Орвэла, знаёмы з фэномэнам «двухдумнасьці». У любым выпадку, агітатараў ён напалохаў, больш не прыходзілі.

Сваю канчатковую выснову зрабіў і КДБ. Освальд найхутчэй не агент ЦРУ, але зарэкамэндаваў сябе як чалавек без камуністычных прынцыпаў, які ня надта хацеў працаваць і вучыцца. Толькі галаўны боль.

КДБ даў заключэньне: пярэчаньняў для выдачы выязной візы Освальду няма.

На адзін галаўны боль меней.

Як той казаў — ну-ну.



Навагодні сьмех

Свой першы Новы год у Савецкім Саюзе Освальд сустракаў у Маскве адзін, у нумары гатэлю «Мэтраполь» — быў у ложку а 10-й вечара, пасьля паходу ў амбасаду, дзе ён заявіў пра адмову ад амэрыканскага грамадзянства.

Другі Новы год Освальд правёў у Менску ў сям'і Элы Герман, у якую быў закаханы — і калі яна не прыняла прапановы, ажаніўся з Марынай Прусаковай, «каб насаліць Эле».

Напярэдадні трэцяга і апошняга Новага году ў СССР у Освальда зьмяніўся паштовы адрас — у сьнежні вуліца Калініна была перайменаваная ў Камуністычную.

Разам з жонкай яны былі запрошаныя на суседнюю вуліцу Чырвоную, 14 да Зігераў. Менавіта Аляксандар Зігер быў першым, хто параіў Освальду вяртацца ў Амэрыку — і Новы год Освальды сустракалі з важнай навіной.

Дзёньнік ЛГО
25 сьнежня 1961

Раство, аўторак. Марыну выклікаюць у пашпартны стол і аддзел візаў. Ёй кажуць, што нам далі савецкія выязныя візы. Яна запаўняе анкеты і вяртаецца дадому з гэтай навіной. Выдатна (я лічу)! Новы год сустракаем апоўначы за сталом у Зігераў, яшчэ шэсьць гасьцей.

Як вынікае з тэксту, запіс зроблены не 25 сьнежня, а найраней у студзені, пасьля сьвяткаваньня — але галоўная навіна пра візы прыйшла менавіта перад Новым годам, і ўпершыню за шмат часу ў Освальдаў добры настрой.

Расшыфроўка падслухоўваньня КДБ
31.12.61

ЛГО: У гэтай сукенцы ты ня будзеш добра выглядаць.

Жонка: Чаму?

ЛГО: Занадта адкрытая.

Жонка: Дзе яна адкрытая? Прыгожа.

ЛГО: Не пасуе.

Жонка: А вось мае туфлі — іншая справа! Яны зусім не пасуюць.

ЛГО: Ты сапраўды ня ўмееш апранацца, далібог!

Жонка: Купі мне іншыя туфлі.

ЛГО: Гэта прыгожыя туфлі.

Жонка: Гэта так. Але яны не пасуюць на зіму. Яны белыя. Ёсьць зімовыя туфлі і летнія туфлі.

(ЛГО ідзе на кухню і адразу вяртаецца.)

ЛГО: Ты зьбіраесься надзець пінжак?

Жонка: Які пінжак? У мяне няма ніякіх пін-

жакоў. Ты думаеш, што ім якая-небудзь розьніца, калі яны пабачаць, што гэта дрэнна выглядае?

ЛГО: Так!

Жонка: Гэта проста сукенка.

ЛГО: Не, яна непрыгожая!

Жонка: Ну, гэту я не магу надзець. Яна ўся ў дзірках. Ня ведаю, што надзець.

ЛГО: Усё будзе добра. Усё будзе цудоўна.

Жонка: Ты ведаеш, што я нікому не патрэбная.

ЛГО: Езус, а што наконт Освальда? *(Цалуе яе.)* **Людзі будуць на нас глядзець і казаць, вось прыгожая пара!**

Жонка: Прыгожая! *(Сьмяецца.)* **Тады я пайду ў спадніцы і свэтры. Табе проста стане сорамна.**

(Паўза.)

Калі б было што насіць, я апраналася б лепш за цябе, лепш за тваіх амэрыканцаў! *(Яны сьмяюцца.)*

Жонка: Калі б на мне былі гэтыя туфлі, калі мы ўпершыню сустрэліся, ты са мной нават ня стаў бы танцаваць. *(Яны сьмяюцца.)*

Пасьля доўгага перапынку ў расшыфроўках КДБ замест сварак і сьлёз зьяўляюцца сьмех і пацалункі.

Можа, гэтак бывала і раней, а Мэйлеру проста не паказалі, можа, назіраньне празь дзірачку ў сьцяне ў навагодні вечар вёў іншы чалавек — напрыклад, жанчына. Так ці іначай, але сьвяточны настрой на той Новы год быў і нават патрапіў у архіў КДБ.

Стужку расшыфроўвалі, пэўна, ужо пасьля Новага году, хаця ў КДБ у навагоднюю ноч, напэўна, працаваў апэратыўны дзяжурны. І ня толькі ў КДБ

і ракетных войсках. Паводле практыкі, якая засталася ад сталінскіх часоў, ва ўсіх органах улады, ад ЦК партыі і Савету Міністраў да райкамаў і райвыканкамаў, ад заводаў да калгасаў на сьвяточную ноч падвышалі пільнасьць — на казённых скураных канапах і драўляных лаўках варочаліся да раніцы адказныя дзяжурныя, а раптам дзе што здарыцца ці хто пазвоніць?

Так было і з Освальдам — хаця апэратыўнікі не працавалі зь ім 24 гадзіны запар, пільнасьць ніхто не адмяняў — да самага ад'езду.

І нават пасьля.



Бомба для Хрушчова

2 студзеня Освальд напалохаў каманду вонкавага назіраньня КДБ — ён выйшаў з хаты са стрэльбай у руках і пайшоў на прыпынак тралейбуса (як высьветлілася, здаваць зброю ў паляўнічую краму, яму нават выплацілі 18 рублёў).

Гэта быў другі пярэпалах — першы здарыўся, калі супрацоўнік, які вёў назіраньне празь дзірачку ў сьцяне, заўважыў падазроныя дзеяньні. Освальд важдаўся з кавалкамі мэталу, нечым, падобным да пораху — так робяць выбуховыя прыстасаваньні. Так, прынамсі, расказалі Мэйлеру.

У КДБ падняўся вэрхал: у студзені Менск меўся адведаць Мікіта Хрушчоў, кіраўнік партыі і ўраду.

Супрацоўнікі КДБ не адказалі на пытаньне Мэйлера, ці яны заходзілі ў кватэру Освальдаў у адсутнасьць гаспадароў, каб праверыць падазрэньне. «Сьцяпан» сказаў, што пазьней яны здолелі дастаць усё са сьметніцы і правесьці інспэкцыю. Трывога

была падманнай, скрынка аказалася лухтой, нічым. Нават не самаробным фэервэркам.

Дзёньнік ЛГО
4 студзеня 1962

Мяне выклікалі ў пашпартны стол, бо мой дазвол на жыхарства сёньня сканчаецца. Я маю цяпер амэрыканскі пашпарт, таму мне выдалі зусім новы дакумэнт, які называецца «Пашпарт для замежнікаў». Паколькі нам далі дазвол на выезд і ведаюць, што мы паедзем, тэрмін дзеяньня да 5 ліпеня 1962 году.

Прыезду Хрушчова, калі меркаваць зь «Дзёньніку», Освальд не заўважыў.

А бязь дзёньніку мог зьвярнуць увагу, што ў суседні, добра бачны з балькону тэатар опэры і балету на аўтобусах масава прывозілі не зусім тэатральную публіку — там адбывалася сельскагаспадарчая нарада, на якой выступаў Хрушчоў. За бясьпеку кіраўніка партыі і ўраду адказваў КДБ, які, як і міліцыя, працаваў у рэжыме асаблівай пільнасьці. Назіраньне за Освальдам у той дзень, верагодна, узмацнілі.

Калі б Освальд нейкім чынам патрапіў у залю, ён бы мог на свае вушы пачуць, як партыя кіруе, напрыклад, навукай — рэфэрэнты назьбіралі Хрушчову прыкладаў з працы беларускіх біёлягаў. Хрушчоў сьмяшыў удзельнікаў нарады прыкладамі пра акадэмічнае разьвядзеньне ў Беларусі далёкаўсходняга коркавага дрэва «аксаміту» — яго любілі зайцы, а дасьледнікі засыналі ад салодкага паху, вось, маўляў, і ўся навука. А хто будзе разводзіць кукурузу квадратна-гнездавым мэтадам?

Але ўсесаюзную вядомасьць мясцовым біёлягам прынёс іншы дасьледнік з Акадэміі навук — ён патрапіў аж у выступ Хрушчова на Пленуме ЦК КПСС:

У Інстытуце біялёгіі Акадэміі навук Беларускай ССР тав. Крапіўны А.П. абараніў вучоную ступень кандыдата біялягічных навук на тэму: «Экалёгія і гаспадарчае значэньне эўрапейскага белага бусла, чорнага бусла і звычайнай шэрай чаплі ў Беларусі». *(Ажыўленьне ў залі, сьмех.)* **Я прызнаюся ў сваім невуцтве — чорнага бусла ня бачыў, ня ведаю, ці водзіцца ён у Беларусі. Веру гэтаму вучонаму: калі ён піша, відаць, чорны бусел ёсьць. Ня ведаю, магчыма, гэта дысэртацыя прынясе карысьць нашым праўнукам, але ня веру і ў гэта. Ва ўсялякім разе савецкія грошы ня трэба траціць на дасьледаваньні белага, чорнага буслоў і шэрай чаплі Беларусі.** *(Воплескі.)*

Пасьля выступаў была мастацкая частка — але калі б Освальд і патрапіў на канцэрт у тэатры, дык усё роўна не пачуў бы дыялёгу ва ўрадавай лёжы. Паводле намэнклятурнага фальклёру, у перапынку канцэрту Хрушчову чытаў вершы другі сакратар ЦК Машэраў. Першы сакратар Мазураў, якому толькі што моцна перапала за правал рэспубліканскіх паставак мяса ў саюзны фонд, сядзеў моўчкі. Хрушчоў павярнуўся да яго — а ты што надзьмуўся, засьпявай нам што-небудзь. Прыпеўкі ведаеш? Ведаю, Мікіта Сяргеевіч, але толькі пра кукурузу.

Амэрыканскі злак пасьля паездкі Хрушчова ў ЗША ахрысьцілі каралевай палёў, і новую манархію насаджалі ў СССР, як некалі скідалі старую. Народная творчасьць зрэагавала на працэс па-свойму:

Выйшла б замуж за Хрушчова,
Ды баялась аднаго:
Кажуць, быццам замест ...
Кукуруза ў яго!

У такую байку з амэрыканскім злакам нумар адзін аформіўся той вечар у любімым менскім тэатры Освальда.

Ня «Пікавая дама», канечне.

Рыфмы ня тыя.



Пад бела-чорнымі крыламі

Да сярэдзіны лютага Освальд зробіць толькі адзін запіс у дзеньніку, пра халодную зіму. Пакінем яго ў шапцы-вушанцы грэцца каля чыгуннай батарэі цэнтральнага ацяпленьня і збочым ненадоўга, каб паглядзець, куды завяла сьцежка выпадковага мінака-біёляга, які патрапіў у выступ Хрушчова.

Аляксандар Крапіўны скончыў Харкаўскі ўнівэрсытэт і быў разьмеркаваны на працу ў Белавескую пушчу. Там ён і заняўся вывучэньнем колькасьці і харчаваньня галянастых птушак, як называюць буслоў і чапляў. Гадзінамі і днямі дзяжурыў ля гнёздаў, адбіраў і клясыфікаваў істотаў, якіх буслы прыносілі, потым скармліваў іх птушанятам. У дысэртацыі пазначана, што 28-гадовы аўтар дасьледаваў 30785 экзэмпляраў жывёлаў — харчовых аб'ектаў белага бусла, і 4248 — чорнага.

Ciconia ciconia, як зьвяртаюцца да буслоў на лаціне, птушка, мякка кажучы, не вэгетарыянская і мае адпаведнае мэню: жабкі, рыба, яшчаркі, зьмеі, сьлімакі, мышы, сусьлікі, птушаняты, у тым ліку

кураняты і качаняты — больш за паўсотні розных істотаў. Крапіўны перабраў рукамі не адзін цэнтнэр здабычы і, верагодна, часам пачуваўся як на мясабойні ці рыбакамбінаце. Такая была цана двух сказаў у дысэртацыі:

... белы бусел эўрыфаг з ухілам да гэрпэтафагіі, энтамомафагіі і міяфагіі. Чорны бусел эўрыфаг з ухілам да гэрпэтафагіі і іхтыяфагіі.*

Празь дзесяцігодзьдзі спэцыялісты напішуць, што гэта была першая дысэртацыя па экалёгіі буслоў ня толькі ў савецкай навуцы — нічога падобнага не было і ў замежнай літаратуры.

Што Хрушчоў не разьбіраўся ў арніталёгіі, дзіўнага мала, а вось яго памочнікі былі халтуршчыкі — уставілі ў выступ факт чатырохгадовай даўніны. Дысэртацыю Крапіўны абараніў у лютым 1958-га, але адмовіўся ад прапановы застацца працаваць у Акадэміі Навук у Менску і паехаў у пэдінстытут у Віцебск, дзе давалі кватэру.

Там і прачытаў у газэтах, што першы сакратар ЦК верыць яму, што чорны бусел сапраўды існуе, але савецкія грошы на яго траціць ня варта. З камсамольскага ўзросту Крапіўны выйшаў, у партыю яшчэ не ўступіў, так што на палітычных сходах яго асабіста моцна не разьбіралі, тым больш, што дысэртацыю ён абараняў у акадэмічным інстытуце біялёгіі, і Хрушчоў згадваў прозьвішча менскага, а ня віцебскага дырэктара.

---

*У перакладзе гэта азначае, што белы бусел харчуецца ўсім, што знойдзе, але больш любіць зьмеек-яшчарак, павукоў- жужалёў, і ўвогуле ўсё мясное. А яго чорны сваяк, хаця таксама непераборлівы, аддае перавагу французскай кухні (жабкі, яшчаркі) і японскай (сырая рыба).

Калі, здавалася, горш ужо ня будзе, 22 сакавіка ў «Правде» зьяўляецца фэльетон «З пункту гледжаньня Бусла», дзе ўжо сьціралася розьніца паміж заалёгіяй і заафіліяй.

Белы Бусел піша Шэрай Чаплі:

І чаго ён прычапіўся да галянастых дзікіх птушак?! Жывем мы мірна, плодзімся мала, людзям жыць не перашкаджаем. Прывыклі абыходзіцца без чалавека. Ужо калі палюбіў птушку, любі свойскую. Пад нашым дубам — птушатнік. Там і куры, і гусі, і качкі. Ім трэба дагляд. Але Крапіўны на свойскую птушку — нуль увагі. Усё да нас, дзікіх, чэпіцца.

Праз паўтара месяца, 10 траўня 1962 году ў рубрыцы «Па матэрыялах «Правды» чытачы пабачылі ў лісьце з Акадэміі навук Беларусі знаёмыя словы — крытыка прызнаная правільнай.

Дырэкцыя і партыйная арганізацыя інстытуту прынялі меры для паляпшэньня дзейнасьці інстытуту і яго навуковай рады ў справе абароны дысэртацыяў. Перагледжаная тэматыка навукова-дасьледнай працы і асьпіранцкіх тэмаў з мэтай набліжэньня іх да патрабаваньняў і запытаў народнай гаспадаркі. Прынятая пастанова аб рэарганізацыі навуковай рады і абнаўленьні яе складу.

Крапіўнага выклікалі ў вышэйшую атэстацыйную камісію, якая прысуджала навуковыя званьні — але годнасьці кандыдата навук не пазбавілі. Часы ўсё ж былі ня сталінскія. Дый не арніталёгія раздражніла партыйнае начальства, абурыла, хутчэй за ўсё, фармулёўка тэмы пра гаспадарчае значэньне

буслоў і чапляў. Справа была ня проста ў каньюнктурнай назьве.*

Каньюнктура была нормай, але назва працы Крапіўнага выглядала горш за прыстасаванства — яна гучала як пародыя, прычым пародыя на палітыку партыі і ўраду ў сельскай гаспадарцы. Не дапамагло і тое, што заалёгія сапраўды ведала пра гаспадарчае значэньне бусла — пры нашэсьці саранчы буслы вылятаюць на палі і трушчаць шкоднікаў ураджаю, як пішуць у навуковых тэкстах, «у велізарнай колькасьці». Крапіўны прыйшоў да высновы, што ва ўмовах Беларусі гаспадарчае значэньне птушкі хутчэй адмоўнае — яны зьнішчаюць такую колькасьць земнаводных, што разбураюць экалёгію вадаёмаў.


У наступным годзе Крапіўны зьехаў зь Беларусі ў Харкаў, дзе ня толькі друкаваў манаграфіі, падручнікі пра зоапсыхалёгію і біяэкалёгію, але й вывучаў паводзіны івалгі, сьпевы валасянак і пеначак, стаў доктарам навук, прафэсарам, прыяжджаў на навуковую канфэрэнцыю ў Менск, усё жыцьцё называў сябе на беларускі лад Алесем, аж пакуль ня выкінуўся з вакна ў 1990-м, не перанёсшы гібелі двух сваіх студэнтаў падчас палявой практыкі.

Пры жыцьці пабачыла сьвет толькі адна яго ненавуковая кніга, якая называлася «Калі няма страху».

Кніга была не пра людзей.

---

*Празь месяц пасьля прыезду Освальда ў Менск у газэтах друкавалася абвестка пра публічную абарону дысэртацыі на атрыманьне вучонай ступені доктара гістарычных навук Г.М. Ліўшыцам на тэму, не дасьледаваную ні Флавіем, ні Тамашом Аквінскім, ні айцамі царквы: «Клясавая барацьба ў Юдэі і паўстаньне супраць Рыму».



Каго бусел прынёс

У беларускай традыцыі дзяцей прыносіць бусел. У амэрыканскай — таксама бусел. Хаця, напэўна, ня ўзімку.

Дзёньнік ЛГО
15 лютага 1962

Марына зьбіраецца нарадзіць 1 сакавіка. Сьвітанак. Марына будзіць. Прыйшоў час. У 9:00 прыяжджаем у шпіталь, пакідаю яе ў руках санітарак, іду на працу. У 10:00 Марына нараджае дзяўчынку. Мне паведамляюць навіну а 5-й вечара, калі я прыходжу ў шпіталь пасьля працы. Мы хацелі хлопчыка. Марына адчувае сябе добра, дзяўчынка таксама.

Рэканструкцыя Мэйлера падае падзеі крыху іначай і з большай рэзкасьцю. Пасьля мітусьні і збораў з дому выйшлі каля 09:00, доўга не маглі злавіць таксі і ў выніку паехалі ў 3-ю клінічную бальніцу на аўтобусе. Освальд яшчэ не даехаў да працы, як

сяброўкі Марыны ўжо пазванілі на завод і на працоўным месцы ён ужо атрымліваў віншаваньні.

Марына ляжала тыдзень — і нататкі, якімі абменьваліся муж з жонкай, урэшце патрапілі ў Камісію Ўорэна і сталі афіцыйным матэрыялам сьледзтва. Цяпер гэты прыватны фрагмэнт менскага жыцьця выстаўлены на агульны агляд.

15 лютага 1962

Дарагая Марына,

Мы з табой зусім не чакалі дачкі, але я вельмі рады ўсё роўна. Малайчына! Як ты здолела так хутка нарадзіць? Малайчына! Ізноў малайчына! Калі табе што трэба, кажы любое жаданьне, мы з табой цалкам гатовыя да Джун Марыны Освальд.

Алек

Дарагі Алік!

Вось ты й бацька. Нават добра, што ў нас дзяўчынка.

Роды прайшлі вельмі добра і хутка. А 10-й гадзіне нарадзілася Джун. Зашылі толькі чатыры трэшчынкі звонку. Я і сама не чакала, што ўсё будзе так хутка. Увечары, верагодна, да цябе прыйдзе цётка Валя. Яна ўжо была ў мяне сёньня. Сёньня нічога не прынось. Заўтра прынясі толькі кефір і салодкае. Шакаляд мне ўжо нельга. Астатняе ты ведаеш.

Цалую, Марына

Дарагая!

Як ты жывеш? Кефіру няма. Што табе трэба? Ты ўжо карміла дзіця? Гэтыя фотакарткі аддай

цётцы Валі, у нас яшчэ ёсьць дома. Хто табе званіў сёньня?

Кахаю цябе.

Алек

18 лютага 1962

Дарагая Марына,

Цётка Валя і дзядзька Ільля былі сёньня ў мяне раніцай. Яна адведае цябе заўтра а 2-й гадзіне. Я сказаў, што трэба купіць. Я і Эрык учора былі ў Зігераў да 24-х гадзінаў. Як там яна, яна есьць, так?

Што табе трэба? Ты можаш хадзіць? Інэса была ў цябе? Джун яшчэ чырвоная? Ты ведаеш, калі цётка Валя прыйдзе заўтра, перадай фатаграфіі ёй. Сёньня цётка Люба да цябе ідзе.

Ну, пакуль.

Твой муж Алек

P.S. Я заўтра не прыйду, добра?

20 лютага 1962

Хэлоў, тата!

Алек, я ня думала, што будзе так цяжка даглядаць дзіцё. Джун зьядае ўсё чыста. Але малако прыбывае перад кожным кармленьнем, і яго трэба адсмоктваць. Гэта так балюча, што лепш бы я нарадзіла яшчэ адно дзіцё. Дарагі Алек, неадкладна, адразу сёньня купі і перадай мне грудны адсос, і каб гумовая груша была цьвёрдая, ня мяккая.

Алек, я стала так дрэнна выглядаць, што ты мяне не пазнаеш. Гэта таму, што я баюся, што Джун не бярэ грудзі. Таксама, тут не даюць паспаць колькі трэба — толькі з 2 да 5 раніцы.

Не магу ўявіць, што буду рабіць дома. Алек, мне таксама пільна трэба 1 руб. 20 капеек. Урэшце, я не магу хадзіць бязь ліфчыка. Тут адной жанчыне купілі два, і яна прадала адзін мне. Мне трэба ёй заплаціць. Гэта ня дзеля прыгажосьці, а каб не застойвалася малако. Ніхто з вас нават ня думае прыносіць мне тое, што мне трэба. Усе толькі і робяць, што пытаюцца, што мне трэба. Ну, хопіць пра гэта, сканчаю.

Марына

21 лютага 1962

Дарагая Марына,

Сёньня мы атрымалі ад заводу вельмі прыгожыя падарункі для Джун; я ведаю, табе спадабаецца. Яны купілі 1 летнюю коўдру, 6 халодных пялюшак, 4 цёплыя пялюшкі, 2 кашулі, 3 вельмі добрыя цёплыя кашулі, 4 вельмі прыгожыя касьцюмчыкі і дзьве цацкі (цалкам 27 рублёў). Я ведаю, што Эрык і Аніта былі ў цябе ўчора, як табе Аніта?

Як Джун есьць?

Заўтра, напэўна, я не прыйду, добра?

Кахаю цябе.

Алек

Дзёньнік ЛГО

23 лютага 1962

Марына выпісваецца са шпіталю, я ўпершыню бачу Джун.

У архівах Менскага ЗАГСу дагэтуль захоўваецца запіс рэгістрацыі грамадзянкі БССР зь незвычайным імем Джун.

Дзёньнік ЛГО
28 лютага 1962

Як патрабуе закон, іду рэгістраваць немаўля. Хачу яе назваць Джун Марына Освальд. Але гэтыя бюракраты кажуць, што яе другое імя павінна быць такім, як маё першае. Расейская традыцыя, падмацаваная законам. Я адмаўляюся, каб запісалі імя «Джун Лі». Абяцаюць пазваніць у гарвыканкам і ўведаць, бо ў мяне сапраўды амэрыканскі пашпарт.

29 лютага 1962

Мне сказалі, што ніхто дакладна ня ведае, што рабіць, але ўсе пагаджаюцца «давай, рабі па-расейску». Імя: Джун Лі.

Ізноў Освальд блытае даты — у лютым 1962-га было 28 дзён. Высакосным быў папярэдні год.

Джун — Юна, Юнона, таксама азначае назву месяца — чэрвень.

Чэрвеня ў Беларусі Джун не дачакаецца — ня хопіць аднаго дня. 1 чэрвеня Освальды будуць ужо ў Маскве.



Антысавецкая фармацэўтыка

23 лютага, калі Освальд упершыню пабачыў дачку, быў мужчынскі дзень — дзень савецкай арміі адзначалі ўсе, хто насіў пагоны, ваяваў, служыў. Прафэсійным сьвятам у доме дзядзькі Марыны цяпер лічыўся і дзень міліцыі, але ён ня мог параўнацца з размахам сьвяткаваньня мужчынскага сьвята. Тым больш, што яно супадала з днём народзінаў цёткі Валі.

У гэты свой першы дзень дома Марына засталася адна і толькі з дапамогай суседкі здолела даць рады дзіцяці — Освальда яна паслала віншаваць цётку. Ён абяцаў хутка вярнуцца, але прыйшоў вельмі позна і на добрым падпітку — Марына ніколі ня бачыла яго ў такім стане. Пілі за цётку, за дачку, за бацьку, за маці, сказаў ён жонцы і заваліўся ў ложак. Як патлумачыць Марына Мэйлеру — не прывык да гарэлкі.

Дзядзьку Марыны, баявому афіцэру падчас вайны, Ільлю Прусакову гэты дзень, напэўна, запомніўся зь іншай прычыны.

Рапарт КДБ
23.02.62.

Сустракаўся з агентам МУС «П» 23.02.62. Сказаў, што ён нядаўна двойчы размаўляў з пляменьніцай Марынай у сувязі з маючым адбыцца ад'ездам з Савецкага Саюзу ў ЗША. «П» растлумачыў Марыне неабходнасьць паводзіцца годна і ня браць удзелу ў антысавецкай прапагандзе ці іншых варожых акцыях, скіраваных супраць Савецкага Саюзу, каб не ствараць праблемы для «П» і іншых сваякоў, якія жывуць у СССР. Марына паабяцала «П», што ня будзе рабіць ніякіх дзеяньняў у ЗША, якія скампрамэтавалі б «П» ці іншых сваякоў.

«П» працягне выхаваўчыя гутаркі і таксама пагаворыць з «Налімам», каб пасьля прыезду ў ЗША ён устрымаўся ад паклёпніцкіх выказваньняў пра СССР.

«П» патлумачыў, што падчас гутаркі з Марынай, выказваючы клопат пра яе, ён пацікавіўся, ці яна заўважала нешта падазронае ў паводзінах Л.Г. Освальда ці ўчынках, што магло б сьведчыць пра яго падвойную асобу. Марына заявіла «П», што нічога падобнага ў паводзінах Освальда яна не заўважала.

Падчас сустрэчаў «П» спытаў у Марыны, ці яна не баіцца, што Освальд будзе пакараны амэрыканскімі ўладамі за тое, што ўцёк з ЗША. Марына ведае са словаў Освальда, што ў ЗША гэта ня лічыцца злачынствам, якое пагражала б арыштам, і, быццам, паводле амэрыканскіх законаў, няма падставаў, каб прыцягнуць Освальда да адказнасьці за гэта, калі ён вернецца ў ЗША.

Марына ў Штатах не займалася антысавецкай дзейнасьцю, але яе адказы на пытаньні Камісіі Ўорэна можна было ўключаць у любы падручнік пра савецкае жыцьцё.

— Колькі вы зараблялі ў Менску?

— Сорак пяць, як усюды.

— За тыдзень?

— Не, за месяц. Гэта не Амэрыка.

— 45 рублёў?

— Так.

— За месяц?

— Так.

— Старымі ці новымі?

— Новымі.

— І колькі гадзін вы працавалі?

— Ад 10:00 да 16:30.

— Калі вы сказалі «як усюды», вы мелі на ўвазе, што аднолькава плацілі і ў вялікіх і ў малых гарадах?

— Так фармацэўтам плацяць усюды.


— Вы ашчаджалі грошы?

— Не. Я атрымаю палучку і патрачу за адзін дзень. Максымум за тры.

Марына жыла ў дзядзькі і не плаціла за кватэру, за бялізну, за ежу. Як у Менску жылі астатнія 27 дзён у месяцы, ні сябры Камісіі, ні пазьней Мэйлер не ўдакладнялі. Дый што там удакладняць.

Да камунізму заставалася толькі дваццаць гадоў.

І толькі раз на чатыры гады надараўся высакосны год зь лішнім днём.



Нахабства бязь межаў

Калі меркаваць зь дзёньніку, сакавік 1962-га — даволі спакойны месяц, справы з ад'ездам рухаюцца, Освальд робіць тры апошнія кароткія запісы.

Дзёньнік ЛГО
24 сакавіка 1962

Марына афіцыйна звальняецца з працы.

26 сакавіка

Атрымліваю ліст ад Службы іміграцыі і натуралізацыі з Сан Антоніё, Тэхас, што заява Марыны на атрыманьне візы ЗША ўхваленая!! Апошні дакумэнт. Цяпер трэба толькі дачакацца, пакуль амбасада ЗША атрымае копію паведамленьня, каб афіцыйна даць дазвол.

27 сакавіка

Атрымліваю ліст ад сп. Філіпса (у яго працуе мая маці), з гарантыяй падтрымкі маёй жонцы, калі трэба.

У гэты самы дзень пішацца ліст да маці ў Тэхас.

ЛГО — ліст да Маргарыты Освальд
27.03.62

Дарагая маці,

Мы маем быць у Штатах найпазьней у траўні. Амбасада пагадзілася пазычыць мне 500 даляраў на падарожжа, а таксама яны прынялі маё сьведчаньне падтрымкі, так што тваё не спатрэбіцца. Аднак, не спрабуй, каб твой сябра-бізнэсмэн скасаваў сваё сьведчаньне аб падтрымцы для мяне, яно калі-небудзь можа прыдацца.

Як ты кажаш, маё падарожжа сюды магло б стаць падставай для добрай гісторыі пра мяне. Фактычна, я ўжо напісаў 50 старонак нататак на гэтую тэму.

Зь любоўю,
Лі

Усю вясну Освальд удзельнічае ў эпісталярнай вайне, у якой бяруць удзел амбасада ЗША ў Маскве, аддзел Савецкага Саюзу і аддзел бясьпекі і консульскіх справаў Дзярждэпартамэнту, служба іміграцыі і натуралізацыі Міністэрства юстыцыі ЗША, і нават камандаваньне корпусу марской пяхоты ЗША.*

*Пасьля таго, як сталі вядомыя гучныя заявы Освальда ў амбасадзе падчас спробы адмовіцца ад амэрыканскага грамадзянства пра гатовасьць расказаць савецкаму боку ўсё, што ён ведае пра радары ды іншыя вайсковыя сакрэты, у яго дакумэнтах быў зьменены запіс аб звальненьні з марской пяхоты — цяпер ён праходзіў па артыкуле «звольнены як непажаданы». Освальд напорыста патрабаваў вярнуць«ганаровае звальненьне».

Консул ЗША ў Маскве Джозэф Норбэры — Освальду
09.03.62

Зразумела, чакаецца, што Вы абярэце самы танны від транспарту і напішаце расьпіску за вылучаныя сродкі.

Мы яшчэ не атрымалі дазволу на візу для вашай жонкі, але як толькі яна будзе ўхваленая, вы можаце падаць пашпарт на выязную візу ў АВІР.

Консул ЗША ў Маскве Джозэф Норбэры — Робэрту Оўэну, аддзел Савецкага Саюзу Дзярждэпартамэнту ЗША
15.03.62

Патрабуецца як найхутчэй рашэньне наконт «выключэньня 243 (г)» з правілаў для Марыны Освальд. Муж часта тэлефануе і піша ў амбасаду, каб уведаць прычыну затрымкі. Нам падаецца неразумным абмяркоўваць праблему з 243 (г), паколькі можна яшчэ атрымаць выключэньне, але ўсё больш няёмка адмаўляць Освальду.

Аддзел Савецкага Саюзу — аддзелу візаў Дзярждэпартамэнту ЗША
16.03.62

Аддзел лічыць, што ў інтарэсах ЗША дапамагчы Лі Гарві Освальду і яго сям'і выбрацца з Савецкага Саюзу і адправіць іх у ЗША як найхутчэй. Як няўстойлівая асоба з цалкам непрадказальнымі паводзінамі, Освальд можа адмовіцца выехаць з СССР ці пазьней паспрабаваць вяр-

нуцца туды, калі мы зробім немагчымым, каб яго жонка і дзіця ехалі разам зь ім з Масквы.

Такія дзеяньні з нашага боку таксама дазволяць савецкаму ўраду заявіць, што хаця яны выдалі выязныя візы спн. Освальд, каб пазьбегнуць разьдзяленьня сям'і, урад ЗША зрабіў гэта гвалтоўна шляхам нявыдачы ёй візы. Заезд у трэцюю краіну запатрабаваў бы дадатковых расходаў ад ЗША.

Тым ня менш, Вашынгтон настойвае на правіле «243 (г)», якое патрабавала, каб жонка спачатку выехала ў трэцюю краіну і адтуль пачынала візавы працэс (што стварала новыя праблемы — віза ў трэцюю краіну, пражываньне там і г.д.). І тады да справы падключаецца амбасадар ЗША ў Маскве Левэлін Томпсан, які адрасуе тэлеграму ў справе Освальда напрасткі дзяржсакратару ЗША Дыну Раску.

Амбасада ЗША ў Маскве — дзяржаўнаму сакратару ЗША, Вашынгтон
04.05.62

Патрабуецца рашэньне як найхутчэй пра перагляд 243 (г) для Освальд. Мы лічым неразумным абмяркоўваць праблему 243 (г), пакуль яшчэ магчымае выключэньне, але становіцца ўсё больш няёмка адмаўляць Освальду.
Томпсан

Тэкст тэлеграмы напісаў консул Норбэры, ён даслоўна супадае з радкамі яго сакавіцкага ліста ў Дзярждэпартамэнт. Освальд сур'ёзна даўся дыпляматам у знакі.

Консул ЗША ў Маскве Джозэф Норбэры — Робэрту Оўэну, аддзел Савецкага Саюзу Дзярждэпартамэнту ЗША
08.05.62

Дарагі Боб,

Ты таксама пабачыш нашу тэлеграму ад 4 траўня ў справе Освальда. Калі выключэньне 243 (г) ня будзе хутка дазволена, я думаю, нам трэба выклікаць Освальдаў і паслаць іх у Бэльгію. Справа ня ў тым, што нашыя сэрцы разрываюцца ад шкадаваньня да Освальда. Яго нахабства ня мае межаў. Яго апошні ліст утрымлівае высакамернае патрабаваньне, каб Дзярждэпартамэнт спыніў спробы атрымаць грошы на яго падарожжа ад сваякоў у ЗША. Двойчы ці тройчы апошнім часам, калі ён званіў зь Менску, я мусіў зь няёмкасьцю спасылацца на «праблему», якая затрымлівае вырашэньне справы яго жонкі.

Невядома, што мела большае значэньне — тэлеграма амбасадара дзяржсакратару, аргумэнты контрапрапаганды, міжнародная абстаноўка, але Освальду заставалася чакаць нядоўга.

Консул ЗША ў Маскве Джозэф Норбэры — Освальду
10.05.62

Дарагі сп. Освальд!

З прыемнасьцю паведамляю, што амбасада ў стане зрабіць апошнія дзеяньні ў справе звароту па візу вашай жонкі. Дзеля гэтага вы і ваша жонка запрашаецеся прыбыць у амбасаду, калі вам будзе зручна.

Амбасада мае дзьве копіі пасьведчаньня аб нараджэньні вашай жонкі і копію пасьведчаньня аб шлюбе. Такім чынам, ёй трэба прадставіць толькі яшчэ адну копію пасьведчаньня аб шлюбе, тры фатаздымкі, рэнтгенаўскі здымак, аналіз крыві і даведку аб прышчэпцы воспы.

Як вам паведамлялася раней, тры фатаздымкі вашай дачкі і копія яе пасьведчаньня аб нараджэньні таксама неабходныя для консульскага пасьведчаньня аб нараджэньні і запісу ў ваш пашпарт.

Калі ласка, паінфармуйце амбасаду, калі вас можна чакаць.

Пасьля ўсіх перашкод і затрымак дзяржаўная машына ЗША зрабіла тое, што назаўсёды ўвойдзе ў гісторыю Амэрыкі — дала доўгачаканы дазвол на ўезд Освальдаў.

Хаця ў доме нумар 4 па вуліцы Камуністычнай у Менску сытуацыя з ад'ездам выглядала хутчэй люстрана адваротнай.



Ідыёт, сабака, мярзотнік, падонак

18 траўня 1962 году ў працоўнай кніжцы Освальда робіцца другі і апошні запіс:

Звольнены з заводу па ўласным жаданьні згодна з пададзенай заявай.

Начальнік аддзелу кадраў мог уздыхнуць спакойна.

КДБ ж перадышкі ня меў. Апошнія тыдні Освальда ў Менску былі, як заўсёды, пад пільным наглядам — але субота 19 траўня хіба найбольш падрабязна прадстаўленая ў архіўнай справе.

Расшыфроўка падслухоўваньня КДБ
19.05.62

ЛГО: Як ты магла! Цябе не было з працы недзе тры гадзіны.

Жонка: <u>Ты ідыёт! Я нікуды з табой ня еду.</u> Можаш узяць дзіцё і ехаць. Бяры яе і едзь.

ЛГО: Заткніся. Вазьмі сваё дзіцё.

(Дзіцё плача.)

Жонка: Адчапіся. Рабі што хочаш, я з табой не паеду. Ты ніколі нічога ня робіш, каб мне дапамагчы. Ідзі, кармі дзіцё. Можаш мяне забіць, але ў мяне зьявіцца малако. Ты будзеш рабіць скандалы да другой гадзіны раніцы. Я ня проста пайшла з працы невядома куды — я мусіла заснуць у той паліклініцы. Гэтыя дактары як спэцыяльна не чакаюць мяне.

(Плача.)

Мне што, бегчы дадому трэба было?

ЛГО: Менавіта.

(Яны ідуць на кухню.)

12:50 *(Яны вяртаюцца.)*

Жонка *(румзае)***: Прэч з маіх вачэй, сабака! Мярзотнік! Не глядзі так на мяне — ніхто цябе не баіцца. Ідзі да д'ябла, падонак!**

ЛГО: Вельмі добра.

Жонка: Можаш ехаць у сваю Амэрыку безь мяне і, спадзяюся, ты здохнеш па дарозе.

(ЛГО выходзіць. У кватэры ціха.)

Магнітафон КДБ працаваў, падслухоўваньне працягвалася — але да вечара нічога новага не запісалі. Жонка з мужам калі і працягвалі размову, дык на бальконе, і нават позьнім гасьцям давялося доўга званіць у дзьверы.

У расшыфроўцы КДБ яны пазначаныя як «Невядомы мужчына 1», «Невядомы мужчына 2» і «Невядомая жанчына 3». Мэйлер ужо дастаткова ведаў кола знаёмых Освальда, каб падставіць у тэкст імёны: Павал Галавачоў, муж і жонка Зігеры.

21:30

Сп-ня Зігер: Мы грукалі й грукалі!

Марына: Мы былі на балконе, нічога ня чулі.

Сп-ня Зігер: Дзе ваша дачка? Будзем спадзявацца, што яна здаровая. У яе вочы яе маці — вельмі вялікія.

Лі: У яе маміны вочы, вусны, нос. Яна ўсё атрымала ад сваёй маці, і нічога ад мяне.

Сп-ня Зігер: Наступны ў вас будзе сын.

Лі: Мы ўжо атрымалі дакумэнты. Верагодна, ад'яжджаем у аўторак.

Сп-ня Зігер: Як вы едзеце? Параходам ці самалётам?

Лі: З Масквы альбо цягніком альбо самалётам. Залежыць ад таго, якую візу нам даюць.

(Усе гавораць адначасна, немагчыма разабраць.)

Сп-ня Зігер: Калі яна вырасьце, яна нават ня будзе ведаць, дзе нарадзілася. Можа, Джун калі-небудзь прыедзе.

Сп. Зігер: Адведаць адна рэч. Ёй толькі ня трэба прыяжджаць сюды жыць.

Лі: Ты паставіла чай?

Сп-ня Зігер: Не турбуйцеся за нас, усё ў парадку.

Лі: У нас ёсьць шклянкі?

Марына: У нас дзьве шклянкі. Таксама ёсьць мой малы кубак. Ён ужо ўсё запакаваў.

Лі: Усё наша багацьце. Пусты пакой.

Сп-ня Зігер: Вы шчасьлівыя, канечне?

Лі: Мы шчасьлівыя.

Сп-ня Зігер: Марыначка, а ты?

Марына: Я зусім не такая ўжо шчасьлівая, зразумела.

Сп-ня Зігер: Дзіцё будзе бляндынкай, яна будзе прыгожая.

Лі: У яе будзе добрае жыцьцё, у яе ўсё будзе.

(Усе гавораць разам, складана разабраць. Прыходзіць Павал, усе трое мужчынаў ідуць на кухню.)

Кожны ў стане прачытаць гэты разьвітальны дыялёг па-свойму. Ён аднолькава бянтэжыць, калі ўявіць яго перад невядомай будучыняй, што чакае герояў наперадзе, і калі прачытаць яго зь сёньняшняга дня.

Зрэшты, і для тых, хто гаворыць, і для тых, хто чытае, існуе толькі сёньня. Амаль як для матылькоў.



Грошы, свабода, каханьне, душа

Запіс падслухоўваньня 19 траўня, у перадапошні дзень Освальда ў Менску, быў самы доўгі за ўсю гісторыю назіраньня. Упершыню гучаць галасы людзей, зь якімі ён сябраваў, бавіў час, якіх адведваў дома.

Расшыфроўка падслухоўваньня КДБ.
Працяг.
19.05.62

Сп-ня Зігер: Марыначка, ты нават ня ведаеш, як я табе зайздрошчу, ты такая здаровая.

Марына: Я прыеду з дачкой, і ня ведаю, можа, будзе цяжка, можа, ён ня знойдзе працу.

Сп-ня Зігер: Чаму ён ня знойдзе працу? Уладкуецеся, усё будзе добра, у вас будзе ўсё, у вас будзе свабода.

Марына: Будуць грошы, будзе свабода.

Сп-ня Зігер: Божа, як я ненавіджу жыцьцё ў гэтым горадзе. У цябе няшмат бялізны. Ці маеш камод? Божа, а ў нас столькі барахла! Колькі

ўсяго мы прывезьлі! І колькі раздалі! Была шафа, ложак, люстэрка ў дубовай аправе, вялізнае. І посуд! Прадалі ўсё.

Марына: Напачатку вы, напэўна, нічога гэтага ня мелі?

Сп-ня Зігер: Так, я памятаю як учора. Яму быў дваццаць адзін. Мне дваццаць чатыры, я была старэйшая за яго.

Марына: Вы выглядаеце, быццам вы маладзейшая.

Сп-ня Зігер: Як у вас з грашыма?

Марына: Мы ашчаджалі. Мы абое такія.

Сп-ня Зігер: Колькі гэта каштуе?

Марына: Адзін квіток 440 рублёў. На дваіх.

Сп-ня Зігер: А цётка крыху не дапамагла?

Марына: Не.

Сп-ня Зігер: Дзякаваць Богу, вы едзеце. Гэта лёс, ты сустрэла свайго каханага амэрыканца.

Марына: Адно скажу, ён мне дапамагае.

Сп-ня Зігер: Самае галоўнае, каб у яго не было іншай жанчыны.

Марына: Хто ведае, можа і я не заўсёды буду добрая для яго. Я не скажу, што сапраўды добрая.

Сп-ня Зігер: У цябе добрая душа.

Марына: Напачатку ён быў засмучаны, што ў нас дзяўчынка, а ня хлопчык, але цяпер ён ня супраць.

Сп-ня Зігер: Зусім не, ён яе палюбіць.

Марына: Ён яе любіць і цяпер.

Марына, натуральна, ня хоча выносіць сьмецьця з хаты — муж ужо і дапамагае, і кахае, а жонка ўжо крытычна глядзіць на сябе. Але падслухач КДБ

робіць выснову, што такая гутарка не ўяўляе цікавасьці для дзяржбясьпекі, і замест поўнага дыялёгу абмяжоўваецца кароткім пераказам у дужках:

Яны гавораць пра дзіцё, пра той факт, што некаторыя мужы дрэнныя, п'юць ці дрэнна абыходзяцца з жонкамі.

Як матылькі, мільгаюць, каб зьнікнуць на дзесяцігодзьдзі ў архівах КДБ, жыцьцёвыя гісторыі, разважаньні, страхі і спадзяваньні.

Сп-ня Зігер: Можа, калі-небудзь ты прыедзеш нас адведаць.*

Марына: Там лягчэй жыць. Ён будзе больш зарабляць, чым тут. Што ён тут можа рабіць? Працуеш, працуеш і зарабляеш капейкі.

Сп-ня Зігер: Дзіўна, што твая цётка табе не дапамагла — яна магла хаця б купіць табе падарунак.

Марына: Пра што вы кажаце! Яна нават пялюшкі для Джун не купіла. Ён і яна зарабляюць тысячы. Яны маглі хаця б нешта купіць. Я не прашу дарагія падарункі, можа быць, маленькую шапачку за 40 капеек. Вось дзяўчаты з аптэкі дапамаглі — адна прыносіла пялюшкі, другая яшчэ нешта. Кожная дробязь дапамагае.

Сп-ня Зігер: Ты ўжо разьвіталася зь цёткай?

Марына: Яшчэ не.

Сп-ня Зігер: Калі ты ёй сказала?

Марына: Я думаю, яны атрымалі мой ліст пазаўчора. Я сказала ёй, што мы ад'яжджаем. «Ты звар'яцела! Ты ўсё ж ад'яжджаеш!»

---

*Марына Освальд упершыню пасьля ад'езду гаварыла зь цёткай па тэлефоне ў 1992-м і прыяжджала ў Менск у 2003 годзе.

Сп-ня Зігер: Едзеш за мужам. Куды голка, туды нітка.

(Яны гавораць, як Марына апранецца на дарогу; гавораць пра мэблю: колькі, больш-менш, за яе дадуць; гавораць пра дзіця.)

Здаўся нават перапісчык КДБ — калі раней усе рэплікі старанна пераносіліся ў друкаваны тэкст, апошняя стужка аказалася занадта доўгай. Замучыўся апэратыўны работнік ці работніца, а можа, начальства падганяла — цікавілі апошнія гадзіны перад ад'ездам, трэба абавязкова прачытаць, што там у апошні вечар адбылося, пра што дамаўляліся, каб прыняць, калі трэба, апэратыўна-сьледчыя захады.

Нагода для такой хады думак сапраўды ўзьнікла.



Спэцтэхніка падвяла

На апошнія паўгадзіны падслухоўваньня ў расшыфроўцы спатрэбілася крыху менш за дзьве з паловай сотні словаў. Але не таму, што суразмоўцы раптам змоўклі ці сталі тлумачыцца знакамі — спэцтэхніка падвяла.

Расшыфроўка падслухоўваньня КДБ. Працяг.

19.05.62

Марына: Алік, хадзі сюды, яна сьпіць.

22:40 *(Лі, Павал і сп. Зігер вяртаюцца з кухні.)*

Сп-ня Зігер: Ну што, Алік, будзеш па нас сумаваць?

Лі: Канечне, будзем сумаваць.

(Усе крычаць, немагчыма расчуць, што; Павал робіць фатаздымкі. Усе гавораць адначасна, немагчыма расчуць.)

Сп-ня Зігер: Мусіш паабяцаць навучыць дзіцё расейскай мове.

Лі: Абяцаю.

Сп-ня Зігер: Расейскую добра ведаць. Ніколі не зашкодзіць. Хіба дрэнна, што ты разумееш?

(Мужчыны гавораць пра радыё; жанчыны пра свае праблемы; немагчыма нічога зразумець.)

Павал: Мытня ня будзе глядзець.

Марына: У любым выпадку, яны не глядзяць усё, яны робяць гэта выбарачна.

Сп-ня Зігер: Калі мы прыбылі ў Адэсу, там быў велізарны склад; кожны прывёз 7 ці 8 скрыняў. Мы прывезьлі піяніна, каляску, чатыры вялізныя камоды, поўныя ўсякай усячыны — кожны прывёз палову вагона рэчаў. А ўкраінкі казалі: «Паглядзіце на іхняе дабро, а нам кажуць, што там людзі паміраюць з голаду». А мае дзяўчаты, калі прыехалі, былі на высокіх абцасах: «Паглядзіце на абцасы!» Мы былі як прыбітыя, можаце ўявіць. Рэчы так зьмяніліся за апошнія пяць гадоў!

Павал: Да горшага?

Сп-ня Зігер: Да лепшага. Будзем спадзявацца. Мне надакучыла жыць і пакутаваць у такой краіне як Расея, самай вялікай і самай багатай.

Павал: Урэшце, колькасьць бомбаў у кожнай краіне не такая й жахлівая. Калі бомбаў досыць, ніхто не пачне вайну.

Сп-ня Зігер: Трэба быць вар'ятам.

Павал: Кажуць, мы ўзбройваемся, бо амэрыканцы хочуць вайны. У амэрыканцаў была бомба раней, чым у нас; чаму яны не напалі тады? Яны ня хочуць вайны. Ніхто ня хоча вайны.

Сп. Зігер: Невядома, ці будзе вайна ці не.

Павал: Дзьве сыстэмы могуць існаваць вельмі доўга.

Сп. Зігер: Калі марксізм сапраўды слушны,

тады капіталізм памірае, сканчаецца, і будзе толькі адна сыстэма. Калі ён ня слушны, тады камунізм доўга не пратрывае. Камунізм зьмяніўся, калі параўнаць яго з камунізмам, апісаным Энгельсам і Марксам.

(Трэск; нічога не чуваць.)

Сп-ня Зігер: Да пабачэньня.

Сп. Зігер: Пабачымся перад ад'ездам.

23:10 *(Сп. і сп-ня Зігеры сыходзяць.)*

У гэтай трэцяй частцы дыялёгу Освальд гучыць толькі двойчы — калі кажа што будзе сумаваць і абяцае вучыць дачку расейскай мове. Ягоныя меркаваньні пра марксізм-камунізм пасьля двух з паловай гадоў у СССР, пра ядзерны арсэнал і магчымасьць вайны засталіся схаваныя за мікрафонным трэскам і рознагалосай гамонкай усёй грамады.

У расшыфроўцы КДБ асобна падкрэсьленыя толькі словы Паўла Галавачова пра мытню. Невядома, ці была падслуханая і запісаная размова, дзе Освальд казаў жонцы перад ад'ездам, каб тая здабыла з аптэкі якія-небудзь наркотыкі — Марына сама расказала гэта Мэйлеру (ніякіх наркотыкаў яна не здабывала).

Але КДБ мог ведаць пра яшчэ адну рэч, якую той хацеў бы вывезьці — рукапіс.



Нататкі антысаветчыка

У апошнюю зіму ў Менску Освальд пачаў рыхтавацца да сваёй будучай ролі ў Амэрыцы — чалавека, які бачыў два сьветы, і які за мітамі халоднай вайны здолеў разгледзець сапраўдную карціну.

Ён пачаў пісаць па начах так зацята, што Марына нават спыталася, ці ён часам не шпіён.

— І што, калі так? Што б ты зрабіла, калі так?

І толькі пабачыўшы, як яна разгубілася, сказаў, што жартуе, піша ўспаміны пра новае жыцьцё. Да ад'езду пасьпеў напісаць паўсотні старонак.

Ці ведалі назіральнікі КДБ пра рукапіс, з матэрыялаў, якія далі Мэйлеру, не вынікае. Але ён пісаў маці пра гэтую сваю працу, лісты чыталі, размовы падслухоўвалі, так што сакрэтам гэта наўрад ці было. Тым ня менш, ён пасьпяхова перавёз напісанае празь мяжу.

Освальд азагаловіў рукапіс «Калектыў — жыцьцё расейскага рабочага». Больш пасавала б назва «Нататкі антысаветчыка».

Аднаўленьне Менску — цікавая гісторыя мужнасьці яго будаўнікоў. У таталітарнай сыстэме вялікія сілы могуць быць прыведзеныя ў дзеяньне пад жорсткім кантролем. Архітэктурнае плянаваньне можна назваць якім заўгодна, апроч як сучасным, але так пабудаваныя амаль усе расейскія гарады.

Калі першы сказ быццам сьпісаны з брашуры Інтурысту, дык таталітарны прыметнік падпадаў пад артыкул 57 Крымінальнага кодэксу БССР 1960 году, бо зьнеслаўляў савецкі дзяржаўны і грамадзкі лад і караўся зьняволеньнем да сямі гадоў з высылкай ад двух да пяці гадоў ці безь яе. Жонку можна было пасадзіць альбо за захаваньне рукапісу (той самы артыкул), ці даць ёй ад аднаго да пяці (артыкул 86.1. Укрывальніцтва дзяржаўных злачынстваў).

Але далей антысаветчыка зьмяняе назіральнік — трохі больш уважлівы і дасьведчаны, чым звычайны турыст, хаця і не нашмат.

За аэрапортам, які служыць усходняй мяжой, перад намі вялікая раскінутая гарадзкая забудова, якая толькі выглядае як горад. На даляглядзе заводзкія карпусы і коміны сьведчаць пра яго індустрыяльны характар; я кажу «выглядае», бо самы высокі будынак — дзевяціпавярховы Дом ураду на адным канцы галоўнай вуліцы, праспэкту Сталіна, які даўжэйшы за дзьве мілі, адзіны такі бульвар у рэспубліцы. Усе астатнія вуліцы — вузкія брукаванкі, якія ўюцца праз горад як каменныя рэчкі ад галоўнай вуліцы, і выходзяць на абшырныя паркі.

Дызайн і зьмест гэтых вуліц вельмі паказальны. З поўначы на поўдзень гэтая прамая, як

страла, гарадзкая артэрыя зьмяшчае на працягу першых дзьвюх міляў цэнтральнага раёну гатэль «Менск» і Галоўпаштамт.

Гатэль быў пабудаваны ў 1957 годзе на загад Хрушчова, якога засмуціў той факт, што падчас яго афіцыйнага прыезду ў Менск у сталіцы Беларусі існаваў толькі адзін стары, занядбаны гатэль. Гатэль пабудаваны за тры месяцы, рэкорд для ўсяго Савецкага Саюзу, мае больш за 500 пакояў. Сучасны, добра пабудаваны, з добрым абслугоўваньнем гатэль, прымае мноства турыстаў, якія едуць зь Нямеччыны і Польшчы празь Менск у Маскву.

Тут Освальд паўтарае байку, якую мог пачуць ад сваіх перакладчыц. Гатэль пачалі будаваць у 1957-м і скончылі ў 1959-м. З усіх будынкаў цэнтральнай часткі праспэкту гэты, бадай, самы непрыгожы і яўна выпадае з усёй архітэктурнай стылістыкі. Мікіта Хрушчоў падчас прыездаў у Менск спыняўся ва ўрадавай рэзыдэнцыі на Бранявым завулку, але да выгляду гатэлю мае наўпроставае дачыненьне. Падпісаная ім у лістападзе 1954 году пастанова «Аб ліквідацыі лішкаў у праектаваньні і будаўніцтве» нанесла сьмяротны ўдар сталінскаму клясыцызму: упрыгожаньні фасадаў, бэльвэдэры, эркеры, дэкаратыўныя калянады і порцікі перасталі адпавядаць лініі партыі.

У пастанове згадваўся Менск. Гарадзкое начальства сьпешна пасылала рабочых зьбіваць калёны і порцікі, замуроўваць аркі, зносіць балюстрады з будынкаў, якія яшчэ не былі здадзеныя дзяржаўным прыёмачным камісіям.

А самы, бадай, прыгожы будынак на праспэкце

пасьпелі завяршыць да хрушчоўскай пастановы — ён знаходзіўся насупраць гатэлю:

Паштамт перапрацоўвае ўсю пошту, якая прыходзіць і выходзіць з гораду. Пабудаваны ў 1955 годзе, на ўваходзе чатыры калёны ў грэцкім стылі.

Освальд памыляецца — паштамт пачалі будаваць у 1949-м і скончылі ў 1953-м. Варта дадаць, што менавіта тут прадавалі авіякапэрты для замежжа, сюды ў спэцыяльную шчыліну можна было кінуць паштоўку за мяжу, і тут, у круглай залі пад шкляным купалам з 18 калёнамі і 15 эркернымі вокнамі, калі стаць каля чацьвёртай калёны зьлева і сказаць нешта шэптам, чалавек, які сядзіць за столікам мэтраў за дзесяць, зьдзіўлена азірнецца — хто гэта шэпча ў вуха, такое там дакладнае і акуратнае рэха. Як рукі пэрлюстратараў, якія вывуджвалі з агульнай купы лісты Освальда ў Амэрыку, расклейвалі, капіявалі і заклейвалі зноў.

Далей па праспэкце крама адзеньня і дзіцячая крама. Цэнтральны кінатэатар, найлепшы ў Менску, зьмяшчае 400 чалавек у маленькай залі без вэнтыляцыі. За ім абутковая крама, насупраць праз вуліцу цэнтральны салён прыгажосьці, цэнтральная аптэка, гастраном і мэблевая крама.

Зыгзагам абабегшы адразу восем адрасоў у трох сказах, Освальд крыху зьніжае тэмп каля наступнага будынку:

Далей ідзе Міністэрства ўнутраных справаў на чале з жорсткім армейскім палкоўнікам Мікалаем Аксёнавым з «народнай міліцыі». Ён мае пасаду

міністра ўнутраных справаў. На рагу знаходзіцца яго падразьдзяленьне, КДБ, Камітэт унутранай бясьпекі (разьведка і тайная паліцыя).

Ці пакрыўдзіліся куратары Освальда, што ён так і ня здолеў разабрацца ва ўзаемаадносінах МУС і КДБ ці, наадварот, усьцешыліся, што так добра працавалі з амэрыканцам, што той нават грозную абрэвіятуру ня здолеў граматна расшыфраваць — невядома. Імя міністра МУС пераблытана — ён Аляксандар, але прозьвішча згаданае дарэчы: менавіта да яго ў адчаі зьвярталася Марына па выязную візу, і хоць ён яе не прыняў, візу ўрэшце далі. Рашэньне, зразумела, прымаў не беларускі міністар.

Праз дарогу заўсёды шматлюдная кніжная крама на праспэкце, а насупраць яшчэ больш шматлюдны рэстаран, адзін зь пяці ў горадзе, дзе за два рублі наведнік можа набыць смажаны язык ці курыцу з бульбай і тушанай капустай, а ня проста «катлеты» (хлеб і мясны фарш) ці шніцэль (дзе крыху болей мяса і менш хлеба) і біфштэкс (адна перамолатая ялавічына), якія падаюцца з бульбай, капустай і часам з макаронамі. Іх заўсёды падаюць у рабочых сталоўках і стаячых кафэ, адкрытых уначы. Часам можна купіць салодкія булачкі, каву, восеньскую садавіну, таксама можна ўзяць салаты і памідоры. Побач з кафэ, якое называецца «Вясна» — булачная. Тут за 13 капеек можна купіць белы батон (без упакоўкі), за 7 капеек — розную салодкую выпечку і за 20 капеек бохан чорнага хлеба. (Бохан чорнага ўдвая большы за белы і такім чынам больш танны ў пераліку за кіляграм і карыстаецца большым

попытам. І яшчэ, чорны хлеб з-за цьвёрдай скарынкі выключна доўга застаецца сьвежым.)

Тут Освальд ізноў пераходзіць праспэкт — вяртаецца да кніжнай крамы, ідзе далей уніз да «Ласунка».

Насупраць гэтай булачнай — крама цукерак. Гэта дзіцячая краіна мараў з цукерак і шакаляду, хаця з-за клімату шакаляд каштуе ў чатыры разы болей, чым у ЗША. За чатыры унцыі трэба заплаціць 60 капеек. Шакаляд карыстаецца вялікім попытам, бо расейцы — ласуны. Тут заўсёды натоўп. Яшчэ далей мы падыходзім да адзінага ўнівэрмагу ў Менску, ГУМу, што азначае «дзяржаўная ўнівэрсальная крама».

Падрабязны пералік тавараў і цэнаў з падарожжа па ўнівэрмагу ўжо прыводзіўся, адзначым толькі дакладную гэтым разам расшыфроўку назвы крамы — не галоўная, як шмат хто лічыць, а дзяржаўная. Дзяржаўная не таму, што іншыя вакол былі прыватныя, а — важная, як узнагарода ці таямніца. Ці як бясьпека.

Перад тым, як выйсьці на плошчу Сталіна, на канцы цэнтральнага раёну праспэкту знаходзім два стаячыя кафэ самаабслугоўваньня. Гэтыя кафэ месьцяцца адно насупраць аднаго праз праспэкт. Звонку і ўсярэдзіне яны абсалютна аднолькавыя, у абодвух падаюць аднолькавыя стравы за аднолькавы кошт. Чаму іх не пабудавалі на розных канцах праспэкту ці нават на розных канцах плошчы — невядома. Хаця гэта было б больш зручна. Прычына, магчыма, палягае ў тым, што архітэктурныя пляны для ўсіх гарадоў

Савецкага Саюзу прысылаюць напрасткі з Масквы, што, як можна ўявіць, зьяўляецца вялікай адказнасьцю для архітэктара. Паколькі ў СССР за памылкі расплачваюцца галавой, лягічнай прычынай стандартнай архітэктуры зьяўляецца тое, што найпрасьцейшы спосаб пабудовы вуліцы — самы бясьпечны.

Лягічна было б у рэчышчы гэтых архітэктурных назіраньняў згадаць якраз такое вырашэньне з помнікамі правадыроў: на адным канцы праспэкту бронзавы Ленін, на другім — бронзавы «Ленін сёньня». Але ў менскіх нататках 9-мэтровая бронзавая статуя Сталіна на 9-мэтровым гранітным пастамэнце ня згадваецца.

У фотаархіве Камісіі Ўорэна няма ніводнага здымка, які звычайна робяць людзі ў чужым горадзе — на фоне адметнага помніка, «Сталін і Освальд». Ці «Ленін і Освальд».

Ну, а зь Дзяржынскім увогуле быў бы клясычны здымак.

Але адсутнасьць здымкаў азначае толькі адсутнасьць здымкаў, ня больш.



Освальд і Сталін

Першы раз Освальд пабачыў Сталіна на дзень свайго 20-га нараджэньня, калі адведаў маўзалей зь дзьвюма муміямі ў Маскве. Апошні — у лістападзе 1961-га ў Менску.

17 кастрычніка ў Маскве пачаўся самы доўгі пасьляваенны зьезд КПСС, 22-гі, які цягнуўся паўмесяца і завяршыўся вынасам сталінскай мумііз маўзалею.

ЛГО — Робэрту Освальду
01.11.61

Дарагі Робэрт,

мы чулі па радыё, што расейскія ўлады выра-шылі прыбраць цела Сталіна з Краснай плошчы. Гэта тут вялікая навіна, для мяне вельмі сьмеш-ная. Калі я слухаю радыё альбо якога-небудзь паліткамісара, я заўсёды думаю пра кнігу Джор-джа Орвэла «1984», дзе «двухдумства» зьяўля-ецца ладам жыцьця таксама. У кожным разе,

тут усё вельмі цікава, і людзі ў цэлым простыя і добрыя.

Ну, гэта амаль усе навіны зь Менску. Твой брат Лі.

Ні ў «Гістарычным дзёньніку», ні ў «Калектыве» Освальд пра Сталіна адмыслова нічога ня піша. Але нягледзячы на іронію ў лісьце да брата, хрушчоўскія зьмены яго ўразілі. Па вяртаньні ў Амэрыку ён дапоўніў менскія нататкі падзеямі лістапада 1961 году:

Новая эра

У Менску быў манумэнт Сталіну, 35 футаў вышынёй, які стаяў нават пасьля выкрыцьця Сталіна Хрушчовым, у той час як помнік Сталіну ў Ленінградзе быў адразу зьнесены. Гэтая вялізная канструкцыя з бронзы і мармуру стаяла так доўга, як гэта было магчыма, дзякуючы намаганьням цьвёрдакаменнага сталінца, такога, як палкоўнік Пятроў, начальнік АВІРу ў Менску, і іншых. Аднак пасьля 22-га зьезду, калі Хрушчоў ізноў разьвянчаў Сталіна, 5 лістапада, за два дні да рэвалюцыйных сьвятаў, атрад у 100 чалавек зьявіўся на плошчы Сталіна (новая плошча Леніна), і з бульдозэрамі і палезабойнымі машынамі пачаў зносіць (не здымаць) помнік. Яны рабілі гэта зь вялікім энтузіязмам, бо ўжо на другі дзень пасьля таго, як яны прыбралі 10 тон бронзы, пяць чалавек старэйшага пакаленьня прыйшлі на плошчу і былі абсьмяяныя саркастычным маладзейшым пакаленьнем.

Самым знакамітым у разбурэньні гэтага гіганцкага манумэнта было тое, што праца

спынілася 6 лістапада, але распачалася ізноў 7-га, у той самы дзень, калі побач праходзіў вялікі парад рабочых. Помнік быў якраз насупраць трыбунаў.

На вачах усіх людзей і рабочых разбурэньне Сталіна і сымбалічнае заканчэньне сталінізму (надзея Хрушчова) было завершанае.

Але Беларусь разам з радзімай Сталіна Грузіяй — усё яшчэ апірышча сталінізму. І адраджэньне сталінізму вельмі, вельмі магчымае ў гэтых дзьвюх рэспубліках.

У гэтым тэксьце Освальд зрабіў паўтузіна памылак і адно прадказаньне. У Ленінградзе сталінскія помнікі (іх было пяць) дэмантавалі не раней, а адначасна зь Менскам; хоць палкоўнік Пятроў быў насамрэч генэралам і старшынём КДБ, ён ня мог ні захаваць, ні разбурыць помнік без каманды з Масквы; у Менску манумэнт зьнесьлі за адну ноч — плошчу ачапілі войскам, сторгнулі статуй, але потым доўга і цяжка дзяўблі пастамэнт, які трымаўся на вялізным бэтонным фундамэнце. Бронзавую фігуру транспартавалі на склады гарадзкіх камунальных службаў, а кавалкі пастамэнта адвозілі на суседняе будаўніцтва музычнай школы пры кансэрваторыі, дзе яны былі закапаныя ў фундамэнт. Плошчу Сталіна тады перайменавалі ня ў «Леніна», а ў «Цэнтральную», і гэты назоў яна захоўвала аж да 1984-га.

У архівах камісіі Ўорэна наступнымі за эсэ «Новая эра» ідуць нататкі Освальда пра камуністычную партыю Амэрыкі. Спачатку ён прапанаваў мясцовай філіі свае паслугі, энтузіязму прапанова ня выклікала, і тады Освальд абвінавачвае партыю

ў здрадзе. Маўляў, яна ператварылася ў рычаг замежнай сілы для скіданьня ўраду ЗША — і не дзеля свабоды ці высокіх ідэалаў, а дзеля сэрвільнага згодніцтва з жаданьнямі Савецкага Саюзу, ня самай, як высьветлілася, узорнай сыстэмы.

Саветы зьдзейсьнілі злачынствы, непараўнальныя нават з тым, што рабілі на пачатку капіталістычныя краіны — зьняволеньне сваіх людзей, масавыя зьнішчэньні, тыповыя для Сталіна.

Прыгнёт індывідуальнасьці, строгая рэглямэнтацыя пры Хрушчове.

Дэпартацыі, мэтанакіраванае абмежаваньне харчаваньня насельніцтва Расеі. Забойства гісторыі, прастытуцыя мастацтва і культуры.

Так чытач Орвэла падкарэктаваў сваё захапленьне Савецкім Саюзам пасьля вяртаньня ў Амэрыку.

А ў «Новай эры» патрабуе папраўкі яшчэ адна недакладнасьць — прадказаньне, што адраджэньне сталінізму «вельмі, вельмі магчымае» ў Грузіі і Беларусі.

Памыліўся, як стала відаць праз паўстагодзьдзя. Можа таму, што ў Грузіі ніколі ня быў.



Нататкі антысаветчыка. Працяг

Кніга, якую Освальд пачаў пісаць у Менску, чытаецца цяжкавата.

Магчыма, таму, што аўтар нічога ня піша пра сябе, а наіўна спрабуе вырашыць навукападобную задачу — ахапіць увесь спэктар савецкага жыцьця.

Ён падае перапісаныя аднекуль статыстычныя зьвесткі пра колькасьць студэнтаў, наклады газэт і часопісаў, санаторнае абслугоўваньне, піянэрскую арганізацыю і камсамольскіх актывістаў, тлумачыць інстытут прапіскі і прыводзіць лічбы хабару за пячатку (60-100 руб.), закранае карупцыю ў гандлі, дзе замест ялавічыны могуць падсунуць каніну, параўноўвае, што на 12 кінатэатраў у Менску прыпадае 58 агітпунктаў, дзе ня толькі раздаюць камуністычныя брашуры, але там ёсьць тэлефон і кожны можа зайсьці і зрабіць данос на іншага члена партыі ці любога грамадзяніна.

Хто яму расказваў гэтыя гісторыі, крыху па-

дагнаныя пад орвэлаўскі «1984», невядома, але ў лічбах недакладнасьці: у Менску было 17 кінатэатраў, а агітпункты былі ў кожнай школе, цэху, установе і налічвалі многія сотні.

І, канечне, даносчыкі давалі рады і без тэлефоннай дапамогі агітпунктаў.

Хаця, магчыма, задача рукапісу «Калектыў» не такая і наіўная — яго пры жаданьні можна разглядаць і як пераадоленьне сваіх ілюзіяў, і як падрыхтоўку да трыюмфальнага вяртаньня ў Амэрыку з гатовай кнігай.*

Калі паспрабаваць расставіць паводле значнасьці будынкі, якія прэтэндуюць на ролю галоўных у менскім жыцьці Освальда, дык на трэцяе месца пасьля КДБ і дому, дзе ён меў кватэру, прэтэндуе Палац прафсаюзаў. І Освальд не абмінае месца, дзе ён сустрэў будучую жонку.

Яшчэ адна характэрная і цікавая пабудова ў Менску — будынак Прафсаюзаў. Там ёсьць канцэртная заля, памяшканьні для заняткаў і пераапрананьня аматарскіх калектываў, якія там час ад часу выступаюць, і невялікая танцавальная заля. Там няма, як можна было б падумаць, прафсаюзнага офісу... Унушальная будыніна выглядае як грэцкі храм зь фігурамі наверсе пад трохкутным дахам, які абапіраецца на вялікія белыя мармуровыя калёны. Аднак, калі прыгледзецца, дык пабачыш не аголеных

*Кніга ніколі не была выдадзеная. Пасьля прыезду Освальд замовіў перадрук машыністцы, але пасьля паўсотні старонак кінуў працу зь ёй. Машыністка хацела працягу, яе зацікавіла незвычайная гісторыя — але ў Освальда не было грошай. У такім выглядзе рукапіс і далучаны да матэрыялаў Камісіі Ўорэна.

грэцкіх багоў, а — зьлева направа — дасьледніка зь мікраскопам, муляра зь вядром, спартсмэна ў трэніровачным касьцюме і больш сымбалічную скульптуру мужчыны ў двухбортным касьцюме з партфэлем — відавочна, бюракрат альбо інтэлігент.

Са свайго балькону Освальд добра бачыў будынак на вуліцы Карла Маркса, 38 — тады ЦК кампартыі. І ў сваёй прагулцы па Менску ён перасякае сквэр каля тэатру Янкі Купалы:

Васьміпавярховы жоўты будынак з мэталу і цэглы, прастакутнік, амаль без аляпаватых упрыгожаньняў, якія можна бачыць амаль на ўсіх гарадзкіх будынках. «Першы сакратар ЦК КП Беларусі» — такі важны тытул мае невысокі поўны мужчына, якому пад шэсьцьдзесят, К.Т. Мазураў. Яго рэдка можна пабачыць на вуліцы, разам зь сям'ёй ён займае вялікую васьміпакаёвую кватэру на апошнім паверсе дому на праспэкце Сталіна. Уваход у будынак ахоўвае днём і ноччу міліцыянэр у форме, які правярае пропускі і не пускае асобаў без дазволу. Мазураў кіруе і кантралюе ўсю дзейнасьць у рэспубліцы з паўнамоцтвамі, якіх ня мае ніводзін губэрнатар у ЗША, бо яго ўладу нельга абмежаваць судовымі пастановамі ці забаронамі, як гэта часта здараецца ў ЗША. Мазураў падначалены наўпрост Маскве і прэзыдыюму партыі на чале з Хрушчовым.

Не згадаўшы Дому афіцэраў і штабу паветранай арміі, які чамусьці месьціўся на праспэкце ў шэрым будынку бяз шыльды, не зьвярнуўшы ўвагі на цырк, перайшоўшы мост празь Сьвіслач, прапусьціўшы

дом-музэй 1 зьезду РСДРП, Освальд адразу падыходзіць да суседняга са сваім дому:

Радыётэлестанцыя ў Менску ўяўляе сабой чатырохпавярховы бэтонны будынак па адрасе вуліца Калініна, 6 каля невялікай рэчкі Сьвіслачы. За ім стаіць унушальная стальная радыёвежа вышынёй 500 футаў, самая высокая пабудова ў Беларусі. Радыёвежа і будынак абнесены высокай агароджай, якую патрулююць узброеныя ахоўнікі з сабакамі. Уваход у двор магчымы толькі праз будынак, і без прад'яўленьня ўзброенаму ахоўніку спэцыяльнага пропуска нельга ўвайсьці.

Выканаўцаў здымаюць у іншай студыі каля цэнтру, адкуль канцэрты і пастаноўкі перадаюцца на станцыю і на вяшчальныя вежы. Такім спосабам надзвычай важная сыстэма камунікацыі застрахаваная ад сабатажу ці захопаў, падобных да такіх, якія часта зьдзяйсьняюць лацінаамэрыканскія контрарэвалюцыянэры альбо незадаволеныя элемэнты.

Разабрацца, хто тады чым быў незадаволены ў дыктатурах Лацінскай Амэрыкі даволі цяжка, але, паводле тону, Освальд ухваляе захады супраць такіх элемэнтаў. Аднак тое, што ён піша далей, магло расцэньвацца як збор сакрэтных і «іншых» зьвестак, як элегантна было сфармулявана ў савецкім крымінальным кодэксе, для выкарыстаньня на шкоду інтарэсам СССР:

Непадалёку ад тэлевежы, за 4 кварталы на ўсход на вуліцы Даўгабродзкай стаяць яшчэ дзьве вежы, кожная прыблізна па 200 футаў. Яны

не займаюцца вяшчаньнем. Фактычна, зусім наадварот. Гэтыя вельмі заўважныя канструкцыі з высакавольтнымі кабэлямі паміж сабой зьяўляюцца вежамі глушэньня перадачаў на кароткіх хвалях з-за мяжы.

Галоўнай мішэньню для гэтых вежаў-глушылак зьяўляюцца мюнхенскія і вашынгтонскія перадатчыкі праграмаў Голасу Амэрыкі. Часам іх выкарыстоўваюць для глушэньня расейскамоўных перадачаў Бі-Бі-Сі і з Францыі.

Гэтыя вежы таксама ахоўваюць узброеныя вартаўнікі, і ўваход на абнесены дротам участак і да вежаў забаронены бяз пропуска. Вядома, што колькасьць электраэнэргіі, якую спажываюць гэтыя вежы, велізарная, асабліва калі ўлічыць, што неабходнае сьвятло на працоўных месцах зь неахвотай уключаюць нават у цёмныя дні.

З іроніяй і сумам думаеш пра велізарнае марнатраўства і высілкі савецкага ўраду дзеля таго, каб не дапусьціць ідэі іншых народаў. Але частоты глушэньня складаюць толькі палову прапагандысцкіх праграмаў Радыё Масквы, якія можна пачуць на любым кароткахвалёвым радыё ў Злучаных Штатах — і без глушэньня. Праграмы Радыё Масквы запэўніваюць людзей, што жалезнай заслоны больш няма, ніколі не было, і яна зьяўляецца паклёпам на Савецкі Саюз, прыдуманым рэакцыянэрамі, sic!!.

Як кажуць — дагуляўся, падышоў ушчыльную да «Артыкулу 62. Шпіянаж» крымінальнага кодэксу БССР, які ў 1962 годзе за збор і перадачу такіх зьвестак даваў ад сямі да пятнаццаці гадоў ці расстрэл.

Адначасна з Освальдам да той самай агароджы і тых самых артыкулаў крымінальнага кодэксу падышоў яшчэ адзін жыхар Менску.

І грымнуў гром — зь ляскатам апусьцілася жалезная заслона.



Нашы на Месяцы

Канваір спыніўся каля кратаў, якія аддзялялі купэ сталыпінскага вагона з шасьцю арыштантамі ад праходу і сказаў: Кенэдзі забілі.

Цягнік ішоў наперад, стукалі колы, ужо месяц палітычнага дывэрсанта Сяргея Ханжанкова (артыкулы 65, 67, 69 КК БССР) везьлі ў месца адбываньня пакараньня — Мардовія, Дубраўлаг. Маршрут пачаўся ў Менску і праходзіў празь перасыльныя турмы Смаленск-Вязьма-Ражск-Пенза-Рузаўка-Поцьма, звычайнаму цягніку на такі маршрут хапіла б двух дзён, але ў турэмнай сыстэмы свае хуткасьці.

Навінаў з волі пасьля месяцаў у турме і на перасылках страшэнна бракавала — і ў лягеры новы зэк адразу накіраваўся ў бібліятэку. Газэты друкавалі спачуваньне ад савецкага ўраду, асаблівых дэталяў не было, чуткі вэрсіі ўспыхвалі як салома на ветры — хто забіў, што будзе, як гэта адаб'ецца на лягерным рэжыме? Неўзабаве ў лягеры стала вядомае імя забойцы — Лі Гарві Освальд.

— А ведаеце, як яго звалі ў Менску? «Лихаря»!

Ханжанкоў гаворыць дакладна, па дзелу, выразна памятае ўсе дэталі падзеяў, якія адбываліся паўстагодзьдзя таму. Мы сядзім у яго пакоі ў тым самым доме, дзе ён тады, да арышту, жыў з бацькамі. Калі правесьці простую лінію ад дому Освальда праз цэнтар парку Горкага, яна выведзе якраз да Ханжанкова, на рог вуліц Першамайскай і Пулі-хава. Штодня пешкі ён выпраўляўся ў політэхнічны інстытут, ішоў часам праз парк, мінаў плянэтарый або праходзіў каля кінатэатру «Летні», выходзіў на плошчу Перамогі і шпацыраваў далей.

— З Освальдам не сустракаўся, але, канечне, ведаў пра дзікі выпадак, што нейкі амэрыканец прыехаў жыць у Менск, ходзіць на танцы ў Дом афіцэраў, клюб Дзяржынскага. Гэта было незвычайна, пра гэта гаварылі, і была такая агульная думка, што амэрыканец, як бы гэта сказаць, ну, дзівак.

Ён хадзіў тымі самымі вуліцамі і бачыў тое самае, што й Освальд, толькі ня так, як амэрыканец.

Ханжанкоў нарадзіўся на Калыме ў 1942-м, дзе пасьля адбыцьця пяцігадовага тэрміну працаваў бацька; яго дзед, матчын бацька, быў асланы на Салаўкі, потым расстраляны — і ў 1955-м, калі сям'я пераехала ў Менск, пра савецкую ўладу ён разумеў ужо нашмат болей за Освальда.

Досьвед савецкага жыцьця хутка адукаваў амэрыканца і амаль выраўняў сьветапоглядную розьніцу, прынамсі, у дачыненьні да дзьвюх вежаў станцыі глушэньня погляды двух маладых людзей

супалі дакладна. Толькі Освальд абмежаваўся запісамі, а Ханжанкоў вырашыў іх узарваць.

Калі бацькі Ханжанкова пераехалі ў Менск, яны зьнялі пакой у доме на рагу праспэкту і вуліцы Казлова. Акно выходзіла ў двор.

— А гэта глушылкі, — адразу патлумачыла гаспадыня заваконны пэйзаж.

Ханжанковы купілі лямпавы прымач «Менск-55», які выраблялі на мясцовым радыёзаводзе — і Сяргей уключыў кароткія хвалі.

— Усё было цікава. Асабліва «Радыё Свабода», якое тады называлася «Вызваленьне». Самыя цікавыя перадачы былі, канечне, па «Свабодзе». «Голас Амэрыкі» — больш амэрыканскія справы, Бі-Бі-Сі, «Нямецкая хваля» таксама... А «Свабода» была самая актуальная. Кожныя паўгадзіны — навіны, а потым культура, белыя плямы гісторыі, цікава было ўсё.

Такім чынам Ханжанкоў пазнаёміўся з глушылкамі другі раз — «Свабоду» глушылі мацней за ўсіх. І студэнт аўтадарожнага факультэту, вайсковая спэцыяльнасьць — сапёр, вырашыў глушылкі ўзарваць. Разам з двума сябрамі (адзін — студэнт, другі — былы зэк) пачаў рыхтавацца — здабываць тол, шукаць дэтанатар, вывучыў мясцовасьць, вызначыў месца закладкі зараду, як вучылі на вайсковай катэдры, каб сталёвая канструкцыя павалілася і нічога не разбурыла. Час павінен быў быць позьні, надвор'е пажадана дрэннае, каб не было мінакоў. Пасьля — уцёкі за мяжу.

Яго арыштавалі ў аўтобусе, у руках была валізка з толам — бо быў яшчэ адзін сябар, школьны, які хутка данёс у КДБ. Там адразу пабачылі пэрспэк-

тыву для ордэнаў і мэдалёў — і замест прафіляктычнай гутаркі празь сябра пачалі распрацоўку. Прапаноўвалі здабыць зброю, зьмяніць аб'ект — узарваць які-небудзь завод, зьвязацца з замежнікамі. Ханжанкова, аднак, цікавіла толькі «Радыёстанцыя № 3», як афіцыйна называлася глушылка — ён хацеў узарваць менавіта сымбаль савецкай улады і яшчэ раскідаць улёткі.

Суд вызначыў максымальны тэрмін — 10 гадоў зьняволеньня, які ён адседзіць ад званка да званка. (Два сябры напішуць просьбы аб памілаваньні і выйдуць на волю празь пяць гадоў, даносчык на судзе праходзіў сьведкам.) На ўсе звароты бацькоў у судовыя інстанцыі, пракуратуры, прэзыдыюмы вярхоўных саветаў, зьездаў і сходаў прыходзіў адказ — злачынства цяжкае, віна даказаная, падставаў для перагляду няма, для амністыі таксама.*

Ханжанкоў сеў раней за герояў забароненага эфіру — Сіняўскі, Даніэль, Галанскоў, Кузьняцоў, Гінзбург...

Ролю Освальда, дакладней, ролю КДБ у забойстве Кенэдзі ў лягеры абмяркоўвалі. Пераважала думка, што наўрад ці забойства арганізаванае савецкім бокам. Хрушчоў быў ня Сталін, мог дамаўляцца з Кенэдзі, навошта было прыбіраць знаёмага ліберальнага партнэра, якога мог зьмяніць куды больш жорсткі лідэр — такі быў палітычны аналіз за калючым дротам, трэба прызнаць, значна больш слушны, чым многія тэорыі, зьлепленыя на свабодзе.

---

*Аляксандар Салжаніцын так ахарактарызуе яго: «Узгадваецца лёс Сяргея Ханжанкова, які адседзеў за спробу — ці нават намер — узарваць глушыцель у Менску... Хоць, зыходзячы з агульначалавечых каштоўнасьцяў, нельга зразумець гэтага злачынцу іначай як барацьбіта за ўсеагульны мір».

У мардоўскіх лягерах увогуле сядзелі разумныя людзі — і працягвалі там адукацыю. Выпісвалі газэты, часопісы, спэцыялізаваліся на нейкай тэме і потым чыталі лекцыі. Ханжанкоў атрымліваў «Известия», «Новый мир», дзе ўпершыню прачытаў аповесьці Быкава, і часопіс «Авиация и космонавтика».

Ён стаў аўтарытэтам у касьмічных справах і даволі хутка прыйшоў да высновы, што гонку ў космасе Савецкі Саюз прайграе — часопіс быў рэфэратыўны, і можна было зразумець, што і чаму робяць амэрыканцы.

Калі мара і задача, якую паставіў Кенэдзі — палёт на Месяц — стала рэальнасьцю, Ханжанкоў зрабіў і павесіў на сьценку бараку схему палёту і тлумачыў іншым, што і як адбываецца, перасоўваючы значку ракеты па траекторыі палёту.

Цемнаваты пакой на нізкім першым паверсе, у якім жыве Ханжанкоў, прыкладна такіх самых памераў, як быў у Освальда. Пэйзаж за вакном толькі іншы — менскі двор, забудаваны рознымі будкамі, перагароджаны, застаўлены аўто. Пад стольлю на шафе стаіць карычневая скрыня лямпавага прымача «Менск-55» з аблупленым лякам, замест верхняга сьвятла гаспадар уключае жалезную лямпу на шнуры, на кніжнай паліцы некалькі дзясяткаў кніг.

У пластыкавых пакетах захоўваюцца складзеныя ў акуратныя стосы некалькі тысячаў паштовак і лістоў — лягерная перапіска. Яе памер у разы пераўзыходзіць перапіску Освальда, далучаную да матэрыялаў Камісіі Ўорэна. Зэк Ханжанкоў сам меў права на адзін ліст у месяц, але атрымліваць пошту дазвалялі. Увесь лягерны тэрмін ён захоўваў лісты

ад маці, ад малодшага брата, паштоўкі ад сваякоў, а дома захоўвалі яго допісы. Цэнзура не дазваляла пісаць пра лягер, палітыку, іншых зэкаў — але кожны радок сьведчыць пра насычанае інтэлектуальнае жыцьцё аўтара: ён абмяркоўвае дасягненьні навукі, творы навамірскіх аўтараў, дае парады.

Пасьля распаду СССР пра яго пісалі газэты, бралі інтэрвію, ён езьдзіў на зьезды палітзэкаў. Але хваля цікавасьці хутка спала, у Менску дэмакратычная апазыцыя ім не зацікавілася, зь беларускімі вязьнямі сталінскага ГУЛАГу ў яго было няшмат агульнага, у лягеры было некалькі зэкаў зь Беларусі, але з крымінальным ухілам, і Ханжанкоў застаўся сам.

Падчас гутаркі я думаў — вось бы Мэйлеру ў Менску не гістарычнай лепідаптэралёгіяй ЗША займацца, а напісаць пра раўналетка Освальда — слухача амэрыканскіх радыёстанцыяў, які дагэтуль ні аб чым не шкадуе і ўпэўнены ў сваім выбары.

Але Бог з Мэйлерам, яму якая была б прычына пісаць кнігу пра Ханжанкова — герой не яго радзімы.

Хаця...

На зоне была кравецкая майстэрня, і зэкі пад кіраўніцтвам Ханжанкова пашылі мадэль карабля, у якім амэрыканцы садзіліся на Месяц — у натуральную велічыню. Мадэль расклалі перад баракам, сабраліся зэкі, і Ханжанкоў з вышыні другога паверху чытаў лекцыю.

Прыбегла ахова — і таксама засталася слухаць.

— Нашы — на Месяцы! — так ён скончыў.

І, пабачыўшы мой запытальны погляд, патлумачыў:

— Нашымі ў лягеры мы называлі амэрыканцаў.



«Калектыў» пра калектыў

Освальд сур'ёзна паставіўся да сваёй ролі чалавека, які атрымаў унікальны досьвед працы на савецкім заводзе — і выступіў у ролі Дантэ, які апавядае пра сваё падарожжа ў замагільны сьвет.

Невядома, хто выступаў у ролі Вэргілія — ім мог быць і Аляксандар Зігер, і Павал Галавачоў.*

Дантэ з Освальда атрымаўся таксама даволі нудны. Нататкі пра калектыў і працу на радыёзаводзе ўражваюць сваёй нецікавасьцю. Освальд завальвае чытача бессэнсоўнай статыстыкай — 87 000 вялікіх і моцных радыёпрымачоў, 60 000 тэлевізараў вырабляецца за год на заводзе, дзе працуюць 5000 рабочых, зь іх 58% жанчыны і дзяўчаты. Далей ён

*Галавачоў хоць быў і маладым хлопцам і сынам генэрала, але савецкую ўладу не любіў даўно: падлеткам яго моцна ўразіў аповед бацькавага знаёмага пра крывавае здушэньне паўстаньня ў Вугоршчыне, у кватэры ў Освальда ён казаў усё, што думае пра савецкую сыстэму, палохаючы асьцярожных гасьцей кшталту Цітаўца, які потым прызнаецца, што «віншаваў сам сябе з тым, што не рэагаваў на разглагольствованьні Паўла Галавачова пра хібы сыстэмы».

дае раскладку па цэхах і ўчастках, называе плошчу заводу і яго каардынаты, расьпісвае арганізацыю працы, ролю майстроў, сумна тлумачыць, хто такія ўдарнікі, і ўзьнікае ўражаньне, што ўсё гэта добрасумленна перапісанае са стэнда наглядная агітацыі ці заводзкай брашуры.

Жыцьцё вяртаецца ў тэкст, калі ён спыняецца на хвіліну ў цэху, дзе працуюць прэсы:

Грукат у цэху амаль аглушае, мэтал трэцца аб мэтал, стальныя пілы ўгрызаюцца у жалезныя балванкі з хуткасьцю два сантымэтры за хвіліну, падлога пакрытая алеем для ахалоджваньня мэталу, і трэба глядзець пад ногі; рукі рабочых чорныя, як падлога, і, здаецца, былі такімі заўсёды...

Наступны цэх пластмасаў. Тут 47 жанчын і трое інвалідаў заліваюць чырвоны расплаўлены пластык у рознай формы прэсы, выраблюць ручкі, кнопкі, трубкі і да т.п. У гэтых рабочых найгоршыя ўмовы на заводзе з-за гарачыні матэрыялаў і шкоднага полымя. Ім даюць 30 дзён адпачынку, максымум для рабочых.

За што пакараныя гэтыя грэшнікі, Освальд не паведамляе — але тэмпэратурныя ўмовы большменш адпавядаюць пакутам, зарэзэрваваным Дантэ для ерэтыкоў і блюзьнераў. Трэба прызнаць, што наступны від пакутаў, падрабязна апісаны Освальдам, ня мае аналягаў у Дантэ — гэта пакараньне сходамі.

Калектыўныя сходы на заводзе настолькі шматлікія, што галава круціцца.

Напрыклад, цягам аднаго месяца ў пляне

наступныя сходы і лекцыі: адзін прафсаюзны сход, на якім абмяркоўваецца праца прафсаюзу па збору ўнёскаў, аплаце пуцёвак і г.д.; чатыры палітінфармацыі, кожны аўторак падчас абеду; два камсамольскія сходы, 6 і 21 кожнага месяца, адна вытворчая нарада, на якой рабочыя абмяркоўваюць, як палепшыць працу; два партыйныя сходы, якія склікае сакратар цэхавай партарганізацыі; чатыры пасяджэньні школы камуністычнай працы, абавязковыя, кожную сераду, адзін спартовы сход, неабавязковы — разам 15 сходаў штомесяц, 14 зь якіх абавязковыя для членаў кампартыі і 12 абавязковыя для ўсіх. Гэтыя сходы адбываюцца пасьля працы альбо ў абед, ніколі не ў працоўны час. Адсутнічаць ніяк не дазваляецца.

У сярэднім кальцы сёмага кола дантаўскага пекла расьце калючае сучкаватае кустоўе — гэта самагубцы, людзі, якія гвалтам пазбавілі сябе жыцьця, ім ужо ня дадзена будзе ўваскрэснуць. На заводзкіх сходах, паводле Освальда, пайшлі на крок далей за Дантэ — людзей ператваралі ў камяні.

Пасьля многіх гадоў жорсткай дысцыпліны, асабліва за сталінскім рэжымам, ніводзін рабочы ня будзе наклікаць на сваю галаву абавязковыя дысцыплінарныя захады з боку членаў партыі і парткаму з-за таго, што паспрабуе вышмыгнуць ці не зьвяртаць увагі на тое, што гаворыцца. Сапраўды, дзіўнае відовішча — сцэна, як мясцовыя члены партыі зьвяртаюцца з палітычным казаньнем да групы звычайна жывых, простых рабочых, якія нейкім дзіўным чынам ператварыліся ў камень. Ператварыліся ў камень — усе, за

выключэньнем цьвёрдых камуністаў з вачыма, якія так і шныраць у пошуках няўвагі з боку любога рабочага, каб злавіць і атрымаць за гэта пахвалу.

А вось пра гэта ў Дантэ ёсьць: у тым самым сёмым коле, якраз на калючым кустоўі зьвілі гнёзды гарпіі — надта брыдкія істоты з чалавечым тварам, шырокімі крыламі і ўчэпістымі кіпцюрамі.

Дзіўная рэч пры назіраньні за палітычнымі лекцыямі — гэта тое, як слухачы ўпадаюць у надзвычай фэнамэнальны стан, яны адключаюцца ад зьнешняга ўмяшаньня ці гукаў. У гэтыя часы найлепш забыцца на свой звычайны шумлівы і жывы характар.

Пад партрэтам Леніна два на два мэтры стаіць сакратар партыйнай пярвічнай арганізацыі, у нашым аддзеле — рабаваты мужчына сярэдняга ўзросту з прозьвішчам Сабакін, звычайнага выгляду ў акулярах. Яго твар у зморшчынах і іскаркі ў вачох ствараюць уражаньне, што зараз ён раскажа салёную гісторыю ці сьмешны жарт, але не. За ім 25 гадоў стажу ў партыі. Яго адносна высокая пасада сьведчыць пра яго эфэктыўнасьць.

Ён стаіць і выкладае з нататак тыднёвую палітінфармацыю з поўнай адсутнасьцю энтузіязму і інтарэсу, як чалавек, якому ня трэба хвалявацца за сваю аўдыторыю ці пра тое, што нехта падымецца і пойдзе прэч.

Освальд мог вывучаць Дантэ ў школе (ён быў уключаны ў праграму), а вось пра Орвэла вядома дакладна — ён чытаў «1984», і гэта можна адчуць

у яго карцінках заводзкага жыцьця. Падрабязна апісаўшы, як заганяюць рабочых на дэманстрацыі двойчы на год, Освальд піша пра тых, хто любіць паспаць і потым выйсьці на вуліцу прагуляцца:

Іх могуць заштурхнуць у калёну міліцыя ці добраахвотныя «народныя дружыньнікі» ў чырвоных павязках. Любы, хто будзе спрачацца, можа стаць аб'ектам шчыльнага расьсьледаваньня пазьней — а гэтага трэба пазьбягаць у любой паліцэйскай дзяржаве...

Дантэ назваў сваё падарожжа ў пекла камэдыяй, бо пачыналася яно жахліва, а скончылася шчасьліва.

Тое, што пачынаецца добра і сканчаецца так, як у Освальда, называецца іначай. Не бывае антыўтопіяў з happy end, асабліва ў жыцьці.

Лёс рукапісу аказаўся больш шчасьлівы — ён выпырхнуў праз жалезную заслону, на караблі пераплыў Атлянтыку, не згубіўся пры пераездах, быў знойдзены паліцыяй пры пратрусе кватэры Освальда і далучаны да матэрыялаў камісіі Ўорэна. Да яго бесьперашкодна зьвяртаюцца дасьледнікі, а Мэйлер апублікаваў большую частку ў сваёй кнізе.

Заслона, як гэта звычайна бывае пры сутыкненьні мэтафары з рэальнасьцю, аказалася не жалезная.



Злавіць матылька

Некаторыя словы як матылькі — пакрасаваліся, патанчылі, пакінулі пыльцу на старонках газэт і зьніклі, быццам іх ніколі й не было.

На пачатку 1960-х гарачую дзясятку ў СССР складалі:

1. Культ асобы (так тлумачылася найбольшае ў гісторыі чалавецтва зьнішчэньне сваёй уладай сваіх людзей),
2. Каралева палёў (кукуруза, якую ўкаранялі квадратна-гнездавым мэтадам ад Крыму да Карэліі),
3. Космас (белазубая ўсьмешка першага чалавека на арбіце Юрыя Гагарына, чый палёт быў аплачаны рабскай працай мільёнаў),
4. Вадародная бомба (гл. тлумачэньне да Космасу),
5. Куба (гл. тлумачэньне да Космасу),
6. Цаліна (гл. тлумачэньне да Космасу),
7. НТР (нешта накшталт Інтэрнэту, але праз мадэм),

8. Хімія (кашулі, у якіх абліваесься потам, і сьмярдзючыя камбінаты, якія будавалі зэкі),
9. «Наш дарагі Мікіта Сяргеевіч» (гл. Культ асобы, але пры Хрушчове лягерных недабіткаў выпусьцілі на волю і надрукавалі Салжаніцына),
10. Амэрыка (дагонім і перагонім, пераможам у барацьбе за мір і пахаваем).

У гэтым сьпісе лексычнай лепідаптэралёгіі няма слова, якое было ключавым у СССР папярэднія тры дзесяцігодзьдзі: пільнасьць.

Што зь ёй толькі не рабілі — праяўлялі, гублялі, падвышалі, усыплялі, заклікалі, а таксама нагадвалі, вучылі, патрабавалі, дамагаліся, і нават часам забываліся.

Але не ў БССР.

Падыходзіў да канца першы год Освальда ў Менску, калі ў галоўнай газэце Беларусі зьявіўся артыкул пад загалоўкам «Пільнасьць — наша магутная зброя».

Публікацыя была прысьвечаная 43-й гадавіне заснаваньня ЧК і яе мэтастазаў — ГПУ-НКУС-МДБ-КДБ.

Аўтар — старшыня Камітэту дзяржаўнай бясьпекі пры Савеце Міністраў БССР Васіль Пятроў пісаў пра страшныя рэчы, якія адбываліся на чыгунцы:

Групай жыхароў гораду Менску былі затрыманыя на перакідным мосьце ля чыгуначнага вакзалу два чужаземцы, якія фатаграфавалі пад'язныя пуці, вакзал і праходзіўшыя саставы. Затрыманымі аказаліся амэрыканскія турысты муж і жонка Марлах, якія апрача фатаграфаваньня, як пазьней высьветлілася, узводзілі паклёп

на нашу рэчаіснасьць, выхвалялі так званы амэрыканскі лад жыцьця.

Што гэта была за група, у якую аб'ядналіся жыхары гораду на перакідным мосьце, перакрылі выхады і захапілі двух фатографаў, колькі іх было — ня выдаў генэрал. Групу напаткаў сюрпрыз, калі меркаваць па выразе «затрыманымі аказаліся амэрыканскія турысты»: вось жа зьдзівіліся, мабыць, жыхары Менску — думалі, фатографы свае, а аказалася — узводзяць паклёп.

Яшчэ адну пільную групу грамадзянаў аб'ядноўвала тое, што яны не жадалі глядзець вузкастужкавыя кінафільмы:

Амэрыканскія турысты, прапаведнікі сэкты пяцідзясятнікаў Матысюк і Дурасаў, якія знаходзіліся ў Менску, прывезьлі з сабой вузкаплёначны кінафільм з пропаведзьдзю кіраўніка амэрыканскіх сэктантаў-эвангелістаў Робэртса, дубляваны на расейскую мову, а таксама рэлігійныя лістоўкі. Аднак яны не знайшлі жадаючых глядзець іх фільм і чытаць лістоўкі. Варожым лазутчыкам савецкія людзі далі дастойны адпор.

Чаму хрысьціянскія місіянэры былі прыраўнаныя да разьведчыкаў у тыле ці ў разьмяшчэньні праціўніка (так тлумачыць слоўнік «лазутчыкаў»), пытаньняў не выклікае — Бога ў СССР не было. Дакладней, іх Бога не было, сваіх хапала, і перад прыездам у Менск Освальд нават пасьпеў адведаць нятленныя мошчы ў Маскве. Але хто былі гэтыя савецкія людзі, якія давалі адпор у Менску? Які адпор лічыцца дастойным, а які не? А калі б фільм быў шырокафарматны? Генэрал пакінуў гэтыя пы-

таньні без тлумачэньня і перайшоў да яшчэ больш драматычнага выпадку.

Едучы па тэрыторыі Беларусі цягніком, група чужаземцаў капіталістычнай дзяржавы спрабавала фатаграфаваць з купэ вагона чыгуначныя збудаваньні і іншыя аб'екты. Правадніца вагона зьвярнула ўвагу на гэтыя падазроныя паводзіны і на наступнай станцыі запрасіла ў вагон супрацоўніка чыгуначнай міліцыі, які запатрабаваў дакумэнты ў названых пасажыраў. На пытаньне супрацоўніка міліцыі, чаму яны займаюцца непрыстойнай дзейнасьцю, адзін зь іх ня змог адказаць што-небудзь пэўнае, другі папрасіў прабачэньня, а трэці настолькі напалохаўся, што наогул ня мог нічога сказаць.*

Мову адняло. І, магчыма, таксама — фотакамэры і адзьнятыя стужкі зь непрыстойнымі кадрамі.

Невядома, чаму Освальду пашанцавала і ён вывез паўсотні старонак «Калектыву» — ці «Сьцяпан» не заўважыў зьвестак пра рукапіс у лістах і запісах падслухоўваньня, ці «Ігар» не надаў увагі, ці сам старшыня КДБ праігнараваў, ці перадалі па інстанцыі ў Маскву, а там махнулі рукой, ці правадніца патрапілася няпільная...

Як са скрухай напіша Васіль Пятроў:

Ёсьць яшчэ ў нас асобныя разявакі, бестурботныя людзі, якія, забываючы аб сваёй высокай

---

*Што тут ад Гогаля, Чэхава, Кафкі — пытаньне да літаратуразнаўцаў. Вядомы, прынамсі, адзін кніжны герой, які аднолькава здатна мог быць і генэралам-аўтарам артыкулу, і пільнай правадніцай, і міліцыянтам-барацьбітом зь непрыстойнасьцю, і капіталістычнымі турыстамі (на якой мове яны тлумачыліся?..) — бравы салдат Швэйк.

адказнасьці, гатовыя балбатаць аб даверaных ім сакрэтах або праходзіць міма фактаў страты палітычнай пільнасьці.

Гэтыя генэральскія словы маглі быць адрасаваныя і высокаадказным работнікам уласнага ведамства.

Хаця іх віна мінімальная. Рукапісы — як матылькі, што ня ведаюць мытняў і межаў.

Прырода іх такая, няпільная.



Апошнія клопаты

Нядзеля 20 траўня стане апошнім днём у кватэры з выглядам на Сьвіслач. Як і папярэднія, ён пачаўся са скандалу — Освальд спрабаваў праінструктаваць жонку, што можна, а чаго нельга казаць у амбасадзе консулу пры атрыманьні візы. Тэмпэратура гутаркі хутка падскочыла да кіпеньня, і Освальд бразнуў дзьвярыма. У гэты самы дзень Марыну наведала сяброўка з аптэкі.

Расшыфроўка падслухоўваньня КДБ 20.05.62

10:05 *(ЛГО сыходзіць)*

13:20 *(Прыходзіць Соня; гавораць пра Марыніна дзіцё.)*

Соня: У вас няшмат рэчаў, толькі чамаданы, так?

Марына: Толькі чамаданы.

Соня: І ўсё?

Марына: Трэба памыць падлогу перад тым, як паедзем.

Соня: Нашто табе? Няхай самі.
Марына: Трэба нацерці.
Соня: Гэта неістотна. Можна проста памыць.

Пасьля прыборкі кватэры Освальды наведалі дзядзьку і цётку, а пасьля праз двор перацягвалі рэчы на суседнюю вуліцу Захарава, 11 — апошнюю ноч і апошні дзень у Менску яны правядуць у чатырохпакаёвай кватэры Паўла Галавачова, каб адтуль выправіцца на вакзал.*

Але не адразу.

Рапарт КДБ
21.05.62

21 траўня 1962 году я правёў гутарку зь дзядзькам «Наліма», Прусаковым І.В., які паведаміў мне, што 20 траўня яго кватэру наведалі пляменьніца Марына і «Налім». У гутарцы «Налім» сказаў Прусакову аб намеры выехаць у Маскву 22 траўня, каб запоўніць усе належныя дакумэнты і затым выехаць у Амэрыку.

У выніку гэтага Прусакоў і ягоная жонка далі Марыне некалькі парадаў. У прыватнасьці, Прусакоў, выказваючы трывогу за свой дабрабыт, прасіў Марыну і «Наліма» ня ўдзельнічаць пасьля прыезду ў ЗША у ніякіх акцыях, варожых Савецкаму Саюзу. Прусакоў нагадаў «Наліму», што яго забясьпечылі і вельмі добра ставіліся да яго савецкія людзі. «Налім» запэўніў Прусакова, што яны ня будуць удзельнічаць у ніякіх шкодных для Савецкага Саюзу акцыях. «Налім» патлума-

*У гэты дом у 1990 годзе я прынёс свой пераклад «Гістарычнага дзёньніку» Освальда — менавіта тут на першым паверсе месьцілася рэдакцыя часопісу «Крыніца/Родник».

чыў, што дзеля таго, каб пазьбегнуць магчымых сустрэчаў і інтэрвію з карэспандэнтамі, ён вырашыў адразу накіравацца да свайго брата, не спыняючыся ў Нью Ёрку.

Перад ад'ездам у Маскву чакаецца, што Марына зноў наведае кватэру Прусаковых. Улічваючы гэты факт, было рэкамэндавана Прусакову правесьці зь ёй гутарку, якая б дапамагла папярэдзіць Марыну і «Наліма» ад удзелу ў антысавецкай прапагадзе за мяжой. Увага Прусакова была зьвернутая на ўсьведамленьне таго, што гэтая гутарка не павінна выклікаць падазрэньне з боку Марыны і «Наліма».

Ня выклікала.

Тое, што сваякі застаюцца закладнікамі, для чалавека, які вырас у Савецкім Саюзе, было зразумела само сабой. Дый пераживалі людзі, выпраўляючы дзяўчыну ў далёкі сьвет.

22 траўня ўвечары на вакзале Освальдаў праводзілі Павал Галавачоў, сям'я Зігераў, яшчэ некалькі знаёмых. Адзіных сваякоў Марыны ў Менску, дзядзькі і цёткі, сярод іх не было. Не было й Эрыка Цітаўца.

Апошні менскі рапарт вонкавага назіраньня КДБ Мэйлеру не паказалі.



Віза для Марыны

У Маскве Освальды правялі крыху больш за тыдзень. Яны спыніліся ў сяброўкі Марыны, і хаця там іх не падслухоўвалі, КДБ дакладна ведаў пра іх апошні галоўны клопат і прычыну частых сварак — візу, якую мусіла атрымаць Марына ў амэрыканскай амбасадзе.

Расшыфроўка падслухоўваньня КДБ 20.05.62

ЛГО: ...Ты нічога не кажы. Ты адкажаш на іх пытаньні і ня будзеш гаварыць. Будзеш там сядзець і маўчаць, зразумела?

Жонка: Калі будуць праблемы, ты зь імі разьбірайся.

ЛГО: Гэта ўсё, што будзе. Гэта мая адказнасьць. Ты проста ціха сядзі. Ты павінна сказаць: не, я ня член прафсаюзу. Я ніколі не была ні ў якай савецкай арганізацыі.

Жонка: Дык за гэта ў Амэрыцы перасьледуюць? Навошта мне ехаць у такую краіну?

ЛГО: Проста скажы.

Жонка: Я яшчэ не ад'ехала. А праблемы ўжо пачынаюцца, і як толькі я даеду да Амэрыкі — ага, ты расейка! Ты член прафсаюзу!

ЛГО: Заткніся, у цябе брыдкія мазгі.

Жонка: Я савецкая дзяўчына, і я нічога не зьбіраюся баяцца. Калі я член прафсаюзу, я член і я не зьбіраюся хавацца!

ЛГО: Ідыётка!

Жонка: Мне няма чаго баяцца.

ЛГО: Дурніца! Скажы проста, што ты фармацэўт.

Жонка: Ну, я не паеду ў краіну, дзе перасьледуюць за кожнае слова.

ЛГО: *(ідыёцкі сьмех)*

Жонка: Ну ты засранец! Лопнеш як мыльная бурбалка!

ЛГО: Ты ўжо даўно лопнула сама.

Жонка: ... Сумленныя людзі нічога не хаваюць, але ты падманшчык. Ты заўсёды падманваеш, ты ўсіх падманваеш.

Освальду не дазволяць прысутнічаць на візавым інтэрвію ў амбасадзе ў Маскве— віцэ-консул Джэк Мэтлак патлумачыў, што гаворыць па-расейску і інтэрвію павінна праходзіць сам-насам.*

Освальд упарта не сыходзіў, тады Мэтлак проста заняўся іншымі справамі — і раззлаваны муж мусіў выйсьці. Марына адмаўляла сяброўства ў

*Джэк Мэтлак будзе амбасадарам ЗША ў Маскве ў 1987-91 гадах і аднойчы, калі я быў на прыёме ў яго рэзыдэнцыі Спаса-Гаўз, зьдзівіць мяне ня тым, што гаворыць па-расейску без акцэнту, а тым, што павітаецца па-беларуску і пахваліцца, што перакладаў Янку Купалу і працытуе верш «А хто там ідзе».

камсамоле, як і вучыў Освальд — але консул ведаў савецкія парадкі і не паверыў, пазначыўшы, што суразмовіца ня кажа праўду. Але паколькі факт сяброўства ў камсамоле, як і ў прафсаюзе, не ўплываў на выдачу візы, Марына яе атрымала.

Як па-філязофску заўважае Мэйлер, іронія аказалася двухбаковай: Освальд меў рацыю і Марына мела рацыю. І той і той мэтад спрацоўвае. Сваркі былі пра рэчы, якія ня мелі значэньня.

Іронія тут, як мінімум, трохбаковая. Мэйлер не зьвярнуў увагі на істотную дэталь — Марына ўсё ж захапіла з сабой у Амэрыку свой прафсаюзны білет, які быў канфіскаваны падчас ператрусу ФБР і далучаны да рэчавых доказаў Камісіі Ўорэна.

Але насамрэч прафсаюзная іронія мела яшчэ адно сапраўды ўражвальнае вымярэньне. Калі членскі білет Марыны мог і не зацікавіць Мэйлера, дык іншы проста мусіў: Освальд таксама быў членам савецкага прафсаюзу і таксама захапіў свой прафсаюзны білет у Амэрыку.


12 жніўня 1960 году ён паставіў свой подпіс ва ўліковай картцы, і апошнія ўнёскі зь яго апошняга заробку былі адлічаныя ў траўні 1962-га, калі ён вучыў жонку не прызнавацца, што яна знаходзілася ў такой крамольнай арганізацыі. Якой, дарэчы, як ён сам ацэніць у нататках пра жыцьцё ў СССР, насамрэч не існавала:

Прафсаюзаў як такіх няма (паколькі страйкі альбо перамовы наконт падвышкі зарплаты не дазволеныя; вядома, кожны рабочы можа рабіць прапановы, але ўсё гэта робіцца празь мясцовы камуністычны заводзкі камітэт, і яны праходзяць ці кладуцца на паліцу, як пажадае камітэт).

Але ні сяброўства ў прафсаюзе, ні ў камсамоле не перашкодзілі пераадоленьню апошняй перашкоды на шляху ў Амэрыку.

Увечары 30 траўня Освальды селі ў цягнік, які ішоў праз Польшчу, Нямеччыну ў Нідэрлянды, дзе іх чакаў акіянскі лайнэр «Маасдам».

Глыбока ўначы 31 траўня цягнік з Освальдамі спыніўся на пару хвілінаў у Менску. Праз вакно ў ценю пэрону, далей ад лямпаў, Марына пабачыла цётку зь дзядзькам, якія стаялі, узяўшыся за рукі і глядзелі на зашторaныя вокны міжнароднага вагона.



Лекі ад «Доктара Жывага»

Справа Освальда была спыненая ўлетку 1962-га. Так Мэйлеру сказаў «Сьцяпан».

Справу, канечне ж, не закрылі — яна працягвала папаўняцца.*

У Менску заставаліся сябры і знаёмыя Марыны і Освальда, якія перад ад'ездам абяцалі не забываць і пісаць.

У дакумэнтах Камісіі Ўорэна захоўваюцца лісты зь Менску, адрасаваныя Освальдам, у тым ліку і лісты Паўла Галавачова і фота: Павал сядзіць на тахце з дэтальлю тэлевізара.

15 верасьня 1962

Прывітаньне, Лі і Марына!

Сёньня, калі прыйшоў з працы, атрымаў ваш ліст. Адразу ж адказваю, бо перапоўнены

*Яна папаўняецца нават цяпер — у асобную тэчку падшываюцца запыты журналістаў, гісторыкаў, усіх, хто хацеў бы пазнаёміцца са справай.

радасьцю. Я ўжо хаджу на заняткі. Займаюся на другім курсе. Заўтра апошні дзень пайду на працу — я звольніўся, таму што займаюся па дзённай сыстэме з адрывам ад вытворчасьці. Марына, ты не пашкадуеш, калі выпішаш замест «Советской Белоруссии» «Известия» зь нядзельным дадаткам «Неделя». У гэтым дадатку вельмі шмат цікавага. Так, часопісы вы, відаць, атрымаеце бліжэйшым часам. Рэч у тым, што я паслаў іх не авіяпоштай (яны даволі цяжкія для самалёта), а параходам. Так што хутка атрымаеце. Я падрыхтаваў яшчэ кучу часопісаў. Заўтра вышлю. Кніг у двух пакетах, якія Лі паслаў мне, я яшчэ не атрымаў, але, відаць, ён іх нядаўна толькі паслаў, таму яны не пасьпелі яшчэ даехаць, але думаю, што хутка даедуць.

Дарэчы, Марына, прышлі мне, калі ласка, у лісьце які-небудзь падрабязны тэхнічны артыкул з прэсы пра касьмічны карабель «Mariner-2». Мне хацелася б ведаць пра яго больш падрабязна.

Дарэчы, Марына, пастарайся патлумачыць Полу, што асноўная думка п'есы Пагодзіна «Чалавек з ружжом» у словах: «Цяпер ня трэба баяцца чалавека з ружжом». Гэта, як кажуць мэдыкі, квінтэсэнцыя.*

Дзякуй, што вы выслалі мне некалькі нумароў «Америки» — яны хутка прыйдуць. Але часопіс

---

*У Камісіі Ўорэна Марыне прад'явілі гэты ліст і папрасілі патлумачыць фразу «Цяпер ня трэба баяцца чалавека з ружжом». Яна расказала, што яе знаёмы, Пол Грэгары, вывучае расейскую мову і пісаў рэфэрат пра п'есу Пагодзіна, яна дапамагала. Член камісіі спытаў: Вы ўпэўнены, што гэта ня мае нічога супольнага з забойствам? Марына адказала, што ўпэўненая; больш да ліста не вярталіся.

«Америка», калі захацець, можна пабачыць і ў нас. Але «Америка», як і «Советский Союз» — гэта не звычайныя штотыднёвыя часопісы. Яны з самага пачатку рыхтуюцца за мяжу (на экспарт). Мне больш хацелася б атрымліваць ад вас тэхнічныя (накшталт нашых часопісаў «Знание-Сила», «Техника-молодежи», радыётэхнічныя і звычайныя штотыднёвыя часопісы тыпу «Life», г.зн. як у нас «Огонёк».

Да пабачэньня.

Чакаю вашых лістоў.

Павал.

У кастрычніку 1962 году Павал Галавачоў ужо сядзеў у кабінэце ў будынку КДБ і паказваў два лісты, якія ён атрымаў з Амэрыкі.

— Навошта ты прынёс лісты? Нам яны ня трэба. Мы падпісалі Жэнэўскую канвэнцыю пра свабоду ліставаньня, і нам нічога гэтага ня трэба.

«Сьцяпан» вярнуў лісты. Так Галавачоў запомніў пачатак гутаркі ў КДБ і пераказаў Мэйлеру.

Калі паспрабаваць знайсьці аналёгію гэтаму эпізоду, дык напэўна трэба шукаць яе пасьля Дастаеўскага, у XX стагодзьдзі. Ня толькі з савецкай гісторыі вядомыя выпадкі, калі сваякі пісалі даносы адзін на аднаго. Але менавіта савецкі лад зрабіў данос на сваякоў, нават на бацькоў справай абавязку і гонару. Выпадак Галавачовых паталягічны, бо сына ў будынак КДБ на рагу Камсамольскай і Ленінскага праспэкту прывяла маці.

Прыехала з-пад Уралу, дзе служыў муж, і пайшла ў КДБ, бо сын мог пашкодзіць бацькавай кар'еры.

Маці так і сказала Паўлу, што сваім сяброўствам з амэрыканцам ён нашкодзіць усёй сям'і. Бацьку пры жыцьці Сталіна называлі сталінскім сокалам, але жыцьцёвы досьвед падказваў, што дзьве зоркі Героя Савецкага Саюзу, якія Галавачоў-старэйшы атрымаў за паветраныя перамогі, былі меншыя за дзьве зоркі на пагонах супрацоўніка асобага аддзелу.

Рапарт КДБ
13.10.62

Маці Галавачова сказала, што яны з мужам абураныя паводзінамі сына і занепакоеныя яго ўчынкамі, і яна нават спэцыяльна прыехала ў Менск, каб лепш разабрацца ў яго паводзінах і зрабіць адпаведныя высновы.

З увагі на тое, што ў адным з прынесеных Галавачовым лістоў да Освальда згадваўся «Доктар Жывага», я спытаўся, ці ён атрымаў гэтую кнігу ад Освальда. Галавачоў адказаў адмоўна.

У адказ на пытаньне, як «Доктар Жывага» прыцягнуў яго ўвагу, Галавачоў патлумачыў, што хацеў пазнаёміцца з раманам чыста зь цікавасьці, каб скласьці нейкае ўяўленьне пра кнігу.

Галавачову было патлумачана, што паводле заключэньня вядомых савецкіх крытыкаў, пісьменьнікаў і іншых асобаў, якія азнаёміліся з «Доктарам Жывага» Пастарнака, ён утрымлівае паклёп на савецкую рэчаіснасьць і не ўяўляе сабой мастацкай каштоўнасьці. Такім чынам, азнаямленьне Галавачова з кнігай «Доктар Жывага» не ўзбагаціла б яго веды, а наадварот, прывяло б яго да скажонага разуменьня пэўных праблемаў.

Таварыш Галавачова востра крытыкавала жаданьне Галавачова прачытаць «Доктар Жывага», заўважыўшы, што ніводзін прыстойны чалавек ня стаў бы марнаваць свой час на такую кнігу.

Падчас далейшай размовы з Галавачовым я нагадаў яму пра нашы ранейшыя сустрэчы, яму былі зробленыя прапановы наконт яго паводзінаў у дачыненьні да Освальда, і ўказаў на недахоп дысцыплінаванасьці Галавачова, які праявіўся ў тым, што ён не зьявіўся на размову з опэрработнікам. Гэтыя дзеяньні былі ўспрынятыя як непавага Галавачова да інтарэсаў дзяржбясьпекі. Разам з тым я даў Галавачову зразумець, што мы не былі цалкам упэўненыя, што ён не расказаў Освальду пра свае гутаркі з опэрработнікам. Галавачоў настойліва прасіў паверыць, што ён не абмяркоўваў гутаркі альбо прапановы, якія ён атрымаў у дачыненьні да Освальда.

Галавачоў сам расказаў Мэйлеру пра адну такую прапанову «Сьцяпана» — загаварыць з Освальдам пра свайго бацьку — камандуючага авіяцыяй вайсковай акругі — і паглядзець, як ён на гэта зрэагуе. Галавачоў загаварыў, але Освальд не праявіў ніякай цікавасьці — затое зрэагавала Марына, якая, гледзячы Галавачову ў вочы, спытала вельмі недвухсэнсоўна: «Павал, а навошта ты пра гэта гаворыш?» Бакі выдатна зразумелі адзін аднаго і больш да гэтай тэмы не вярталіся.

Рапарт КДБ
Працяг

Абураная абыякавым стаўленьнем Галавачова П.П. да просьбаў опэрупаўнаважанага

аб сустрэчы, маці Галавачова зьвярнулася да яго з наступнымі словамі: «Хіба так паводзяць сябе савецкія патрыёты? Ты мусіў сам пайсьці і расказаць ім пра знаёмства з амэрыканцам». Пагадзіўшыся з гэтымі довадамі сваёй маці, Галавачоў папрасіў прабачэньня за свае безадказныя ўчынкі.

У канцы гутаркі я папрасіў Галавачова неадкладна інфармаваць нас пра любыя факты, якія могуць быць цікавыя органам КДБ, у тым ліку пра асобаў, якія могуць спрабаваць уступіць зь ім у кантакт у выніку яго знаёмства з Освальдам. Галавачоў заявіў, што ў будучыні ён будзе дзейнічаць адпаведна.

Пасьля сыходу Галавачова яго маці, якая падзялілася са мной страхамі за лёс свайго сына, выказала шкадаваньне, што за чатыры гады ён аддаліўся ад бацькоў і трапіў пад уплыў непажаданых асобаў. Таварыш Галавачова абяцала ўдзяліць больш увагі палітычнаму выхаваньню сына.

Яна зьбіраецца часьцей прыяжджаць у Менск, каб праверыць, як паводзіцца сын. Больш за тое, у будучыні яна абмяжуе яго фінансава і будзе даваць грошы толькі на абсалютна неабходныя выдаткі. Паводле яе словаў, бацька Галавачова П.П. прымусіў яго падпісацца і рэгулярна чытаць маладзёвыя газэты і часопісы. Яны будуць старацца сачыць за тым, наколькі сумленна Галавачоў П.П. будзе выконваць гэтыя ўказаньні.

Маці Галавачова П.П. таксама выказала пажаданьне, каб органы пэрыядычна сустракаліся зь яе сынам, што, на яе думку, мела б станоўчы выхаваўчы ўплыў. Я патлумачыў маці Галавачова, што

ў гэтым няма патрэбы, і выказаў упэўненасьць, што яны самі здольныя паўплываць на сына ў правільным накірунку, каб ён быў дастойным сваіх бацькоў і ўзяў актыўны ўдзел у будаўніцтве камунізму ў нашай краіне.

Сьцяпан Васілевіч Грыгор'еў».*

Але ня гэтая размова пра раман Пастарнака запомнілася Галавачову найбольш.

*Генэралам Павал ня стаў, камунізм не пабудавалі, бацька памёр у 1972 годзе, і яго імем назвалі вуліцу і яшчэ нешта ў Буда-Кашалёўскім раёне, а маці праз трыццаць гадоў пасьля яго сьмерці апублікавала свае ўспаміны. Інтэрнэтная шукалка паведамляе: «У артыкуле «Я зноў пішу пра яго», апублікаваным у газэце «Рэспубліка» 14 лістапада 2003 году, жонка героя ўспамінае пра сумеснае жыцьцё, расказвае малавядомыя факты біяграфіі П.Я. Галавачова». Пра паход з сынам у КДБ там ня згадваецца. А «Доктар Жывага» сын, напэўна, прачытаў — але распытаць пра яго ўражаньне не ўдалося, у 2003 годзе П.Галавачоў быў выпісаны зь Менску, як падае Менгардаведка, «у сувязі са сьмерцю».



Паліцыя абвінавачвае ў забойстве
прэзідэнта Кенедзі Лі Освальда
НЬЮ-ЙОРК, 23 лістапада. (ТАСС).
абвінавачванню ў забойстве прэзі-
нта ЗША Дж. Кенедзі паліцыя го-
упарта адмаўляў сваё дачыненне
забойства.
Акруговы пракурор Даласа Ген

«Лі Освальд» — 35 разоў па-беларуску

Упершыню шырокае кола людзей у Беларусі прачытала і пачула імя Лі Гарві Освальда ў аўторак 26 лістапада 1963 году. Мясцовыя газэты друкавалі паведамленьне ТАСС пад загалоўкам:

Паліцыя абвінавачвае ў забойстве прэзыдэнта Кенэдзі Лі Освальда.

Гэтае самае першае паведамленьне было самым інфарматыўным:

Па абвінавачаньні ў забойстве прэзыдэнта ЗША Дж. Кенэдзі паліцыя гораду Даласу арыштавала жыхара гораду нейкага Лі Гарві Освальда. Гэты 24-гадовы чалавек быў затрыманы, нягледзячы на яго адчайнае супраціўленьне, у памяшканьні кінатэатру «Тэхас», якое знаходзіцца на адлегласьці каля шасьці кілямэтраў ад месца пагібелі прэзыдэнта ЗША.

Лі Освальда абвінавачваюць таксама ў забойстве паліцэйскага.

Пасьля амаль дзесяцігадзіннага няспыннага

допыту, якому падверглі Освальда ў паліцэйскім участку паліцэйскія і агенты ФБР, яму было прад'яўлена афіцыйнае абвінавачаньне ў забойстве прэзыдэнта. Затым Освальда прадставілі карэспандэнтам. Паводле паведамленьня карэспандэнтаў агенцтва АП, Освальд упарта адмаўляў сваё дачыненьне да забойства.

Акруговы пракурор Даласу Генры Ўэйд адмовіўся адказаць на пытаньне карэспандэнтаў, ці былі на вінтоўцы, зь якой, як мяркуюць, быў забіты прэзыдэнт ЗША, чые-небудзь адбіткі пальцаў.

У гэтым кароткім тэксьце імя Освальда згадваецца шэсьць разоў.

На наступны дзень яго імя будзе згадана ўжо адзінаццаць разоў: пад загалоўкам «Замятаюць сьляды» газэты друкавалі паведамленьне ТАСС пра забойства Освальда Джэкам Рубі (яго імя тады пісалі «Рабі») і пра загад новага прэзыдэнта Джонсана дасьледаваць гэтае забойства.

Менскія чытачы ўсесаюзнай газэты «Известия» 27 лістапада маглі пабачыць яго фота ў апошнія хвіліны жыцьця — знакаміты кадар, калі ён зьдзіўлена выгінаецца ад нечакана балючай кулі ва ўпор. «Звязда» і «Советская Белоруссия»друкавалі паведамленьне безь ілюстрацыі.

Усе публікацыі ў Беларусі адбываліся паводле падвойнага календара: ужо на момант самай першай, аўторкавай 26 лістапада, ня толькі Кенэдзі, але і Освальд быў два дні як мёртвы, а Рубі арыштаваны.

Імя Освальда можна сустрэць на старонках бе-

ларускага друку яшчэ 16 разоў да канца лістапада, потым два разы ў сьнежні.

Ніводнага разу нідзе ня згадваецца яго прыезд у СССР, жыцьцё ў Менску, праца на радыёзаводзе, жонка і дзіця, вяртаньне ў Амэрыку.

У Менску, дзе імя Освальда ведалі сотні чалавек, гэта азначала толькі адно: трэба маўчаць.

У доме перакладчыцы Інтурысту Стэліны Пажалуістэ рвалі на шматкі фотаздымкі з Освальдам. Яна плакала, а муж папярэджваў, што зараз давядзецца расплочвацца ўсёй сям'і.

Яна ўспамінала для Мэйлера:

Калі маці і я пачулі, што Кенэдзі забіты і Освальд меў да гэтага дачыненьне, мы так і селі. І сядзелі бяз руху. Я памятаю той вялікі страх. Ён апанаваў мяне і сям'ю.

Стэліна зь сям'ёй вырашыла зьехаць зь Менску — і да 1977 году жыла і працавала настаўніцай у Віцебску.

Студэнта мэдінстытуту Канстанціна Бандарына выклікалі ў КДБ, спыталі пра фатаздымкі — ён усе спаліў — і адпусьцілі, не запрасіўшы нават сесьці.

Але Стэліну ў КДБ не выклікалі. Эла Герман чакала, што яе выклічуць. Ня выклікалі. Ня выклікалі Аніту Зігер, яе сястру Элеанору, бацькоў.

Мэйлеру было невядома, ці выклікалі Эрыка Цітаўца.

Ён падае сьведчаньне аднаго з кампаніі студэнтаў-мэдыкаў, Канстанціна Бандарына, які кажа, што, у адрозьненьне ад іншых знаёмых, якія перасталі сустракацца з Освальдам перад ад'ездам, бо былі ўпэўненыя ў сачэньні КДБ, Эрык працягваў кантактаваць — і нават, адрозна ад усіх іх, заха-

ваў усе матэрыялы таго часу. Усе зьнішчалі фота і паперы, а Эрык сказаў: вы ўцякаеце, як купка баязьліўцаў, і ўсё выкідаеце за борт. Эрык мусіў бы трэсьціся ад страху, як асіна, але выйшаў сухім з вады, яму нічога не было, хаця ён меў самыя блізкія стасункі з Алікам.

Бандарын кажа Мэйлеру:

Чаму гэта Эрык быў такі сьмелы?

І Мэйлер спыняецца, сканчае абзац, пакідае пытаньне ў паветры і без адказу.

Кропка як апошні штрых у партрэт пэрсанажа «Цітавец».*

Чэкісты таксама плачуць — прынамсі, Мэйлер менавіта так, з камяком у горле, падае словы былога начальніка контраразьведкі.

Я адчуў сябе ня дрэнна — а жахліва! Гэта быў найгоршы момант майго жыцьця!

Так адказаў генэрал «Гузьмін» пра рэакцыю на навіну з Даласу. І затым, піша Мэйлер, ён ледзь не заплакаў.

Усе вінавацяць мяне! Быццам я ведаў, што ён будзе страляць. Мы ня мелі паняцьця. Нельга ў Менску знайсьці ніводнага чалавека, хто сказаў бы — так, Освальд меў намер вярнуцца ў Амэрыку і заварыць гэтую кашу.

---

*У сваёй кнізе праз паўтара дзясятка гадоў пасьля публікацыі Мэйлера Цітавец напіша, што ў яго таксама забралі ўсе лісты Освальда. Спачатку яго выклікалі на размову з КДБ у кабінэце рэктара, а назаўтра папрасілі прынесьці з дому лісты — ён прынёс і аддаў. Пра магнітафонныя стужкі ніхто ня ведаў, таму яны засталіся.

«Гузьмін» і «Сьцяпан» больш за ўсё баяліся: а раптам Освальд рыхтаваўся да забойства ў Менску, і яны не заўважылі. Але самым важным прызнаннем, якое запісаў Мэйлер ад чэкістаў, ён палічыў апошняе:

Калі шчыра, нас не хвалявала грамадзкая думка ў Амэрыцы. Нас хвалявала, што скажа Масква.

Хто б сумняваўся.



Памылка Мэйлера

У лістападзе 1963-га адзін жыхар Менску зрабіў учынак, які звычайна лічыцца сьведчаньнем добрага выхаваньня і ветлівасьці, але які безь перабольшаньня можна было назваць геройскім — і можна было кваліфікаваць як здраду.

Адзіны з усіх знаёмых Марыны і Освальда ў Савецкім Саюзе пасьля забойства самога Освальда Джэкам Рубі — Павал Галавачоў — напісаў і занёс на Менскі паштамт ліст да Марыны Освальд са спачуваньнем.

Наступнай раніцай па яго прыйшлі.

Два супрацоўнікі КДБ, якія пастукалі ў кватэру Паўла Галавачова, павялі яго на тралейбусны прыпынак і празь дзесяць хвілін яны ўваходзілі ў будынак КДБ. Паўла завялі на другі паверх, з вакна была відаць кнігарня, у пакоі было чалавек сем.

Як Галавачоў пазьней скажа Мэйлеру — яны былі ветлівыя і яго ня білі.

Гаворка ішла пра ліст Марыне са спачуваньнем.

Мэйлер піша:

Яны пачалі з таго, што сказалі яму: «У нашай краіне толькі прадстаўнікі народу могуць пасылаць спачуваньні. Ты не прадстаўнік нашага народу. Ты ня маеш права выказваць спачуваньні. Гэта адно. Ты страціў палітычную пільнасьць. Ты стаў палітычна блізарукім. Калі ты ня хочаш, каб законы нашай краіны напісалі табе на шкуры, калі ты хочаш зноў пабачыць неба, перастань рабіць глупствы. Дарэчы, якія твае адносіны з Марынай Освальд? Ты зь ёй спаў?» Яны задавалі іншыя пытаньні і затым вярталіся да гэтага: «Спаў з Марынай калі-небудзь? Чаму ты напісаў такі ліст, калі ты зь ёй ня спаў?»

Лёгіка КДБ зразумелая — калі б Павал адказаў, што так, спаў з Марынай, адразу зьявіўся б ясны і бясьпечны матыў, чаму ён спачуваў. Усё іншае было палітычна небясьпечным, магчыма, у міжнародным маштабе.

Чалавечыя паводзіны былі небясьпечныя.

Пасьля гутаркі яго завялі на паштамт і прымусілі напісаць заяву пра адкліканьне ліста. Такое захаваньне законнасьці ня надта ўразіла Галавачова — адкуль жа КДБ ведае зьмест, калі яны яшчэ не перахапілі ліст?

Марына ніколі не атрымала спачуваньня ад Паўла.

У размове з Мэйлерам праз трыццаць гадоў ён назаве гэтую размову з кадэбістамі найгоршым момантам свайго жыцьця.

Дэпутат Сяргей Навумчык сустракаўся са «Сьцяпанам» — былым куратарам Освальда палкоўнікам

у адстаўцы Аляксандрам Касьцюковым. Сцэна — як з-пад пяра Дастаеўскага:

Ён наракаў на менскіх сяброў Освальда, якія давалі заходнім журналістам недакладную інфармацыю, дзе сумнеўна паказвалі яго, Касьцюкова, ролю. Асабліва скардзіўся на Паўла Галавачова: «Паўлік кажа, што я яго выклікаў, сурова зь ім размаўляў... Ды калі яго маці паскардзілася ў КДБ і мне прыйшлося зь ім сустракацца, я дрыжэў, як той восеньскі ліст: я — малодшы афіцэр, ніхто, а ён — сын Героя Савецкага Саюзу, сябра Хрушчова...»*

У самым канцы кнігі Мэйлера, у імянным паказьніку, Павал Галавачоў будзе прадстаўлены як «сябар Освальда і інфарматар КДБ». З мноства людзей, зь якімі Освальд сустракаўся ў СССР і зь якімі потым працаваў Мэйлер, гэтак будзе напісана толькі пра аднаго Галавачова.**

Кніга Мэйлера амаль бездакорна дакладная: памылкі ў ёй — не памылкі, а, хутчэй, абдрукоўкі (ня тая літара ў прозьвішчы консула, які выдасьць Марыне візу для вяртаньня ў Амэрыку, лішняя галосная ў прозьвішчы старшыні КДБ («Шыракоўскі»),

*Тут важны час і кантэкст: опэрупаўнаважаны гаворыць так увесну 1993-га, час росквіту беларускай дэмакратыі, калі гаворкі пра люстрацыю вядуцца не на кухнях, а ў парлямэнце, і гаворыць гэта дэпутату апазыцыі, перад якім тады расчынялі дзьверы старшыня КДБ і міністры. А журналісты, на якіх спасылаецца Касьцюкоў, насамрэч былі ўсходнія — Галавачоў расказаў пра запалохваньні КДБ карэспандэнту газэты «Известия», якая друкавала сэрыю матэрыялаў пра Освальда ў жніўні 1992-га.

**Эрнст Цітавец у сваёй кнізе, якая выйшла празь сем гадоў пасьля сьмерці Галавачова, назаве яго агентам КДБ чатыры разы.

сьмешнае тлумачэньне, што калі імя аднаго з суразмоўцаў — Саша, а яго бацькі — Мікалай, дык яго завуць «Саша Мікалаевіч»).

Але словы ў паказьніку імёнаў пра Паўла Галавачова, хаця фармальна і не няправільныя, акажуцца самымі несправядлівымі.

Сымпатычны хлопец быў. Не засранец.



Кніга без ілюстрацыяў

У архівах Камісіі Ўорэна сабраныя тысячы рэчавых доказаў — фатаздымкаў зь Менску і Тэхасу, лістоў, рукапісаў, нататнікаў, капэртаў, арыгіналаў дакумэнтаў. Экспэртамі намаляваныя маршруты праезду, траекторыя стрэлаў. Існуе самая дарагая ў сьвеце аматарская дакумэнтальныя стужка, зьнятая жыхаром Даласу Абрамам Запрудэрам падчас забойства (26,6 сэкунды былі ацэненыя ў 16 мільёнаў даляраў).

Выбіраць было з чаго — але ў «Гісторыі Освальда» ня зьмешчана ніводнай ілюстрацыі. Няма нават партрэта героя.

Чаму Мэйлер не захацеў уключаць ілюстратыўны матэрыял у кнігу? Чаму няма нават Освальда з Марынай?

Магчыма, таму, чаму няма фатаграфіяў у раманах Талстога ці Дастаеўскага. Освальд, зразумела, рэальны чалавек, а не літаратурны пэрсанаж. Але Мэйлер ня столькі хоча расказаць пра героя, колькі знайсьці адказ на пытаньне — ці існуе ўвогуле та-

ямніца, альбо мы маем справу з праявай абсурду, постмадэрнісцкай рэальнасьцю, дзе ўсё можа быць бяз дай прычыны. Іншымі словамі — калі прэзыдэнта забіла нікчэмная жамяра, дык мы жывем у сьвеце дэградаванага хаосу, і ўсё безнадзейна, калі асоба з ідэямі застрэліла бацьку трох дзяцей і забіла паліцэйскага, дык такое зло можна зразумець і, значыць, зь ім змагацца.

Калі б выбіраць толькі адзін здымак — варта было б надрукаваць зусім не драматычны, а даволі банальны здымак Освальда і Марыны ў сонечны дзень на набярэжнай Сьвіслачы, непадалёку ад іх дому. Галоўная яго адметнасьць — гэта адзіны здымак, на якім абое дадзеныя на поўны рост.

Вось яны сталі каля парапэту, Освальд усьміхнуўся ў камэру, палова твару жонкі захінутая ценем, фотаапарат пстрыкнуў — і гатова. Не адразу, вядома, а пасьля таго, як стужка пабывала ў бачках з праяўляльнікам, фіксатарам, была прамытая, высушаная ў цёмным пакоі з чырвонай лямпай, а потым друкаваліся картачкі, і гэта таксама працэс, які пачні апісваць — ня спыніься.

Я паслаў гэты здымак на камэнтар аднаму знаўцу фотамастацтва, ня кажучы, хто выяўлены на фота. Вось што ён мне адпісаў, з агаворкай пра малы фармат і нізкую якасьць выявы:

З таго, што відаць, агулам можна сказаць, што гэта неблагая фатаграфія «на памяць», зьнятая даволі пісьменна бяз грубых тэхнічных памылак. Камэра, хутчэй за ўсё, кінаплёначная (24x36), якасьць файла не дае сказаць упэўнена. Зьнята, відаць, аматарам падчас шпацыру, без прадуманай пастаноўкі. Прафэсіянал пры спэцыяльнай

здымцы не дапусьціў бы, каб жанчына стаяла неэстэтычна, з расстаўленымі нагамі. Дрэнная якасьць файла ўсё ж дае магчымасьць разглядзець крыху псыхалёгію пары, але толькі ў самых агульных рысах. Так выглядае жанатая пара, калі сумеснае жыцьцё ўжо ўвайшло ў пэўную прывычку. Хаця заўважаецца пэўная адчужанасьць паміж гэтымі людзьмі, нейкая нестабільнасьць, недасказнасьць. Ня ўсё ў іх добра.*

*Здымак камэнтаваў Зянон Пазьняк, вядомы ня толькі як палітык, але і як мастацтвазнаўца, фатограф, аўтар фотаальбомаў. Пазьней ён палепшыў здымак і даслаў дадатковы камэнтар:

Гэтыя людзі розныя па культуры фатаграфаваньня. Жанчына фатаграфуецца непасрэдна, такой, якой ёсьць, ня думаючы, якой выйдзе і не прыхарошваючыся, не прымаючы «паляпшальных» паставаў. Тым часам мужчына прыняў, відаць, знаёмую яму позу і завучаную ўсьмешку, але ўсё гэта выглядае непасрэдна і элегантна. І трымаецца ён больш раскавана і таксама элегантна. Паліто на ім даволі дарагое, добра на ім сядзіць і дакладна пашыта па ім; штаны па тагачаснай модзе і дакладныя па даўжыні, адпрасаваныя, туфлі начышчаныя да бляску; шалік акуратна падабраны і ўкладзены; тып прычоскі характэрны для інтэлігентнага чалавека. Мужчына, што на фота, прывык нязмушана сачыць за сабой (за сваім выглядам). Гэта мог бы быць чалавек з тагачаснай інжынэрна-тэхнічнай інтэлігенцыі, з выкладчыкаў сярэдняй ці вышэйшай школы, альбо з дробных дзяржаўных служачых.

Па зьнешнім выглядзе жанчына элегантнасьцю не вылучаецца. Зьнешні выгляд яе праставаты, адзежа не дапасаваная (магчыма, купленая ў «шырспажыве» — што было), але трымаецца яна ўпэўнена, спакойна і самадастаткова. Па ўнутраным напаўненьні яна выглядае больш дарослай за мужчыну і мацнейшай па характары. Мужчына ў параўнаньні зь ёй выглядае крыху інфантыльным. Не зразумела, чаму жанчына бяз шаліка, у паліто і з адкрытай голай шыяй і грудзінай. Па выгляду гэта тыповая мянчанка таго часу, працаўніца сталовай, бухгальтэрыі, паліклінікі, цырульні, швачнай фабрыкі, гадзіньнікавага заводу, прадавачка ў гастраноме і г. д. — сярэдні ўзровень жыхара Менску. Тым часам мужчына больш тыповы для Заходняй Беларусі, Прыбалтыкі, Польшчы. Гэта больш заходні тып чалавека.

У гэтым аналізе ўражвае ўсё, але адна рэч, пра якую зараз пойдзе гаворка, ня проста ўражвае — шакуе сваёй дакладнасьцю.

Рэч у тым, што з усіх менскіх здымкаў менавіта гэты быў адным з галоўных доказаў тэорыі, што Освальда тут падмянілі і ў Амэрыку вяртаўся чалавек КДБ.

Знаўцы адразу заўважылі, што на здымку Освальд і Марына амаль аднолькавага росту. Насамрэч яна мела каля 160 см, а Освальд — каля 180 см (па іншых зьвестках — 175). На здымку Марына ў басаножках без плятформы і абцасаў. Хто тады побач зь ёй?

Першы некансьпіралягічны адказ на гэтае пытаньне здолеў даць на пачатку 90-х канадыйскі журналіст Пітэр Уронскі, які перавярнуў яго дагары нагамі: ня хто побач з Марынай, а — хто побач з Освальдам?

Падчас прыезду ў Менск ён сустракаўся зь сяброўкай Марыны Людмілай Петрусевіч, якая сказала: гэта яна на здымку з Освальдам. Людміла ўзгадала, як яны гулялі, рабілі здымкі разам і паасобку, і вось гэты здымак зрабіла Марына. А чаму гэтае паліто на Марыне на іншых здымках? А таму што Людміла гуляла без паліто, замерзла і пазычыла пагрэцца.

Публікацыя Ўронскага выклікала сэнсацыю у колах освальдолягаў і загадка лічылася вырашанай, аж пакуль ён ізноў не прыехаў у Менск і не паспрабаваў зьняць усю сцэну на відэакамэру.

Знайшлі тое самае месца, усталявалі камэру, каб выбраць правільны ракурс, паставілі каля балюстрады разам зь сяброўкай Марыны памочніцу Ўронскага — і раптам у кадры Люся Петрусевіч

аказалася аднаго росту з істотна вышэйшай за яе памочніцай.

Асфальтавае пакрыцьцё каля балюстрады ўзгорбілася, побач зь ямамі былі ўзвышшы. На гістарычным фота сапраўды была Марына — яна стаіць на ўзвышэньні, крыху расставіўшы ногі (што і адзначыў пры аналізе ўважлівы позірк фотазнаўцы) — мысок яе левай туфлі на адным узроўні з правым чаравікам Освальда, але абцас вышэй.

Вось як праца гарадзкіх камунальных службаў некалькі дзесяцігодзьдзяў псавала ці ўзмацняла — каму як — рэпутацыю савецкага КДБ, давала занятак цэламу накірунку освальдазнаўства, прывяла да эксгумацыі цела Освальда ў 1981 годзе, ня кажучы пра прачуханыя да пярэдніх зубоў патыліцы зьбянтэжаных журналістаў.

Ой, Менск — горад ня просты для прагулянак.

Трэба пад ногі глядзець.

Нават калі стаіш.



Далсты

Гісторыі Освальда пасьля вяртаньня з СССР Мэйлер прысьвяціў другую, большую палову кнігі, і па тых сьцежках мы не хадзілі.

Мякка кажучы, жыцьцё ў Амэрыцы для Освальда не было прагулянкай. Прэса ім не цікавіцца, але цікавіцца ФБР, мяняюцца працы, гарады, грошай не хапае, пачынаюцца скандалы з Марынай, якая ў выніку зьяжджае з дачкой жыць да новай знаёмай у гарадку Ірвінг, няўдалая спроба прапанаваць свае паслугі савецкай амбасадзе ў Мэксыцы, ня надта плённая дзейнасьць у камітэце ў падтрымку Кубы, спроба ўгаварыць зноў цяжарную жонку разам угнаць самалёт і паляцець у Гавану, няўдалы абстрэл дому правага палітыка генэрала Ўолкера, нязьдзейсьнены намер забіць Рычарда Ніксана, няўцямнае кантактаваньне зь мясцовай філіяй кампартыі, зварот па візу на вяртаньне ў СССР — усё гэта ня менскія маршруты, хаця ў Амэрыцы Освальд і аформіў падпіску на газэту зь Менску — «Советскую Белоруссию».

У матэрыялах Камісіі Ўорэна захоўваецца заключэньне доктара Гаварда Роўма, які аналізаваў менскі дзёньнік і рукапісы Освальда з пункту гледжаньня дысьлексіі:

Я лічу, што гэты дэфэкт і яго наступствы... маюць значэньне, бо ўзмацняюць уражаньні многіх іншых крыніцаў пра прыроду адчужанасьці Освальда ад людзей, яго няўпэўненасьць і агрэсіўнасьць, прычыны яго праблемаў у школе, неабгрунтаваную ацэнку сваіх літаратурных магчымасьцяў. Такія рысы — зусім ня рэдкае наступства жыцьцёвага досьведу, які пазначаны рэгулярнымі няўдачамі амаль у любой сфэры прадпрынятай дзейнасьці. Для здольнага чалавека мець фізычнае абмежаваньне ў карыстаньні мовай зьяўляецца асабліва прыніжальным. Мне падаецца, што ў выпадку з Освальдам гэтая фрустрацыя дала дадатковы штуршок яго патрэбе давесьці ўсяму сьвету, што ён зьяўляецца непрызнаным «вялікім чалавекам».

Толькі пасьля паўтысячы старонак, прысьвечаных паўтара гадам Освальда ў Амэрыцы, Мэйлер прапануе адказ на пытаньне — чаму Освальд выбраў за мішэнь Кенэдзі?

Адказ сьведчыць пра наша разуменьне Освальда: гэта быў найбольшы шанец, які ён калі-небудзь меў. Забойства прэзыдэнта было б землятрусам. Для амэрыканцаў яго рэха будзе гучаць да канца стагодзьдзя і нават больш. Гэта таксама будзе карай для расейцаў і кубінцаў. Але ён, ён быў вышэйшы за капіталізм і вышэйшы за камунізм. Вышэйшы за абодва! У яго было, як ён

лічыў, вышэйшае пакліканьне і патэнцыял, як у Леніна. Освальд падзяляў яго веру ў тое, што выдатная мэта апраўдвае любыя сродкі.

Пасьля прыніжэньня ў Мэхіка і адсутнасьці сацыяльнага статусу ў мястэчку Ірвінг, куды пераехала Марына, выглядае, што палітычная ідэалёгія Освальда нарэшце спынілася на цэнтральным нэрве нігілізму — справы павінны значна пагоршыцца перад тым, як выправяцца. Можна працытаваць яго запіс, зроблены на цеплаходзе падчас вяртаньня ў Амэрыку:

Цікава, што было б, каб нехта ўстаў і сказаў, што ён супраць ня толькі ўладаў, але супраць народу, усёй краіны і ўсяго падмурку грамадзтва.

У гэтым сказе — уся матывацыя стрэлу ў Кенэдзі.

Гэтая рэканструкцыя настолькі нагадвае гераяў «Бесаў» Фёдара Дастаеўскага і іх галоўнага пратаганіста Сяргея Нячаева зь яго людажэрным катэхізысам рэвалюцыянэра, што ўсьлед за Марынай хочацца ўсклікнуць: не Талсты!

Dalsty.

Мэйлер піша, што Кенэдзі меў здольнасьць усяляць аптымізм і даваць надзею, і ў гэтым сэнсе ён быў добрым прэзыдэнтам, і Освальд ніколі нічога дрэннага пра яго не казаў — але, з пункту гледжаньня Освальда, ён быў занадта добрым прэзыдэнтам і мог затармазіць разьвіцьцё сацыяльнага крызісу і радыкальныя перамены і таму аб'ектыўна перашкаджаў стварэньню лепшага сьвету. Лепш, як звычайна, чым горш.

Маршрут Кенэдзі быў надрукаваны ў тэхаскіх газэтах, і рабочыя ў кніжным складзе тыдзень абмяр-

коўвалі навіну, што прэзыдэнт будзе праяжджаць пад іх вокнамі. Як Освальд пісаў брату Робэрту:

Заўсёды лепш скарыстаць магчымасьць, калі яна табе надарылася.

Надарылася 22.11.1963.

У 12:30 скарыстаў.

Магчымасьці, як матылькі, могуць зьявіцца ня толькі нечакана, але й зь нечаканага боку: праз два дні, 24.11.1963, калі Освальда пераводзілі з паліцэйскага ўчастку ў турму, у натоўпе рэпарцёраў з кольтам у руках чакаў мясцовы жыхар Джэк Рубі, які вырашыў забіць Освальда, бо надарыўся такі момант.

У 11:21 магчымасьць была скарыстаная.

Мэйлер хацеў назваць кнігу «Амэрыканская трагедыя» — калі б ня Драйзэр, які зрабіў гэта на 70 гадоў раней. Загаловак «Амэрыканская мара» Мэйлер скарыстаў для свайго чацьвёртага раману.

Дастаеўскі вучыў, што «чалавек ёсьць таямніца». Чым было шматстаронкавае дасьледаваньне Мэйлера, як не разгадваньнем, пошукам адказу, спробай вытлумачыць абсурднасьць, якая раптам так дыспрапарцыйна перакуліла час? І «Гісторыя Освальда» атрымала падзагаловак: «Амэрыканская таямніца».

Прыметнікі «савецкая», «расейская», «беларуская» ці «менская» сапраўды не пасавалі.

Амаль не пасавалі.



Освальд — чытач «Гісторыі Освальда»*

Освальд мог ведаць імя Мэйлера. Яго першая кніга «Голыя і мёртвыя» выйшла ў 1948-м і карысталася велізарнай папулярнасьцю. Падзеі, якія там апісаныя, адбываюцца на Ціхім акіяне — там, дзе служыў марскі пехацінец Освальд.

Як бы Освальд, калі б яго не забілі, успрыняў кнігу Мэйлера пра сябе, пра падслухоўваньне КДБ, пра сяброў, сябровак і жонку, пра сваё жыцьцё, вывернутае навонкі?.. І што бы ўдакладніў, што аспрэчыў? Ці адразу зарадзіў бы свой карабін Манліхер-Каркан і першым рэйсам вылецеў з Даласу ў Нью Ёрк — хаця не, са зброяй у самалёт ня пусьцяць, значыць, хутчэй, завёў бы свой аўтамабіль і паехаў, але не ў Нью Ёрк, і не таму, што задалёка, бо што такое паўтары тысячы міляў для 55-гадовага мужчыны на добрым аўто па добрай дарозе,

*Слова «гісторыя» ў назьве ўжываецца ў значэньні «аповед», «жыцьцяпіс», па-ангельску — ня «history», а «story».

а ў адвакацкую кантору — судзіцца з аўтарам, выдавецтвам і КДБ. Нават прасьцей — нікуды б не паехаў, а адвакаты самі прыйшлі б. Бо калі б яго не забілі і справа дайшла да суду і нават да сьмяротнага выраку, амэрыканскія юрысты адцягваюць выкананьне на гады.

Таксама верагодна, што за гэты час ён сам напісаў і апублікаваў бы свае мэмуары, і, можа, нават прадаў правы на экранізацыю ў Галівуд. І Мэйлер не паехаў бы ў Менск, і не дамовіўся б з КДБ, і не раскрыліся б такім чынам дагэтуль страшна сакрэтныя таямніцы мэтадаў апэратыўнай працы органаў у Менску, і не было б — ды мала чаго не было б.

Адзін зь вядомых заходніх гістарыёграфаў* сто гадоў таму так апісаў праблему прычыннасьці гісторыі: чалавек выпіў лішні кілішак, сеў за руль аўтамабіля са слабымі тармазамі і, калі паварочваў на неасьветленым скрыжаваньні, зьбіў чалавека, які выскачыў па цыгарэты.

Хто вінаваты ў сьмерці?

Кіроўца, які выпіў лішку?

Мэханік, які не адрэгуляваў тармазы?

Мясцовыя ўлады, якія не адрамантавалі ліхтар?

Курэц, які перабягаў вуліцу, каб задаволіць шкодную звычку? Яго сяброўка, якая забрала сабе апошнюю цыгарэту?

Калі ведаеш фінал гісторыі Освальда, падобныя пытаньні можна задаваць яшчэ сто гадоў.

Але адно пытаньне ўсё ж нельга не задаць: які уплыў меў менскі пэрыяд жыцьця Освальда на ягоны ўчынак у Даласе?

---

*Юджын Кар. Што такое гісторыя?

Менскія знаёмыя Освальда, уключна зь яго пастухамі з КДБ, адзінадушна лічылі, што Освальд ня мог быць забойцам Кенэдзі. Так знаёмыя кажуць пра амаль усіх забойцаў: быў ціхі хлопчык у школе, прыстойныя бацькі, дапамагаў суседзям, меў добрыя характарыстыкі, мы разам гулялі ў парку...

Гэта псыхалягічна просты і пашыраны фэномэн — абарончая рэакцыя ад нечаканага выкіду абсурду.

У менскім асяродку разыходзяцца хіба толькі ў прычынах, чаму ня мог: частка, уключна з КДБ, лічыла яго прымітыўным, неразьвітым, лянівым няздарам, іншыя — інтэлігентным, адукаваным, неардынарным маладым чалавекам.

У 1963-64 гадах Камісія Ўорэна карпатліва сабрала неверагодную колькасьць інфармацыі пра жыцьцё Освальда, ад здымкаў немаўляці ў сямейным альбоме да здымку трупа на стале патолягаанатама, ад ацэнак у трапнасьці стральбы ад яго сяржанта да апошняй старонкі нататніка, ад сьведчаньняў маці, брата і жонкі да паказаньняў асобаў, якія сустракаліся зь ім толькі аднойчы.

Яшчэ праз трыццаць гадоў, паводле пастановы Кангрэсу ЗША, Рада ў справе вывучэньня дакумэнтаў забойства рассакрэціла дадатковыя дзясяткі тысячаў папераў і ў 1998 годзе зрабіла ўсе чатыры мільёны дакумэнтаў даступнымі любому дасьледніку.

Рассьледаваньне забойства Кенэдзі — самая падрабязная і самая вялікая ў гісторыі чалавецтва сьледчая справа.

Яе высновы вядомыя — прэзыдэнта забіў Освальд, і ён дзейнічаў адзін.

Літаратурнае сьледзтва, якое правёў Мэйлер,

мела справу з дасьледаваньнем асобы Освальда і пошукам адказу на пытаньні, ня хто і як забіў прэзыдэнта, а — чаму.

Але першае дасьледаваньне ўнутранага сьвету Освальда зьявілася задоўга да Мэйлера, і задоўга да «Справы 34451», заведзенай КДБ: «Справа №26996» пабачыла сьвет у траўні 1953-га, і яе аўтарам быў псыхіятар.

Першы канфлікт з правапарадкам Освальд меў у Нью Ёрку ва ўзросьце 13-ці гадоў: маці была няздольная справіцца з сынам, які прагульваў школу, і 16 красавіка яго зьмясьцілі ў «Юнацкі дом», дзе зь цяжкімі падлеткамі працавалі лекары. 1 траўня Освальда аглядаў галоўны псыхіятар Рэнатус Гартагз, які пазьней прысьвяціў яму сэмінарскія заняткі, дзе мэдыкі абмяркоўвалі незвычайных пацыентаў.

Гартагз пісаў:

Гэта напружаны, адчужаны і ўхілісты хлопчык, які надзвычай ня любіць гаварыць пра сябе і свае пачуцьці. Яму падабаецца ствараць уражаньне, што яго не кранае меркаваньне іншых людзей, каб ад яго адчапіліся і ня трэба было прыкладаць намаганьні да гутаркі. Пераадолець эмацыйную сьцяну, за якой хаваецца гэты хлопчык, было цяжка, але ён даў дастаткова ключоў, якія дазволілі разгледзець напружаны неспакой, сарамлівасьць, пачуцьцё няўклюднасьці і неўладкаванасьці як галоўныя прычыны адчужанасьці і звычак самотніка. Лі сказаў: «Я не хачу мець сябра і не хачу гаварыць зь людзьмі». Ён сам называе сябе ўпартым і прызнае, што любіць казаць «не».

Гартагз выводзіць прычыну такога стану зь ся-

мейнай сытуацыі: бацькі няма, маці занятая сама сабой, браты яго ігнаруюць, у школе ў Нью Ёрку да падлетка з паўднёвым акцэнтам ставяцца як да правінцыяла.

Лі жыве яркімі фантазіямі, якія круцяцца вакол тэмаў усемагутнасьці і ўлады, якімі ён спрабуе кампэнсаваць свае недахопы і фрустрацыі. Яму не падабаецца ні з кім быць разам, і на пытаньне, якой кампаніі — дзяўчат ці хлопцаў — ён аддаў бы перавагу, ён адказаў «Мне не падабаюцца ўсе».

Гартагз адзначае «моцныя нэгатывісцкія рысы», але як клінічны псыхапатоляг ня лічыць іх хваробай: «мэнтальны псыхозны зьмест» і «псыхічныя мэнтальныя зьмены» ім адмаўляюцца. Тым ня менш, ён ставіць дыягназ «асоба характэранага тыпу ўзрушэньняў з шызоіднымі рысамі і пасіўна-агрэсіўнымі тэндэнцыямі» і рэкамэндуе выпрабавальны пэрыяд пад наглядам дзіцячага псыхіятра.

У дзень забойства Кенэдзі да Гартагза зьвярнулася тэлебачаньне па камэнтар, хто, з пункту гледжаньня псыхіятрыі, мог забіць прэзыдэнта.

Гартагз сказаў:

Вельмі верагодна гэта мэнтальна няўстойлівая асоба, якая мае асабістую непрыязь да людзей ва ўладзе, і, вельмі верагодна, гэта чалавек, які ў спробе пераадолець сваю нязначнасьць і бездапаможнасьць паспрабуе зьдзейсьніць учынак, які напалохае іншых, які страсяне сьвет, які прымусіць іншых людзей адчуць сябе неабаро-

ненымі, каб такім чынам пазбавіцца ад уласнага пачуцьця неабароненасьці.*

Падлеткаў (дый дарослых), якіх можна апісаць падобнымі фармулёўкамі — процьма. Рэч ня ў тым, што ня ўсе потым робяцца злачынцамі — а хутчэй у тым, як складваюцца іх абставіны і магчымасьці, што зьмякчае, а што ўзмацняе і памнажае «нэгатывісцкія» рысы аж да прабаднога хаосу.

Вось што Мэйлер адказаў на маё пытаньне пра сувязь паміж Менскам пачатку 1960-х і Даласам 22 лістапада 1963 году:

— Я думаю, што трэба пайсьці значна глыбей. Освальд выехаў зь Менску і вярнуўся ў Амэрыку. І аднойчы ён сказаў сабе: я адзіны чалавек, які жыў параўнаўча каля самага дна, у сацыяльных нізах у абедзьвюх краінах. Я быў рабочым нізкага ўзроўню ў Савецкім Саюзе і я рабочы нізкага

*Гартагз нярэдка выступаў у ролі экспэрта на тэлебачаньні, і ў той дзень ні журналісты ня ведалі, ні ён сам ня памятаў, што Освальд быў яго пацыентам. Цікава, як ацаніў бы амэрыканскі доктар высновы менскага прафэсара мэдыцыны Эрнста Цітаўца, якімі той завяршае праз паўстагодзьдзя сваю кнігу ўспамінаў:

«Ці быў Освальд шчасьлівым чалавекам? Калі шчасьце азначае здольнасьць свабодна выбраць жыцьцёвую місію і працаваць дзеля яе ажыцьцяўленьня, ён быў шчасьлівы. Яго місія была ідэалістычнай — паспрабаваць зрабіць сваю краіну лепшай. Надзіва адважна і мэтанакіравана вёў яго гэты ідэал. Ён лічыў, што ў Атэнскай сыстэме ён знайшоў трэці шлях па-за пасткамі камунізму і капіталізму. Гэта быў адказ, да якога ён прыйшоў як праз наўпроставы досьвед, гэтак і праз старанныя тэарэтычныя пошукі. Жыцьцё яго было поўнае прыгодаў і намаганьняў, якія ўсе былі скіраваныя да гэтай ідэалістычнай мэты. Ён бачыў сьвет, сустракаўся зь цікавымі людзьмі і зрабіў свае бясстрашныя высновы пра магчымасьць уяўленьня сьвету па-за фізычнымі, інтэлектуальнымі, палітычнымі і нават асабістымі рамкамі халоднай вайны. Ён быў шчасьлівы чалавек».

ўзроўню тут, у Амэрыцы. І я ведаю абедзьве краіны ад нізу да верху так, як ніхто болей ня ведае. Ніхто ў сьвеце ня ведае таго, што ведаю я. І гэта было сапраўды так. Адсюль прыйшло пачуцьцё сваёй велізарнай значнасьці.

Такі эфэкт меў на яго Менск.

Першапачаткова Мэйлер хацеў назваць сваю кнігу «Освальд у Менску».



Цягнік, які не спазьніўся

Я пайшоў у першы кляс праз пару месяцаў пасьля таго, як цягнік з Освальдам, які вяртаўся ў Амэрыку пасьля двух з паловай гадоў жыцьця ў Менску, пастаяў некалькі гадзінаў недалёка ад нашага дому ў Берасьці, пакуль мянялі колы, сьвіснуў на разьвітаньне і пагрукатаў празь мяжу.

Мы зь сябрамі падкладалі на рэйкі манэты — для цягніка пяць капеек былі ня больш адчувальныя, чым матылёк, які сеў на бліскучую адпаліраваную сталь, атрымлівалася тонкая авальная бляха, залаціста-жоўтая, з крылападобнымі вострымі краямі, за якую ўжо нічога нельга было купіць і, праўду кажучы, якой асабліва нічога нельга было й зрабіць. Пятак аніяк не ўплываў і на чыгуначны рух.*

*Прыхільнікі «эфэкту матылька» могуць запярэчыць, напрыклад, што з таго расьціснутага пятака пачалася інфляцыя ці дэфляцыя, якая вядома чым скончылася ў 1991-м. Тэрмін «эфэкт матылька» зрабіў папулярным дасьледнік тэорыі хаосу Эдвард Лорэнц. У 1961 годзе ён рабіў матэматычныя разьлікі мадэлі надвор'я і нязначна, на адну дзесяцітысячную долю, зьмяніў

Пасьля 12:30 у суботу 22 лістапада 1963 году ў сьвеце стала менш сьмеху, больш сьлёз. Але ўплыў стрэлаў у Даласе на палітычную гісторыю быў неістотны.

Ва ўнутранай палітыцы Ліндан Джонсан працягваў рэформы, якія Дэмакратычная партыя ЗША пачала рэалізоўваць пры Кенэдзі: пашырэньне грамадзянскіх правоў, канец расавай сэгрэгацыі, падтрымка корпусу міру, які даў магчымасьць ідэалістычнай моладзі паспрабаваць зьмяніць да лепшага жыцьцё ў краінах трэцяга сьвету і больш уведаць пра сьвет самім.

Удзел амэрыканцаў у віетнамскім канфлікце пачаў драматычна нарастаць яшчэ пры Кенэдзі і перарос у поўнамаштабную вайну пасьля яго, дагэтуль дзейнічае падпісаная ім дамова аб забароне ядзерных выпрабаваньняў у атмасфэры, космасе і пад вадой (многія лічаць гэта найважнейшым дасягненьнем яго тысячы дзён у Белым доме), словы Кенэдзі ў Бэрліне пасьля ўзьвядзеньня сьцяны («Ich bin ein Berliner! — Я — бэрлінец!») паўтаралі наступныя прэзыдэнты, пакуль сьцяна не развалілася ўшчэнт. Палітыка ў адносінах да Кубы засталася нязьменнай цягам наступнага паўстагодзьдзя, урокі карыбскага крызісу засвоілі абодва бакі.

Празь пяць з паловай гадоў пасьля забойства прэзыдэнта Амэрыка выканала задачу палёту на Месяц, якую паставіў Кенэдзі.

Самыя моцныя рэжымы пэрсанальнай улады

адзін складнік у формуле — і раптам атрымаў радыкальна іншы прагноз. На гэтым назіраньні было пабудаванае паведамленьне на адной амэрыканскай мэтэаралягічнай канфэрэнцыі: «Ці выклікае ўзмах крылцаў матылька ў Бразіліі тарнада ў Тэхасе?»

рассыпаюцца пасьля сьмерці дыктатараў, іх помнікі трушчаць, а імёны ганяць. Дэмакратыі па сваёй прыродзе гістарычна сэйсмастойкія. Невядома, канечне, што б яшчэ зрабіў Кенэдзі для Амэрыкі і сьвету, але гэта так і застанецца невядомым.

Заўважныя зьмены адбыліся ў працы прэзыдэнцкай службы аховы: перасталі загадзя друкаваць маршруты паездак і агучваць іх даты, адкрытыя кабрыялеты былі выведзеныя з парку прэзыдэнцкіх машын.

Наступныя паўстагодзьдзя ляўры Освальда не давалі спакою яшчэ тузіну асобаў, а сканчалася ўсё, як для матылькоў на рэйках: іх альбо лавілі і саджалі за краты, альбо яны гінулі самі. Больш амэрыканскіх прэзыдэнтаў не забівалі, толькі псыхічна хворы нападнік здолеў параніць прэзыдэнта Рэйгана ў 1981 годзе.

Чалавечая трагедыя, якая разыгралася 22 лістапада 1963 году ў Даласе, абарвала жыцьці адных людзей, непазнавальна зьмяніла лёсы іншых, але ня мела гістарычнага вымярэньня.

Освальд зрабіў ня большы ўплыў на хаду падзеяў XX стагодзьдзя, чым матылёк пад коламі цягніка на яго прыбыцьцё на станцыю паводле раскладу.

Рэй Брэдбэры, хоць і прычыніўся да нараджэньня матыльковай тэорыі хаосу, усё ж пісаў фантастыку.

А лепідаптэралёгія — навука.



Хоць на Месяц узвый

У менскую вандроўку па сьлядах Освальда варта было б узяць кнігу журналісткі Прысцылы МакМілан «Марына і Лі» — 527-старонкавы том у цьвёрдай вокладцы, які выйшаў у 1977 годзе.

У 1959-м МакМілан працавала ў Маскве як няштатны рэпарцёр на амэрыканскі газэтны сындыкат, жыла, як і Освальд, у гатэлі «Мэтраполь» і па падказцы знаёмага з амбасады пайшла браць інтэрвію ў перабежчыка. Освальд пагадзіўся, надзеў касьцюм з гальштукам, прыйшоў да яе ў нумар і адказваў на ўсе пытаньні. Ён уразіў яе тым, што хваліўся першым самастойным дзеяньнем у Маскве — адзін прайшоў да ўнівэрмагу «Дзіцячы сьвет», купіў марозіва і вярнуўся.

Яна адзначыла дзіўнае спалучэньне інфантыльнасьці і рашучасьці — усё ж далёка ня кожны быў здольны на такі крок, як адмова ад грамадзянства і пераезд у чужую невядомую краіну.

Потым яна напіша:

Калі наша гутарка падыходзіла да канца, у мяне ўзьнікла жахлівае адчуваньне марнасьці. Яго чакала, я была ўпэўненая, расчараваньне. Калі ён сыходзіў, я запрасіла заходзіць. Расейцы мяне папярэдзілі, сказаў Освальд, каб я не размаўляў з амэрыканцамі. Але перад тым, як зачыніць дзьверы, ён паабяцаў не рабіць рашучых крокаў, не паведаміўшы мне.

Праз два дні я пайшла на другі паверх і спытала ў дзяжурнай, дзе Освальд. Ён зьехаў, адказала яна.

Пасьля забойства МакМілан здолела пабудаваць даверлівыя адносіны з удавой Освальда і ў 1964-65 гадах запісала больш за 700 старонак інтэрвію зь ёй. Яна называла Марыну «вельмі сумленным чалавекам», які гаворыць праўду.

«Марына і Лі» стала клясыкай, яе высока ацаніў Мэйлер, які, аднак, адразу заявіў, што не з усім пагаджаецца, і патлумачыў — іначай навошта яму было б пісаць сваю кнігу.

Сапраўды.

Увогуле, калі паставіць за мэту захапіць з сабой усе дакумэнты, прысьвечаныя Освальду і забойству Кенэдзі, дык каб цягнуць 18 тон паперы, запатрабуецца воз і пара добрых коней, напрыклад, выведзенай у 1950-я пароды «савецкі цяжкавоз».

Аднак кнігі, прысьвечаныя менскаму пэрыяду, можна і ў руках панесьці, што зразумела: МакМілан па сьвежых сьлядах распытала Марыну, апроч Мэйлера ніхто ня меў доступу да дакумэнтаў КДБ і большасьці менскіх знаёмых Освальда, а зь іх толькі адзін Эрнст Цітавец напісаў свае ўспаміны.

Але адна амэрыканская кніга пра Освальда вы-

лучаецца — па-першае, таму што была напісаная яшчэ да таго, як Освальд стаў пасьмяротна ўсясьветна знакамітым, а па-другое, таму, што ўгадала будучыню освальдазнаўства.

Кніга, дзе прататыпам быў Освальд, называлася «Ідэальны ваяр». Яе напісаў сябра Освальда па службе ў марской пяхоце нехта Керы Торнлі.

Торнлі вонкава быў падобны да Освальда і потым шмат гадоў у шматлікіх інтэрвію ён заяўляў, што яны з Освальдам былі «прадуктамі генэтычных выпрабаваньняў, якія рабіла сэкта эўгенікаў, нацысцкіх прыхільнікаў з таварыства «Вірыл», што ў яго і Освальда пры нараджэньні ўжывілі прыстасаваньні для падслухоўваньня, за імі сачылі і маніпулявалі зь дзяцінства ўсемагутныя кіраўнікі «Вірылу».

Торнлі быў ахвярай неўміручай традыцыі, якая пачалася, верагодна, неўзабаве пасьля першай размовы Евы са Зьміем, і ня спыніцца, пакуль будзе існаваць чалавецтва. Гэта — пошук тайных спружынаў там, дзе іх няма, сакрэтных змоваў там, дзе іх не існавала, пабудова пірамідаў аргумэнтацыі, якія ні на што не абапіраюцца, непрыняцьце фактаў пасьля таго, як яны былі спраўджаныя належным чынам.

Мяжа, дзе здаровы скепсіс ператвараецца ў псыхічную хваробу, даволі шырокая. Часам вельмі. І, як у выпадку з гісторыяй Освальда, можа доўжыцца дзесяцігодзьдзямі.

У Беларусі, напрыклад, пасьля выхаду кнігі Мэйлера крытыкі як зь лягеру дэмакратычнай апазыцыі, гэтак і з афіцыёзу будуць абвінавачваць Станіслава Шушкевіча ў супрацоўніцтве з КДБ.

Так, галоўны рэдактар газэты адміністрацыі прэзыдэнта заявіць:

Ёсьць яшчэ адна цікавая рэч: у Менск з ЗША прыехаў Лі Гарві Освальд. Ня ведаю, навошта яго сюды прыслалі, але ўвесь час яго вучылі страляць. І настаўнікам расейскай мовы ў яго быў Шушкевіч, паверце мне, КДБ нічога не рабіла бяз сэнсу. Пра тое, каб яго вучыў Шушкевіч, было вырашана ў Маскве, на Лубянцы, Станіслаў Станіслававіч многа ведае, але ня скажа.*

Наконт таго, што КДБ нічога не рабіў «бяз сэнсу», спрачацца сэнсу ня мае, кожнаму сваё.

Мае сэнс нагадаць, што ў 1960-м, пасьля хрушчоўскага выкрыцьця сталінскіх злачынстваў, усю ўладу забрала партыйная намэнклятура, якая ў мэтах сваёй бясьпекі і пад лёзунгам аднаўленьня «ленінскіх прынцыпаў сацыялістычнай законнасьці» значна абмежавала ўсемагутныя органы. І сакратар парткаму, які на буйным заводзе быў фігурай ня менш важнай за дырэктара, мог арганізаваць урокі расейскай мовы без пэрсанальных падказак з Лубянкі.

Прэзыдэнцкі рэдактар таксама закідае Станіславу Шушкевічу рэпрэсаванага бацьку — як так, чаму сына ворага народу падпусьцілі да сакрэтнай працы.

Таксама варта нагадаць — афіцыйнае стаўленьне да ахвяраў рэпрэсіяў і іх сваякоў было ў тыя некалькі гадоў антысталінісцкай адлігі хутчэй спрыяльным — іх аднаўлялі ў партыі, а заслужаных

*Зрабаваны народ. Размовы зь беларускімі інтэлектуаламі. Гутарка з П. Якубовічам. Гарадзенская бібліятэка, 2009.

чэкістаў-ардэнаносцаў, наадварот, выключалі. Ішла выбарачная люстрацыя.*

Недарэчнае таксама сьцьверджаньне, быццам Освальда «ўвесь час вучылі страляць» — насамрэч вядома толькі пра два стрэлы, якія зрабіў Освальд на паляваньні ў Беларусі — і абодва міма, і аднойчы паўдзельнічаў у стральбе зь пісталета ў заводзкім клюбе ДТСААФ — «на троечку», як ацаніў інструктар (што ні пра што ня сьведчыць — вядомая гісторыя аднаго шматразовага чэмпіёна сьвету па стральбе зь пісталета, якога абрабавалі дома. Ён страляў у рабаўнікоў некалькі разоў з блізкай дыстанцыі і ні разу не патрапіў).

Увогуле, колькасьць журналісцкіх публікацыяў і ўспамінаў пра Освальда ў беларускім і расейскім друку (пра ананімных віртуалаў у Інтэрнэце лепш памаўчаць) вядзецца на сотні. І цяжка знайсьці хоць адну, дзе б не было фактычных памылак, ня кажучы ўжо пра дзікія дапушчэньні і фантастычныя высновы.

Ня ўсё яшчэ вычарпана, канечне. У Менску Освальд мог сустракацца і, зусім магчыма, бачыўся на вуліцах зь людзьмі, дасьведчанымі ў тэрактах. Напрыклад, з партызанкай Марыяй Осіпавай,

*У 1958-м быў звольнены з пасады чэкіст прызыву 1931 году, намесьнік старшыні КДБ Міхаіл Дзечка — «паводле фактаў, якія дыскрэдытуюць высокае званьне афіцэра» за тое, як сказана ў пастанове бюро ЦК КПБ, што «браў удзел у неабгрунтаваных арыштах савецкіх грамадзянаў і дапускаў грубыя парушэньні сацзаконнасьці пры дасьледаваньні крымінальных справаў». З 19 гадоў ён быў катам Мазыршчыны, пасьля вайны даслужыўся да міністра. Адну такую гісторыю пра ката Меншчыны Гарбанеўскага я падрабязна апісаў у кнізе «За кіпучай чэкісцкай работай». Пакараньні былі сьмешныя — адбіралі партбілет, але нікога не судзілі і не пасадзілі.

арганізатаркай зьнішчэньня цывільнага кіраўніка нямецкай улады ў акупаванай Беларусі Вільгельма Кубэ, што справакавала масавыя расстрэлы мірнага насельніцтва. Ці са старшынём прэзыдыюму Вярхоўнага Савету БССР Сяргеем Прытыцкім, што, як герой «Бесаў», па заданьні сваёй арганізацыі спрабаваў забіць сьведку на судзе.

Але найбольш блізкі Освальду ўзростам, поглядамі і маштабам зьдзейсьненага злачынства быў мясцовы сучасьнік Дастаеўскага Ігнат Грынявіцкі, які забіў Аляксандра Другога, самага лібэральнага расейскага цара, які вызваліў рабоў у Расеі, што амаль у той самы час зрабіў амэрыканскі прэзыдэнт Эйб Лінкальн.

І як тут абмінуць паралелі забойства Лінкальна і Кенэдзі. Першы быў абраны ў Кангрэс ў 1846-м, другі — ў 1946-м. Першы стаў прэзыдэнтам ў 1860-м, другі — у 1960-м, імёны абодвух па-ангельску налічваюць па сем літараў, абодвух забілі ў пятніцу, абодвух стрэлам у галаву, абодвух ззаду, побач з абодвума былі іх жонкі, Лінкальн быў забіты ў «Тэатры Форда», Кенэдзі ў аўтамабілі «Форд» мадэлі «Лінкальн», абодва наступныя прэзыдэнты мелі прозьвішча Джонсан і абодва былі з поўдня, першы Джонсан нарадзіўся ў 1808-м, другі ў 1908-м — але гэта толькі кветачкі.

Забойца Лінкальна Джон Вілкес Бут нарадзіўся ў 1839-м, Лі Гарві Освальд — у 1939-м, абодва былі з поўдня, у абодвух трохслоўнае імя, у абодвух імёны па-ангельску налічваюць 15 літараў, абодва былі забітыя перад судом...

Гэты сьпіс падабенстваў зьявіўся неўзабаве пасьля забойства Кенэдзі і паўстагодзьдзя зачароўваў амэрыканскую публіку, якая не давала веры

скептыкам, якія сьцьвярджалі, што нічога неверагоднага з пункту гледжаньня статыстыкі тут няма, што адрозьненьняў нашмат больш, чым супадзеньняў, што некаторыя зьвесткі недакладныя (Бут нарадзіўся на год раней), паралелі нацягнутыя...*

Неяк, адразу пасьля выхаду кнігі Мэйлера, я спытаўся ў аднаго менскага літаратара, чаму ён казаў знаёмым, быццам я агент КДБ. Крыху сумеўшыся, той патлумачыў — ты ж пісаў пра Освальда. Паводле гэтай лёгікі ён сам зьяўляўся сэксуальным маньякам, заафілам, нэкрафілам, сэрыйным забойцам і зрэдку іншаплянэтнікам.

Як казаў у падобных выпадках беларускі клясык Уладзімер Караткевіч:

«Хоць ты ўзвый на Месяц, стаўшы ракам!»

---

*Адзін з самых цытаваных аўтараў у сьвеце, радыкальны крытык амэрыканскай палітыкі зьлева, прафэсар Масачусэцкага тэхналягічнага інстытуту Ноам Чомскі, які нічога ніколі ня браў на веру, так выказаўся з нагоды тэорыяў змовы: «Ёсьць шмат супадзеньняў, нявытлумачаных зьяваў, чаму нешта здарылася, а нешта не. Калі паглядзець на кіраваны, кантраляваны навуковы экспэрымэнт у найлепшай лябараторыі — там таксама так. Там таксама шмат невытлумачальных рэчаў, дзіўных супадзеньняў. Паглядзіце на лісты, якія друкуюць у навукова-тэхнічных часопісах, такіх як «Nature», «Science» — пішуць пастаянна пра невытлумачальныя праявы ў тэхнічных экспэрымэнтах, як шмат рэчаў застаюцца без вытлумачэньня. Так створаны сьвет. Шмат розных рэчаў здараецца, пазьней можна іх аб'яднаць у якую-небудзь заканамернасьць, але раней нельга было. Але й гэтая заканамернасьць можа цалкам ня мець сэнсу. Проста такая прырода складаных падзеяў. Сьведчаньні, якія зь іх вынікаюць, ня маюць каштоўнасьці. Перакананьне, што гэта магло быць зроблена спэцыяльна, выклікае надзвычай малы давер... Велізарная энэргія кідаецца на пошукі, хто забіў Кенэдзі... Сотні людзей забіваюць увесь час, і што з таго, што адзін зь іх быў Кенэдзі? Калі б была падстава меркаваць, што існавала якая-небудзь змова ў вярхах, было б цікава, але доказы пра аднаго забойцу аглушальна пераканаўчыя». http://www.youtube.com/watch?NR=1&v=LoDqDvbgeXM



Пераклады перакладаў перакладаў

Маршрут гэтага падарожжа пралягае праз дакументы КДБ, якія атрымаў і апублікаваў Мэйлер. Цымус у тым, што атрымаў ён іх па-расейску, а апублікаваў па-ангельску, а я з ангельскай перакладаў на беларускую. Але гэта ня ўсё. Некаторыя дакументы, якія атрымаў Мэйлер ад КДБ, былі перакладамі з ангельскай на расейскую, зь якой потым ён перакладаў на ангельскую, а затым я на беларускую.

І гэта ня ўсё — каб палагодзіць пытаньні з аўтарскімі правамі Мэйлера, быў адпраўлены ліст у амэрыканскае выдавецтва і праваўладальнікам, дзе апісвалася структура майго дасьледаваньня і ішла гаворка пра аўтарскае права на пераклады і пераклады зь перакладаў — натуральна, усё гэта зноў у перакладзе.

Вось як пішчом чытачу трэба лезьці ў тыя архівы КДБ.

А вось што атрымаецца, калі запусьціць выраз «пішчом лезьці» праз аўтаматычны перакладчык

Google па ланцужку «беларуская — расейская — ангельская — беларуская»:

«Пішчом лезьці — пищат лезет — squeak climbs — складана падымаецца».

І сапраўды складана. Але падымаецца! Як падымаецца з кожным трапятаньнем бязважкі матылёк, ад крылцаў якога, як сьцьвярджаюць прыхільнікі тэорыі хаосу, можа нарадзіцца нават бура.

І некалі ж можна будзе зазірнуць і ў калекцыі КДБ, каб удакладніць пераклады, дый ня толькі іх.

Але гэта адбудзецца ўжо пасьля перайменаваньня другога паводле вядомасьці ў сьвеце расейскага слова з трох літараў.

Калі ня спаляць, як некалі ў апошнія гадзіны ГДР палілі архівы Штазі.

Хоць як спаліш сьляды матылькоў, што адляцелі?



Хто сьмяецца апошнім

Гэтая лепідаптэралягічная экспэдыцыя па сьлядох Освальда была і дасьледаваньнем менскіх падарожжаў Нормана Мэйлера, які лавіў тут сваіх матылькоў.

Мэйлер упадабаў Менск:

— Гэтая кніга пісалася лягчэй, чым іншыя мае кнігі. Я таксама атрымаў больш ад гэтай кнігі. Я люблю гэтую кнігу, таму што ў мяне быў надзвычайны досьвед жыцьця ў Менску. Я адчуў, а, чорт, мне ўжо даўно сёмы дзясятак, і я адчуў — я яшчэ не памёр. Зусім няблага. Я магу жыць у дзіўным месцы і шмат ад гэтага атрымліваць, і я плённа працую. Было весела.

На заканчэньне нашай доўгай гутаркі я папрасіў аўтара ўявіць сюжэт: амэрыканскі пісьменьнік прыяжджае ў Менск, дзе атрымлівае матэрыялы сачэньня спэцслужбаў за амэрыканскім грамадзянінам, які жыў тут на пару дзесяцігодзьдзяў раней. Пісьменьнік наймае кватэру, сустракаецца з мно-

ствам людзей, заводзіць знаёмствы — і ўвесь час за ім вядуць назіраньне спэцслужбы, падслухоўваюць размовы, здымаюць гасьцей на відэа, прымушаюць знаёмых пісаць справаздачы. А потым, праз пару дзесяцігодзьдзяў, у Менск прыяжджае дасьледнік творчасьці гэтага амэрыканскага пісьменьніка і атрымлівае доступ да архіву спэцслужбаў...

Мэйлер засьмяяўся.



Замест пасьляслоўя

Першай пакупкай Освальда ў Менску стала электравілка, сымбаль яго лёсу, што як матылёк біўся паміж плюсам і мінусам, пакуль не замкнуў напружаньне на сабе і не згарэў, пакінуўшы ўспамін, крохкі, як вугальныя лускачкі, і эфэмэрны, як дым.

Хоць можна сказаць і наадварот — чатыры мільёны аркушаў дакумэнтаў, што зьявіліся на сьвет з нагоды Освальда, рэч зусім не эфэмэрная. А рапарты вонкавага назіраньня КДБ апярэдзілі відэакамэры на дзесяцігодзьдзі і, дзякуючы ім, можна, як падарожніку ў часе — герою Брэдбэры, патрапіць у дзень Освальда ў Менску:

У 11:00 Лі Гарві выйшаў з гатэлю «Менск» і пайшоў у ГУМ. Там зайшоў у аддзел электратавараў, нешта спытаўся ў прадаўца, дастаў з кішэні грошы і пайшоў да касы. Ні за што не заплаціў, паклаў грошы назад у кішэню і пачаў хадзіць па першым паверсе ўнівэрмагу туды і назад і разглядаць розныя тавары. Затым вярнуўся ў

аддзел электратавараў, заплаціў 2 рублі 25 капеек за электравілку, паклаў яе ў кішэню і падняўся на другі паверх. Там правёў некаторы час у аддзеле гатовага адзеньня, перагледзеў наяўныя касьцюмы, затым выйшаў і хутка пайшоў...

... я таксама выйшаў з гатэлю «Менск» і павярнуў налева, прайшоў паўз кінатэатар «Цэнтральны», абутковую і ювэлірную крамы, затым бясконцы жоўты дом з калёнамі, ззаду засталася заўсёды шматлюдная кнігарня, шакалядны аазіс, крамы кветак і сувэніраў і праз 5 хвілін я ўваходзіў у ГУМ, падышоў да аддзелу электратавараў, павітаўся з прадавачкай, дастаў з кішэні грошы, падышоў да касы, не заплаціў, а вырашыў прагуляцца па першым паверсе ўнівэрмагу туды і назад і паглядзець розныя тавары, падняўся на другі паверх у аддзел мужчынскага адзеньня, перагледзеў наяўныя касьцюмы, вярнуўся ў аддзел электратавараў, заплаціў 1160 рублёў за электравілку, паклаў яе ў кішэню і хутка пайшоў на выхад.

Не з пустымі ж рукамі вяртацца.

Падзякі

Аўтар удзячны ўсім, хто спрыяў пошукам і дзяліўся знаходкамі ў сваёй памяці, прыватных архівах, сямейных альбомах і іншых месцах, недаступных нават усемагутнаму Google — Аляўціне Вячорцы, Сьвятлане Лукашук, Інэсе Маркавай, Зянону Пазьняку, Эдуарду Сагындыкаву, Алене Сіваковай, Дэйвіду Суорцу, Станіславу Шушкевічу, Сяргею Ханжанкову, калегам з Радыё Свабода.

Нельга перабольшыць ролю, якую адыгралі ў гэтым паляваньні на матылькоў Стыў Пэтрэн, сваяк аўтара з Масачусэтсу, які здабыў тэкст першай публікацыі «Гістарычнага дзёньніку»; пісьменьнік Норман Мэйлер зь Нью Ёрку, які ахвотна даў аўтару працягнуць інтэрвію; дэпутат Вярхоўнага Савету Беларусі 12-га скліканьня Сяргей Навумчык, які бясстрашна і рашуча пашыраў беларускую галоснасьць і напісаў свае сьведчаньні для гэтага дасьледаваньня; пісьменьнік Уладзімер Арлоў, які перагарнуў рукапіс прыдзірлівай рукой гісторыка і лёгкай рукой паэта.

Трафэі гэтай экспэдыцыі ніколі б не пабачылі сьвет без прафэсійных лепідаптэрыстаў — мастака Генадзя Мацура, чыё каліграфічнае пяро ўмее лятаць, вёрстка чытаецца як верш, а вокладкі экспануюцца на выставах, і рэдактара Сяргея Дубаўца, чые парадаксальныя, як зігзагі матылька, прапановы, вострыя, як шпількі для калекцыі лускакрылых, заўвагі, падрабязныя, як навука энтамалёгія, парады аўтар стараўся ўвасобіць, наколькі мог.

Усе недакладнасьці, прабелы і недарэчнасьці — заслуга самога аўтара, за якую ён гатовы панесьці якое-небудзь лёгкае пакараньне, напрыклад, паспрабаваць амаль немагчымае — злавіць у палёце матылька.

І адпусьціць.

Асноўныя крыніцы

Report of the President's Commission on the Assasination of President John F. Kennedy and 26 accompanying volumes of Hearings and Exhibits. Washington D.C. US Government Printing Office, 1964

http://www.history-matters. com*

Who Was Lee Harvey Oswald? Documentary, Frontline —WGBH, Boston -PBS, 1993

Priscilla McMillan. Marina and Lee. New York, Harper and Row, 1977

Norman Mailer. Oswald's Tale. An American Mystery. New York, Random House, 1995

Ernst Tsitovets. Oswald. Russian episode. Minsk. 2010

Газэта «Звязда», 1959-1962 гг.

Газэта «Советская Белоруссия», 1959-1962 гг.

Дзяржаўны архіў кінафотафонадакумэнтаў Беларусі, Дзяржынск

*Гэты сайт (у перакладзе — «Справы гісторыі» ці «Гісторыя мае значэньне») дае найбольш поўны доступ да амэрыканскіх першакрыніцаў у Інтэрнэце. Яго кіраўнік Рэкс Брэдфард тлумачыць: «Мэта гэтага вэбсайту і наагул праекту «Гісторыя мае значэньне» — праліць неабходнае сьвятло на цьмяныя аспэкты амэрыканскай паваеннай палітыкі, асабліва на забойствы 1960-х. Хлусьня і міты пра гэтыя забойствы стварылі «чорную дзірку гісторыі», якая скажае наша разуменьне ўсяго пэрыяду. Урэшце, няздольнасьць паглядзець у твар сваёй сапраўднай гісторыі стварае пагрозу дэмакратыі і свабодзе».

Паказьнік асобаў*

Агафонава Роза *140*
Адамовіч Алесь *196*
Аквінскі Тамаш *260*
Аксёнава Люба *140*
Аксёнаў Аляксандар *41*, *289*
Ала *159*
Альбіна *109*
Альфрэд *108*, *127*
Аляксандар Другі *366*
Арлоў Уладзімер *374*
Астапенка П. *64*
Аценкаў Міхаіл *75*

Бакацін Вадзім *79*, *80*
Бандарын Канстанцін *140*, *335*, *336*
Бараўцоў Валянцін *140*
Барашкін *133*
Бардо Брыжыт *131*, *132*, *186*, *192*
Берлава Муся *140*
Берыя *59*, *73*
Бонд Джэймс *212*
Бостэр Дэвіс *116*
Брэдбэры Рэй *8*, *360*, *372*
Брэдфард Рэкс *375*
Брэжнеў *22*, *23*
Бураўкін Генадзь *65*
Бут Джон Вілкес *366*, *367*
Буш Джордж старэйшы *43*, *44*
Быкаў Васіль *60*, *307*
Бэлоў Сол *171*
Бюкэнан Пэт *23*
Бялянкіны Галіна і Юры *140*

Варашылаў *240*
Ведзянеева Раіса *140*
Верас Аляксандар *33*, *36*, *37*, *38*
Вострыкаў *72*
Вузэр *199*

*За выключэньнем Лі Гарві Освальда.

Вулф Том *196*
Вэргілі *309*
Вячорка Аляўціна *374*

Гагарын Юры *314*
Галавачоў Павал *97, 99, 100, 101, 137, 140, 145, 149, 151, 154, 155, 170, 171, 177, 201, 276, 278, 283—285, 309, 320, 321, 326, 328, 329—332, 338—340*
Галавачоў-старэйшы *329*
Галанскоў *306*
Галубцоў (ён жа «Гузьмін Ігар Іванавіч», ён жа «Ігар») *72*
«Гандончык» *170, 171*
Гарбанеўскі *365*
Гардзіеўскі Алег *212*
Гартагз Рэнатус *354, 355, 356*
Гельфант Леанід *140*
Герман Эла (яна ж «Дора») *140, 170, 172—174, 176—181, 183, 185, 204—206, 249, 335*
Гінзбург *306*
Гінзбург Алэн *171*
Гітлер *122, 169*
Глебаў Яўген *239*
Гогаль *317*
Гол *45*
Голдынг Уільям *113*
Гразноў Феадосій *64*
Грыг *204*
«Грыгор'еў Сьцяпан Васілевіч» (ён жа «Сьцяпан», ён жа Касьцюкоў Аляксандар Фёдаравіч) *72, 332*
Грынявіцкі Ігнат *266*
Грэгары Пол *327*
Гувэр *98*
«Гузьмін Ігар Іванавіч» (ён жа «Ігар», ён жа Галубцоў) *71—73, 145, 160, 166, 181, 206, 336, 337*
Гэмінгуэй Эрнэст *112, 113, 145*
Гярцовічы Мая і Сямён *209*

Даніэль *306*
Дантэ *309—313*
Дастаеўскі *16, 96, 112, 233—235, 328, 340, 342, 349, 350, 366*
Джонсан Джэй Лі *98*
Джонсан Ліндан *20, 23, 98, 334, 359, 366*
Дзечка Міхаіл *365*
Дзьмітрыенка М. *89*

Дзяржынскі *37, 292*
Дмоўская Вольга *140*
«Дора» (яна ж Герман Эла) *175, 180, 183*
Драйзэр *350*
Дубавец Сяргей *374*
Дурасаў *316*

Ева *363*
Ельцын Барыс *46*

Жынкевіч Раіса *140*

Запрудэр Абрам *342*
Зігер Аляксандар Раманавіч *58, 62, 63, 108, 109, 140, 149, 151, 155, 182, 249, 283—285, 309*
Зігер Аляксандра *140*
Зігер Аніта *58, 108, 109, 127, 128, 264, 335*
Зігер Элеанора *58, 108, 127, 335*
Зігер, сп-ня *277, 279—281, 283—285*
Зігеры *108, 109, 127, 141, 144, 154, 163, 249, 250, 263, 276, 285, 321*
Зімянін *59*

«Ігар» (ён жа «Гузьмін Ігар Іванавіч», ён жа Галубцоў) *71, 73, 75, 84, 85, 100, 212, 317*
Іна *177, 178*
Іна Т. *163, 164*
Інэса *201, 263*

Кальман Імрэ *107*
Капотэ Трумэн *196*
Кар Юджын *352*
Караткевіч Уладзімер *367*
Картэр *98*
Кастра Фідэль *231*
Касьцюкоў Аляксандар Фёдаравіч (ён жа «Грыгор'еў Сьцяпан Васілевіч», ён жа «Сьцяпан») *37—39, 73, 74, 86, 340*
Кафка *317*
Кебіч Вячаслаў *40*
Кенэдзі Джон Фіцджэральд *9—12, 20, 22, 23, 31, 33, 38, 43—45, 50, 55, 77—79, 98, 116, 150, 203, 231, 303, 306, 307, 333—335, 348—349, 353, 355, 359, 360, 362, 366, 367*
Клейнэр *94*
Клінтан Біл *23, 43, 44—46*
Коналі Джон *11*

Корбут Вольга *23*
Крапіва Кандрат *132*
Крапіўны Аляксандар *255*, *257—260*
Кручкоў *79*
Кубэ Вільгельм *366*
Кузьмічы Людміла і Міхаіл *140*
Кузьняцова Роза *27*, *86*, *99*, *114*, *177*, *306*
Купала Янка *323*

Лавіцкі Генадзь *32*, *37*, *39*
Лебедзеў Валеры *137*, *138*
Ленін *14*, *16*, *102*, *104*, *105*, *113*, *132*, *134*, *237*, *292*, *294*, *312*, *349*
Лібезін *99*
Лінкальн Эйб *366*
Ліст *204*
Ліўшыц Г.М. *260*
Лондан Джэк *113*
Лорэнц Эдвард *358*
Лукашук Сьвятлана *374*
Лукашэнка Аляксандар *46*, *130*
Люба *263*

«Магда» *170*, *171*
Мазураў Кірыла *59*, *64*, *65*, *255*, *299*,
МакВікерс *246*
МакМілан Прысцыла *155*, *222*, *361*, *362*
Макнаўцы Надзея і Дзяменці *140*
Макоўская Галіна *140*
Малянкоў *240*
Манро Мэрылін *51*
«Мараў генэрал» *71*
Марвэл *45*
Марк *231*
Маркава (Пісенка) Іна *44*, *157*, *158*, *374*
Маркс *113*, *158*, *171*, *285*
Марлах муж і жонка *315*
Мартын Уільям *117*
Мастаўшчыкоў Сяргей *48*
Матысюк *316*
Мацур Генадзь *374*
Мацюшка *133*
Машэраў *59*, *255*
Меражынскі Юры *140*, *169*, *187*, *188*, *190*
Меражынскі, прафэсар *187*, *190*

Міган Дон *122*, *123*
Мікі Маўс *125*
Мітчэл Бэрнан *117*
Міхайлаў Валянцін *140*
Мэйлер Норман *10*, *32*, *36—38*, *45*, *47—51*, *54*, *55*, *60*, *62*, *66—69*, *71—74*, *77*, *78*, *81—84*, *86*, *90*, *95*, *96*, *100—103*, *106*, *109*, *110*, *115*, *117—119*, *129*, *136*, *139—146*, *148—150*, *156*, *157*, *160—164*, *166*, *167*, *169—171*, *173*, *178*, *179*, *181*, *184*, *187*, *188*, *194*, *196*, *197*, *199—203*, *205*, *206*, *209*, *211*, *212*, *222*, *226*, *232—238*, *244*, *245*, *247*, *251*, *253*, *261*, *266*, *268*, *276*, *285*, *286*, *308*, *313*, *321*, *324*, *326*, *328*, *330*, *335—340*, *342*, *347—354*, *356*, *357*, *362*, *363*, *367*, *368*, *370*, *371*, *374*
Мэндэльсон *157*
Мэтлак Джэк *323*

Навумчык Сяргей *30—33*, *36*, *37*, *40*, *41*, *73*, *339*, *374*
Ніксан Рычард *21—23*, *347*
Нічыпарэнка Алег *140*
Норбэры Джозэф *271*, *273*
Нэлі *159*
Нэля *177*
Нэля К. *164*
Нячаеў Сяргей *349*

Орвэл Джордж *112*, *171*, *248*, *293*, *296*, *312*
Освальд Джон *98*
Освальд Джун *262—265*, *277*
Освальд Маргарыта *115*, *116*, *120*, *270*
Освальд (Прусакова, Портэр) Марына *22*, *34*, *39*, *47*, *55*, *56*, *74*, *93*, *139*, *154*, *155*, *166*, *185—189*, *191*, *192*, *194*, *196*, *198—211*, *214*, *215*, *217*, *218*, *222*, *226*, *230—232*, *234*, *235*, *237*, *239*, *243—245*, *248—250*, *261—264*, *266—269*, *271*, *272*, *277*, *279—281*, *283—286*, *290*, *319—327*, *330*, *338—340*, *342*, *343*, *345—347*, *349*, *361*, *362*
Освальд Робэрт *16*, *293*, *350*
Освальд Робэрт Эдвард Лі *194*
Освальд Рэйчал *231*
Освальд Томас Гепварт *194*
Освальд Уільям *194*
Осіпава Марыя *365*
Оўэн Робэрт *271*, *273*

Пагодзін *327*
Падгорны М. *65*
Пажалуістэ Стэліна *27*, *98*, *140*, *195*, *335*
Пазьняк Зянон *44*, *344*, *374*

Паліна *244*
Панамарэнка *59*
Пастарнак *329*, *332*
Патолічаў *59*
Паўэрс Фрэнсіс Гэры *173*
Перасьветава Людміла *53*
Петрусевіч Людміла *345*
Пісенка (Маркава) Іна Андрэеўна *140*, *156*
Піскалёў Аляксандар *140*, *186—188*, *210*, *211*, *230*
По Эдгар *75*
Портэр Кенэт *231*
Пракапчук Галіна *140*
Прахорчык Макс *140*, *173*
Прусакова Валянціна *186*, *194*, *196*, *234*, *262*, *263*, *266*
Прусаковы Паліна і Валянціна *140*
Прусакоў Ільля *186*, *194*, *243*, *244*, *263*, *266*, *320*, *321*
Прытыцкі Сяргей *366*
Пушкін *236*, *238*
Пэтрулі *18*
Пэтрэн Стыў *374*
Пянькоўскі Алег *212*
Пянькоўскі Валянцін *212*
Пятроў Васіль *33*, *85*, *103*, *294*, *295*, *315*, *317*

Райх Вільгельм *170*, *171*
Райцэз Дэйвід *44*
Раманава Аляксандра *140*
Раск Дын *116*, *272*
Робэртс *316*
Роўм Гавард *348*
Рубі Джэк *12*, *98*, *334*, *338*, *350*
Рут Уолер *19*
Рымскі-Корсакаў *204*
Рэйган *360*

Сабакін *312*
Сабела Яніна *140*
Сагындыкаў Эдуард Кадыравіч *93*, *94*, *374*
Салжаніцын Аляксандар *60*, *114*, *306*, *315*
Санкоўская Тамара *140*
Сахараў *114*
Севасьцянава Ларыса *140*
Сівакова Алена *374*
Сімчэнка Аляксандар *140*

Сіняўскі *306*
Скопа Соня *140*
Смольскі Міхаіл *140*
Снайдэр Рычард *18*, *21*, *182*, *206*, *246*
Соня *319*, *320*
Сталін *14*, *16*, *30*, *59*, *124*, *157*, *189*, *210*, *211*, *240*, *292—296*, *306*, *329*
Стоўн Олівэр *44*
Суорц Дэйвід *42—44*, *61*, *374*
«Сьцяпан» (ён жа «Грыгор'еў Сьцяпан Васілевіч», ён жа Касьцюкоў Аляксандар Фёдаравіч) *72*, *73*, *75*, *77*, *78*, *85*, *86*, *100*, *103*, *110*, *112*, *162*, *166*, *167*, *253*, *317*, *326*, *328*, *330*, *337*, *339*
Сэлінджэр Джэром *171*

Талсты *189*, *192*, *232*, *233*, *235*, *342*
Тангайм *45*
Танк Максім *65*
«Таня» *28*, *110*, *112*, *114*, *162*
Таўэр Джон *245*, *247*
Томіс *159*
Томка *159*, *164*
Томпсан Гунтар *196*
Томпсан Левэлін *272*
Торнлі Керы *363*
Трапш Рыгор *147*
Тыпіт Джэй Ды *11*

Уолкер *22*, *347*
Уорэн Эрл *20*
Уронскі Пітэр *48*, *345*
Уэйд Генры *334*
Уэлс Гэрбэрт *102*, *112*

Філіпс *269*
Філістовіч Янка *147*
Флаві *260*
Фолкнэр *113*
Форд Джэральд *21*, *166*
Франк Леанард *113*
Фройд Зыгмунд *170*, *171*

Ханжанковы *305*
Ханжанкоў Сяргей *303*, *304*, *305*, *306*, *307*, *308*, *374*
Хрушчоў Мікіта *58*, *59*, *63—65*, *78*, *107*, *120—125*, *186*, *240*, *242*, *253—258*, *288*, *294—296*, *299*, *306*, *315*, *340*

Цагойка Леанід *136*, *137*, *140*
Цанава *73*, *74*
Цітавец Натальля *140*
Цітавец Эрнст *109*, *140—146*, *148—155*, *157*, *159*, *161*, *185*, *189—193*, *229*, *237*, *263*, *264*, *309*, *321*, *335*, *336*, *340*, *356*, *362*

Чайкоўскі *204*, *238*, *239*
Чайкоўскі Мадэст *238*
Чаркасава Лідзія *65*, *133*, *134*, *140*, *169*, *186*, *187*, *190*
Чомскі Ноам *367*
Чэхаў *317*

Шавура *133*
Шалякіна Альбіна *140*
Шапілаў *240*
Шарапаў Васіль Іванавіч *27*, *57—59*, *197*
Швэйк *317*
Шоў Бэрнард *145*
Шпанко Анатоль *140*
Шуман *205*
Шушкевіч-бацька *83*
Шушкевіч Станіслаў *31—33*, *41—44*, *47*, *81—83*, *102*, *137*, *140*, *363*, *364*, *374*
Шылер Лорэнс *51*, *69*, *81*, *148*, *235*
Шыракова Рыма *140*
Шыркоўскі Эдуард *31—33*, *37*, *38*, *47*, *71*, *80*, *102*, *340*
Шэксьпір *145*, *192*

Эйзэнгаўэр *101*
Энгельс *30*, *158*, *285*
Эпстайн Эдвард *149*

Юдзялевіч *89*

Яанімэтс Віктар *121—125*
Якубовіч П. *364*
Яхель Інэса *140*

Пра аўтара

Аляксандар Лукашук нарадзіўся ў 1955 у Берасьці, вучыўся ў Менску, працаваў перакладчыкам, журналістам, рэдактарам. У 1990-1992 быў галоўным рэдактарам выдавецтва «Беларусь». З 1993 — на Радыё Свабода, з 1999 дырэктар Беларускай службы РС. У 2004-2005 быў дырэктарам Радыё «Свабодны Афганістан», у 2007-2008 выконваў абавязкі галоўнага рэдактара Радыё Свабода/Радыё Свабодная Эўропа. Стыпэндыянт Гувэрскага інстытуту, Стэнфардзкі ўнівэрсітэт, Каліфорнія, 2000.

Адзін з заснавальнікаў «Мартыралёгу Беларусі», у 1990-1995 — сябра Камісіі Вярхоўнага Савету Беларусі па правах ахвяраў палітычных рэпрэсій. Аўтар дасьледаваньняў гісторыі 20-га стагодзьдзя, у тым ліку кніг «Зьдзек» (1988), «Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста» (1997), «За кіпучай чэкісцкай работай» (1997), «Прыгоды АРА ў Беларусі» (2005), кнігі дакумэнтальнай прозы «У фіялетавай ночы вугал крыла» (1999).

Аўтар больш чым ста артыкулаў і інтэрвію пра палітычную сытуацыю Беларусі ў амэрыканскіх і замежных эўрапейскіх СМІ.

Сцэнарыст фільмаў «Трагедыя Арменіі» (1990), «Дэпутаты» (1992), «Дарога на Курапаты» (Дзяржаўная прэмія Беларусі ,1994), і іншых.

Ляўрэат міжнароднай прэміі імя Францішка Багушэвіча Беларускага Пэн-цэнтру.


Жыве ў Празе.

Summary


«Trace of a Butterfly» is the story of Lee Harvey Oswald's life in Minsk, Belarus from January 1960 through May 1962 — as told through secret audio and video surveillance files of the KGB, Oswald's own journals, and the recollections of his friends and lovers. In prose both lapidary and ironic, author Alexander Lukashuk resurrects all the challenges and joys of life in a provincial Soviet industrial center of the Krushchev era — with all its Orwellian propaganda and Kafkaesque reality. Famed Oswald biographer Norman Mailer, who himself lived in Minsk in the early 90s, was interviewed extensively by Lukashuk and becomes the book's second protagonist.

At once a literary feast and a mockery of Oswaldian mythology, «Trace of a Butterfly» is a delectable double treat.


«Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе» —
кніжны праект Беларускай службы Радыё Свабода.
Чытайце ў інтэрнэце: **www.svaboda.org**




Верш на Свабоду.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2002. — 464 с.




Дарога праз Курапаты.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2002. — 464 с.: іл.




Poems on Liberty: Reflections for Belarus.
Пераклады Веры Рыч.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2004. — 312 с.




Быкаў на Свабодзе.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2004. — 536 с.: іл.




Быкаў на Свабодзе.
Збор выступаў клясыка беларускай літаратуры ў этэры Радыё Свабода.
Аўдыёдыск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2004.




Дуліна ад Барадуліна.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2004. — 254 с.: іл.




Аляксандар Лукашук. **Прыгоды АРА ў Беларусі.** Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2005. — 500 с.: іл.




Быкаў на Свабодзе. 2-е выд., дапоўненае. Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2005. — 662 с.: іл.



Сяргей Дубавец. **Вострая Брама.** Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2005. — 520 с.




Вячаслаў Ракіцкі. **Беларуская Атлянтыда.** Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2006. — 504 с.: іл.




Плошча, 19.03–25.03.2006. Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2006. — 400 с.: іл.




Вінцэсь Мудроў. **Альбом сямейны.** Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2007. — 232 с.: іл.



Начная чытанка. 50 аўтараў з этэру Радыё Свабода.
Мультымэдыйны дыск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2007.



Уладзімер Арлоў.
Імёны Свабоды.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2007. — 576 с.: іл.



Івонка Сурвіла.
Дарога. Стоўпцы – Капэнгаген – Парыж – Мадрыд – Атава – Менск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2008. — 144 с.: іл.




Пётра Садоўскі.
Мой шыбалет.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2008. — 426 с.: іл.




Начная чытанка 2. 50 аўтараў з этэру Радыё Свабода.
Мультымэдыйны дыск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2009.



Адзін дзень палітвязьня.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2009. — 364 с.: іл.




Юры Дракахруст.
Акцэнты Свабоды.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2009. — 430 с.: іл.




Сяргей Дубавец.
Як? Азбука паводзінаў.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2009. — 252 с.: іл.




Міхась Скобла.
Вольная студыя.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2009. — 554 с.: іл.



Барды Свабоды.
Зборнік гутарак і песень 50 удзельнікаў аднайменнай перадачы
Радыё Свабода. Мультымэдыйны DVD-дыск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2010.




Васіль Быкаў. Доўгая дарога дадому.
Чытае аўтар.
Мультымэдыйны дыск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2010.



Вячаслаў Ракіцкі.
Беларуская Атлянтыда. Кніга другая.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2010. — 352 с.: іл.




Сто бардаў Свабоды. Зборнік гутарак і песень 100 удзельнікаў перадачы «Барды Свабоды». Мультымэдыйны DVD-дыск. Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011.




Галіна Руднік. **Птушкі пералётныя.** Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011. — 192 с.: іл.



Галасы Салідарнасьці. Міжнародная падтрымка беларускай дэмакратыі. Мультымэдыйны DVD-дыск. Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011.



Вячаслаў Ракіцкі. **Сто адрасоў свабоды.** Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011. — 330 с.



Саўка ды Грышка. Год першы. Калекцыя 50 песьняў – падзеі года ў сатырычным дуэце Лявона Вольскага з самім сабой на Радыё Свабода. Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2011.



Альгерд Бахарэвіч. **Малая мэдычная энцыкляпэдыя Бахарэвіча.** Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011. — 320 с.: іл.

бібліятэка Свабоды

XXI стагоддзе

сьлед матылька

«Сьлед матылька» — дакумэнтальнае падарожжа ў Менск 1960-х, дзе жыве дзіўны амэрыканец-перабежчык, за якім дзень і ноч сочыць вока і вуха дзяржбясьпекі. Неўзабаве ён адляціць на радзіму і наробіць там такіх дзялоў, што дагэтуль яго менская справа застаецца засакрэчанай. Але не для чытачоў гэтай кнігі.

«Бібліятэку Свабоды» складаюць выбраныя перадачы Беларускай службы Радыё Свабода.

ISBN 978-0-929849-41-6

сьлед матылька